Юліян ВЫСОЦКІ

# Перамогу набліжалі як маглі



## САЛДАТАМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*74-й гадавіне Перамогі*
*ў Вялікай Айчыннай вайне прысвячаю*

Як мала вас засталося,
Салдаты Айчыннай вайны!
І вяне жыццё, як калоссе,
Ды ў тым няма вашай віны.

Сябе вы не шкадавалі:
Пад кулі, на міны ішлі,
Краіну сваю вызвалялі
Ды іншым руку падалі.

А як вас Еўропа вітала:
Ад шчасця вясна там цвіла!
І пела яна, танцавала –
Ды памяць кароткай была.

Стараюцца сплавіць у Лету
Ваш подзвіг і веліч яго –
Няхай і не мараць пра гэта,
Бо мы не дапусцім таго.

Запалім агонь мы нязгасны,
Каб вечна свяціў, як маяк,
І будзе тут кожнаму ясна,
Што ён – нашай памяці знак!

І кожнай ружовай вясною
Салютам яна прагрыміць,
У тым – нашай праўды аснова,
Інакш мы не зможам пражыць.

А тых, хто ахвоч перагледзець,
Гісторыю перапісаць,
Бяспамятных нашых суседзяў
Мы зможам пераканаць.

**Юліян Высоцкі**

*Май 2015 года*



Юліян ВЫСОЦКІ

# Перамогу набліжалі як маглі

*Дакументальныя аповесці*

МІНСК
ВЫДАВЕЦКІ ДОМ
«ЗВЯЗДА»
2019

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
В93

*Пераклад архіўных дакументаў з рускай мовы аўтара*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 978-985-575-218-0**

© Высоцкі Ю. С., 2019
© Высоцкі Ю. С., пераклад на беларускую мову, 2019
© Афармленне. РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2019

## БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ, ЛЮДЗІ!

*Даўно адгрымела над нашай планетай самая крывавая сусветная вайна. Была яна цяжкай трагедыяй, асабліва для народаў Еўропы. Пасля яе такога напалу жорсткасці, такіх вялікіх ахвяр і такога размаху змагання свет ужо не зведаў. Як і ўсё пад плынню гадоў, Другая сусветная вайна стала гісторыяй. Але гэта трагічная гісторыя павінна заставацца ў памяці чалавецтва назаўсёды, таму што той, хто забыўся на сваё мінулае, можа паўтарыць яго неаднойчы.*

*Трэба заўсёды памятаць, якой цаной мы здабылі мір, колькі крыві і жыццяў палажылі нашы продкі на алтар Перамогі, каб усталяваць на нашай зямлі спакой. Калі гэта памяць будзе заўсёды з намі, мы не дапусцім новай вайны. Шануючы подзвігі продкаў, унікаючы ў героіку ваенных будняў мінулых гадоў, мы аддаем павагу іх удзельнікам і вучымся захоўваць мір і спакой у родным краі.*

*Для беларусаў назаўсёды крывавай ранай памяці павінна заставацца Вялікая Айчынная вайна, у якой загінуў кожны трэці жыхар рэспублікі. Самае жорсткае і ўпартае супрацьстаянне дабра і зла, самыя жудасныя злачынствы і здзекі з мірных людзей былі менавіта на зямлі Беларусі. Як жа можна забыцца пра іх, пра мільёны ахвяр, сотні спаленых вёсак, попел якіх стукае ў нашы сэрцы?*

*Людзі! Памятайце: па зямлі ходзяць тыя, хто жадае зноў кінуць нас у пекла бамбёжак, ваенных пажараў і д'ябальскія колы канцлагераў. Агрэсія наступае – памятайце заклік Юліуса Фучыка: людзі, будзьце пільнымі!*

*Да гэтага заклікаюць вас і героі маіх новых дакументальных аповесцей – пра генерала А. І. Гасціловіча, камандарма 18-й арміі, дзе Л. І. Брэжнеў узначальваў палітаддзел, пра І. М. Фёдарава, камісара самай баявой і трагічнай на Беларусі партызанскай брыгады «Штурмавая», пра разведвальна-дэсантную групу 1-га Беларускага фронту, у якой плячо да пляча змагаліся савецкія афіцэры і жаўнеры адроджанага Войска Польскага. І кранальная аповесць пра юных следапытаў – навучэнцаў 30-й мінскай гімназіі, якія адкрылі невядомыя старонкі вайны, паказалі высокі прыклад шанавання герояў Вялікай Айчыннай і захавання памяці пра ўдзельнікаў вялікага змагання.*

***Аўтар***

# Камандарм васямнаццатай

На Валожыншчыне добра вядома імя генерала **А. І. Гасціловіча,** які прайшоў адметны жыццёвы шлях у радах Савецкай Арміі. Генерал-палкоўнік, доктар ваенных навук, прафесар Акадэміі Генеральнага штаба ў розны час камандаваў нашай 17-й арміяй у Манголіі, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны – васямнаццатай на 1-м і 4-м Украінскіх франтах, вызваляў Заходнюю Украіну і Чэхаславакію. Антон Іосіфавіч быў знаёмы і сябраваў з многімі вядомымі военачальнікамі і палітычнымі дзеячамі: Г. К. Жукавым, А. І. Антонавым, П. А. Ротмістравым, М. Ф. Ватуціным, С. М. Штаменкам, Цэдэнбалам, Людвікам Свабодай, Леанідам Брэжневым, які ў ваенныя гады ўзначальваў палітаддзел той жа 18-й арміі.



## ЦЯГНІК У ГЕРАІЧНАЕ БУДУЧАЕ

Яны выйшлі з варот дзіцячага дома і міжволі спыніліся. Хлопцам падалося, што перагортваецца нейкая важная старонка іхняга гаротнага жыцця. Усе дзіцячыя беды і рэдкія радасці застаюцца за гэтай агароджай, за сценамі памяшкання, якое яны пакінулі назаўсёды, дзе засталіся іх малодшыя паплечнікі, строгія выхавальнікі, нянечкі, педагогі. Хлопчыкі азірнуліся на свой часовы прытулак, паглядзелі адзін на аднаго і засмяяліся: вецер свабоды клікаў у нязведаную дарогу, як ім здавалася, у шчаслівую будучыню.

– Ну што, Антон, пададзімся на поўдзень? – спытаў вышэйшы падлетак.

– Мы ж яшчэ раней запланавалі гэта. Толькі ж як ехаць на той далёкі поўдзень? Ты падумаў?

– Што тут думаць! Пойдзем на бліжэйшую чыгуначную станцыю і сядзем у цягнік, які адпраўляецца ў паўднёвым кірунку…

Праз некаторы час хлопцы апынуліся на чыгуначным вакзале. У людской штурханіне, у вакзальным бедламе яны не адразу адшукалі патрэбны састаў, зайшлі з канца і залезлі на дах апошняга вагона. Каб іх не заўважылі да

адпраўлення, перабраліся праз некалькі вагонаў наперад і залеглі.

– А на поўдні, напэўна, хлеба многа: наямося ад пуза, – летуценна прамовіў Міша.

– Ты спачатку дабярыся да таго хлебнага месца, а пасля пра харчы думай, – разважліва перапыніў яго сябра.

Цягнік развітальна пратрубіў і нетаропка рушыў. Загрукалі на стыках рэек колы, паравоз паскорыў пыхценне, і хуткасць пачала нарастаць. Паравозны гудок зноў разнёсся над зямлёй, і ў яго гуле расталі чалавечыя крыкі і гвалт, што даносіліся з паўнюткіх вагонаў. Хлопцы падняліся і ўселіся спінамі па руху поезда. Міша выцягнуў кавалак газеты, які ён падабраў на вакзале, і пачаў чытаць уголас. З вагоннага вакна вытыркнулася кудлатая галава з шэрым закурадымленым тварам.

– Ты, хлопча, умееш добра чытаць – нібы рэпу грызеш. Дык прачытай мне вось гэту граматку, – і салдат працягнуў прамавугольнік шэрай абгортачнай паперы. Гэта аказалася адозва палітаддзела 3-й арміі з заклікам уступаць у рады Чырвонай Арміі і падымацца на барацьбу з контррэвалюцыяй. Уважліва выслухаўшы тэкст, салдат паківаў галавою і з горыччу заўважыў:

– Ну які з мяне цяпер чырвоны герой! Куды мне, бязногаму, на фронт? Адваяваўся. Цяпер дома буду лапці плесці. А вы, хлопцы, што рабіць думаеце? – спытаў ён падарожнікаў.

– Тут трэба пакумекаць, у якую вайсковую часць запісацца. Дзе прымуць... – разважліва адказаў Антон.

Дабраліся да Чышмы, гарадка непадалёку ад Уфы, і хлопцам давялося развітацца: Антон захварэў на тыф. Толькі праз некалькі месяцаў, аслабелы і знясілены выйшаў ён са шпіталя і падаўся на вакзал, каб адправіцца далей на поўдзень. І тут яму на вочы трапіла абʼява, што бялела на дзвярах станцыйнага памяшкання.

«Толькі спачуваючым РКП(б)! Праводзіцца набор чырвонаармейцаў, добраахвотнікаў у Чышмінскую стралковую роту ўнутранай аховы рэспублікі Усерасійскай Надзвычайнай камісіі».

І Антон зразумеў, што гэта яго кліча лёс. Праз некаторы час ён ужо стаяў перад камандзірам роты з просьбай запісаць яго ў рады чырвонаармейцаў.

– Ты што, хлопец, сурʼёзна? – спытаў той з недаверам, агледзеўшы хударлявую постаць падлетка. – Наша справа небяспечная. Хто твае бацькі?

– Бацька – тэлеграфіст, маці – сялянка. Але яны не тут. А сам я з дзіцячага дома.

– Ну што ж, думаю, падыдзеш, – пасля кароткага роздуму вымавіў камандзір. – Кудашоў! – запатрабавальна выгукнуў ён.

На вокліч зʼявіўся чырвонаармеец у лётным абмундзіраванні і, аддаўшы чэсць, застыў перад камроты.

– Залічыць таварыша Гасціловіча ў роту чырвонаармейцам, паставіць на ўсе віды забеспячэння, выдаць зброю і абмундзіраванне, рыштунак...

Было 2 лістапада 1919 года. Антону Гасціловічу праз пяць дзён спаўнялася сямнаццаць гадоў. Атрымалася амаль як у вядомай рэвалюцыйнай

песні: «Шёл парнишке в ту пору восемнадцатый год...»

Байцы асобнай роты 27-й асобнай стралковай брыгады ваявалі з бандамі, ганяліся за кулацкімі атрадамі, часта траплялі ў засады. У адной з сутычак вызначыўся чырвонаармеец Гасціловіч: ён выратаваў роту, якая адпачывала на хутары пасля цяжкага пераходу па слядах банды. Быў у каравуле, заўважыў, што бандыты неўпрыкмет акружаюць хутар, падняў трывогу.

Узорнае нясенне службы не засталося незаўважаным, і 18 снежня Антона Гасціловіча прымалі ў партыю бальшавікоў. На партыйным сходзе прапанавалі Антону расказаць сваю біяграфію. Гасціловіч падняўся і на хвіліну задумаўся. Перад вачыма прамільгнула яго кароткае жыццё: дзяцінства, школа, гімназія, вандраванні па краіне, дзіцячы прытулак...

– Нарадзіўся я ў далёкай адсюль Беларусі, – нетаропка, хвалюючыся, пачаў расказваць малады воін. – Бацькі мае жылі на хутары Пянькоўшчына ў Віленскай губерні. Бацька працаваў тэлеграфістам, маці займалася хатняй гаспадаркай. Мяне аддалі ў Забрэжскую царкоўнапрыходскую школу. Неўзабаве бацьку перавялі ў горад Маладзечна, дзе я паступіў у гімназію. Падчас імперыялістычнай вайны сям'я выехала далей ад фронту, які набліжаўся да нашай мясцовасці. У гэтых вандроўках я адстаў ад бацькоў і трапіў у дзіцячы прытулак. Са сваім сябрам вырашыў адправіцца на поўдзень, але даехаў толькі да Чышмы – мяне тут зваліў тыф. Пасля шпіталя я ўступіў у рады чырвонаармейцаў. Ну, а астатняе вы ўсё ведаеце...

Пасля аднадушнага «за» да Гасціловіча падышоў камандзір роты, павіншаваў яго, сказаў:

– Хлопец ты старанны, пісьменны, ды ваенных ведаў у цябе яшчэ малавата. Паступай на вучобу, таварыш Гасціловіч, авалодвай ваеннай навукай, і з цягам часу станеш выдатным чырвоным камандзірам...

## ПРАЗ ЦЕРНІ – ДА ЗОРАК

Наказ свайго першага камандзіра Антон Гасціловіч выканаў толькі летам 1922 года – стаў курсантам малодшага класа 2-й Маскоўскай пяхотнай школы. Строга рэгламентаванае жыццё ў палявым лагеры, статутны парадак маладому курсанту спадабаліся. Заняткі ішлі па страявой і агнявой падрыхтоўцы, тапаграфіі, тактыцы, сапёрнай справе. Многа часу займалі фізічная падрыхтоўка і каравульная служба. Не раз праводзіліся 40–50-кіламетровыя маршы. Малады арганізм загартоўваўся. І не дзіўна, што пасля 1922 года, па ўспамінах А. І. Гасціловіча, ён чвэрць стагоддзя не хварэў. Восенню пасля парада на Краснай плошчы ў гонар 5-й гадавіны рэвалюцыі, у якім упершыню ўдзельнічаў Гасціловіч, яго разам з іншымі курсантамі перавялі ў Петраград, у 8-ю пяхотную школу камсаставу...

...Апошні вучэбны год завяршаўся. Антона Гасціловіча выклікаў начальнік школы і спытаў:

– Дзе вы, таварыш Гасціловіч, хацелі б працягваць службу пасля заканчэння школы?

– Я чалавек ваенны: куды накіруеце, туды і паеду.

– Мы заўважылі, што ў вас ёсць педагагічныя здольнасці, таму будзем рэкамендаваць камандзірам узвода 1-й пяхотнай школы, якая размяшчаецца ў памяшканні былога Пажаскага корпуса.

– Што табе прапанавалі? – спытаў яго аднакурснік і сябра Павел Ротмістраў, калі Антон выйшаў ад начальніка школы.

– Стаць выхавацелем і камандзірам узвода ў пяхотнай школе. Толькі я сумняваюся наконт сваіх педагагічных здольнасцей... Ды начальству відней...

– Дзейнічай, Антоне: з часам ты і прафесарам станеш, – пажартаваў Ротмістраў. Не ведаў яго сябра, што словы гэтыя будуць прарочымі...

– Каб стаць прафесарам, трэба яшчэ многа навукі адолець, закончыць Акадэмію, атрымаць вышэйшую адукацыю, – заўважыў Гасціловіч.

– Дык у чым жа справа? Давай, не адкладваючы, рыхтавацца разам да паступлення. Я таксама наважыўся вучыцца далей.

І сябры заселі за падручнікі: трэба было авалодваць курсам сярэдняй школы. Вечарамі штудзіравалі гісторыю, матэматыку, вывучалі французскую мову. Бралі платныя ўрокі па двух апошніх прадметах. У 1928 годзе Ротмістраў і Гасціловіч сталі слухачамі Ваеннай акадэміі РСЧА імя Фрунзэ.

Каля раскладу заняткаў у Акадэміі сабралася група яе новых слухачоў.

– Бач ты, у нас будуць вольнымі ад заняткаў ажно два дні, – звярнуўся Антон да Ротмістрава. – Куды мы патрацім гэты час?

– Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца! – пажартаваў Павел.

Да іх размовы ўважліва прыслухоўвася малады падцягнуты камандзір. Нарэшце ён звярнуўся да Антона:

– Скажы, дружа, ты выпадкова не з Беларусі? – прыязна спытаў ён Гасціловіча.

– Так, з Беларусі, з Віленскай губерні.

– Выдатна! – засмяяўся малады чалавек. – Вось і земляка сустрэў. Я родам з Гродна. Будзем знаёмымі: Антонаў!

– Ну што ж, спадзяюся, што мы пасябруем: я – Антон, а ты – Антонаў! – пажартаваў Гасціловіч.

Заняткі непасрэдна ў Акадэміі праводзіліся толькі чатыры разы на тыдзень, два дні і вечары былі ў распараджэнні слухачоў, і ўся падрыхтоўка праходзіла на кватэры. На першым курсе слухачы ўсебакова вывучалі дзеянні палка ва ўсіх відах бою, на другім – стралковай і кавалерыйскай дывізіі, на трэцім – стралковага і кавалерыйскага корпуса. Акрамя гэтага на трэцім курсе адпрацоўваліся дзеянні буйнога злучэння конна-механізаваных войскаў для развіцця поспеху пры аператыўным прарыве абароны праціўніка. Гады вучобы праляцелі непрыкметна і хутка. На апошнім курсе Гасціловіч атрымаў заданне распрацаваць у якасці дыпломнай работы ваенную гульню па тэме «Дэсант на марскім беразе пры падтрымцы марскога і паветранага флоту».

Абарона дыпломнай прайшла так паспяхова, што ў сярэдзіне сакавіка 1931 года Гасціловіча, як і некалькіх іншых курсантаў з яго курса, датэрмінова выпусцілі з Акадэміі і накіравалі ў войскі. А. І. Гасціловіч стаў начальнікам 1-й часці штаба 45-й Чырванасцяжнай Валынскай стралковай дывізіі, яго

непасрэдным начальнікам быў прызначаны аднакурснік П. І. Ляпін, А. І. Антонаў заняў пасаду начштаба суседняй 46-й дывізіі таго ж 14-га корпуса, а М. С. Цярэшчанка узначаліў корпусную артылерыю. Корпус уваходзіў у склад Украінскай ваеннай акругі, якой камандаваў легендарны І. Э. Якір.

Неяк Гасціловічу патэлефанаваў М. С. Цярэшчанка і пацікавіўся, як ідзе служба. У далейшай размове ён між іншым заўважыў, што у 14-м корпусе 45-ю дывізію лічаць асаблівай. Гасціловіча зацікавіла гэта акалічнасць, і ён задаў адпаведнае пытанне.

– А ты не ведаеш? – здзівіўся аднакурснік. – Вашу дывізію пад Адэсай у Грамадзянскую вайну фарміраваў сам камандуючы акругай Іёна Эмануілавіч Якір. Да гэтага часу ён з асаблівай увагай адносіцца да свайго «дзіцяці». Намячаюцца вайсковыя вучэнні, і Якір абавязкова будзе ў 45-й. Так што трымай вуха востра.

Неўзабаве Гасціловічу даручылі распрацаваць і правесці вялікае вучэнне дывізіі па тэме «Марш і разгортванне да бою». Па ходу вучэння калоны палкоў праходзілі непадалёку ад каманднага пункта. Антон Іосіфавіч вырашыў праверыць паходны марш двух палкоў і конна адправіўся ў дарогу. Зрабіўшы заўвагі камандзірам калон, ён пераканаўся, што ўсё пайшло як належыць, вярнуўся на камандны пункт. І тут твар у твар сутыкнуўся з камандуючым акругі.

– Таварыш камандуючы! Дазвольце далажыць: начальнік 1-й часці штаба дывізіі…

Якір перапыніў яго рапарт і загадаў падрабязна далажыць пра разгортванне палкоў. Бачна была яго незадаволенасць ранейшымі дакладамі кіраўнікоў

вучэнняў. Гасціловіч адрапартаваў пра абстаноўку на гэты час і сказаў, што калоны палкоў разгорнуты ў паходны марш. Падрабязнасці даклада задаволі і зацікавілі Якіра.

– А адкуль вы гэта ведаеце? – з хітрынкай у голасе спытаў камандуючы.

– А я толькі што праверыў маршавыя калоны, – адказаў Гасціловіч. – Прытым праверыў і па шэрсці, і супраць шэрсці.

– Толькі так і трэба, – задаволена заўважыў Якір.

Іёну Эмануілавічу спадабаўся малады знаходлівы камандзір, і Гасціловіча неўзабаве перавялі ў штаб акругі. Падчас чарговай ваеннай гульні Якір паклікаў да сябе Антона Іосіфавіча і прапанаваў яму:

– Сядайце, таварыш Гасціловіч, каля мяне і наносце на маю карту ўсе ўводныя, якія я буду даваць. Ваша задача – уважліва сачыць за ходам гульні, за ўводнымі данымі. Калі ўзнікне неабходнасць, напамінайце пра найбольш вострыя моманты, пра небяспечныя або цікавыя вынікі і паведамляйце мне кароткімі запіскамі. Кладзіце іх проста на маю карту...

Такім метадам Якір не толькі забяспечваў знешні кантроль, але і прывіваў метадычныя навыкі афіцэрам свайго штаба.

У самых буйных і павучальных Кіеўскіх манеўрах, якія праходзілі ў верасні 1935 года, Гасціловіч выконваў абавязкі начальніка штаба славутай 24-й Жалезнай Самара-Ульянаўскай дывізіі, хаця на той час пастаянна з'яўляўся камандзірам і адначасова камісарам 286-га стралковага палка. Назіраць за манеўрамі прыбыў наркам

абароны Варашылаў, французская, італьянская і чэхаславацкая ваенныя дэлегацыі. Войскі, якімі кіраваў Іёна Эмануілавіч, дзейнічалі ўмела і дынамічна, асабліва механізаваныя, кавалерыйскія, танкавая часці і паветраны дэсант. У раёне Бровары, пад Кіевам, былі дэсантаваны не толькі 1300 дэсантнікаў, але і некалькі падраздзяленняў пяхоты, гарматы, аўтамашыны і зенітная артылерыя. Манеўры надзвычай высока ацанілі замежныя назіральнікі.

У такіх аперацыях, на самастойнай камандзірскай практыцы, Гасціловіч спасцігаў самыя перадавыя метады кіравання вайсковымі злучэннямі. У снежні 1935-га яму прысвоілі званне палкоўніка. Пад канец лета наступнага года яму патэлефанаваў начальнік аддзела кадраў штаба акругі і спытаў:

– Ці згодны вы паехаць на вучобу ў Акадэмію Генеральнага штаба, якая адкрываецца ў Маскве?

Гасціловіч задумаўся: шкада было пакідаць свой полк, але і вучоба ў такой навучальнай установе здавалася прывабнай. Канец яго ваганням палажыла кароткая рэпліка суразмоўцы:

– Спіс кандыдатаў складаў асабіста таварыш Якір.

У новай Акадэміі Гасціловіч сустрэў многіх сваіх аднакурснікаў і па пяхотных школах, і па Акадэміі імя Фрунзэ. Палкоўнікі Антонаў, Малінін, Багалюбаў, Скарабагаты, маёр Казакоў таксама трапілі ў першы набор новай вышэйшай ваеннай навучальнай установы. Вучоба Гасціловічу давалася лёгка, і ўжо на трэці год Антон Іосіфавіч стаў старшым выкладчыкам на кафедры тактыкі вышэйшых злучэнняў. Тут ён працаваў разам з ленгендарным Д. М. Карбышавым. Сярод слухачоў вучэбнай групы,

якой кіраваў Антон Іосіфавіч у 1938–1939 гадах, асабліва вылучаўся лагічнасцю сваіх меркаванняў, выдатнай памяццю, высокай працаздольнасцю маёр С. М. Штаменка. Пасля зімовай сесіі Гасціловіч з вялікім задаваленнем атэставаў яго на прысваенне чарговага воінскага звання.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Штаменка стаў начальнікам Генеральнага штаба. Ён на ўсё жыццё застаўся ўдзячны свайму настаўніку.

## У СТЭПАХ МАНГОЛІІ

У верасні 1939 года, калі на захадзе ўжо грымела Другая сусветная вайна, А. І. Гасціловіча накіравалі ў Забайкальскую ваенную акругу ў якасці лектара-міжнародніка. Ён яшчэ на першым курсе вучобы стаў членам лектарскай групы Маскоўскага камітэта ВКП(б), і за два гады прачытаў звыш 160 дакладаў па пытаннях знешняй палітыкі і на міжнародныя тэмы. Так ён рэалізоўваў прагу да педагагічнай дзейнасці, якую нарэшце заўважыла і камандаванне Акадэміі, прызначыўшы яго старшым выкладчыкам на адной з кафедраў.

У Забайкаллі давялося выступаць і перад грамадзянскімі аўдыторыямі – партактывам Іркуцка, Улан-Удэ. Найбольш уважліва слухалі старшага выкладчыка Ваеннай акадэміі Генштаба ў гарнізонах ваеннай акругі, задавалі многа пытанняў, і ўсё больш пра вайну, што ішла ля заходніх граніц Савецкага Саюза, пра палітыку партыі ў гэты ваенны час. Тым больш што і СССР таксама ўжо ўвязаўся ў ваенныя

дзеянні і ўзяў пад сваю абарону Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.

Камандзіроўка, якая доўжылася амаль месяц, заканчвалася. Пасля адной з лекцый, прачытанай для афіцэраў штаба акругі, Гасціловіча запрасілі да камандуючага франтавой групы, што паспяхова ваявала супраць японцаў. Р. М. Штэрн цёпла павітаўся з маскоўскім лектарам, распытаў пра яго асабістыя планы і нечакана сказаў:

– Я прапаную вам пасаду начальніка штаба 1-й армейскай групы, якой у Манголіі камандуе камкор Жукаў. Гэта пасада – генеральская, так што будзе прастора для росту.

– Але ж баявыя дзеянні супраць Японіі закончаны, і няёмка прыехаць на разбор шапак, – засумняваўся Гасціловіч.

– Армейская група ў гэты трывожны час павінна выканаць надзвычай важныя і адказныя задачы, галоўная з іх – стрымліваць японскую ваеншчыну ад нападу на нашу Радзіму, дапамагчы мангольскім саюзнікам умацоўваць граніцу. Так што згаджайцеся, і я падрыхтую адпаведнае прадпісанне.

Раніцаю наступнага дня Г. М. Штэрн уручыў Антону Іосіфавічу прадпісанне і сказаў:

– Вішую вас з новым адказным назначэннем, жадаю поспехаў. Праз дзве гадзіны ў мангольскі гарадок Тацмак адпраўляецца самалёт, і на ім вы павінны вылецець да месца прызначэння...

...Самалёт зрабіў круты разварот, і зямля стала дыбам перад ілюмінатарамі.

– Тацмак! – вымавіў хтосьці з пасажыраў-ваеннаслужачых.

На мангольскім аэрадроме Гасціловіча сустрэў адзін з камандзіраў з 1-й армейскай групы. Ён быў на аўтамашыне, на якой меліся адолець звыш ста кіламетраў да Хамар-Даба, дзе размяшчаўся камандны пункт групы. Пад калёсамі машыны слаўся роўны, як выгаблеваная дошка, стэп, за акном рассцілаліся аднастайныя краявіды. Зямля была цвёрдая, і ездзілі тут у любым кірунку, пра што сведчыла сетка слядоў аўтамабільных шын. Ужо добра сцямнела, калі машына пасля доўгай дарогі спусцілася ў шырокі роў.

– Прыехалі! – радасна паведаміў спадарожнік. – Вось бліндаж камандуючага.

Знутры бліндаж аказаўся даволі ўтульным: сцены абшыты фанерай, у ім знаходзіліся два ложкі, стол і некалькі табурэтак. У гэты сціплым жытле размяшчаліся камкор Жукаў і член Ваеннага савета дывізійны камісар Нікішоў.

– Сядайце да стала, – прапанаваў Жукаў Антону Іосіфавічу. – Раскажыце нам пра сваю службу і работу...

Падчас гутаркі у бліндажы з'явіўся камбрыг Багданаў, ад якога Антон Іосіфавіч павінен быў прыняць справы. Гэта быў аднакурснік Гасціловіча па Ваеннай акадэміі імя Фрунзэ, і за вячэрай размова працягвалася больш ажыўлена. Жукаў расказваў пра суровыя прыродныя і бытавыя ўмовы, у якіх даводзіцца працаваць штабам і камандзірам: за апошнія паўтара месяца баі і напружаная работа не дазвалялі нават распрануцца і адпачыць. У заключэнне камандуючы паведаміў:

– Цяпер у штаба групы дзве задачы – закончыць выдачу японцам іхніх загінуўшых і развесці нашы

войскі ад Халхін-Гола на абумоўленыя месцы. Першую задачу працягне выконваць Багданаў, які застаецца маім намеснікам, другой займіцеся вы. Усё, што трэба, вам раскажа Багданаў...

7 лістапада 1939 года ва Улан-Батары адбываўся першы сумесны парад савецкіх і мангольскіх войск і дэманстрацыя насельніцтва, прысвечаныя гадавіне Кастрычніка і перамозе на Ханхіл-Голе. Прымалі парад маршал Чайбалсан і камкор Жукаў. Стоячы побач у адкрытым аўтамабілі, яны аб'ехалі калоны войск і дэманстрантаў. Пасля падняліся на трыбуну, і Чайбалсан з прыязнай усмешкай нечакана працягнуў руку Антону Іосіфавічу:

– Віншую вас, таварыш Гасціловіч, з першым генеральскім чынам! – на чыстай рускай мове сказаў маршал. Відаць, ён даведаўся ад Жукава, што напярэдадні свята Антон Іосіфавіч атрымаў званне камбрыга.

Дні беглі за днямі, і Гасціловіч трывала асвоіўся на новай пасадзе, наладзіў узорную работу штаба, паступова вырашаў складаныя задачы, планаваў вучэнні сваіх часцей і падраздзяленняў. І ў студзені 1940 года адбыліся першыя пасля халхінголскіх баёў вучэнні штабоў. Салдаты і афіцэры хутка прызвычаіліся да суровых умоў мангольскай зімы і паказалі высокую вывучку. У маі таго ж года армейскую групу ператварылі ў 17-ю армію і падпарадкавалі Забайкальскай ваеннай акрузе. Армія аказалася прататыпам тых злучэнняў, якія ствараліся пазней: яна была высокамеханізаванай.

Г. К. Жукава адклікалі на іншае месца службы, і ў штабе з'явіўся новы камандарм – П. А. Курачкін, аднакурснік Антона Іосіфавіча па Акадэміі Генштаба.

Пасля афіцыйнай цырымоні прадстаўлення яны сардэчна абняліся, і Курачкін папрасіў расказаць пра стан даверанай яму арміі.

– Нашы мотастралковыя дывізіі, – пачаў Гасціловіч, – укамплектаваны поўнасцю па штату ваеннага часу. Кожная з іх мае свой танкавы батальён, у саставе арміі яшчэ адна танкавая дывізія, дзве бронебрыгады, асобны матацыклетны полк і чатыры авіяцыйныя брыгады знішчальнікаў і бамбардзіроўшчыкаў. Так што «гаспадарка» вялікая – толькі паспявай упраўляцца.

– Спадзяюся, што разам справімся, – з энтузіязмам заўважыў Курачкін. – Цалкам давяраю табе, Антон Іосіфавіч. Праяўляй ініцыятыву, а я заўсёды цябе падтрымаю...

Але хутка Курачкіна прызначылі камандуючым войскамі Забайкальскай ваеннай акругі, і камандармам 17-й стаў генерал Раманенка.

...Ішоў другі дзень чарговых армейскіх вучэнняў, калі ў 12 гадзін Раманенку і Гасціловіча запрасілі ў палатку камандуючага ваеннай акругі генерал-лейтэнанта Курачкіна.

– Таварышы генералы, – усхвалявана прамовіў Курачкін пасля прывітанняў і кароткай паўзы. – Павінен паведаміць вам, што сёння на світанні фашысцкая Германія вераломна напала на нашу Радзіму... Цяпер ідзе вайна. Загадваю: вучэнні спыніць, аб'явіць пра пачатак вайны усяму асабоваму саставу. Штабам – вярнуцца на пастаянныя месцы дыслакацыі. Узмацніць ахову і надзейна прыкрыць дзяржаўную граніцу сяброўскай Манголіі...

Пачаўся вельмі трывожны і напружаны перыяд. 17-я армія стрымлівала японскую ваеншчыну,

давала адпор Квантунскай групоўцы праціўніка, рашуча перапыняла ўсе правакацыі. Бурнымі тэмпамі ўзводзіліся абарончыя збудаванні, аб'екты. Паступова армія стала выдатнай школай падрыхтоўкі рэзерваў для фронту. Мангольскі суровы клімат і быт, вучэнні ва ўмовах, блізкіх да баявых, павышалі баяздольнасць часцей і злучэнняў. Ужо ў кастрычніку з саставу 17-й арміі на фронт адправіліся 1-я танкавая і 82-я мотастралковая дывізіі, матацыклетны полк, вялікая група ўмелых камандзіраў. Пасля выгрузкі мотастралковая дывізія адразу ўступіла ў бой пад Масквой, ваявала мужна, умела і неўзабаве стала 3-й гвардзейскай.

...Раніцаю 15 мая 1942 года камандарм Раманенка выклікаў А. І. Гасціловіча да сябе на кватэру. Антон Іосіфавіч падумаў, што Раманенка прыхварэў, бо напярэдадні ён пачуваў сябе ніякавата, яму нездаровілася, і ён хоча даць нейкія указанні па службе. Але Пракоп Логвінавіч быў вясёлым, ажыўленым.

– Віншую з новым прызначэннем! – весела звярнуўся ён да Гасціловіча. – Жадаю вам поспехаў у службе. – З гэтымі словамі Раманенка працягнуў тэлеграму. Па загаду Стаўкі ён адпраўляўся на фронт, а Гасціловіч прызначаўся камандуючым 17-й арміі...

...Лета прайшло у напружанай вучобе. Да таго ж давялося заняцца і сельскай гаспадаркай, каб забяспечыць войскі харчовымі прадуктамі. Камандарм палічыў, што прасіць і чакаць пастаўкі харчавання з Радзімы ў такі цяжкі час не варта, і служба тылу 17-й арміі занялася вырошчваннем

рознай гародніны, хаця лічылася, што мангольскі стэп непрыгодны для сельскагаспадарчай вытворчасці. Насуперак такому меркаванню па берагах рэк разбілі плантацыі і, на здзіўленне манголькіх аратых, атрымалі высокі ўраджай – выспелі нават бахчавыя культуры. З гэтага часу і качэўнікі заняліся сельскай гаспадаркай.

З мясной жа прадукцыяй праблем не было: Манголія здаўна вырошчвала вялікія атары авечак, у стэпах пасвілася безліч дзікіх коз. Паляваннем на іх заняўся і сам камандарм, пасля таго як Цэдэнбал зрабіў яму падарунак – выдатную паляўнічую стрэльбу. Мяса эшалонамі адпраўлялі ў Саюз як сціплую дапамогу фронту. Па-ранейшаму рыхтавалі воінскія папаўненні. У манеўрах, часта разам з падраздзяленнямі МНРА, адпрацоўваліся баявыя дзеянні дывізій у поўным саставе. З пачатку вайны ў 17-ю штогод прысылалі 20–25 тысяч маладых, ненавучаных байцоў, у Манголіі яны спасцігалі азы і сакрэты баявой навукі і адпраўляліся на фронт загартаванымі, умелымі воінамі. З імі ехалі і некалькі тысяч аўтамашын з высокакваліфікаванымі вадзіцелямі за рулём.

На фронт імкнуўся і камандарм Гасціловіч. Ён закідваў рапартамі і асабістымі пісьмамі сваіх знаёмых па абедзвюх акадэміях, якія занялі да гэтага часу высокія пасады і ў Генеральным штабе, і ў Стаўцы. І нарэшце ў снежні 1943 года са штаба акругі яму паведамілі, што ў Манголію накіроўваецца новы камандуючы 17-й арміі генерал-лейтэнант Данілаў, а Антону Іосіфавічу пасля здачы спраў трэба выехаць у Маскву. Развітаўшыся з сям'ёю і сябрамі,

Гасціловіч новы год сустрэў у цягніку, які з Чыты імчаў яго ў сталіцу, бо з-за нялётнага надвор'я ўсе авіярэйсы адмянілі.

## НА ПЕРШЫМ І ЧАЦВЁРТЫМ УКРАІНСКІХ

Масква здалася Гасціловічу суровым і незнаёмым горадам: такое ўражанне стваралі зацямненне, аэрастаты і зенiткі, замаскіраваныя ў дварах. Але суровай напружанасці не адчувалася, працавалі тэатры і кіно. На вуліцах – ажыўлена. У вулічным натоўпе большасць складалі жанчыны – прыкмета ваеннага часу. Пятага студзеня Антон Іосіфавіч патэлефанаваў свайму сябру, аднакашніку па абедзвюх акадэміях, першаму намесніку начальніка Генеральнага штаба генералу арміі А. І. Антонаву і папрасіў прыняць яго. У тэлефоннай трубцы загучаў радасны голас Аляксея Інакенцьевіча:

– Што за цырымоніі паміж Антонам і Антонавым! Рад цябе, дружа, чуць і бачыць. Прыязджай прама ў штаб сёння ж а палавіне адзінаццатай ночы. Пагутарым, паўспамінаем!

У Генштабе Гасціловіча сустрэў дзяжурны афіцэр і правёў у невялікую утульную прыёмную, дзе, акрамя дзяжурнага генерала, нікога не было. Генерал запрасіў Антона Іосіфавіча ў кабінет Антонава. Той выйшаў з-за стала, і даўнія сябры сардэчна абняліся. Заўсёды спакойны і ўраўнаважаны Аляксей Інакенцьевіч цяпер быў усхваляваным, як быццам сустрэў сваю маладосць. Распытваў пра

службу ў Манголіі, пра агульных знаёмых і ў канцы размовы сказаў:

– Ты, канешне, хочаш на фронце адразу заняць высокую камандную пасаду, бо доўга быў камандармам. Але ж я ўпэўнены, што «гаспадар» (Сталін. – *Ю. В.*) армію на фронце табе адразу не дасць. Табе трэба набрацца франтавога вопыту, добра азнаёміцца з баявой абстаноўкай. Давай зробім так: я звяжуся з Жукавым – ён жа выдатна цябе ведае – і дамоўлюся, каб ён прыняў да сябе і на месцы вызначыў табе пасаду. Так што адпраўляйся, дружа, на 1-ы Украінскі, дзе Жукаў у якасці намесніка Вярхоўнага каардынуе дзеянні абодвух украінскіх франтоў.

Гасціловіч выехаў да месца прызначэння аўтамабілем, бо над Масквою лютавала моцная мяцеліца. Дарога ішла праз спаленыя і разбураныя гарады і пасёлкі, праз Гомель, Чарнігаў і Кіеў. Тут у каменданта горада Антон Іосіфавіч высветліў дыслакацыю штаба 1-га Украінскага і ўжо вечарам 12 студзеня прыбыў туды. Яго сустрэлі аднакурснікі па акадэміях – начальнік штаба фронту генерал-лейтэнант Багданаў, камандуючы фронту М. Ф. Ватуцін. Праз паўтары гадзіны Антона Іосіфавіча прыняў саслужывец па Манголіі маршал Жукаў. Тэмай сяброўскай гутаркі, як і трэба было чакаць, сталі Манголія, іх агульныя знаёмыя кіраўнікі рэспублікі, перамены, што адбыліся пасля ад'езду Георгія Канстанцінавіча ў Саюз.

– Вам трэба глынуць франтавога паветра, набрацца франтавога духу. Таму адпраўляйцеся ў арміі і карпусы, пазнаёмцеся з людзьмі і метадамі работы, – сказаў Жукаў. – Паслядоўнасць паездкі,

а таксама тэрміны – на ваш асабісты выбар. Падрабязнасці ўдакладніце з Багданавым. А мне штодзённа паведамляйце шыфрам пра свае ўражанні і заўвагі.

Тут жа дзяжурны генерал ад рукі напісаў мандат, згодна з якім А. І. Гасціловіч «з'яўляецца прадстаўніком тав. Юр'ева (такі быў псеўданім Жукава на той час. – *Ю. В.*) у 18-й, 1-й гвардзейскай і 6-й танкавай арміях», і з гэтым ён адправіўся на фронт. Раніцай Антон Іосіфавіч прыбыў у 18-ю армію. Начштаба арміі генерал-маёр Паўлоўскі пазнаёміў яго з баявой абстаноўкай, са сваімі падначаленымі і саслужыўцамі. Сярод іншых Антону Іосіфавічу прадставілі і начальніка палітаддзела маладога жыццярадаснага палкоўніка Брэжнева.

У гэты час праводзілася Корсунь-Шаўчэнкаўская аперацыя, і Гасціловіч разам са сваім знаёмым па Манголіі генерал-палкоўнікам Курачкіным – намеснікам камандуючага 1-га Украінскага фронту – каардынавалі дзеянні 6-й і 40-й танкавых армій. Кальцо вакол варожай групоўкі хутка замкнулася, фашысты адчайна спрабавалі боем выявіць слабыя месцы і разарваць кальцо акружэння. Такім месцам быў вузкі, шырынёй ад 4 да 8 кіламетраў, калідор на стыку 1-га і 2-га Украінскіх франтоў ад Звінегародкі да Шполы. Тут немцы і наносілі контрудары звонку і знутры кальца. Контратакі адбівалі 6-я і 5-я гвардзейскія танкавыя арміі абодвух франтоў. Там склалася вельмі трывожнае становішча. Жукаў па тэлефоне загадаў Гасціловічу ўзяць узвод танкаў і прабіцца ў раён Шполы, каб каардынаваць дзеянні абедзвюх гвардзейскіх танкавых армій.

Па непралазнай, балоцістай, разбітай снарадамі і мінамі каляіне пад артылерыйскім абстрэлам узвод танкаў прабіваўся на камандны пункт 5-й гвардзейскай. У дарозе адзін танк падбілі, загінуў механік-вадзіцель, астатнія члены экіпажа былі паранены. З цяжкасцю даехалі да КП арміі. Не паспеў Гасціловіч выйсці з машыны і прывесці сябе ў парадак, як каржакаваты, паўнаваты генерал-палкоўнік схапіў яго ў моцныя абдымкі і, казычучы пышнымі вусамі, усклікнуў:

– Антоне! Дарагі сябра, я і не спадзяваўся ўбачыць цябе на маім камандным пункце! Якім ветрам занесла цябе сюды?

Толькі цяпер Гасціловіч пазнаў Паўла Ротмістрава, з кім паступаў у Акадэмію імя Фрунзэ, з кім вучыў матэматыку і французкую мову, з кім з'еў не адзін пуд солі. Яшчэ да вайны Ротмістраў стаў кандыдатам ваенных навук.

Павел Аляксеевіч адразу безапеляцыйна заявіў, што не будзе пачынаць дзелавых размоў, пакуль не адмые і не накорміць свайго дарагога госця. У хаце з'явіўся абед. За сталом яны хутка абмеркавалі і ўдакладнілі дэталі ўзаемадзеянняў абедзвюх армій, пра што склалі сумеснае данясенне Жукаву і камандуючым абодвух франтоў.

На світанні генерал Гасціловіч адправіўся на свой камандны пункт у 6-ю танкавую армію. Па дарозе зноў трапілі пад моцны абстрэл, і Антон Іосіфавіч вярнуўся толькі на адным танку. Два іншыя былі разбіты, іх экіпажы загінулі ці былі паранены. З экіпажа танка, у якім знаходзіўся Антон Іосіфавіч, таксама дваіх параніла – камандзіра гарматы і ад'ютанта генерала Кляменцьева.

Паездка аказалася выніковай: аперацыя, што распрацавалі Ротмістраў і Гасціловіч, дазволіла скончыць з катлом, і Антон Іосіфавіч вярнуўся ў спецыяльны цягнік маршала і зноў пачаў выконваць яго даручэнні. Па сутнасці, ён стаў дзяжурным генералам у штабе Георгія Канстанцінавіча і яго самым блізкім дарадцам. Жукаў цалкам давяраў Антону Іосіфавічу, заўсёды ўлічваў яго парады, бо добра ведаў здольнасці свайго паплечніка і сябра па Манголіі. За Корсунь-Шаўчэнкаўскую аперацыю Гасціловіч атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга – першы савецкі ордэн на 25-м годзе ваеннай службы. Крыху пазней у гонар гэтага юбілею яго ўзнагародзілі і ордэнам Леніна.

Трагічна загінуў камандуючы 1-га Украінскага фронту М. Ф. Ватуцін, і па загаду Стаўкі Жукаў прыняў камандаванне. Антон Іосіфавіч стаў назаляць Жукаву просьбамі адпусціць яго на самастойную камандную работу, і нарэшце ў красавіку маршал сказаў яму:

– Выбірай на нашым фронце любы гвардзейскі корпус і ўступай у камандаванне...

На 1-м Украінскім ваявалі тры гвардзейскія карпусы. Гасціловіч пасля роздуму спыніўся на 17-м стралковым, які ўваходзіў у састаў 1-й гвардзейскай арміі генерал-палкоўніка Грэчкі. Магчыма, выбар Антона Іосіфавіча падсвядома супаў з лічбамі, бо і ў Манголіі ён камандаваў 17-й арміяй. У той жа дзень быў падпісаны загад аб яго прызначэнні, і назаўтра новы камкор адправіўся да месца далейшай службы.

## ШЛЯХ ПРАЗ КАРПАТЫ

Корпус пасля цяжкіх баёў вывелі ў франтавы рэзерв, каб папоўніць тэхнікай, узбраеннямі, абмундзіраваннем і боепрыпасамі. Дывізіі панеслі вялікія страты і налічвалі ўсяго па 2–2,5 тысячы байцоў. Іх поўнасцю ўкамплектавалі, давялі колькасць асабовага саставу да 6,5 тысячы. Пасля трох пераходаў дывізіі сканцэнтраваліся каля горада Каламыя. У той жа дзень камкору Гасціловічу патэлефанаваў камандуючы 18-й арміі генерал-лейтэнант Жураўлёў:

– Як настрой, Антон Іосіфавіч? – спытаў ён. – Войскі гатовы дзейнічаць? – Пачуўшы сцвярджальны адказ камкора, ён загадаў: – Вам належыць пераправіцца на паўднёвы бераг ракі Прут і наступаць у напрамку на Дзеляцін і Ворахту…

Наперадзе паўставалі Карпаты. Ні камкор, ні камандзіры дывізій вопыту наступальных баёў у гарах не мелі. Толькі адна з трох дывізій – 2-я паветрана-дэсантная палкоўніка С. М. Чорнага – была навучана самастойным дзеянням асобнымі падраздзяленнямі, што вельмі прыдалося ў наступленні праз Карпаты. Яно пачалося 25 красавіка. Завязаліся цяжкія баі, у ходзе якіх былі разгромлены дзве горнастралковыя варожыя брыгады і ачышчаны паўднёвы бераг Прута да лініі Рунгуны–Косаў–Куты–Берагамет. Немцы перакінулі на ўчастак наступлення корпуса чатыры свежыя дывізіі – з іх адну танкавую – і пачалі контратакаваць. З вялікімі стратамі для абодвух бакоў контратакі адбілі, і з 18 мая праціўнікі перайшлі да абароны.

Генерал Гасціловіч сабраў камандны і палітычны састаў корпуса і падрабязна прааналізаваў урокі і памылкі майскіх баёў. У разгар вучобы ў штаб прыехаў начальнік палітаддзела арміі Л. І. Брэжнеў. Даведаўшыся пра тэму заняткаў, ён сказаў:

– З вашага дазволу, таварыш генерал, я на некалькі дзён застануся ў падраздзяленнях часці і дапамагу камандзірам у навучанні байцоў тактыцы баёў у гарах.

Так Леанід Ільіч прыняў непасрэдны ўдзел у навучанні салдат і афіцэраў тонкасцям змагання ў горнай мясцовасці, прымяненні тут для горных пераправаў розных падручных сродкаў. У начальніка палітаддзела аказаўся немалы вопыт вядзення бою ў гарыстай мясцовасці, які ён набыў пад Туапсэ, Наварасійскам, на Тамані і каля Готхскага перавала падчас вызвалення Каўказа...

...На стыку паміж 1-м і 2-м Украінскімі франтамі стварылі 4-ы, і васямнаццатая армія ўвайшла ў яго састаў. Камандуючы новага фронту генерал-палкоўнік Пятроў пасля дэталёвага азнаямлення на месцы з баявым і тактычным патэнцыялам часцей загадаў вывесці 17-ы корпус з саставу арміі і падпарадкаваў яго непасрэдна фронту.

– Даручаю вам, таварыш Гасціловіч, распрацаваць план далейшага наступлення праз Карпаты і далажыць яго ў штаб фронту, – загадаў камандуючы камкору.

Калі план быў дэталёва прапрацаваны, Антон Іосіфавіч па высокачастотнай сувязі далажыў камандуючаму, што план адпраўлены ў штаб і коратка расказаў пра яго асноўныя пункты: двумя дывізіямі наступаць уздоўж дарогі на Татарскі

перавал, а трэцяй з Краснаільска па горных сцежках рухацца ў напрамку Растокі. Рашэнне камандуючы зацвердзіў, і 11 верасня падраздзяленні корпуса перайшлі ў наступленне праз адно з самых высокіх нагор'яў Карпат – Гарганы, прыкрытае цэлай сістэмай варожых абарончых рубяжоў. Да таго ж фашысты тут мелі перавагу ў жывой сіле і тэхніцы.

Войскі корпуса прымянілі належнае тактычнае майстэрства, сур'ёзную горную вывучку, энтузіязм, з якім байцы і афіцэры сустрэлі пачатак наступлення. Дзейнічалі палкамі і батальёнамі, нідзе не атакавалі ў лоб, абыходзілі апорныя пункты ворага па амаль недаступных схілах гор, без дарог, умела манеўравалі агнём артылерыі. І ўжо на другі дзень дывізіі прарвалі першыя абарончыя палосы праціўніка. На камандным пункце Гасціловіча пачуўся сігнал палявой рацыі:

– Дакладвае камандзір 2-й паветрана-дэсантнай дывізіі палкоўнік Чорны. Дывізія авалодала апорным пунктам Ворахта і Татарскім перавалам. Немец контратакуе, дзве атакі паспяхова адбіты!

– Трымайцеся, таварыш палкоўнік. Дапамагу артылерыяй і мінамётным агнём, – абнадзеіў яго Гасціловіч, – перадайце патрэбныя арыенціры. І вось яшчэ што: са свайго каманднага пункта я не магу вызначыць, дзе наступаюць нашы падраздзяленні. Зверым гадзіннікі – у мяне 13.50. Загадайце камандзірам батальёнаў роўна ў 14.00 даць тры зялёныя ракеты, каб я змог дакладна ўбачыць нашы перадавыя лініі.

У вызначаны час над пярэднім краем наступаючых войск узвіліся зялёныя маланкі, і камкор дакладна вызначыў пазіцыі сваіх падраздзялен-

няў. Гэты метад пасля ўзялі на ўзбраенне іншыя камандзіры і часта карысталіся ім у горнай мясцовасці.

Паветрана-дэсантнай дывізіі ў гэты дзень давялося адбіць ажно восем атак ворага. Пазіцыі яна свае адстаяла. Праз некалькі дзён 8-я стралковая авалодала Яблыневым пераваламі. У гэтых баях падраздзяленні корпуса нанеслі цяжкія страты 10-й нямецкай і 1-й горнастралковай венгерскай дывізіям. Пра вынікі наступальнай аперацыі камкор далажыў камандуючаму фронта І. Я. Пятрову.

– Аб'яўляю асабіста вам і часцям корпуса падзяку, – сказаў камандуючы. – Наперадзе ў вас – адна з самых магутных горных крэпасцей Карэшмезе на моцна ўмацаванай варожай лініі «Арпад». Дасканала разведайце мясцовасць і далажыце план наступлення асабіста мне...

Разведка правяла некалькі рэйдаў у тыл ворага і нанесла на карту размяшчэнне ўсіх апорных і абарончых збудаванняў. Аказалася, што на плошчы 50 квадратных кіламетраў фашысты ўрэзалі ў скалы 50 дотаў, узвялі і ўмацавалі многа дзотаў. Увесь раён апаясалі траншэямі, драцянымі загародамі. Былі тут бетанаваныя стралковыя ячэйкі і мінныя палі. Танканебяспечныя напрамкі вораг перагарадзіў ірвамі і жалезабетоннымі надаўбенямі. На іх развесілі аголеныя правады пад токам 3 тысячы вольт, якія выпрацоўвалі дзве перасоўныя электрастанцыі. Сапёры-разведчыкі своечасова выявілі гэты сюрпрыз, і наша артылерыя знішчыла абедзве электрастанцыі. Падчас абмеркавання плана наступлення ўлічылі ўсе асаблівасці абароны праціўніка. Начальнік штаба корпуса палкоўнік Шуба прапанаваў:

– Хрыбты Свідовец і Паланіна Германска лічацца непраходнымі і недаступнымі. Нашы падраздзяленні маюць ужо багаты вопыт пераадолення такіх перашкод. Думаю, што абходным манеўрам праз Свідовец мы застанем ворага знянацку і імклівым ударам авалодаем горадам Рахаў...

...Праз гадзіну пасля вызвалення Рахава Антон Іосіфавіч на «Вілісе» ехаў па гарадскіх вуліцах. У горадзе чуўся перазвон царкоўных званоў, па галоўнай вуліцы ішлі калоны чырвонаармейцаў, рухалася артылерыя, праходзіў полк 138-й стралковай дывізіі. Воінаў радасна віталі мясцовыя жыхары. Нечакана на рагу адной з вуліц наперарэз воінскай калоне выйшаў крыжовы ход з абразамі і харугвамі. Гасціловіч загадаў калоне спыніцца. Да яго падышоў сівагаловы святар.

– Пан генерал! – звярнуўся ён да Антона Іосіфавіча. – Дазвольце блаславіць нашых вызваліцеляў!

...Дывізіі корпуса імкліва наступалі. У горадзе Сігет на рацэ Ціса Гасціловіч пачуў загад Вярхоўнага галоўнакамандуючага, у якім аб'яўлялася падзяка войскам за пераадоленне Карпат, за ўзяцце гарадоў Карэмшэзе, Рахаў і Сігет. У загадзе ўпершыню ўпаміналіся прозвішчы і камандзіра 17-га корпуса, і камандзіраў усіх яго дывізій. Корпусу і 138-й дывізіі было прысвоена ганаровае найменне «Карпацкіх». Такі ж загад Галоўкама прагучаў і пасля вызвалення гарадоў Мукачава і Ужгарад.

Буйной чыгуначнай станцыяй Чоп 28 кастрычніка авалодала 237-я стралковая дывізія, якую са свайго рэзерву перадаў камандуючы фронту Пятроў. Ён асабіста прывёў дывізію ў корпус.

Дывізія пад камандаваннем палкоўніка Цітэнка была ўкамплектавана аўтамабілямі «Віліс». Ноччу, калі Саўінфармбюро паведамляла пра ўзяцце Чопа, вораг нечакана атакаваў дывізію і адкінуў яе на 1–1,5 кіламетра ад станцыі. Антон Іосіфавіч адразу ж пазваніў у штаб фронту і далажыў камандуючаму пра гэту няўдачу. Генерал Пятроў пасля кароткага роздуму заўважыў:

– Гэта ж вайна. А на вайне ці мала што здараецца. Не перажывай і не хвалюйся – адаб'еш ты гэты няшчасны Чоп. Дарэчы, на ўкраінскай мове чоп – гэта корак. Вось ён і заткнуў табе шлях. Выбівай яго і наступай далей...

...Надышло 7 лістапада – двайное свята для Антона Іосіфавіча: у гэты дзень ён нарадзіўся на далёкім цяпер беларускім хутары Пянькоўшчына непадалёку ад Забрэжжа. Вечарам яму патэлефанаваў Пятроў:

– Віншую вас, – сказаў ён, – і не толькі яшчэ раз з днём нараджэння. Ваш корпус зноў уключаецца ў састаў 18-й арміі, а вы прызначаны яе камандуючым. Чакаю вас заўтра...

На камандным пункце фронта Гасціловіча сустрэў яго былы аднакурснік па Акадэміі імя Фрунзэ начальнік штаба генерал-лейтэнант Ф. К. Каржаневіч. Ён папрасіў ад імя камандуючага пачакаць некалькі хвілін. Сябры пачалі ўспамінаць гады вучобы, агульных знаёмых. Нарэшце з'явіўся Пятроў. Разам яны адправіліся да былога камандарма 18-й Жураўлёва, каб на месцы азнаёміцца са становішчам часцей арміі. Акрамя 17-га гвардзейскага армія ўключала яшчэ 18-ы гвардзейскі і 95-ы стралковы карпусы і знаходзілася на ўчастку Ужгарад – Чоп.

– Справа ад нас дзейнічае 1-я гвардзейская генерал-палкоўніка А. А. Грэчкі, – расказваў былы камандарм, – Злева мы маем 40-ю армію 2-га Украінскага фронту генерал-лейтэнанта Ф. Ф. Жмачэнкі. Суседзі надзейныя, сувязь у нас з імі трывалая. А цяпер пабываем у штабах карпусоў і некаторых дывізій.

За дзень яны аб'ехалі штабы двух карпусоў і асобных дывізій. Пад вечар вярнуліся на камандны пункт арміі. У дзверы пастукалі. У памяшканне зайшоў поўны сівагаловы генерал-маёр.

– Таварыш генерал, – звярнуўся ён да Гасціловіча. – Дазвольце прадставіцца: намеснік камандуючага арміі генерал-маёр Кляменцьеў.

Затым новаму камандарму афіцыйна прадставіліся начальнік штаба арміі генерал-лейтэнант Брылёў і член Ваеннага савета генерал-лейтэнант Каланін, начальнік палітаддзела генерал-маёр Брэжнеў. Тут Антон Іосіфавіч даведаўся, што у састаў арміі ўключаны 1-ы Чэхаславацкі корпус пад камандаваннем брыгаднага генерала Людвіка Свободы. Гасціловіч успомніў першую сустрэчу са Свободай у студзені 1944 года. Тады камандзір асобнай чэхаславацкай брыгады высокі сівагаловы палкоўнік Свобода цвёрда заявіў камусьці з савецкіх генералаў:

– Там, дзе стаіць чэхаславацкая брыгада, немцы не пройдуць!

І вось цяпер чэхаславацкія падраздзяленні ў саставе 18-й арміі наступаюць на гарады Кошыцэ і Попрад. Корпус складаўся з асобных брыгад. Разам са злучэннямі 18-й арміі ён энергічна праследаваў

ворага і прыняў удзел у вызваленні Кошыцэ і Попрада.

Пасля вызвалення горада Кошыцэ ў студзені 1945 года па радыё абвялі пастанову Саўнаркама аб прысваенні Антону Іосіфавічу Гасціловічу воінскага звання «генерал-лейтэнант».

У гэты час 1-ы Чэхаславацкі корпус дзейнічаў самастойна ў даліне ракі Ваг, а часці 18-й арміі знаходзіліся за Высокімі Татрамі з асобнымі іх вышынямі ў 2200–2700 метраў, занесенымі глыбокімі снягамі. На шляху наступлення чэхаславакаў немцы арганізавалі эшаланіраваную абарону глыбінёй у 25–30 кіламетраў, якую даводзілася настойліва прагрызаць, пераадольваючы праз кожныя 2–3 кіламетры новыя і новыя пазіцыі ворага да самага горада Ружамберака. Баі прынялі зацяжны характар.

Падчас аднаго з іх на КП арміі пазваніў генерал Свобада і папрасіў камандарма прыехаць да яго, каб на месцы ацаніць тактычную абстаноўку. Антону Іосіфавічу давялося застацца ў чэхаславакаў на два дні. Была падрыхтавана чарговая атака, распрацаваны план узаемадзеяння падраздзяленняў. Пачалося наступленне, спачатку яно развівалася паспяхова, але на нейкім этапе чэхаславацкія батальёны прыпыніліся і заляглі. Генерал Свобада папрасіў у камандарма дазволу адправіцца ў брыгаду, якую немцы пачалі контратакаваць. Абапіраючыся на свой посах у выглядзе карпацкай пастушковай сякеркі, ён энергічна пакрочыў у ланцугі байцоў і падняў іх у атаку...

...Заснежаныя горныя вышыні Высокіх Татраў здзіўлялі сваёй прыгажосцю. Тут не было суцэльнай

лініі фронту – яна працягнулася па абодвух баках горнага хрыбта. А самі Татры здаваліся недаступнымі, але толькі не для партызан, якія мужна дзейнічалі сярод заснежаных далін і гор. Глыбокі снег і непралазныя хмызнякі былі для іх надзейнымі саюзнікамі. Партызанскія камандзіры пачалі ўстанаўліваць тактычнае ўзаемадзеянне з воінскімі часцямі нашай арміі. Атрады імя Суворава (камандзір Стаднюк) і брыгада А. С. Ягорава нечакана спусціліся з гор і правялі дыверсіі на чыгунцы, перашкодзіўшы фашыстам вывезці на захад ваенную маёмасць і нарабаванае дабро. Улічваючы гэтыя абставіны, генерал Гасціловіч дазволіў стварыць дваццацікіламетровы разыў паміж 1-м Чэхаславацкім і 17-м карпусамі сваіх падначаленых злучэнняў, а камкору 17-га гвардзейскага загадаў прымяніць партызанскую тактыку.

Ноччу, калі ў гарах лютавала мяцеліца, падраздзяленні корпуса без артылерыйскай падрыхтоўкі прарвалі варожую абарону ў раёне Пароніна і нанеслі імклівы нечаканы ўдар. Батальёны адразу захапілі тры варожыя траншэі. Наша артылерыя абрушылася на батарэі і іншыя аб'екты ворага, а пяхота нястрымна ішла наперад, захопліваючы апорныя пункты і артылерыйскія пазіцыі. У выніку атакі горад Ружамберак абышлі з поўначы, і 5 красавіка савецкія войскі ступілі на гарадскія вуліцы. Зноў у гонар 18-й арміі прагучаў салют у Маскве, і ў загадзе Вярхоўнага галоўнакамандуючага назвалі прозвішчы яе генералаў і камандарма...

...Часці 18-й арміі з баямі наступалі на горад Жыліну – вельмі важны вузел дарог у Заходніх

Карпатах, з усіх бакоў акружаны гарамі. Фашысты ўзарвалі тут усе дарогі і масты і перакрылі подступы да горада, узвялі на абарончым прыгарадным абводзе два супрацьтанкавыя равы, траншэі, дзоты, драцяныя агароджы, мінныя палі. Гэтыя ўмацаванні абаранялі выдатна ўзброеныя вопытныя варожыя падраздзяленні, і іх цяжка было адолець у лоб. Пасля ўсебаковага абмеркавання плана аперацыі па ўзяцці горада генерал-лейтэнант Гасціловіч сказаў:

– Зацвярджаю план, які прадугледжвае абходны манеўр. Сапёрным падраздзяленням пераправіць артылерыю праз горны хрыбет у самым недаступным месцы. Гэта баявая задача палкоўніка Журына і яго інжынерных часцей. Звяжыцеся, таварыш палкоўнік, з чэхаславацкімі сапёрамі і дзейнічайце разам. Начальніку разведаддзела працягваць дакладна вывучаць абарону ворага і адразу ж паведамляць мне і начальніку штаба пра ўсе змены на гэтым участку фронту. Абапірайцеся на дапамогу партызан. Абходны манеўр завяршыць да канца красавіка і сканцэнтраваць ударныя часці на поўдзень ад горада...

На світанні 30 красавіка поўным ходам ішла падрыхтоўка да штурму абарончых ліній ворага ля горада Жыліны, і тут разведка далажыла, што фашысты спынілі агонь, і ў іх траншэях назіраецца вялікае ажыўленне, узвіліся сцягі.

– Можа, фрыцы вырашылі скласці зброю і зараз прышлюць парламенцёраў? – выказаўся хтосьці са штабных афіцэраў.

– Чакай, пакуль яны пабягуць здавацца, – запярэчыў начальнік штаба 17-га корпуса палкоўнік Шуба. – Не-не, тут нешта іншае.

Тут хтосьці з чэхаславацкіх афіцэраў успомніў, што менавіта ў гэты дзень Гітлер прыйшоў да ўлады, і фашысты вырашылі зрабіць сабе свята.

– Такое нахабства даравацъ нельга! – усклікнуў генерал Клапалек, які нядаўна замяніў Людвіка Свабаду на пасадзе камандуючага корпуса. – Давайце пачнем атаку.

– Ну што ж, – згадзіўся Антон Іосіфавіч, – пакажам ім свята і заадно напомнім, што заўтра ў нас Першае мая... Артылерыя – агонь!

Удар быў імклівым і магутным. Немцы не вытрымалі і пабеглі, горад Жыліна перайшоў у рукі нашых войск. Пачалося праследаванне ворага, і працягвалася яно амаль бесперапынна. На камандны пункт 17-га корпуса, куды генерал Гасціловіч прыбыў адзначыць першамайскае свята, паступіла данясенне пра авалоданне гарадамі Чадца і Велька Бітча – у 30 кіламетрах на захад ад Жыліны. Ад Чадцы нашы войскі прасоўваліся так імкліва, што часам тылы нашых дывізій аказваліся наперадзе адступаючых варожых калон, перакрывалі ім шляхі адыходу і бралі шмат палонных.

## БАІ ПАСЛЯ КАПІТУЛЯЦЫІ

Другога мая ўся наша перадавая лінія салютавала ўзяццю Берліна. А ўжо 8 мая ў Маскве адбыўся салют некалькім франтам, у тым ліку і 4-му Украінскаму за ўзяцце ім горада Аламоўц. Праз некалькі гадзін радыё абвясціла яшчэ адну радасную і эпахальную навіну – у Берліне падпісаны акт аб безумоўнай

капітуляцыі германскіх войск, 9 мая абʼяўлялася Днём Перамогі. Але менавіта ў гэты дзень фашысты аказалі ўпартае супраціўленне падраздзяленням 18-й арміі, якая ў гэты час знаходзілася на паўднёвым захадзе ад Аламоўца, а яе КП – у горадзе Каэцін на рацэ Марава.

Ноччу сюды паступіла распараджэнне штаба фронту выслаць на світанні парламенцёраў ва ўсе чатыры нямецкія дывізіі для прыёму капітуляцыі. Афіцэры адправіліся ў распалажэнне варожых часцей. Пачалося трывожнае чаканне. Нарэшце каля 9 гадзін парламенцёры вярнуліся. Яны далажылі камандарму пра вынікі сваёй місіі: у трох дывізіях размаўляць з імі не сталі і выгналі, камандзір жа чацвёртай перадаў на імя А. І. Гасціловіча кароткае ветлівае пасланне, у якім было сказана, што ён пакуль не атрымаў загаду скласці зброю і таму вымушаны працягваць супраціўленне.

Антон Іосіфавіч далажыў абстаноўку камандуючаму фронту генералу арміі А. І. Яроменку і атрымаў загад разграміць і ліквідаваць на сваім участку падраздзяленні варожай групы армій «Цэнтр». Яе камандуючы генерал-фельдмаршал Шэрнер загадаў сваім войскам, якія налічвалі больш за 57 дывізій, працягваць ваенныя дзеянні і з баямі адыходзіць на захад, да англічан і амерыканцаў. Група Шэрнера аказалася ахопленай з абодвух флангаў войскамі 1-га і 4-га Украінскіх франтоў. Войскі абодвух франтоў атрымалі задачу ўзяць варожую групоўку ў палон і згрупавацца на паўночным усходзе ад Прагі, у якой успыхнула паўстанне.

Генерал Гасціловіч даручыў свайму штабу распрацаваць план ліквідацыі варожых часцей, што супрацьстаялі 18-й арміі. Нянавісці да фашыстаў, якія парушылі ўмовы капітуляцыі, не было мяжы, асабліва ў чэхаславацкіх салдат. Пачалося праследаванне ворага, які імкнуўся адарвацца ад нашых часцей, але шляхі адыходу аказаліся перакрытымі. План ліквідацыі ўступіў у дзеянне, і над дарогамі, запруджанымі варожай сілай і тэхнікай, з'явіліся савецкія штурмавікі. «Ільюшыны» на брыючым праносіліся над варожымі калонамі, сеялі паніку і смерць. Варожыя машыны збівалі адна адну, валіліся ў прыдарожныя канавы, салдаты кідалі зброю і разбягаліся. Праз некалькі дзён на гэтых дарогах, з дапамогай мясцовага насельніцва расчышчаных ад ваеннага друзу: танкаў, аўтамашын, гармат, зброі, штабных дакументаў, – з'явіліся калоны ваеннапалонных, якія панура брылі на ўсход.

Незадоўга перад гэтай аперацыяй на камандны пункт да А. І. Гасціловіча прыйшоў камандзір чэхаславацкага партызанскага атрада ў чыне капітана і паведаміў, што да іх у палон трапіў адзін з генералаў уласаўскай арміі са штабнымі дакументамі.

– Як яго прозвішча? – запытаў Антон Іосіфавіч.

– Ён сябе называе генералам Трухіным, – сказаў партызанскі камандзір. – Можа вы хочаце дапытаць палоннага?

У памяці камандарма паўстаў высокі пануры палкоўнік з выцягнутым конскім тварам, які працаваў на кафедры Акадэміі Генеральнага штаба. Пасля кароткага роздуму Гасціловіч загадаў свайму

начальніку контрразведкі дапрасіць палоннага і адправіць разам з дакументамі ў Маскву.

Чэхаславацкі корпус выйшаў з саставу 18-й арміі і фарсіраваным маршам накіраваўся ў Прагу, дзе 15 мая быў пераўтвораны ў 1-ю Чэхаславацкую армію. А нашы часці атрымалі загад размясціцца ўлясных лагерах каля горада Полічка і прывесці сябе ў парадак. Кожная дывізія 18-й арміі абсталявала сабе ў лесе лагер і вучэбна-спартыўны гарадок. Усюды панаваў узорны парадак. Твары салдат і афіцэраў свяціліся радасцю і гонарам пераможцаў. Яны заняліся мірнай вучобай.

Камандарм Гасціловіч у гэтыя радасныя дні наведаў усе свае карпусы і дывізіі з высакароднай мэтай: узнагародзіць афіцэраў, якія з-за нейкіх абставін за ўсе ваенныя гады не атрымалі ніводнай узнагароды. Здаралася гэта па розных прычынах: пасля раненняў афіцэры траплялі ў іншыя часці або часта пераводзіліся на іншае месца службы, губляліся прадстаўленні да ўзнагарод. Антон Іосіфавіч з афіцэрамі свайго армейскага аддзела кадраў загадаў сабраць і пастроіць усіх «забытых», гутарыў з кожным і тут жа уручаў ім баявыя ўзнагароды. У той час камандуючы арміі меў права ўручыць высокія воінскія адзнакі – да ордэна Чырвонага Сцяга ўключна. Тут жа афармлялі і патрэбныя дакументы. Такую ж працэдуру камандарм загадаў выканаць усім камандзірам карпусоў і дывізій у адносінах да радавых і сяржантаў.

Сам генерал-лейтэнант Гасціловіч у гэтыя дні атрымаў ордэн Суворава 1-й ступені за пераход Карпат і вызваленне Чэхаславакіі, а 6 чэрвеня ад

імя чэхаславацкага ўрада быў удастоены вышэйшай ваеннай узнагароды гэтай дзяржавы – ордэна Белага Льва 1-й ступені.

Прыйшоў загад з Масквы рыхтавацца да Парада Перамогі на Краснай плошчы, які меў адбыцца 24 чэрвеня. Кожны фронт быў прадстаўлены тут зводным палком, а кожная армія – батальёнам. На чале кожнага палка ішоў камандуючы фронта са сваімі камандармамі. Пасля праходжання Маўзалея камандуючыя франтоў падымаліся на яго трыбуну, а камандармы займалі месца на трыбуне непасрэдна каля правага крыла Маўзалея.

Наступным днём савецкі ўрад наладзіў урачысты прыём у гонар удзельнікаў Парада. Камандуючых франтоў і армій разам з сем'ямі запрасілі ў Георгіеўскую залу Крамля, дзе знаходзіўся прэзідыум. Пасля кожнага тоста за адпаведны фронт яго камандуючы і камандармы падыходзілі да прэзідыума пад апладысменты ўсёй залы. Кіраўнікі партыі і ўрада пацiскалі ім рукі і чокаліся з імі. Гучаў урачысты марш.

Антон Іосіфавіч сустрэў тут мноства сваіх знаёмых, паплечнікаў па акадэміях, франтах, па службе ў Манголіі. Адбылася радасная сустрэча з міністрам абароны Чэхаславакіі Людвікам Свобадай, які прыязна запрасіў Гасціловіча наведаць Злату Прагу.

## КАМАНДАВАЦЬ, ВУЧЫЦЬ І ВУЧЫЦЦА

Менавіта такой дзейнасцю давялося заняцца Антону Іосіфавічу ў пасляваенныя гады. 28 чэрвеня

ў адным з маскоўскіх прыгарадных лагераў, дзе размяшчаўся зводны полк 4-га Украінскага фронту, адбыўся развітальны абед, і арганізацыйна гэта ваеннае фарміраванне перастала існаваць. Адны яго часці падпадалі пад расфарміраванне, іншыя ўключаліся у састаў ваенных акруг і накіроўваліся да месца далейшай службы. Але да расфарміравання падраздзяленняў падышлі не зусім абдумана. Так, быў расфарміраваны 17-ы «Карпацкі» гвардзейскі корпус, які мог бы з вялікай выхаваўчай карысцю знаходзіцца ў Прыкарпацкай ваеннай акрузе, дзе ён прайшоў гераічнымі баявымі дарогамі. Трапіла пад ліквідацыю і славутая Самара-Ульянаўская дывізія. Калі за свой корпус Гасціловіч па этычных прычынах заступіцца не мог, то супраць расфарміравання дывізіі ён выступіў рашуча.

– Загады трэба выконваць! – безапеляцыйна напомнілі яму.

Тады Антон Іосіфавіч пазваніў у Генеральны штаб і пагутарыў з Аляксеем Інакенцьевічам Антонавым. Расфарміраванне Самара-Ульянаўскай спынілі. Так была выратавана адна з гераічных часцей Савецкай Арміі.

А ў выніку гэтай размовы са сваім аднакашнікам з Генштаба А. І. Гасціловіч аказаўся на камандным пасадзе ў Закаўказскай ваеннай акрузе, але ўжо летам 1946 года ўзначаліў кафедру тактыкі вышэйшых злучэнняў у акадэміі, на якой да вайны працаваў старшым выкладчыкам. Зноў пачалася вучоба: ён вучыў і вучыўся сам. Восенню Антон Іосіфавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю і быў прызначаны членам экспертнай камісіі пры Міністэрстве вышэйшай адукацыі.

Нечакана летам 1948-га Гасціловіча выклікалі ў Генштаб, дзе ён атрымаў прадпісанне выехаць у Прыбалтыйскую ваенную акругу на пасаду памочніка камандуючага генерала арміі І. Х. Баграмяна. На гэтай пасадзе генерал Гасціловіч знаходзіўся да 1953 года, калі яго зноў вярнулі на тую ж кафедру. Але з'явіўся ён там толькі ў студзені наступнага года: па загадзе Генштаба ён прымаў удзел у вялікіх манеўрах Прыкарпацкай ваеннай акругі – на месцы сваіх баявых паходаў.

У акадэміі Антон Іосіфавіч сустрэў сваіх аднакурснікаў – начальніка акадэміі В. В. Курасава і яго намесніка П. А. Курачкіна. Курасаў выклікаў яго ў кабінет і прапанаваў:

– Я ведаю, што ў вас за час службы ў Прыбалтыцы назапашаны вялікія звесткі па пытаннях марскіх дэсантаў і супрацьдэсантнай абароне. Трэба абагульніць гэты каштоўны вопыт у выглядзе доктарскай дысертацыі. Згодны?

– Значыць, трэба зноў сядаць за вучобу, – вырашыў Гасціловіч.

– Так, прапаную павучыца ў нашай дактарантуры і падрыхтаваць навуковую працу, якая вельмі спатрэбіцца нам у вучэбным працэсе.

Антон Іосіфавіч паспяхова абараніў доктарскую і ў лютым 1958 года стаў намеснікам начальніка акадэміі па навукова-даследчай рабоце. Гэта ваенная навукова-вучэбная ўстанова зноў, дарэчы, стала Акадэміяй Генеральнага штаба.

Асабліва плённым аказаўся для А. І. Гасціловіча наступны, 1959 год: яму прысвоілі адразу два высокія званні – воінскае генерал-палкоўніка і вучонае – доктара ваенных навук, прафесара кафедры.

У гэтыя ж дні ён стаў дзядулем – у яго нарадзіўся ўнук. Гады пачалі нагадваць пра сябе рознымі болькамі, але яны не спынілі плённай навуковай дзейнасці генерала. Ён напісаў вялікую навуковую працу, якая была выдадзена ў якасці вучэбнага дапаможніка для слухачоў акадэміі.

У адстаўку Антон Іосіфавіч выйшаў у 1965 годзе. Памёр ён 23 лістапада 1975-га і пахаваны на Галавінскіх могілках. Наш зямляк генерал-палкоўнік Гасціловіч пакінуў значны след у баявых дзеяннях Савецкай Арміі і ваеннай навуцы таго часу. Прозвішча генерала зберагаецца навечна ў аналах ваеннай гісторыі, а ў раённым цэнтры Валожыне яго імем названа адна з новых вуліц.

# Камісар Фёдараў і іншыя

Лёс падараваў мне многа сустрэч з цікавымі, адметнымі людзьмі. Адным з іх аказаўся **Ілля Мартынавіч Фёдараў** – чалавек з багатай на падзеі біяграфіяй, умелы суразмоўца, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. На долю Фёдарава выпала нямала цяжкіх выпрабаванняў, пра якія ён расказаў падчас нашых шматлікіх сустрэч. Яго аповеды-ўспаміны і ляглі ў аснову гэтай дакументальнай аповесці



## ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ

...Батарэя, дзе служыў намеснік палітрука Ілля Фёдараў, належала 7-му стралковаму палку славутай 24-й Чырванасцяжнай Самара-Ульянаўскай Жалезнай дывізіі. Адзін яе полк размяшчаўся ў Валожыне, а 7-ы стралковы – у Маладзечна. Тут, у батарэі 76-мм пушак, і нёс службу малодшы палітрук Фёдараў.

У чэрвені 1941 года полк выехаў у летні лагер. Устанавілася незвычайна сухое, не характэрнае для Беларусі надвор'е. Раніца 22 чэрвеня выдалася цудоўнай. Рана падняўся і развеяўся ў лесе туман, звонка на ўсе лады шчабяталі птушкі, лёгкі ветрык прагнаў апошнюю начную прахалоду. Чырвонаармейцы пасля чысткі зброі з нецярпеннем чакалі каманды на снеданне, пасля якога ў салдат і афіцэраў – выхадны, свабодны ад заняткаў дзень.

Фёдараў вырашыў скарыстаць выхадны для падрыхтоўкі да заняткаў у палкавой школе, дзе два разы на тыдзень выкладаў матэматыку. Да прызыву ў армію Ілля Мартынавіч закончыў фізіка-матэматычны факультэт Растоўскага ўніверсітэта і цяпер побач з палітычным выхаваннем салдат і сяржантаў батарэі павышаў веды афіцэраў па матэматыцы ў агульнаадукацыйнай палкавой школе.

Да 12 гадзін ён прасядзеў у чырвоным кутку, чытаў газеты і часопісы, рыхтаваўся да палітзаняткаў. Пасля абеду пайшоў у лес. Выбраў у цяньку зручнае месца і пачаў складаць план заняткаў.

Раптам цяжкае, натужнае гудзенне многіх матораў адцягнула яго ўвагу ад падручніка. Узняўшы галаву, ён убачыў, як строга звеннямі на захад ляцела вялікая група цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў. Налічыў іх сямнаццаць: у апошнім звяне не аказалася аднаго самалёта. Бамбардзіроўшчыкі ляцелі, здавалася, павольна, напаўняючы паветра тугім гудзеннем. І па тым, што ляцела адразу многа цяжкіх баявых машын, і па тым, што кіраваліся яны на захад, вопытны вайсковец Фёдараў зарыентаваўся: гэта – вайна.

Ён схапіў падручнікі, сшытак і кінуўся ў лагер. Не паспеў дабегчы, як пачуў:

– Тры-во-о-га-а!

Раней, падчас вучэнняў, гэта слова ўспрымалася зусім інакш. Цяпер яно адразу ж стала побач са словам *вайна*.

– Батарэя, станавіся!

Байцы з усіх бакоў выбягалі і, цяжка дыхаючы, станавіліся на свае месцы. Гэтак жа хутка прыбеглі камандзіры ўзводаў – лейтэнанты Міхайлаў, Папоў, Шмуглін і Гагарын. Амаль адначасова з'явіліся камандзір батарэі лейтэнант Марозаў, палітрук Шумкоў і начальнік палкавой артылерыі капітан Фрыдман. Перад строем пабялелы капітан пачаў ахрыплым голасам выкрыкваць страшныя словы:

– Таварышы! Сёння ў 5 гадзін раніцы фашысцкая Германія без абвяшчэння вайны напала на нашу Радзіму! Гітлераўская авіяцыя бамбіла ўжо Брэст, Адэсу, Кіеў, Жытомір... Нашы пагранічныя войскі па-геройску адбіваюць азвярэлыя фашысцкія

банды. Мы павінны выступіць на дапамогу сваім пагранічнікам і даць ворагу рашучы адпор!..

– Да гармат! – усклікнуў камандзір батарэі Марозаў. – Пяць мінут на зборы – і выступаць у кірунку Маладзечна! – удакладніў ён.

Праз 10 мінут увесь полк хутка рухаўся на свае зімовыя кватэры ў Маладзечне, каб атрымаць на складах узбраенне, боепрыпасы, новую ваенную тэхніку, абмундзіраванне. Аднак доўга затрымаліся на рэчавых складах, бо нічога не было тут падрыхтавана. Даводзілася паспешліва, не гледзячы на размеры, браць гімнасцёркі, штаны, боты, пілоткі і г.д. Аб'явілі, што новае ўзбраенне і тэхніку выдадуць у Лідзе, а цяпер неадкладна трэба выступаць туды.

Рухаліся адкрыта, на прывалах падганялі амуніцыю, прымяралі процівагазы. Назаўтра ў 11 гадзін паказаліся самалёты. Спачатку не паверылі, што гэта – варожыя, думалі: з задання вяртаюцца свае. Але як толькі яны наблізіліся, адразу кінуліся ў вочы іх незвычайная знешняя форма і афарбоўка, што рэзка адрознівалася ад нашых самалётаў. А хутка ўбачылі на крылах і фюзеляжах крыжы і свастыку. Гэта здалося такім дзіўным і незвычайным, што доўгі час ніхто не мог вымавіць ніводнага слова. У Фёдарава міжволі вырвалася:

– Вось вам, таварышы, крыжовы паход крыжаносцаў!

– Глядзіце, глядзіце! – усклікнуў хтосьці з артылерыстаў. – Самалёт падае! Не, зноў падняўся.

– Во! І другі падае і таксама падымаецца.

Пачуліся глухія ўзрывы.

– Гэта ж яны Валожын бамбяць, дзе адзін наш полк стаяў!

Увесь гэты час калона ішла сваім звычайным маршам, і толькі праз чвэрць гадзіны пачулася

каманда разгрупавацца. Увайшлі ў лес і больш як гадзіну рухаліся па лясной дарозе. Нарэшце паступіла каманда разгрупаваца ў лесе і адпачываць. Быў разгар спякотнага летняга дня, пасля начнога паходу людзі адчулі, што яны не толькі знясілелі, змарыліся, але і прагаладаліся. Мучыла смага. Але варта было прылегчы ў цяньку, як многія заснулі глыбокім сном.

Праз дзве гадзіны пасля таго, як полк размясціўся на адпачынак і абед, у свае падраздзяленні пасля нарады ў камандзіра і камісара палка прыйшлі камандзіры і палітрукі. Іх на нарадзе папярэдзілі захоўваць пільнасць і асцярожнасць, запатрабавалі старанна маскіравацца на маршы і прывалах, сачыць, каб у падраздзяленні не праніклі незнаёмыя людзі – магчымыя шпіёны і дыверсанты. Аказалася, што мінулай ноччу група дыверсантаў перабіла на прывале гарматны разлік і забрала зенітку, а гадзіну таму пад бамбёжку трапіў батальён 274-га палка. Ёсць страты. Горад Ліду немцы поўнасцю разбурылі, спалілі авіяцыяй, і дывізіі было загадана абысці яго злева.

Адразу пасля абеду полк рушыў далей і ў пяць гадзін вечара праехаў невялікі добраўпарадкаваны гарадок Юрацішкі. Яго яшчэ не бамбіла варожая авіяцыя, і тут было ціха і спакойна. Рухаліся ўсю ноч па лясной дарозе. І раптам каманда:

– Гарматы наперад! Танкі праціўніка!

Артылерысты праскочылі наперад галопам і пачулі гудзеннематораў. Спынілі коней, адчапілі гарматы, разварнулі іх і адкрылі агонь туды, адкуль насоўвалася гудзенне матораў. У лесе панавала яшчэ цемра і ніякай цэлі не было відаць. Стрэлаў ворага не было чутна з-за грукату нашых гармат

і разрываў варожых снарадаў. Адзін з іх разарваўся побач. Камандзіра гарматы сяржанта Аляксеенку кантузіла, і Фёдараў заняў яго месца. У лясным змроку ён раптам заўважыў сілуэты танкаў і загадаў біць па цэлі прамой наводкай. Зусім блізка ўспыхнуў вялікі зыркі агонь, пасля другі, у лесе стала светла як днём: гэта запалалі фашысцкія танкі.

Вораг пачаў адыходзіць. Камандзір танкавай калоны гітлераўцаў нямецкі маёр старанна таптаў педаль свайго матацыкла, спрабуючы яго запусціць і ўцячы. Ён так захапіўся, што не заўважыў, як побач апынуліся чырвонаармейцы, наставілі на яго карабіны і скамандавалі:

– Рукі ўгору!

– Хэндэ хох! – паўтарыў Сяўніцкі, чырвонаармеец з разліку ПТР.

Гітлераўскі маёр, які нядаўна так упэўнена вёў танкавую калону, паволі, нібы нехаця, падняў рукі. Яго танкі адступілі і былі ўжо далёка. Сяўніцкі абяззброіў фашыста і дулам карабіна паказаў яму дарогу. Пад'ехалі камандзір палка маёр Песьякоў і нампаліт старшы батальённы камісар Гарчакоў. Камісар запытаў палоннага па-нямецку:

– Вы – камандзір дэсантнай групы ці рэгулярнай танкавай часці?

– Пра які дэсант можа ісці размова, калі каля ста тысяч рускіх салдат і афіцэраў захоплена ў палон толькі на гэтым участку фронта! – зарагатаў гітлеравец.

– Брэша гад! – выгукнуў хтосьці.

Фашыст адмовіўся адказваць на іншыя пытанні і толькі паўтараў:

– Русіш капут, хайль Гітлер!

Кампалка загадаў адвесці палоннага ў штаб дывізіі. А Фёдараву загадалі заняць са сваёй гарматай вышыню справа ад лесу і падтрымліваць агнём трэці стралковы батальён капітана Аляксеева.

– Трэба прыкрыць наш правы фланг, каб гітлераўцы не абышлі нас, – сказаў маёр Песьякоў.

На пазіцыю гарматы нечакана рынулася нямецкая танкетка, стракочучы з кулямёта. Яна на вялікай хуткасці імчалася на гармату, наблізілася, зачапіла злёгку за шчыт і праскочыла міма. Фёдараў загадаў развярнуць гармату на 180 градусаў і адкрыць агонь па танкетцы. З першага ж стрэлу танкетку падбілі, і з яе выскачылі два танкісты, якіх пехацінцы захапілі ў палон. У гэты момант камандзір узвода малодшы лейтэнант Рабаў нечакана напароўся на замаскіраваны ў кустах нямецкі танк і закрычаў:

– Нампаліт, каці сюды гармату!

З дапамогай пехацінцаў 76-міліметровую гармату ўстанавілі на пазіцыю і адкрылі агонь прамой наводкай. Як толькі развеяўся парахавы дым, павалілі клубы чорнага дыму – загарэўся варожы танк. Раптам з-за яго выпаўз яшчэ адзін. Пасля другога стрэлу ён закружыў на месцы, і яго ахапіла полымя. З абодвух танкаў не вылез ніводзін танкіст. Але гэта быў толькі ўдалы пралог, у ходзе якога гармата Фёдарава падбіла танкетку і два цяжкія танкі ворага.

Бой неўзабаве разгарэўся на подступах да пасёлка Іўе. Тут наш артылерыйскі полк перагарадзіў дарогу больш як ста фашысцкім танкам.

Паказанні палоннага маёра ў штабе дывізіі дапамаглі нашаму камандаванню вызначыць сілы праціўніка і напрамак іх галоўнага ўдару, і таму атрылерыйскі полк аказаўся на гэтай пазіцыі.

У ходзе бою фашысты пакінулі на полі 36 танкаў, ніводзін гітлераўскі танкіст не застаўся жывым. Пасля няўдалай танкавай атакі вораг вырашыў узяць рэванш ударам з паветра. Але паветраны налёт пачаўся тады, калі артылерысты і пяхота пакінулі свае пазіцыі.

Фёдараў далажыў камандзіру ўзвода лейтэнанту Міхайлаву і палітруку батарэі Шумкову пра поспехі свайго гарматнага разліку. Палітрук сказаў, што Фёдарава прадставяць да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі.

Увесь дзень 27 чэрвеня ішоў бой. Спачатку немцы абрушылі на нашы пазіцыі шквал артылерыйскага агню, услед за абстрэлам з'явіліся пікіруючыя бамбардзіроўшчыкі. Адна хваля самалётаў змянялася другой, зямля стагнала ад узрываў, на ўсе бакі ляцелі вялікія камякі глебы, асколкі бомбаў, у паветры завіс дым і смурод. Здавалася, на гэтай скурожанай, перамолатай зямлі не засталося нічога жывога. Як толькі закончылася бамбёжка, у атаку рынулася пяхота праціўніка. Гітлераўцы беглі на ўвесь рост, упэўненыя, што на нашых пазіцыях мала хто застаўся жывым.

Абтросшы зямлю і пыл, капітан Аляксееў загадаў:

– Падпусціць ворага як мага бліжэй! Без каманды не страляць!

Камандзір батарэі 76-міліметровых гармат лейтэнант Марозаў, абходзячы разлікі, гаварыў:

– Спакойна, хлопцы. Падрыхтуйце шрапнель. Калі нашы стралковыя роты адкрыюць агонь, мы сыпанём шрапнеллю. А як толькі гітлераўцы пабягуць назад, мы створым перад імі вогненны вал.

Гітлераўцы набліжаліся да нашых перадавых пазіцый, але чырвонаармейцы не падавалі ніякіх

прыкмет жыцця. Фашысты беглі наперад бадзёра і ўпэўнена. Камандзір 2-й роты лейтэнант Пахомаў, хвалюючыся, папрасіў:

– Таварыш капітан, пара!

– Без каманды не страляць! – строга паўтарыў Аляксееў.

Варожыя салдаты ўжо зусім блізка, выразна відаць іх не толькі потныя ў касках твары, але і гузікі на мундзірах. Большасць з іх беглі з аўтаматамі, у многіх былі вінтоўкі і ручныя кулямёты. Рукавы мундзіраў закасаныя па самыя локці. Але цяпер чырвонаармейцы глядзелі не на немцаў, а на капітана Аляксеева.

– Агонь! – на ўвесь голас закрычаў капітан.

Адразу ж запрацавалі ўсе нашы кулямёты, аўтаматы, вінтоўкі. Фашысты лажыліся цэлымі радамі, нібы касіла іх нябачная вялізная каса. Для іх гэты шквал агню быў настолькі нечаканым, што многія з іх аслупянелі. Яшчэ міг – і яны павярнулі назад, падалі, ускоквалі і беглі без аглядкі. А лейтэнант Марозаў усё не падаваў каманды адкрыць артылерыйскі агонь, бо вораг быў яшчэ так блізка, што можна было паразіць і сваіх. Гітлераўцы аддаляліся, пакідаючы за сабой забітых і параненых. Вось ужо нашы падымаюцца з акопаў, каб праследаваць праціўніка.

– Ану, падсыпаць агеньчыку! – падбадзёрыў артылерыстаў лейтэнант Марозаў.

Над галовамі фашыстаў паўсталі слупы разрываў, абсыпаючы іх шрапнеллю. Вораг замітусіўся, рассеяўся. І тут запрацавала гітлераўская артылерыя. Снарад трапіў у галаву лейтэнанта Марозава. Чырвонаармейцы навалiлiся на гарматы і пакацілі іх наперад, не зважаючы на небяспеку.

За артылерыстамі падняліся стралковыя роты – і вось ужо увесь полк пайшоў у атаку. Гітлераўцы працягвалі паліваць агнём прыстрэленую вышыню, хаця нашы салдаты пакінулі яе. Па артылерыі праціўніка ўдарыла наша батарэя 120-міліметровых мінамётаў. На варожых артылерыйскіх пазіцыях уздыбілася зямля, і гарматы іх змоўклі.

– Так страляць! – усклікнуў капітан Аляксееў, паціскачы руку камбату мініметчыкаў старшаму лейтэнанту Гужэўскаму.

– Рад бы, ды няма чым, – адказаў Гужэўскі. – Вось выпусціў апошнія міны, а цяпер хоць мінамёты ўзрывай...

...У апошнія чэрвеньскія дні, ажно да вечара 30-га фашысты спрабавалі некалькі разоў на дзень выбіць чырвонаармейцаў з іх пазіцый, але кожны раз вымушаны былі адступаць назад. Вечарам 30 чэрвеня камандаванне аб'явіла, што немцы занялі ўжо не толькі Валожын, Маладзечна і Вілейку, але і Мінск. Паступіў загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага выходзіць з акружэння групамі. Фёдараў са сваёй гарматай і артылерыйскім разлікам трапіў у групу, камандзірам якой прызначылі старшага лейтэнанта Гужэўскага, а нампалітам – палітрука Шумкова. У групе налічвалася каля 250 чалавек.

Каб выйсці з акружэння, рушылі па азімуце на Маладзечна. Па дарозе людзі пачалі адставаць, і калона змяншалася. Падышлі да невялікай балоцістай рэчкі, пераправіліся цераз яе і ўглыбіліся ў лес, дзе размясціліся на прывал. Фёдараву загадалі ісці ў разведку, каб вызначыць далейшы шлях. Прайшоўшы метраў 200, ён трапіў на ўскраек лесу, з якога убачыў дарогу. Па ёй бесперапынным патокам ішлі аўтакалоны фашысцкіх войскаў.

Гітлераўцы ехалі ў адкрытых машынах без пілотак, у расшпіленых мундзірах, гарлапанілі песні.

«Вось калі б наш полк поўным саставам размясціць уздоўж дарогі ды адкрыць агонь з усіх відаў зброі па гэтай калоне ад галавы да хваста, ад яе мала што засталося б, – падумаў Ілля Мартынавіч. – Пасля хуценька зняцца і арганізаваць такую ж засаду ў іншым месцы на другую калону. Тады фашысты не ехалі б з песнямі па нашай зямлі і, напэўна, далёка б не прайшлі». Але гэта былі толькі мары. Фёдараву трэба было вяртацца і далажыць пра вынікі разведкі. Вярнуўшыся, ён не знайшоў камандзіра Гужэўскага.

Людзі спалі. Не спалі толькі каравул і малодшы лейтэнант Мазурын. Ён запытаў пра абстаноўку і сказаў, што Гужэўскі, нікога не папярэдзіўшы, пайшоў у невядомым напрамку з 19 мінамётчыкамі сваёй былой батарэі. Увесь дзень акружэнцы назіралі за праціўнікам, каб выбраць спрыяльны момант і пераскочыць дарогу. Аднак дыстанцыя паміж калонамі была настолькі малой, што нельга было і думаць, каб перавесці тут звыш 200 чалавек і вялікі вайсковы абоз. Дзень цягнуўся марудна, голад нясцерпна мучыў салдат, даўно ніхто ўжо не спаў. Усіх ахапіла трывога.

Нарэшце наступіла змярканне, гул машын на дарозе пачаў заціхаць, і чырвонаармеец Яфімаў далажыў, што, здаецца, прайшла апошняя калона. Даўно чакалі гэтага сігналу і таму былі гатовыя да маршу. Але як толькі выйшлі з лесу і наблізіліся да дарогі, паказаліся ледзь прыкметныя агеньчыкі фар чарговай варожай калоны. Фашысты баяліся ночы і таму строга захоўвалі правілы святломаскіроўкі. Навісла смяротная пагроза: завярнуць назад сваю

калону ўжо было немагчыма, а праскочыць перад носам праціўніка шанец быў невялікі.

Доўга не раздумвалі, бо трэцяга выхаду не было. З усіх сіл паганяючы коней і дапамагаючы ім працягнуць павозкі і гарматы праз кюветы, чырвонаармейцы перабеглі дарогу. І тут жа застракаталі кулямёты і аўтаматы з аўтакалоны. У адказ пачуўся нястройны рэдкі агонь: у акружэнцаў было ўжо зусім мала патронаў. Адна машына ў фашысцкай калоне ўспыхнула, і полымя ад яе ўзнялося высока ў неба. Гэта асляпіла гітлераўцаў і выклікала ў іх мітусню, хаця яны і ўзмацнялі агонь. Пачалі рвацца міны. Наша калона рассеялася па полі, і далей ужо адыходзілі невялікімі групамі.

Вырашылі рухацца да старой граніцы, спадзеючыся, што Чырвоная Армія здолела замацавацца на лініі Сталіна і дае адпор фашыстам. Праз двое сутак падыходзілі да Маладзечна. Аказалася, што горад запалонены варожымі войскамі. Рушылі ў абход горада. Голад і неймаверная стомленасць валілі з ног: ужо трэція суткі не змыкалі вачэй, капалі акопы, а елі нерэгулярна. Байцы і камандзіры выбіваліся з сіл, закончылася паліва, згінула многа коней, закончыліся боепрыпасы. Па прапанове камандзіраў Папова, Гагарына і Міхайлава ад Маладзечна група пайшла не проста на ўсход да граніцы, а паралельна ёй – на поўдзень.

У ваколіцах мястэчка Ракаў аказаліся ў другой палавіне дня 4 ліпеня. Ніякай граніцы тут не было. Мясцовыя жыхары паведамілі, што Мінск заняты ўжо 28 чэрвеня, горад амаль поўнасцю згарэў ад бамбёжкі. Фашысты рвуцца да Масквы, і ёсць звесткі, што яны ўжо ў Барысаве. Пад канец наступнага дня група аказалася ў лесе каля вёскі

Старое Сяло Мінскага раёна і сустрэла тут вялікую колькасць нашых войск. З дазволу генерала ўліліся ў гэта воінскае злучэнне, якое аказалася дрэнна арганізаваным, многія салдаты не мелі зброі, не было тут належнай дысцыпліны і маскіроўкі ад авіяцыі ворага.

Не паспелі як след разабрацца ў абстаноўцы, як на лес абрушыўся шквал артылерыйскага агню, білі сотні гармат і мінамётаў розных калібраў. Усе кінуліся бегчы хто куды. Спробы Фёдарава спыніць паніку не далі выніку. За артабстрэлам пачаўся налёт авіяцыі. Людзі бегалі па полі і гінулі ад асколкаў бомбаў і куль, якімі фашысцкія сцярвятнікі палівалі на брыючым палёце. На шчасце, хутка сцямнела, і налёт закончыўся.

## ВАЯВАЦЬ МОЖНА І ЗА ЛІНІЯЙ ФРОНТУ

З Фёдаравым засталося каля паўтара дзясятка байцоў сваёй батарэі і з узвода сувязі. Гармата аказалася разбітай прамым ударам бомбы, каля яе ляжаў труп байца-ездавога Шчарбухі. Пачакалі больш за гадзіну з надзеяй, што, магчыма, хтосьці з батарэйцаў адшукае іх. Але ніхто не падышоў. Пахавалі Шчарбуху, і сяржант Шкляр звярнуўся да Фёдарава:

– Вядзі нас, таварыш нампаліт!

Фёдараваў скамандаваў:

– Станавіся! Па парадку разлічыцца! Таварышы! Нас засталося ўсяго 14 чалавек, – сказаў нампаліт. – Гэта добрае аддзяленне. Калі мы праявім вытрымку, дысцыплінаванасць, дружбу, як гэта патрабуе ад нас воінскі Статут, то мы дойдзем да лініі фронту

і ўвальемся ў рэгулярныя часці нашай арміі. Пасля будзем біць ворага так, як мы гэта ўмеем і як ужо білі яго пад Іўем.

Адправіліся на ўсход. Рухаліся толькі прыцемкамі раніцай, вечарам і ў асноўным – ноччу, бо не давалі спакою варожыя самалёты. Фашысцкія сцярвятнікі ганяліся нават за адзіночкамі на брыючым і расстрэльвалі іх з буйнакаліберных кулямётаў. У пасёлку Такарня былога Рудзенскага раёна, раздзяліўшыся па двое, зайшлі ў вясковыя хаты. Гаспадыня, да якой трапілі Фёдараў і Салаўёў, пачала іх прасіць, каб яны неадкладна пакінулі пасёлак:

– Учора немцы на тым канцы вёскі пастралялі ўсю сям'ю толькі за тое, што ўбачылі, як з хаты выходзілі чырвонаармейцы...

Раптам за акном пачуўся роў матацыкла. Прыхапіўшы праснак і дзве вараныя бульбіны, хуценька выбеглі ў двор. Матацыкл заглух ля самай хаты. Забеглі за адрыну і адразу ж пачулі аўтаматныя чэргі ў хаце. Кінуліся туды і ўбачылі на падлозе ў лужыне крыві гаспадароў. А фашысты ўжо схаваліся за паваротам вуліцы. З дамоў выйшлі астатнія чырвонаармейцы і гаспадары. Салдаты збіраліся адразу ж пайсці, але іх не адпусцілі. Пажылыя вяскоўцы сказалі:

– Вы не вінаватыя. Немец заўсёды быў такім. Ён і ў тую вайну лютаваў, а цяпер тым больш: вядома ж – фашыст!

Салдат запрасілі зноў у хаты, прапанавалі прывесці сябе ў парадак, памыцца, памяняць потную, брудную ніжнюю бялізну. Ад гэтага і ад прыязных сардэчных слоў такіх добрых людзей стала лягчэй на душы, з'явілася ўпэўненасць. Салдаты горача

падзякавалі вяскоўцам, пастроіліся і па ўсіх правілах страявога статута прайшлі па ўсёй вуліцы, дакладна адбіваючы крок.

– Во, зноў на чырвонаармейцаў сталі падобнымі! – неслася ім услед.

Калі група зайшла ў лес, Фёдараў прапанаваў:

– Трэба адпомсціць фашыстам за смерць мірных людзей. Якія будуць меркаванні?

– Злавіць іх, даць добрую «баню», а пасля прагнаць пад канвоем праз усю вёску і аддаць на суд насельніцтву, – сказаў Махарадзэ.

– Не, – запярэчыў Фёдараў, – туды мы іх не пагонім, бо за гэта акупанты знішчаць усю вёску і яе жыхароў. Мы іх абяззброім і запросім сюды, у лес родных і блізкіх забітых, няхай яны і вырашаць лёс бандытаў.

– Давайце спачатку зловім, а пасля ўжо ашчыпаем, – з'едліва заўважыў Шкляр.

Пачалі прыкідваць план аперацыі. Вырашылі парваць тэлефонную сувязь і чакаць, пакуль фашысты прыедуць шукаць месца разрыву. Шкляр падняў ля дарогі пляскаты важкі камень, засунуў яго за пояс, залез на сасну, каля якой стаяў тэлеграфны слуп, і каменем разбіў на ім некалькі ізалятараў, перабіў провад аб жалезны кручок, на якім мацаваўся ізалятар. Вялікі кусок провада зваліўся на зямлю. Адзін яго канец надзейна прывязалі за слуп на вышыні каля метра, а другі працягнулі цераз дарогу і абматалі на сасне, што стаяла насупраць слупа. Сталі чакаць.

Час цягнуўся марудна, і калі ўжо лопнула цярпенне, чуйны на слых Махарадзэ ўсклікнуў:

– Падрыхтавацца, едуць!

Праз мінуту з-за пагорка вынырнуў матацыкл. Наперадзе за рулём сядзеў вялізны граміла, ззаду –

маленькі і дробны гітлераўскі неданосак. Як толькі яны наблізіліся на патрэбную адлегласць, провад нацягнулі і туга абматалі вакол сасны. Фашысты зваліліся на дарогу, а матацыкл паляцеў у кювет. А далей усё разгортвалася згодна з планам. У лес запрасілі сялян і аддалі ім на расправу гітлераўскіх ваяк. Яны поўзалі ў нагах, прасілі літасці, але... Потым 30-гадовы мужчына звярнуўся да чырвонаармейцаў:

– Дзякуй вам, браты! Хаця і не вернеш нашых бацькоў, але няхай фашысты ведаюць, што літасці ім не будзе ...

Шлях на ўсход працягваўся. На дарозе Смілавічы–Пухавічы ў кювеце ўбачылі два спаленыя нямецкія грузавікі. Гэта здзівіла, бо вакол не было ніякіх слядоў бою. Перайшлі дарогу і ўбачылі труп чырвонаармейца на прыдарожнай адкрытай палянцы. Тут ляжаў і станок кулямёта «максім», пустыя кулямётныя стужкі і каробкі ад іх.

– А вось і ствол ад кулямёта! – усклікнуў Яфімаў. Ён вынес з кустоў ствол і ўставіў яго ў станок. Не было толькі замка. Сталі шукаць яго ў траве, але знайшлі толькі тады, калі агледзелі кулямётчыка. Замок аказаўся пад гімнасцёркай смельчака. У кішэні было пісьмо ад маці, салдацкі медальён. Кулямётчык аказаўся з горада Ліпецка. Пахавалі Мікалая – так зваўся салдат – ціха і моўчкі, без салюта. Зноў разабралі і схавалі кулямёт і рушылі з лесу. На шляху ўперадзе за паўкіламетра ўбачылі вёску. Вырашылі зайсці туды, каб падсілкавацца і пакінуць тут сваіх хворых Ягорава і Ярастава, у якіх разбалеліся жываты.

Калі да вёскі заставалася метраў 250, Фёдараў спыніў групу і паслаў у разведку Салаўёва і Шкляра.

Не прайшлі яны і 50 метраў, як іх абстралялі з кулямётаў і аўтаматаў. Падхапілі насілкі з хворымі і кінуліся ў лес. Пад асколкам міны ўпаў Алтухоў, за ім зваліўся Кучарэнка. Па-пластунску дапаўзлі да лесу і сталі азірацца. На полі застаўся таксама і Ярастаў. Шкляр далажыў, што пры адступленні бачыў на бульбяным полі мёртвага салдата з каробкамі ад кулямётных стужак у руках.

– Трэба паглядзець, – заўважыў Фёдараў. – Магчыма, там патроны.

На спіну Шкляра прывязалі для маскіроўкі некалькі густых яловых лапак, і ён асцярожна папоўз па баразне. Гітлераўцы яго не заўважылі, і ён вярнуўся назад. Фёдараў раскрыў каробкі і пераканаўся, што там кулямётныя стужкі, набітыя патронамі. Сабралі схаваны «максім» і вырашылі адпомсціць фашыстам за смерць таварышаў. Месца для засады выбралі амаль ідэальнае: лес падступаў тут да самага гасцінца, па якім з вёскі, адкуль іх абстралялі, павінна была рухацца аўтакалона. Махарадзэ лёг за кулямёт, Фёдараў побач з ім – другім нумарам. Злева на адлегласці 60–70 метраў залеглі байцы, узброеныя вінтоўкамі і трафейнымі аўтаматамі.

Неўзабаве пачуўся рокат матораў, і паказаліся аўтамашыны, наперадзе калоны ішла легкавушка, а ў канцы – аўтобус. Налічылі 22 машыны.

– Першыя 15 машын прапусціць! – крыкнуў Фёдараў. – Ударым па хвасце, адсячом некалькі апошніх і знішчым. Першыя машыны па інерцыі праскочаць, і, пакуль яны апамятаюцца і развернуцца, мы будзем далёка.

Калона стала падцягвацца. Стаяў бязветраны дзень, і гітлераўцы ехалі ў адкрытах аўтамабілях,

гучна размаўлялі, смяяліся, пелі песні. Машыны адна за адной праязджалі міма засады. Аўтобус ішоў шаснаццатым ад галаўной машыны.

– Вось з яго і пачынаем, – сказаў Фёдараў першаму нумару, – але доўга на ім не затрымлівайся, каб і на астатнія аўтамабілі хапіла патронаў.

– Не хвалюйся, нампаліт, – адказаў Захар Махарадзэ, – я ўжо ўсё прадумаў і разлічыў, – і ён націснуў на гашэтку.

Аўтобус адразу ж завіхляў, зляцеў у кювет і, двойчы перавярнуўшыся, загарэўся. Захар перанёс агонь на наступную машыну, якая пачала тармазіць. На яе наляцела трэцяя, амаль упрытык пад'ехала чацвёртая. Агонь касіў фашыстаў, што гарохам пасыпаліся з кузавоў і спрабавалі схавацца. Успыхнула яшчэ адна машына, за ёй другая. Махарадзэ змяніў кулямётную стужку. Апошні, сёмы грузавік спрабаваў заднім ходам адысці назад, але стралкі і аўтаматчыкі сканцэнтравалі на ім агонь. Ён таксама запалаў, і з яго пачалі выскокваць гітлераўцы.

Налёт быў раптоўным, і, пакуль гучаў кулямёт, немцы не змаглі зрабіць ніводнага выстралу ў адказ. Яны апамяталіся толькі тады, калі, расстраляўшы ўсе патроны, акружэнцы адскочылі ў глыбіню лесу. І тады затрашчалі аўтаматы, пасля кулямёты, але кулі ляцелі высока над галовамі. Пачалі вакол ірвацца міны, і давялося залегчы і перачакаць. Стральба аслабела, і, падабраўшы хворага Ягорава, рушылі далей на ўсход. Прайшоўшы ўвесь лес, выйшлі на ўскраек, за якім паказалася вёска. Людзі хадзілі па вуліцы без справы, нібы на свята. Гэта быў ціхі куток, куды яшчэ не праніклі акупанты.

Тут чырвонаармейцаў накармілі, да хворага запрасілі фельчара. Адпачыўшы, адправіліся далей, да Бярэзіны. Ягорава давялося пакінуць у вёсцы.

## ПЯКЕЛЬНЫЯ КОЛЫ «ШТАЛАГА-352»

Раніцай 13 ліпеня падышлі да ракі. Чатыры дні тут ішлі баі, а пасля вораг абышоў нашы часці, і яны вымушаны былі адысці. Трэба было неадкладна, пакуль гітлераўцы яшчэ спалі, пераправіцца цераз Бярэзіну. Некаторыя не ўмелі плаваць, і давялося шукаць лодку. За кіламетр ад пераправы стаяла вёска Перавоз, а на супрацьлеглым беразе – вёска Брадок. Яны былі заняты ворагам, і таму не заставалася нічога іншага, як падысці неўпрыкмет да Перавоза і незаўважна ўзяць лодку. Але толькі рушылі з месца, як з кручы берага пачуўся гартанны выкрык:

– Хальт! Хэндэ хох! – і адразу ж застракаталі кулямёты і аўтаматы.

Гэта было такім нечаканым, што ўсе кінуліся ў розныя бакі. Фёдараў пабег да ракі, каб пераплыць на другі бераг, аднак яго дагнала варожая куля. Ён ускочыў на ногі, але рэзкі боль пранізаў усё цела, а ў пятцы левай нагі адчуўся такі жар, як быццам да яе прыклалі гарачыя вуголлі. Гітлераўцы ўжо набліжаліся. Ілля Мартынавіч успомніў пра партбілет і хуценька закапаў яго ў вільготны пясок, сеў на тое месца і спрабаваў сцягнуць бот, з якога лілася кроў. Падышло некалькі гітлераўцаў, і Фёдараў пачуў:

– О-о, каміса-ар, камуні-іст ферфлюхт!

І толькі тут Фёдараў успомніў, што на рукавах яго гімнасцёркі – шытыя золатам пяціканцовыя

зоркі, якія да вайны насілі ўсе палітработнікі. Фашысты пачалі тыкаць duламі аўтаматаў яму ў твар, у грудзі, крычалі і ўлюлюкалі. Пасля пачалі біць ботамі, павалілі і сталі таптаць. Фёдараў страціў прытомнасць. Махарадзэ пасля расказваў, што білі палітрука да таго часу, пакуль ён не страціў прытомнасць і перастаў падаваць прыкметы жыцця. Салаўёў і Драздоў былі забітыя, і іх таварышы папрасілі дазволу пахаваць іх.

Калі выкапалі яму і палажылі ў яе забітых, вярнуліся да Фёдарава, каб пахаваць і яго. Хлопцы моцна здзівіліся, калі выявілася, што ён жывы, хаця на ім не было ніводнага цэлага месца. Яны падумалі, што канваір застрэліць параненага, але ён загадаў набраць рачной вады і змачыць яму галаву і грудзі. Шкляр і Махарадзэ знялі з палітрука ніжнюю сарочку, разарвалі яе і забінтавалі нагу, а гімнасцёрку вывернулі і надзелі так, каб нарукаўныя зоркі не прыводзілі фашыстаў у шаленства.

Пад вечар прыйшлі грузавікі, палонных пагрузілі ў кузаў і павезлі пад канвоем у лагер Дразды, што знаходзіўся за два кіламетры ад Мінска. Побач з лагерам ваенапалонных размяшчаўся лагер для яўрэяў і тых, каго фашысты падазравалі, што яны пераадзетыя чырвонаармейцы. Людзі свабодна хадзілі з аднаго лагера ў другі, мянялі вопратку і ўсё, што ў іх было. Яўрэі стараліся набыць сабе ваенную форму і перайсці у лагер ваеннапалонных, думаючы, што да ваеннапалонных гітлераўцы будуць ставіцца лепш. Многія чырвонаармейцы ахвотна ішлі на такі абмен, бо ў цывільнай адзежы было больш шанцаў на ўцёкі.

Шкляр яшчэ ўчора вечарам абмяняў сваю форму на касцюм, а сёння, наведаўшы Іллю Мартынавіча

і напаіўшы яго вадой, пайшоў шукаць урача. Ён доўга не вяртаўся, ранішняя прахалода пачала мяняцца гарачынёй, усталявалася спякота. Але вось паказаўся з натоўпу Шкляр, следам за ім – чалавек у форме ваенурача з вялікай сумкай, на якой ярка выдзяляўся чырвоны крыж. Ён падышоў бліжэй і адрэкамендаваўся:

– Ваенурач 2-га рангу Свірыдаў!

Папрасіў, каб з параненага знялі шынель, падняў падол гімнасцёркі, і бровы яго нахмурыліся, а вочы сталі злымі:

– На ім жывога месца няма! Папрацавалі, сволачы...

Агледзеўшы нагу, урач заўважыў:

– Уся мякаць ступні раздроблена, пашкоджаны косці. У нармальных умовах варта было б прааперыраваць, але ў мяне, акрамя скальпеля, нічога няма. Паранены страціў многа крыві і так збіты, што нават і ў шпіталі ён наўрад ці выжыў бы...

– Доктар! Ён павінен выжыць, зрабіце ўсё, што можаце! – узмаліўся Шкляр, ледзьве не плачучы.

Урач яшчэ раз уважліва агледзеў нагу, змазаў рану зялёнкай і туга забінтаваў. Ён расказаў пра страшную антысанітарыю, што пануе ў лагеры, пра сотні трупаў, якія распухлі пад сонцам і сташэнна смярдзяць, разносячы заразу. Тут жа, з краю лагера, на беразе Свіслачы дыхаць было лягчэй, а сябры Іллі Мартынавіча нацягнулі над ім плашч-палатку, каб знізу дзьмуў ветрык і не прыпякала сонца. І калі асабліва не рухацца, цярпець боль было можна.

– А ведаеце, у вас тут лепш, чым у іншых месцах, – заявіў урач. – Тут больш свежага паветра, менш смуроду, пылу, бруду і нечыстот, а значыць,

менш усялякай заразы. Вы не будзеце пярэчыць, калі і я тут уладкуюся?

– Ой, што вы, доктар, калі ласка, мы будзем толькі рады вам! – у адзін голас усклікнулі Шкляр і Махарадзэ.

– Ну вось і выдатна. Я цяпер пайду да каменданта лагера і скажу, што, калі трупы не прыбяруць і не ліквідуюць цеснату, то можа ўспыхнуць эпідэмія чумы, тыфу ці халеры, ад якіх не толькі палонным, але і ім, немцам, не будзе выратавання. Я крыху размаўляю па-нямецку і скажу, што клапачуся не пра палонных, а ў першую чаргу пра нашых «вызваліцеляў». А раптам – клюне!

Вынікі гэтага візіту да каменданта аказаліся ашаламляльнымі. Камендант прыйшоў у роспач ад перспектыў, якія намаляваў яму Свірыдаў, і загадаў аднаму з афіцэраў – Курту – арганізаваць пахаванне трупаў, а другому – Рыхарду – на працягу тыдня агледзець усе ваенныя гарадкі ў Мінску і яго наваколлі і падрыхтаваць да прыёму палонных. Свірыдаў па распараджэнні каменданта стаў без чаргі атрымліваць добры прадуктовы паёк і дзяліўся ежай з Фёдаравым. З драздоўскага лагера пачалі пераганяць палонных у іншыя месцы. З адной партыяй пагналі Шкляра і Махарадзэ, і Ілля Мартынавіч вельмі перажываў, што страціў сваіх верных сяброў.

Але з ім застаўся Свірыдаў. Вечарам ён прыйшоў з кучай навін, прынёс харчы і прыгатаваў вячэру. Прысеўшы побач, доктар расказаў, што неўзабаве вялікую частку палонных перагоняць у ваенны гарадок Масюкоўшчына.

– Я сёння выпрасіў у каменданта самую лепшую казарму для арганізацыі шпіталя для параненых

і хворых ваеннапалонных. Пастараюся ўладкаваць у шпіталь і цябе. А цяпер пайду да Рыхарда і дамоўлюся пра транспарт для хворых і параненых.

Пасля абеду да лагера пад'ехалі некалькі грузавікоў. З кабіны аднаго з іх выйшаў Свірыдаў, накіраваўся да Фёдарава, дапамог яму згарнуць плашч-палатку, шынель і пасадзіў у машыну. Загадаў берагчы месца для яго і пайшоў дапамагаць іншым параненым. Некаторыя з іх, не чакаючы, пакуль ім дапамогуць, паўзлі да машын. Яны былі падобныя на мерцвякоў, і таму здавалася, што мёртвыя ўсталі з магіл і паўзуць немаведама куды. Відовішча было жудаснае. Гітлераўцы хворых на грузавікі не бралі, заявіўшы, што яны паважаюць толькі параненых – таму што яны мужна ваявалі, а хворыя самі вінаватыя, што захварэлі.

Да вечара прыехалі на новае месца. У Масюкоўшчыне дзякуючы настойлівасці і «дыпламатыі» Свірыдава параненым былі створаны параўнальна нядрэнныя ўмовы. Іх размясцілі ў лепшай казарме, дзе захаваліся ложкі, на якіх спаць здавалася казкай. Пасля многіх дзён пакут на голай, забруджанай зямлі, сярод смуроду і бруду прасторнае памяшканне з ложкамі ўяўлялася раем. Але так працягвалася нядоўга. Ужо праз тыдзень не толькі ўсе ложкі, але і праходы паміж імі былі запоўнены параненымі.

Свірыдаў адчыніў усе вокны і дзверы, і дыхаць стала намнога лягчэй. Ён паведаміў, што пад лазарэт адвялі толькі адну казарму, і на першым паверху яе арганізаваны прыёмны пакой, перавязачная, рэгістратура, ізалятар і іншыя падсобныя медыцынскія службы. Трэці паверх давялося адвесці для інфекцыйных хворых, і толькі другі –

для параненых. Усё, што знаходзіцца ў шпіталі, – справа рук саміх ваеннапалонных, у асноўным медыкаў. Кожны з іх меў санітарную сумку, і ўсё, што там знаходзілася, – медыкаменты, паравязачныя матэрыялы, – сабралі і ўзялі на строгі ўлік. Самі ўрачы заняліся параненымі.

Паступова ўсе казармы і баракі, складскія памяшканні і канюшні ваеннага гарадка да адказу запоўніліся ваеннапалоннымі. Зноў умовы ўтрымання палонных сталі мала чым адрозніваецца ад тых, што былі ў драздоўскім лагеры. Розніца была толькі ў тым, што цяпер людзі ляжалі не пад адкрытым небам, а ў памяшканнях. І самае галоўнае, у Масюкоўшчыне кожны ваеннапалонны два разы на дзень атрымліваў паўкацялка баланды і 100 грамаў хлеба папалам з апілкамі. Якасць і каларыйнасць ежы былі разлічаны так, каб людзі павольна паміралі. І таму адчуванне голаду з кожным днём павялічвалася. Большасць ваеннапалонных схуднелі настолькі, што былі падобныя на жывыя шкілеты, абцягнутыя сухой жоўтай, як пергамент, скурай.

Фашысты зрабілі ўсё, каб ніхто не змог адсюль збегчы. Яны абцягнулі лагер калючым дротам у пяць радоў, прапусцілі па ім ток высокага напружання. Зона паміж радамі таксама была пераплецена дротам. Вышыня слупоў, дзе мацаваўся дрот, дасягала трох метраў. Адразу за агароджай па ўсім перыметры лагера ўстанавілі каравульныя вышкі, на якіх кругласутачна неслі вахту кулямётныя разлікі. І калі ноччу ў лагеры панавала абсалютная цемра, то з вонкавага боку, за агароджай на высокіх слупах ззялі магутныя электралямпы.

Лагерамі смерці небеспадстаўна лічацца Дахау, Асвенцым, Бухенвальд і да іх падобныя. Але «Шталаг-352», як фашысты называлі канцлалер у Масюкоўшчыне, мала адрозніваўся ад Асвенцыма. Рэжым тут быў такі ж, накіраваны на знішчэнне людзей. І рабілі гэта рознымі спосабамі: расстрэламі, зверскімі катаваннямі, антысанітарыяй. Адным халодным дажджлівым лістападаўскім днём вязняў, у тым ліку і параненых, выгналі на двор, заявіўшы, што ў памяшканнях будзе праводзіцца дэзінфекцыя. Цэлы дзень палонныя прастаялі пад дажджом па калена ў брудзе. Наступіў вечар, а бедалагам, якія прамоклі да ніткі і змерзлі да здранцвення, усё не дазвалялі заходзіць у казармы і баракі.

– Братцы, трэба прасіць афіцэра, каб ён пашкадаваў нас і дазволіў разысціся па сваіх месцах, – прапанаваў хтосьці.

Афіцэр ніяк не рэагаваў на ўсе просьбы зняволеных. Калі ж пажылы ваеннапалонны са слязамі на вачах упаў да ног гітлераўца з просьбай, той адступіў назад і адвярнуўся. Аўсеенка, што стаяў побач з Іллёй Мартынавічам, сказаў старому:

– Каго ты просіш? Прасіць можна людзей, а не іх. Хіба яны людзі!

Фашыст, аказалася, разумеў рускую мову. Ён хутка павярнуўся, падышоў да Аўсеенкі і стрэліў яму проста паміж вачэй. Пасля ён узняў крык, салдаты і паліцаі пачалі ўсіх біць прыкладамі і палкамі, заганяючы ў баракі і казармы. Хто падаў, прыстрэльвалі на месцы. Фёдараў з параненай нагой хутка бегчы не мог, і яму дасталося ўдараў больш за іншых. У памяшканнях для ваеннапалонных ніхто ніякай дэзінфекцыі не праводзіў, а вось пасля халоднага шматгадзіннага «душу» многія захварэлі

на запаленне лёгкіх. І без таго вялізная смяротнасць павялічылася ў многа разоў.

Казармы і баракі той незвычайна халоднай зімой не ацяпляліся, вокны былі выбіты, дзверы не зачыняліся. У суровую сцюжу схудалыя і знясіленыя людзі ляжалі на земляной падлозе, захутаўшыся ў розную адзежыну і рваныя шынялі, збіваліся ў кучы, клаліся адзін на аднаго, а раніцай знаходзілі па некалькі трупаў. Іх было з кожным днём так многа, што на двары лагера іх складвалі, як дровы, у велізарныя штабелі. Усе трупы былі цалкам голыя і уяўлялі сабой жудаснае відовішча. Іх раздзявалі тыя, хто ратаваўся ад нясцерпнага холаду.

А фашысты вынаходзілі ўсё новыя правакацыі, каб знішчыць як мага больш людзей. На Новы, 1942 год мароз выдаўся градусаў пад 30. Раніцай выгналі ўсіх на двор і пастроілі ў шарэнгу. На лютым марозе вязні прастаялі гадзіны тры, некаторыя пачалі замярзаць і падаць. Іх тут жа прыстрэльвалі і адносілі ўбок. Нарэшце прыбыў лагерны афіцэр Ліпп і пачаў выдаваць «навагодні падарунак» – па дзве сігарэты кожнаму. У Фёдарава міжволі вырвалася:

– Я не куру, навошта мяне марозілі?!

Ліпп з усяе сілы ўдарыў яго палкай па галаве і загадаў даць яшчэ 25 палак. Паліцаі раздзелі Фёдарава да кальсонаў і адлічылі 25 удараў па спіне, пасля аблілі халоднай вадой. Боль быў страшэнны. Каля месяца Ілля Мартынавіч праляжаў збітым і хворым на запаленне лёгкіх. І калі б не сябра Свірыдаў, загінуў бы, як і многія тысячы іншых. Пасля «цырымоніі ўручэння навагодніх падарункаў» у некаторых бараках засталіся толькі адзінкі, а ў бараках № 11 і 17, дзе было па 120–130 чалавек, памерлі ўсе. Ва ўсім лагеры застава-

лася каля пяці тысяч вязняў, у тым ліку не больш як 300 працаздольных. Таму ўсіх, хто мог рухацца, неадкладна выганялі са шпіталя і адпраўлілі ў рабочыя каманды. Фёдараў трапіў у адну з такіх, дзе налічвалася 12 чалавек. Працавалі на пракладцы глыбокай канавы для каналізацыйных труб ад лазні. Работа патрабавала вялікіх фізічных намаганняў, бо глеба глыбока прамерзла і яе трэба было дзяўбці кіркамі, а сілы ў вязняў неставала. Канваіры шчодра надзялялі іх ударамі палак і прыкладаў...

Як толькі Фёдараў адчуў, што нага пачала зацягвацца, ён сказаў Свірыдаву:

– Цяпер можна падумаць і пра ўцёкі. Давай абмяркуем, як гэта зрабіць.

– Я даўно пра гэта думаў, але пакуль у лагеры сотні параненых і тысячы хворых, не маю права як урач уцякаць. Ты бяжы адзін, а я табе дапамагу.

Ён пазнаёміў Фёдарава з Ягорам Батвіным і Іванам Лузіным, якія ўжо даўно рыхтаваліся да ўцёкаў. Яны працавалі ў камандзе па пахаванні трупаў, і канваір ім настолькі davяраў, што часта адпускаў іх адных на работу, а сам заставаўся на прахадной. Калі б у Лузіна і Батвіна раны былі менш небяспечныя, яны даўно ўцяклі б. Дамовіліся, што, калі раны Фёдарава канчаткова зажывуць, Свірыдаў папросіць камenданта лагера, які яму цалкам давяраў, прызначыць яго ў каманду магільшчыкаў.

Але планы гэтыя паламаліся, бо Іллю Мартынавіча прызначылі ў іншую каманду і перавялі з лазарэта ў барак № 24. Фашысты пастаянна мянялі састаў рабочых каманд, каб вязні не змаглі дамовіцца пра ўцёкі або стварыць падпольную арганізацыю. У новай камандзе людзі не давяралі адзін аднаму, бо асцерагаліся правакатараў і шпіёнаў. Што ж,

з пункту гледжання прафілактыкі падпольнай работы гітлераўцы дасканала распрацавалі тэорыю і практыку.

Напрыканцы лютага каманду землякопаў перагналі ў былы рэчавы армейскі склад, у якім былі пабудаваны ў тры ярусы нары. Вялізнае памяшканне з шырокімі варотамі і маленькімі аконцамі не ацяплялася, і холад тут панаваў страшэнны. Сюды сагналі не менш як тысячу чалавек і абʼявілі каранцін. Але каранцін быў нейкім незвычайным: тут давалі двайную норму харчавання, усіх зганялі ў лазню і выдалі новыя шынелі. Не было сумненняў, што вязняў кудысьці рыхтуюць.

А хутка ў новым бараку зʼявіўся нехта Абду Бары – аджарац па нацыянальнасці. Ён адрэкамендаваўся капітанам інтэнданцкай службы. Яму акупанты цалкам давяралі, тры разы кармілі на кухні і дазвалялі бесперашкодна хадзіць па ўсім лагеры. Абду Бары выступаў перад ваеннапалоннымі з правакацыйнымі прамовамі, заклікаў да спакою і разважлівасці. Ён нічога не гаварыў пра вайну і імкнуўся паказаць, што вельмі клапоціцца пра дабрабыт палонных.

– Тут, у новым бараку, сабраны лепшыя мужныя людзі, якія стойка перанеслі раненні, інфекцыйныя захворванні, холад і голад, – гаварыў Абду Бары. – Цяпер нямецкае камандаванне лічыць, што мы пасля каранціну зможам паехаць у Германію на работу, дзе нас чакае добрае харчаванне і спакойнае жыццё. А магчыма, некаторыя з вас папоўняць рады гераічнай германскай арміі і будуць змагацца супраць жыдоў і бальшавікоў.

І здраднік энергічна ўзяўся выконваць арганізацыйныя мерапрыемствы: падабраў сабе па-

мочнікаў – камандзіраў батальёнаў, рот, узводаў і аддзяленняў. Не прайшло і тыдня, як ён укамплектаваў поўны штат каманднага саставу і пад выглядам фіззарадкі і ўмацавання здароўя ваеннапалонных кожную раніцу і вечар стаў выганяць іх на страявыя заняткі.

Яшчэ ў рабочай камандзе Ілля Мартынавіч зблізіўся з двума таварышамі – Лукіным і Цімохіным. Разам яны трымаліся і ў каранціне. З кожным днём станавілася больш ясна, што вязняў рыхтуюць не для паездкі ў Германію, а для нечага іншага. Канешне, новым сябрам не падыходзіла паездка ў Германію, але гэта было б лепш, чым аказацца на фронце і ваяваць супраць сваіх.

– Ад фашыстаў усяго можна чакаць, – ціха сказаў Цімохін. – Паставяць камандзірамі «чыстых арыйцаў» – і будзеш страляць у сваіх, а не будзеш – атрымаеш кулю.

– Трэба штосьці рабіць, каб сарваць гэту фашысцкую задумку, – прапанаваў Фёдараў. – Давайце напішам пракламацыю і выкрыем планы Абду Бары.

У Лукіна знайшоўся сшытак, з якога вынялі двайны ліст паперы і друкаванымі літарамі напісалі, што фашысцкая армія нясе вялікія страты, і Гітлер хоча выкарыстаць ваеннапалонных у сваіх крывавых мэтах. Лістоўка заканчвалася словамі: «Смерць нямецка-фашысцкім акупантам і іх прыслужнікам, здраднікам Радзімы! Смерць Абду Бары!» Ноччу Фёдараў у поўнай цемры ціхенька прабраўся да варот барака і хлебам прымацаваў пракламацыю.

Раніцай жыхары барака адзін за адным падыходзілі да варот, чыталі і моўчкі адыходзілі, азіраючыся па баках. Так працягвалася каля

гадзіны, раптам пачуўся шэпт: «Абду Бары ідзе!» Адзін з вязняў хуценька сарваў паперу, скомкаў яе, сунуў у кішэнь і нырнуў у натоўп. Абду Бары так нічога і не даведаўся. Прыйшоў час выходзіць на страявыя заняткі, і па камандзе камбатаў Пузняцова і Вараб'ёва ваеннапалонныя нехаця пачалі выходзіць на пляц. Апошнім палыпаў Фёдараў. Але Абду Бары, паклаўшы яму руку на плячо, ціха сказаў:

– Не хадзі. Куды табе з тваёй нагой! Я таксама хутка вярнуся, у мяне да цябе ёсць прапанова.

На страявых занятках ён доўга не затрымаўся і, як заўсёды, даручыўшы іх сваім памочнікам – Пузняцову і Вараб'ёву, – вярнуўся ў барак. Нечакана ён пачаў расказваць Фёдараву пра сваю сям'ю, спытаў, якая сям'я ў Фёдарава і пра тое, колькі ён служыў і на якой пасадзе. Вельмі здзівіўся, калі пачуў, што Ілля Мартынавіч быў простым чырвонаармейцам. Даверліва сказаў, што, кім бы яго суразмоўца ні быў, ён яго не выдасць, бо адчувае да яго сімпатыю. Ён сказаў пра сваю адзіноту і пра тое, што вельмі хоча пасябраваць з Фёдаравым.

– Тут, у бараку – у асноўным моладзь. Вы – больш сталы і, напэўна, адукаваны чалавек, таму мне прыемна размаўляць з вамі. Вараб'ёў і Пузняцоў – малапісьменныя людзі, і ў мяне з імі няма і не можа быць сапраўднага сяброўства. Я чуў, што вы – з Растова, а я – з Каўказа, і мы фактычна – землякі. Гэта для сяброўства таксама мае вялікае значэнне.

– Не, я толькі жыў і працаваў у Растове, а нарадзіўся ў былой Арлоўскай губерні, цяпер Курскай вобласці, – асцярожна сказаў Ілля Мартынавіч.

Але Абду Бары не прыдаў гэтым словам ніякай увагі і працягваў:

– Я даўно да вас прыглядваюся і не магу зразумець: з аднаго боку, бачу, што вы – сур'ёзны, пісьменны і ў той жа час – сціплы чалавек. Гэта тое, што мне і патрэбна, вы – самая дастойная кандыдатура на пасаду майго намесніка па палітчастцы. З другога боку, мне здаецца, што вы – камуніст і па ўсіх прыкметах у арміі былі палітруком, а можа, камісарам, і ў гэтым выпадку вы на гэту пасаду не падыходзіце.

– Каб быць камісарам ці палітруком якога-небудзь падраздзялення, трэба быць кадравым афіцэрам Чырвонай Арміі, – сказаў Фёдараў. – А я толькі адбываў тэрміновую службу.

– Няпраўда! Ваш узрост выдае вас з галавой.

Фёдараў помніў, як у лістападзе 1941 года ён стаў ахвярай злоснага даносу, што ён – камісар. Яго вывелі на расстрэл, прымусілі капаць магілу, але пры апошнім вобыску раптам знайшлі ў кішэні гімнасцёркі даведку, выданую Сталінскім ваенкаматам г. Растова-на-Доне, якая сведчыла, што 27 кастрычніка 1939 года Фёдараў здаў пашпарт у сувязі з прызывам у Чырвоную Армію на тэрміновую службу. Тады гэта паперка, пра якую Ілля Марнынавіч зусім не памятаў, выратавала яму жыццё. Таму ён цяпер упэўнена і цвёрда заявіў:

– Я дакументальна дакажу, што адбываў тэрміновую службу, – і тут жа падаў Бары гэтую даведку.

Той двойчы прачытаў яе, некалькі разоў перавярнуў і працягнуў назад.

– Так, – нарэшце прамовіў Бары. – Усё ясна. Ну што ж, гэта – добра. Значыць, буду прадстаўляць вас на пасаду свайго намесніка па палітчастцы.

– Прашу гэтага не рабіць, – узмаліўся Фёдараў. – Калі вы мяне хоць крыху паважаеце, то не будзеце

настойваць на сваім. У мяне дзевяць родных братоў ваююць на фронце, і я не магу выступіць супраць іх са зброяй у руках. Упэўнены, што нават немцы не дазволяць мне ісці на фронт, калі я ім скажу, што на тым баку фронту ваююць мае браты. Я не магу быць вашым намеснікам яшчэ і таму, што на гэтай пасадзе патрэбен здаровы і высокаадукаваны чалавек, які і словам і справай зможа весці за сабой людзей. У мяне ж свішч на назе і адукацыя – кот наплакаў: вядомая справа – электраманцёр...

– Вы – электраманцёр?! Ніколі не падумаў бы. Я меркаваў, што вы – або інжынер, або настаўнік. Як жа я так памыліўся? Ну, нічога. Прашу толькі, каб пра нашу размову ніхто не даведаўся. Ясна?

– Зразумела. Можаце на мяне ў гэтым цалкам разлічваць.

З гэтай размовы стала ясна, што палонных рыхтуюць для папаўнення гітлераўскай арміі ці для стварэння спецыяльных фарміраванняў калі не на фронце, то ў тыле. Гэта вельмі ўстрывожыла Фёдарава і яго сяброў, якім ён пад вялікім сакрэтам вечарам расказаў пра сваю размову з Абду Бары. Трэба было неадкладна сарваць гітлераўскія планы. І тады Ілля Мартынавіч прапанаваў зноў напісаць лістоўку і расказаць пра сувязь Бары з фашыстамі. Ноччу лістоўка з'явілася на варотах.

Раніцай вялікі натоўп ваеннапалонных чытаў лістоўку. Рэагавалі па-рознаму. Адны казалі, што гэта да дабра не давядзе, іншыя, наадварот, адыходзілі весела і заяўлялі, што гэта правільная лістоўка і на страявыя заняткі яны больш не пойдуць. І раптам зусім нечакана ў барак увайшоў Бары. Ён падышоў да варот і пачаў чытаць. Чытаў доўга, напэўна, адначасова меркаваў, як на гэта рэагаваць. Нарэшце павярнуўся і сказаў:

– Я хацеў, каб вам было лепш, а тут, аказваецца, ёсць такія, хто разумее маю дабрыню інакш. Нават мне пагражаюць... Ну што ж, калі хто не хоча заставацца тут, я не трымаю. Ідзіце да каменданта і прасіце ў яго работу. Але тых, хто пойдзе, сюды мы больш не прымем. Вы, напэўна, забыліся, што там замест поўнага кацялка баланды атрымаеце палавіну і замест 200 грамаў хлеба – 50. – І ён пайшоў з барака.

Наступіў час страявых заняткаў, але Бары не прыйшоў, а Вараб'ёў і Пузняцоў без яго не рашыліся выводзіць людзей на двор. Устанавілася цяжкая цішыня. Усе чакалі, што вось-вось уварвуцца гестапаўцы. Лістоўка ўсё яшчэ бялела на варотах. Яе даўно ўжо ўсе прачыталі, і цяпер навісла пагроза, што яна можа адыграць непапраўную ролю, калі трапіць у рукі гестапа. Але калі зняць яе самім, то ўзнікне падазрэнне, што яе аўтары – ваеннапалонныя, і расправы не пазбегнуць. І тады Фёдараў звярнуўся да Вараб'ёва:

– Пан камбат, загадайце зняць і знішчыць лістоўку, бо, калі наскочыць гестапа, то і вам пападзе ў першую чаргу.

Вараб'ёў хутка падняўся і вымавіў: «Гэта правільна!» Ён падышоў да варот, зняў лістоўку і, выняўшы запальнічку, спаліў яе.

## З РАБОЧАЙ КАМАНДЫ – НАЎЦЁКІ

У барак зайшоў Абду Бары і абвясціў, што ствараецца рабочая каманда па аднаўленні размарожанага водаправода і каналізацыі ў казармах, дзе жывуць немцы.

– Хто ў гэтай справе разбіраецца, прашу падыходзіць і запісвацца.

Прайшло пяць мінут, а ахвотнікаў не было: не хацелася траціць дадатковыя паўкацялка баланды і 100 грамаў хлеба. Сябры – Фёдараў, Цімохін, Лукін – параіліся і вырашылі запісацца. Бары нічога не сказаў, калі запісваліся Лукін і Цімохін, а калі падышоў Фёдараў, ён са здзіўленнем спытаў:

– А нага?

– Урачы рэкамендуюць больш рухацца. Тут ад мяне мала карысці. А працаваць я змагу: рукі і ўсё астатняе – здаровае.

Праз гадзіну добраахвотнікі паступілі ў распараджэнне так званага «рускага каменданта» лагера, маёра Музычэнкі. Ён таксама быў ваеннапалонным, але нейкім чынам увайшоў у давер да акупантаў і атрымаў гэту пасаду. Для ўсіх было загадкай, чаму камендант Іоўн узяў яго сабе ў памочнікі. У адрозненне ад іншых халуёў, Музычэнка ніколі нікога не лаяў і не зачапіў нават пальцам. Ён размясціў рабочую каманду ў бараку побач са сваім пакоем, і палонныя вырашылі, што ён будзе за імі назіраць і насцярожыліся. Але «рускі камендант» паблажліва ставіўся да падначаленых, запрашаў іх па чарзе ў свой цёплы пакой пагрэцца, вёў размовы на нейтральныя тэмы.

...Надвор'е ў сакавіку 1942 года выдалася незвычайна суровым – марозным і снежным, з завеямі і пранізлівымі вятрамі. Наступіла другая палавіна месяца, а ніякіх прыкмет вясны не назіралася. Халоднай марознай раніцай рабочую каманду пад канвоем пагналі за межы лагера. Прыйшлі ў вялікае цаглянае памяшканне – былы Ждановіцкі дом адпачынку. Навокал лес і некалькі

аднапавярховых жылых дамоў. Вязням загадалі дэманціраваць водаправод і каналізацыю.

Фёдараў агледзеўся навокал, і ў яго радасна забілася сэрца: вось адкуль можна ўцячы! Канваіры тут не маглі пастаянна сачыць за ваеннапалоннымі, бо тыя разышліся па розных паверхах і працавалі па 2–3 чалавекі.

– Нельга ўпускаць такі зручны выпадак, – ціха сказаў Ілля Мартынавіч сваім паплечнікам – Лукіну і Цімохіну.

– Гэта правільна, – згадзіўся Лукін. – Але трэба ўсё дасканала прадумаць.

– Перш за ўсё трэба здабыць зброю, а значыць – перабіць канвой, – заявіў Фёдараў. – Пайду агітаваць Барысава і Кудрына.

Кудрына – капітана Чырвонай Арміі, камуніста, які трапіў у палон восенню 1941-га пад Вязьмай і таму быў яшчэ ў добрым фізічным стане, – агітаваць доўга не давялося. Ён адразу прыняў прапанову і цалкам згадзіўся з планам уцёкаў. Нават паабяцаў узначаліць гэта мерапрыемства. Дамовіліся, што аперацыю правядуць пад канец работы вечарам. Тады ў палонных наперадзе будзе ўся ноч, ды і фашысты не змогуць адразу ж арганізаваць пагоню. Значыць, лягчэй будзе замесці сляды і адысціся як мага далей.

За тры гадзіны да канца рабочага дня групу змоўшчыкаў нечакана разлучылі. Дзевяць чалавек з рабочай каманды, сярод іх Лукіна і Цімохіна, павезлі на падстанцыю за 3 кіламетры ад дома адпачынку, дзе таксама трэба было дэманціраваць абсталяванне. А Шматаў, Кудрын, Барысаў і Фёдараў засталіся на месцы. Неўзабаве пад'ехалі дзве параконкі, і вязням загадалі складаць у іх

інструменты. На адну параконку ўселіся па камандзе Кудрын і Шматаў, на другую – Барысаў і Фёдараў. Першая падвода накіравалася на падстанцыю, а другая – у лагер.

На ёй размясціліся вазніца, двое палонных і канваір. Сані былі з дзвюма папярэчнымі лавачкамі. На пярэднюю ўсеўся фурман, а на другую – канваір. Барысаў сеў паміж імі на борт саней, а Фёдараў – ззаду канваіра. Паглядзеўшы на Барысава, Ілля Мартынавіч адразу па выразу яго твару зразумеў, што той чакае яго каманды. А лагер усё бліжэй і бліжэй: яшчэ якой паўгадзіны – і зноў за вязнямі зачыняцца вароты пекла. І Фёдараў усёй душою адчуў, што лепш загінуць тут у барацьбе з ворагам, чым вярнуцца ў страшэннае месца зямной юдолі. Схапіўшы са дна падводы лом, ён крыкнуў Барысаву:

– Бі гадаў! – і з усяе сілы замахнуўся на фашыста.

Але ад крыку коні рванулі, і удар трапіў не па галаве, а па плячы гітлераўца. Той усхапіўся на ногі і спрабаваў сарваць з пляча вінтоўку. Фёдараў адкінуў лом і наваліўся на ворага, паваліў яго і стаў душыць за горла. Фашыст стаў біць Фёдарава кованымі ботамі ў жывот і стараўся вырабіцца з-пад яго. У самую крытычную хвіліну, калі гітлеравец стаў ужо выслізгваць, Фёдараў убачыў на яго баку штык-кінжал, выхапіў яго і ўдарыў у грудзі фашыста, а пасля па руках. Вінтоўка апынулася ў Фёдарава, і ён з такой сілай стукнуў ёю па галаве ворага, што прыклад адляцеў убок. Фашыст, заліўшыся крывёю, зваліўся на дно саней.

Барысаў свайго ворага абяззброіў, але таму ўдалося збегчы. Ён мог папярэдзіць ахову, і ўцекачам пагражала пагоня. Таму яны хутка развярнулі падводу і накіраваліся назад у Ждановічы. Мінулі

дом адпачынку і павярнулі на дарогу, якая вяла на поўнач. Успомнілі, што дамаўляліся з астатнімі таварышамі прабірацца ў бок Суража, каб перайсці там лінію фронту: пра партызан аніякага ўяўлення ў іх яшчэ не было. Мінулі лес, і іх погляду адкрылася вёска. На краі вуліцы каля вясковага млына стаяла група мужчын. Дарогу перагарадзіў чырванатвары вялікі таўстун, па ўсіх прыкметах – мясцовы млынар: яго адзенне было абсыпана мукой.

– Вы куды гэта, хлопцы? – пагрозліва спытаў ён, схапіўшы коней за аброць.

На хвіліну ўцекачы разгубіліся, пасля Фёдараў сарваў з пляча вінтоўку і наставіў на млынара. Той адступіў і схаваўся ў млыне, астатнія мужчыны таксама хуценька разышліся. Млын стаяў на беразе ракі, і, пачуўшы шум вады, коні спыніліся як укапаныя, і ніяк нельга было іх зрушыць з месца. Пакуль валаводзіліся з коньмі, млынар збегаў дадому і выклікаў паліцая. Проста з парога той пачаў страляць з вінтоўкі, але кулі ляцелі высока над галавой: паліцай быў п'яны. Давялося кінуць сані з трупам фашыста і хуценька адыходзіць у лес.

Паглыбіліся у гушчар і вырашылі перадыхнуць, але адпачывалі не больш як пяць хвілін і зноў пайшлі, каб як мага далей адысціся. Асабліва асцерагаліся пагоні са службовымі сабакамі, таму вырашылі заблытаць сляды. За лесам аказалася вялікая дарога, па якой час ад часу групамі і па адной праязджалі фурманкі. Наблізілася падвода, у якой сядзеў вазніца і дзве кабеты. Паміж імі было свабоднае месца, і ўцекачы, не згаворваючыся, ускочылі ў сані. Жанчыны перапалохаліся.

– Не бойцеся, – супакоіў іх Ілля Мартынавіч. – Мы крыху пад'едзем і пойдзем сваёй дарогай.

Вочы жанок пасвятлелі, твары асвяціліся цёплай усмешкай. Адна з іх запытала:

– Вы, напэўна ж, з канцлагера?

Кіўком галавы ўцекачы пацвердзілі яе словы. Жанчыны разгаварыліся, але трэба было ўжо расставацца: праехалі каля трох кіламетраў, і нядужы конік прытаміўся. Падзякаваўшы добрым людзям і развітаўшыся з імі, хлопцы саскочылі з саней і пайшлі сваёй дарогай. Яна аказалася доўгай і небяспечнай. Двойчы пашчасціла схавацца ад пагоні з сабакамі. Адпачывалі ў вялікім пустым гумне, а на змярканні падышлі да вёскі. Трапілі ў трэцюю ад краю хаціну. Там было ціха і цёмна, стаяў холад. Тут жыла сям'я, якая пераехала з Сёмкавага Гарадка, дзе гаспадар – Іван Русак – працаваў брыгадзірам на торфапрадпрыемстве «Змяёўка». Пазнаёміліся. Пачуўшы прозвішчы гасцей, гаспадар заўважыў:

– Ага, рускія, значыць. Праходзьце, будзеце гасцямі!

Давялося ўсё расказаць. Гаспадар пахваліў гасцей за ўцёкі, але скептычна аднёсся да іх намеру перайсці лінію фронту.

– Наўрад, хлопцы, ці ўдасца вам гэта. Вы ж такія змучаныя, а дарога далёкая: напрасцяк да Віцебска не менш як 300 кіламетраў. А вам прыйдзецца пятляць, абыходзіць вёскі з гарнізонамі. Ды і ці трэба вам туды ісці – ворага можна біць і тут, у партызанах.

Прагаварылі амаль усю ноч. Іван Русак расказаў пра становішча ў наваколлі, пра тое, у якіх вёсках і да якіх людзей можна смела зайсці і папрасіць дапамогі і ўрэшце даў адрас свайго даверанага чалавека ў вёсцы Жукаўка. Туды і накіраваліся, паснедаўшы на дарогу. Праз двое сутак у прыцемках

яны пастукалі ў хату, што стаяла насупраць царквы. Дзверы адчыніў сам гаспадар з акладзістай барадой. Даведаўшыся, што іх прыслаў Іван Русак, дзед адразу прапанаваў:

– Заходзьце, заходзьце хутчэй – дарагімі гасцямі будзеце! Жонка прыйдзе, збярэ вячэру. Людзі ў нас харошыя, можаце быць спакойнымі. Немцы прыязджалі толькі восенню і з тае пары не паяўляліся. Паліцаяў таксама не было.

Прыйшла гаспадыня са свежым сырадоем, і праз чвэрць гадзіны на стале дымілася ў чыгунку бульба, побач з ёй узвышаўся стос бліноў і міска са смятанай. Пасля вячэры ўладкаваліся на начлег. Упершыню за многія месяцы хлопцы разуліся і распрануліся. І толькі цяпер яны адчулі сапраўдную свабоду. Фашысцкі палон, канцлагеры, мукі і здзекі гітлераўцаў – усё гэта, як кашмарны сон, засталося ззаду. Прыйшоў час фашыстам плаціць па страшных рахунках. Хутчэй бы да партызан – і помсціць, помсціць.

Але знайсці партызан было нялёгка. Ад вёскі да вёскі крочылі Барысаў і Фёдараў, па ўказаных ім адрасах заходзілі ў хаты, распытвалі, ды мясцовае насельніцтва строга захоўвала тайну і не выдавала незнаёмцам нават прыкладнай дыслакацыі народных мсціўцаў.

І толькі ў Стайках ім нарэшце пашчасціла. Гаспадар быў сувязным партызанскага атрада маёра Варанянскага, але, як здаралася неаднойчы, пачаў перад незнаёмцамі нахвальваць «новы парадак». Фёдараў сказаў яму:

– Вы, бацька, гаворыце не тое, што думаеце. Пра вас мы ўжо ўсё ведаем ад вашага сябра з Пуцілава. Ён і накіраваў нас сюды.

– А халера вас ведае, хто вы такія! – зарагатаў гаспадар. – Ходзяць цяпер тут усякія – нядоўга і на шыбеніцу трапіць.

Раптам гаспадыня падхапілася з месца і ўсклікнула:

– Ідуць!

– Хто? – спытаў Фёдараў.

–Як – хто? Партызаны, – хутка прамовіла гаспадыня і выбегла на двор.

Яна неўзабаве вярнулася і сказала, каб хто-небудзь з хлопцаў выйшаў без зброі на перамовы. Фёдараў сарваўся з месца і выйшаў з хаты. Да яго ўпэўненым крокам наблізіліся два мажныя дужыя хлопцы, хутка абшукалі кішэні і тут жа правялі кароткі допыт: адкуль і куды ідуць. Даведаўшыся, што перад імі былы вязень з Масюкоўшчыны, запрасілі з сабою ў хату.

– Гэта, бацька, свае хлопцы. Няхай яны пераначуюць у вас, а раніцай мы вернемся і забяром іх у атрад.

Рана-раненька партызаны вярнуліся і загадалі збірацца. Адзін з іх між іншым спытаў:

– Вы ж не адны ўцяклі з лагера?

Фёдараў расказаў, што павінны былі ўцячы яшчэ дзевяць чалавек, і назваў прозвішчы іх і прыкметы.

– Так-так, правільна, гэта яны, – пацвердзіў партызан.

– Дык яны ў вас?

– Не, яны трапілі ў суседні атрад. І калі вы пажадаеце быць разам са сваімі сябрамі, мы адвядзём вас да іх.

## У АТРАДЗЕ АСТАШОНКА

У Руднянскім лесе Лагойскага раёна размяшчаліся два партызанскія атрады – «Мсцівец» маёра Варанянскага і атрад пад камандаваннем капітана Асташонка. Абодва яны былі з акружэнцаў. У Варанянскага налічвалася каля 80 партызан, у Асташонка – не больш за 50.

Група Кудрына сустрэла гэты атрад на трэці дзень пасля ўцёкаў. Ім удалося збегчы значна лягчэй. Калі яны пачалі біць канваіраў, адзін з іх раптам закрычаў:

– Іх бін комуністішэ! – і тут жа дастаў з патайной кішэні чырвоную кніжку – партбілет. Аддаў сваю зброю.

Да яго далучыўся і адзін паліцай з так званага ўкраінскага батальёна – Барыс Лунін, які ахоўваў вязняў. Да вайны Лунін атрымаў пяць гадоў зняволення за тое, што ў бойцы нанёс траўму свайму начальніку. Калі пачалася вайна, яго, як шафёра, вызвалілі і адправілі на фронт. Там ён трапіў у палон і ўступіў у паліцэйскі батальён. Цяпер Лунін выкарыстаў зручны выпадак і далучыўся да ўцекачоў.

Група былых вязняў на чале з Кудрыным адправілася да лініі фронту. Па дарозе немец-камуніст пачаў скардзіцца, што не прывык да такіх цяжкасцей, што яго мучаць голад і стомленасць. Яго спыталі:

– Калі мы цябе адпусцім, куды ты пойдзеш?

– Вярнуся ў свой батальён, – адказаў той.

– А цябе не расстраляюць свае?

Ён патлумачыў, што пасля паражэння пад Масквой Гітлеру трэба многа салдат, і яму дадуць толькі 5–10 сутак арышту. Яго адпусцілі.

А вось другі ўцякач – Васільеў – збег з каравула, калі сам напрасіўся на пост у вёсцы Бабры, дзе група спынілася на начлег. Васільеў і яшчэ шэсць ваеннапалонных не ўдзельнічалі ў змове і знішчэнні канвоя, і для іх вызваленне нібы з неба звалілася. Са слязамі на вачах яны дзякавалі таварышам за выратаванне іх з няволі. Васільеў таксама дзякаваў, але, тым не менш, збег і вярнуўся ў канцлагер, спадзеючыся на ўзнагароду за тое, што ён назаве месца размяшчэння ўцекачоў.

Гітлераўцы, атрымаўшы ад яго такія звесткі, павесілі яго разам з маёрам Музычэнкам «за ўдзел ва ўцёках». Музычэнку фашысты схапілі проста так, не маючы супраць яго ніякага кампрамату. На допыце ён заявіў:

– На вялікі мой сорам, я не ўдзельнічаў ў падрыхтоўцы ўцёкаў. Цяпер вельмі шкадую і не магу сабе дараваць гэтага. Я ведаю, вы мяне расстраляеце ці павесіце. Смерці я не баюся. Я бязмежна рады, што мае хлопчыкі вызваліліся і стануць народнымі мсціўцамі. Асцерагайцеся, гэта будуць самыя бязлітасныя мсціўцы! Яны адпомсцяць і за мяне...

Атрад Асташонка быў зусім небаяздольным: на ўвесь асабовы састаў налічвалася ўсяго толькі дзевяць вінтовак і адзін няспраўны ручны кулямёт. Палавіна партызан абмарозілі рукі і ногі: нягледзячы на лютую зіму, людзі жылі ў шалашах. Адзенне і абутак былі парваныя, харчаваліся партызаны дрэнна. Сам Асташонак амаль не вылазіў са сваім штабам з маленькай, цёмнай, але цёплай зямлянкі. Калі ён і паяўляўся на паветры, то толькі для таго, каб у чарговы раз папярэдзіць партызан:

– Не стукайце, не шуміце, бо немцы пачуюць!

Былыя вязні вырашылі праявіць ініцыятыву і прапанавалі разграміць гарнізон у вёсцы Боўблі, што за 5–6 кіламетраў ад Заслаўя. Асташонак рашуча выступіў супраць, заявіўшы, што актыўныя баявыя дзеянні ён дазволіць толькі вясной, калі растане снег і не будзе відаць слядоў. Начальнік штаба атрада, немец па нацыянальнасці, Ганс раптам сказаў:

– А няхай ідуць. Навошта стрымліваць ініцыятыву? Мы з табою не будзем несці адказнасці, калі іх напаткае няўдача: яны самі настаялі на правядзенні гэтай аперацыі. Ну, а калі ім удасца разграміць гарнізон, то гэта і нам хвала.

І Асташонак згадзіўся. Ён наогул заўсёды кожнае сваё дзеянне ўзгадняў са сваім начальнікам штаба, хаця таму было толькі 22 гады і вялікім розумам ён не вызначаўся, таксама як і мужнасцю. Ніхто не ведаў, хто ён і адкуль узяўся. Было незразумела, за якія заслугі гэты 22-гадовы юнак быў назначаны начальнікам штаба. Узнікла падазрэнне, што гэта – гестапавец, якога прыставілі да Асташонка, а сам Асташонак – здраднік і арганізаваў правакацыйны партызанскі атрад.

У разведку адправіліся Гламаздзін і яшчэ два партызаны, а Фёдараў выбраў найбольш баяздольных байцоў і павёў іх да гарнізона, умовіўшыся з разведчыкамі пра месца сустрэчы перад аперацыяй. Усяго падабралася 40 чалавек, на ўзбраенні якіх было 8 вінтовак і адзін рэвальвер. Большасць партызан думалі здабыць зброю ў баі, а Фёдараў разлічваў на поспех аперацыі, спадзеючыся на нечаканасць нападу, бесклапотнасць праціўніка і адвагу партызан.

Гарнізон размяшчаўся ў дзвюх сялянскіх хатах: у адной – салдаты, а ў другой – афіцэры. Фёдараў

узначаліў групу, якая павінна была знішчыць салдат, а Гламаздзін – такую ж групу для знішчэння афіцэраў. У групе Фёдарава было 9 чалавек, а ўзбраенне – вінтоўкі ў камандзіра і ў Жукава ды наган у Ціхановіча. Група Гламаздзіна была ўзброена не лепш: давялося выдзеліць два ўзброеныя заслоны па 5 – 6 чалавек з абодвух бакоў вёскі для аховы ад магчымай падмогі з боку Заслаўя ці Радашковічаў. Трэцяя група адправілася для парыву сувязі.

Групе Фёдарава пашанцавала: гаспадыня адчыніла дзверы адразу на ледзь чутны стук. Увайшлі ў пярэдні пакой, дзе жыла сям'я, а гітлераўцы знаходзіліся ў другім. Гаспадыня пасвяціла газоўкай, і Жукаў і Фёдараў уварваліся туды. У пакоі панавалі цемень і цішыня. Партызаны запалілі факелы і кінуліся на фашыстаў. Некалькі мінут былі чуваць стрэлы партызанскіх вінтовак, выкрыкі і зубоўны скрыгат, просьба аб літасці. Хутка ўсё было скончана. Партызаны не страцілі ніводнага байца, а фашыстаў знішчылі ўсіх.

У Гламаздзіна аперацыя пачалася няўдала – фашысты заўважылі партызан яшчэ на подступах, зачыніліся на ўсе засаўкі і адкрылі праз вокны агонь з вінтовак і аўтаматаў. Прыйшлося схавацца за грузавіком, што стаяў за 25 – 30 метраў ад штаба. Гламаздзін папрасіў дапамогі ў групы Фёдарава. Фёдараў падбег да грузавіка і запытаў:

– У каго ёсць гранаты з запалам?

Партызан Борд падаў яму адразу дзве. Праз два скачкі Фёдараў апынуўся ля хаты, з вокан якой ляцелі трасіруючыя кулі. Падабраўшы зручны момант, Фёдараў кінуў гранаты ў акно. Страляніна спынілася, пачуліся стогны, а потым наступіла цішыня. Штаб быў разгромлены. Партызаны ўзламалі

дзверы склада з харчаваннем, пагрузілі на тры параконкі прадукты, абмундзіраванне, пасцельныя прыналежнасці, сабралі трафейную зброю і тут жа выдалі яе бяззбройным партызанам. Пастроіліся і ўслед за падводамі адправіліся на базу.

Але на базе было толькі некалькі байцоў, астатніх Асташонак павёў нібы на аперацыю па разгрому Докшыцкага гарнізона. На самай справе ён стараўся пазбегнуць сустрэчы з карнікамі, якія пачалі прачосваць партызанскую зону. З атрадам Асташонка пайшлі Цімохін і астатнія былыя ваеннапалонныя, што ўцяклі з Масюкоўшчыны. Неўзабаве Цімохін вярнуўся на базу і расказаў, што Асташонак адвёў атрад на які кіламетр адсюль, абʼявіў прывал і загадаў размяшчацца на начлег.

– Ісці ноччу небяспечна: можна нарвацца на засаду, – заявіў ён. – Рушым заўтра на світанні.

– Нашы хлопцы, – працягваў Цімохін, – паслалі мяне да вас за парадай: ці трэба нам ісці з Асташонкам? Мы моцна сумняваемся, што ён павядзе атрад на Докшыцы. Нам здаецца, што ён проста ўцякае ад карнікаў. Але чаму ён пакінуў вас тут?

– Мне здаецца, што Асташонак вас проста падмануў, – заўважыў Фёдараў. – Ніякай аперацыі ён праводзіць не будзе, бо да яе зусім не рыхтаваўся.

– Асташонак, як я пераканаўся, – баязлівец і карʼерыст, – са злосцю вымавіў Лунін. – Ён бяжыць ад карнікаў, а як карʼерыст пастараўся пазбавіцца ад нас, бо ўбачыў у нас сваіх супернікаў. Ён толькі загубіць атрад. Няхай Цімохін вернецца і шапне нашым хлопцам, каб яны ішлі сюды.

– Я ўношу прапанову стварыць свой атрад, – сказаў Фёдараў. – Збяром сваіх хлопцаў і неадклад-

на пойдзем адсюль. Мне гэты лес не падабаецца: тут добра адседжвацца, а не ваяваць. Каб напасці на боўблінскі гарнізон, мы павінны былі двое сутак ісці туды і двое – назад. Па дарозе мы спыніліся на адпачынак у лесе непадалёку ад вёскі Манылы, і тое месца найбольш падыходзіць для дыслакацыі новага нашага атрада: там суха і чыста. Ад яго да шашы Мінск–Маладзечна не больш як 14 кіламетраў, да дарогі Мінск–Полацк яшчэ бліжэй. Можна кожны дзень мініраваць дарогі і наладжваць засады.

Цімохін адправіўся за хлопцамі ў атрад Асташонка, а Фёдараў і Лунін яшчэ доўга абмяркоўвалі дэталі арганізацыі партызанскага атрада. Пад раніцу вярнуўся Цімохін, з ім прыйшлі Кудрын, Фогель, Петракоўскі, Вінаградаў і іншыя – усяго 8 чалавек. Вырашылі дзень пабыць у Руднянскім лесе, а вечарам адправіцца ў Манылы. Папярэдні дзень надарыўся ясным і цёплым: такія бываюць звычайна на канцы красавіка. Пасля халоднай зімы яны здаюцца асабліва прыемнымі, хочацца, каб яны не заканчваліся.

Нарэшце пачало змяркацца, і група стала збірацца ў дарогу. Карнікі, якія ўвесь дзень ездзілі па перыметры лесу па дарогах і бесперапынна стралялі, адправіліся ў гарнізоны, і можна было бесперашкодна выходзіць з базы. Раптам з боку Пуцілава застрачылі кулямёты і аўтаматы, пачуліся разрывы мін ці гранат. Сумнення не было: атрад Асташонка сутыкнуўся з карнікамі. Хлопцы паімкнуліся бегчы на дапамогу, але, прабегшы некалькі кіламетраў, пачулі, што страляніна змоўкла. У неба ўзняліся чорныя клубы дыму: стала ясна, што фашысты падпалілі вёску Пуцілава.

Фёдараў прапанаваў застацца на базе да раніцы, каб сустрэць тых партызан Асташонка, якія, магчыма, выратуюцца і вернуцца сюды. Сярод іх могуць быць параненыя, якім спатрэбіцца дапамога. Так і здарылася: раніцай прыбег амаль у беспамяцтве Рашэўскі, падабралі цяжка параненага палітрука Федасеева, днём прыйшлі Ілля Худзякоў, Вася Лашын, Вера Верхаводзька і многа іншых. Яны з вялікім абурэннем расказалі пра тое, як Асташонак і Ганс падставілі іх пад агонь фашыстаў. На адным з чарговых прывалаў яны пайшлі нібы ў чарговую разведку і не вярнуліся, а неўзабаве на атрад наляцелі карнікі.

– Цэлы дзень учора мы ішлі, прайшлі 10 кіламетраў: 10 мінут ідзём, а пасля добрую гадзіну ляжым на прывале, – расказваў сяржант Худзякоў. – Асташонак і Ганс пайшлі на разведку ў вёску Пуцілава. І як толькі яны схаваліся, на нас абрушыўся град кулямётных і аўтаматных куль. Палітрукоў Борда і Іванова ды яшчэ чатырох партызан забіла на месцы, а астатнія кінуліся ўрассыпную, многія нават не паспелі схапіць сваю зброю. Добра, што мы яшчэ не выйшлі з лесу ды пачало цямнець, а то ўсіх пастралялі б, як курапатак.

Так бясслаўна закончыў сваё існаванне партызанскі атрад, якім камандавалі капітан Асташонак і яго начальнік штаба Ганс. Пазней ад маёра Варанянскага стала вядома, што Асташонак і яго начальнік штаба нават не спрабавалі адшукаць і сабраць сваіх людзей, а пайшлі ў Бярэзінскі запаведнік і там хацелі арганізаваць новы атрад. Ім удалося стварыць групу з 7 чалавек, якія толькі тым і займаліся, што здабывалі для Асташонка і Ганса прадукты харчавання, абутак і адзенне. Мясцовая

моладзь і былыя ваеннапалонныя ішлі ў тыя атрады, якія не адседжваліся, а вялі барацьбу з акупантамі.

Зімой 1942–1943 гадоў Асташонак, сабраўшы характарыстыкі ад камандзіраў іншых атрадаў, пайшоў за лінію фронту. Больш пра яго ніякіх звестак не было...

## НАРАДЖЭННЕ «ШТУРМА»

...Зранку 28 красавіка 1942 года група размясцілася ў Манылаўскім лесе на стыку Заслаўскага і Лагойскага раёнаў. Для базы выбралі месца паблізу вёсак Сярэдняе (Манылы), Кукалеўшчына, Пральня – у заходняй часцы ляснога масіву.

Увечары і ноччу партызаны пабывалі ў навакольных населеных пунктах: Жабічы, Кукалеўшчына, Сярэдняе, Трусавічы, Доўбатава, Вожыкі. Усюды насельніцтва прымала іх гасцінна і, нягледзячы на сваё паўгалоднае існаванне, дзялілася усім, чым магло, расказвала пра дыслакацыю варожых гарнізонаў, указвала, дзе ёсць паліцаі і здраднікі, людзі ахвотна давалі характарыстыку старастам і пісарам валасных упраў.

Пры кожнай валаснай управе былі пункты па зборы малака, масла, яек, сала. І, каб не папрашайнічаць і не абіраць насельніцтва, напярэдадні 1 Мая атрад разграміў Бясядскую і Шаршунскую валасныя ўправы, разагнаў стараст і пісараў, знішчыў усе дакументы, пабіў сепаратары на малочных пунктах. Партызаны раздалі насельніцтву многа тысяч штук яек, сотні кілаграмаў смятаны і масла, забралі сабе неабходную

колькасць прадуктаў. Адначасова праводзілі гутаркі пра становішча на фронце, прапанавалі не здаваць падаткі і паведамляць партызанам пра дзеянні акупантаў і іх памагатых – здраднікаў.

Першага мая палітрук Фёдараў правёў улік камуністаў і камсамольцаў. Камуністаў аказалася ўсяго 4 чалавекі і адзін кандыдат у члены партыі. Сабралі партыйны сход, на якім Фёдарава абралі сакратаром партарганізацыі, а на адкрытай частцы сходу – камісарам атрада. Луніна абралі камандзірам, а Іосіфа Фогеля – начальнікам штаба. З гэтага дня і пачаліся рэгулярныя баявыя аперацыі новага атрада. Ужо 3 мая партызаны разграмілі варожы гарнізон у Раёўцы і вывелі са строю фабрыку па вытворчасці асвятляльных ракет.

У маі–чэрвені баявыя аперацыі ішлі адна за адной амаль бесперапынна. Партызаны разграмілі ахову дзяржаўнага маёнтка «Бахшты», разбілі спіртзавод у Новым двары, каля вёскі Лашаны Заслаўскага раёна пусцілі пад адхон варожы эшалон з баявой тэхнікай і боепрыпасамі, з засады на шашы Мінск–Маладзечна ружэйна-вінтовачным агнём падбілі і спалілі дзве аўтамашыны. Было забіта 29 гітлераўцаў.

Грамілі валасныя ўправы ў Мінскім, Заслаўскім, Лагойскім і Радашковіцкім раёнах. Вялікая тэрыторыя гэтых раёнаў была вызвалена ад акупантаў, насельніцтва гэтай зоны не плаціла падаткаў, не выконвала ніякіх павіннасцей, за дапамогай і парадамі звярталася да сваіх вызваліцеляў.

– Вось гэта дык партызаны: сапраўдныя байцы-штурмавікі – штурмуюць і штурмуюць! – гаварылі ў навакольных вёсках.

Так сам народ падказаў назву новаму атраду – «Штурм». Слава пра новы атрад распаўсюдзілася далёка за межы яго дзейнасці, і ў яго не толькі пайшло мясцовае насельніцтва, акружэнцы Чырвонай Арміі і былыя ваеннапалонныя, але сталі далучацца і іншыя дробныя атрады, якія дзейнічалі дагэтуль самастойна. Толькі ў чэрвені ў «Штурм» уступілі групы Уладзіміра Праслава, Мікалая Гарачава, Васіля Краўчанкі, Валянціна Багданава, Сямёна Кулаковіча. З маладзечанскага канцлагера ў атрад прыйшла група былых ваеннапалонных на чале з сяржантам Захарыем Цыклаурыя.

Паступова атрад «Штурм» ператварыўся ў вялікае партызанскае падраздзяленне. Камандаванне «Штурма» за кароткі тэрмін здолела наладзіць воінскую дысцыпліну, узорна паставіла штабную работу, і атрад стаў баяздольнай воінскай часцю. І душой усіх гэтых пераўтварэнняў быў несумненны лідар, сапраўдны камісар Ілля Фёдараў.

Дзякуючы сваім маральным якасцям, прыроднай мудрасці Фёдараў стаў душой выхаваўчай і палітычнай работы ў атрадзе, а пасля і ў брыгадзе. Да яго цягнуліся людзі, і ён разумеў іх нават нявыказаныя думкі і няпэўныя памкненні, умеў разгаварыць чалавека, параіць яму выйсце з самага, здавалася б, тупіковага становішча. Таму і нядзіўна, што камісар быў адной з вышэйшых неаспрэчных інстанцый, да каго звярталіся і з просьбамі, і за парадай ці канчатковым вырашэннем складаных жыццёвых пытанняў.

...У чэрвені ў атрад «Штурм» прыбыла дыверсійна-разведвальная група Генеральнага штаба Чырвонай Арміі пад камандаваннем капітана Васіля Шчарбіны. У групе было 14 чалавек.

Разведчыкі ішлі ў Налібоцкую пушчу і спынілася ў атрадзе на адпачынак. Налібоцкая пушча была найбольш зручным і бяспечным месцам для прыёму самалётаў з Вялікай зямлі. Аб'ектам разведкі і дыверсій групы Шчарбіны быў Мінск і камунікацыі Брэст–Мінск і Вільнюс–Мінск.

У групе Шчарбіны была рацыя, і ён адразу загадаў разгарнуць яе для чарговага сеанса сувязі з Цэнтрам. Калі сеанс закончыўся, Васіль Васільевіч падаў Фёдараву лісток з тэкстам. Гэта была клятва партызана. Ілля Мартынавіч адразу перапісаў яе і загадаў пастроіць асабовы састаў атрада. Ён пачаў уголас урачыста чытаць тэкст, і над лясной палянай загучалі словы, поўныя патрыятызму і адданасці: «Я, грамадзянін Савецкага Саюза, уступаючы ў рады чырвоных партызан...» – і шматгалосае рэха далёка разносіла ўрачыстыя словы клятвы на вернасць Радзіме. Твары партызан суровыя і рашучыя, абстаноўка – сама ўрачыстасць.

Пазнаёміўшыся з дзейнасцю «штурмаўцаў», капітан Шчарбіна прыйшоў у захапленне і не хаваў сваёй радасці. У «Штурма» ўжо дзейнічала даволі шырокая сетка агентурнай разведкі ў гарнізонах Мінска, Заслаўя, Радашковіч, Лагойска, партызаны набылі немалы вопыт дыверсій на камунікацыях праціўніка. Але ў іх не было рацыі, сувязі з Масквой, і каштоўныя разведданыя і вынікі баявых дзеянняў яны нікому не маглі перадаць. І Шчарбіна хутка за гэта ўхапіўся:

– Ды ці ведаеце вы, як патрэбны гэтыя звесткі Генеральнаму штабу Чырвонай Арміі! – усклікнуў ён.

І адразу ж са згоды камандавання атрада перадаў па рацыі Разведупру Генштаба звесткі пра мінскі гарнізон, пра дыслакацыю, найменні

і нумарацыю там воінскіх часцей, пра рух праціўніка па камунікацыях Мінск–Вільнюс. Пасля Шчарбіна папрасіў, каб пад яго камандаванне наогул перадалі лепшых партызанскіх разведчыкаў на станцыі Мінск і ў гарнізоне. За гэта ён паабяцаў дапамагаць атраду «Штурм» зброяй і боепрыпасамі. Шчарбіна запэўніў камандаванне «Штурма», што ваенныя грузы будуць паступаць у атрад рэгулярна, як толькі яго група прыйдзе ў Налібоцкую пушчу і абсталюе там пасадачную пляцоўку.

Не толькі камандаванне атрада, але і ўвесь асабовы састаў усрыняў гэта з вялікай радасцю: партызаны цепер могуць непасрэдна дапамагаць Чырвонай Арміі і фактычна становяцца яе састаўной часткай. Капітан Шчарбіна стаў рэгулярна перадаваць у Маскву весткі пра баявыя дзеянні партызан і абяцаў рабіць гэта і з Налібоцкай пушчы. Дамовіліся трымаць з ім пастаянную сувязь праз спецыяльных конных ці пешых сувязных. І, нягледзячы на вялікую адлегласць паміж базай партызан і Налібоцкай пушчай, сувязь была рэгулярнай.

Кожны раз да Шчарбіны паступалі разведданыя і звесткі пра вынікі партызанскай баявой дзейнасці, а адтуль атрымлівалі новыя спецыяльныя заданні разведцэнтра. Аднак абяцаных ваенных грузаў доўга не было. Шчарбіна кожны дзень атрымліваў радыёграму: «Самалёт вылятае, распальвайце вогнішча». Агонь распальвалі, але самалёты не прылялалі. Не было іх у чэрвені, ліпені, і камандаванне атрада «Штурм» у жніўні нават адклікала свайго прадстаўніка з пушчы, але амаль услед за гэтым у атрадзе з'явіўся пасыльны ад Шчарбіны з запіскай.

Васіль Васільевіч пісаў: «Прыляцеў "Дуглас". Скінуў шэсць мяшкоў грузаў і другога радыста. Сёння раніцай сабралі і прывезлі на базу. Масква прыслала ўсё, што вы прасілі. Нават газеты прыслаць не забыліся. Шліце за грузам чалавек 15 з рэчавымі мяшкамі, бо далёка і больш як 15 кілаграмаў кожны не возьме. 14 жніўня 1942 г. Баця».

Шчарбіне не споўнілася і 25 гадоў. Але ён адпусціў вялікую чорную бараду, быў нетаропкім, ураўнаважаным і таму выглядаў сталым чалавекам. Ён лічыў сябе верным вучнем палкоўніка Г. М. Лынькова – аўтара кнігі «Вайна ў тыле ворага», імкнуўся ва ўсім быць да яго падобным, нават падпольны псеўданім узяў у Лынькова.

У той жа дзень, калі атрымалі запіску Шчарбіны, у дарогу з атрада адправіліся на чале з Фёдаравым начальнік штаба Фогель, камандзір дыверсійнай групы Кулаковіч, начальнік разведкі Кудрын і іншыя – усяго 15 чалавек. Ішлі лясамі і балотамі, абміналі населеныя пункты. На трэці дзень былі ўжо ў «Барадача», як партызаны называлі Васіля Шчарбіну. Адпачыўшы двое сутак і атрымаўшы груз, адправіліся ў зваротны шлях. Але не ўсе. Шчарбіна ўгаварыў перайсці да яго ў групу капітана Кудрына, і той згадзіўся. Да «Барадача» пастаянна ішлі людзі з просьбай прыняць іх у атрад. Але ён не хацеў, каб яго група моцна разраслася, і таму стварыў асобны атрад, камандзірам якога і быў прызначаны Кудрын.

Не паспелі партызанскія «грузаношы» вярнуцца на сваю базу, як там атрымалі новую запіску ад Васіля Васільевіча пра тое, што прыбыў яшчэ адзін самалёт з грузам. Давялося адпраўляць у пушчу новую групу. Аднак, калі партызаны прыйшлі за грузам, Шчарбіны сярод жывых ужо, на вялікі жаль,

не было. Ён загінуў на інструктыўных занятках, на якіх вывучалі будову і спосаб прымянення міны-рапіды. Заняткі праводзіў сам камандзір, і нечакана рукавом зачапіў кантактны замыкальнік рапіды, якая ўзарвалася разам са скрынкай толу, што стаяла побач. Васіль Шчарбіна быў забіты, а многія партызаны-падрыўнікі з суседніх атрадаў, якія прыйшлі на інструктаж, аказаліся цяжка параненымі.

Так выпадкова загінуў мужны патрыёт, выдатны арганізатар партызанскага руху. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а памяць пра маёра Васіля Васільевіча Шчарбіну навечна захоўваецца ў Беларусі: адна з цэнтальных вуліц раённага цэнтра Валожына названа ў яго гонар. Пасля гібелі камандзіра спецгрупу ўзначаліў яе камісар Давід Кеймах («Дзіма»).

Кеймах са сваёй групай неўзабаве перадыслацыраваўся зноў у Руднянскі лес і падпарадкаваў сабе не толькі «Штурм», але і суседнія партызанскія атрады, і нават тыя, што знаходзіліся ў Івянецкай пушчы. Так узнікла асобае аб'яднанне партызанскіх атрадаў (ААПА). «Дзіма» паставіў задачу «Штурму» займацца толькі разведкай. Але атрад па-ранейшаму праводзіў баявыя дзеянні, ды так вынікова, што слава пра грозных баяздольных народных мсціўцаў разносілася далёка па наваколлі, і гэта прыцягвала ў «Штурм» нават іншаземцаў.

## ІНШАЗЕМЦЫ Ў ПАРТЫЗАНСКІХ РАДАХ

Асабліва ярка праявіліся педагагічныя выхаваўчыя камісарскія здольнасці Іллі Мартынавіча

ў рабоце з іншаземнымі грамадзянамі, якія дызерціравалі з вермахта, пераходзілі на бок партызан і пасля гераічна змагаліся ў радах народных мсціўцаў. Пра іх у пасляваенны час з вялікай цеплынёй успамінаў як пра верных баявых сяброў і пабрацімаў былы партызанскі брыгадны камісар. І пачуцці гэтыя былі ўзаемнымі: былая партызаны-іншаземцы з павагай і цеплынёй ставіліся да свайго камісара, некаторыя з іх прыязджалі ў Беларусь на традыцыйныя пасляваенныя партызанскія сустрэчы.

У жніўні 1942 года ў атрадзе «Штурм» з'явіліся шаснаццацігадовыя паляк Эдмунд Эрнст, літовец Франц Станкявічус (Францішак Станкевіч) і былы ваеннапалонны Іван Саламахін, які збег з Гданьскага канцлагера. Эрнста насільна мабілізавалі і прывезлі адбываць працоўную павіннасць у горад Гданьск на чыгуначна-рамонтны завод. Вось як пра гэта Эдмунд расказаў у сваіх успамінах.

«...Мяне разам з групай іншых жыхароў Торуня, Вэбжэзна і Грудзёндза прывезлі ў Гданьск 21 красавіка 1942 года. Працаваць прыйшлося ў электратэхнічным цэху, дзе апроч некалькіх немцаў, якія займалі пасады майстроў, было многа рускіх, беларусаў і палякаў. Нягледзячы на малы ўзрост – мне было толькі 15 гадоў, – я добра ведаў нямецкую мову і перакладаў сваім калегам загады майстроў. Часта за такой жа дапамогай звярталіся да мяне і расіяне, хаця ведаў я небагата рускіх слоў.

Праз месяц мяне выклікалі да кіраўніка аддзела кадраў Ёрга. Ён запытаў, адкуль я ведаю рускую мову. Адказаў яму, што ведаю яе вельмі слаба – толькі некалькі слоў. Ёрг закрычаў на мяне, каб не адпіраўся, бо ў яго ёсць інфармацыя ад майстра цэха, што ён аддае загады расіянам толькі праз мяне.

У канцы размовы Ёрг паведаміў, што прызначае мяне перакладчыкам і да маіх абавязкаў на тэрыторыі завода ўваходзяць усе справы, звязаныя з рускімі. Так я зблізіўся з людзьмі, якіх жорстка эксплуатавалі, мардавалі і ўсяляк прыгняталі.

Расіяне, хаця і ведалі, што я паляк, спачатку не вельмі мне давяралі. Пачалі мяне правяраць і выпрабоўваць. Рабілі гэта цікавым спосабам, захоўваючы вялікую асцярожнасць. Падыходзіў да мяне які-сьці абдзёрты і змардаваны рускі, выцягваў з лахманоў кішэнны гадзіннік маркі "Кіраў" і прапаноўваў мне яго за кілаграм хлеба. Хвіліну я глядзеў на свайго суразмоўцу, пасля прынёс буханку хлеба і аддаў яму, сказаўшы, каб гадзіннік ён схаваў на горшыя часы. Праз некалькі дзён іншы расіянін прапанаваў за хлеб залаты царскі пяцірублёвік. І гэтай прапановы я не прыняў, але хлеб даў...»

А далей падзеі разгортваліся, як у кіно. Адным вечарам да Эдмунда – рускія яго называлі Эдзікам – падышоў рускі Захар'еў і стаў распытваць яго, адкуль ён родам, колькі яму гадоў і яшчэ пра многае іншае. Пад канец Захар'еў нечакана спытаў:

– Ці любіш ты, Эдзік, фашыстаў?

– А ты, Захар'еў, іх любіш? – пытаннем адказаў Эдмунд.

– Вельмі іх, погань, ненавіджу.

– Я стаўлюся да гэтай дрэні гэтак жа, – зазначыў Эдмунд.

Захар'еў пасля гэтых слоў моцна пацiснуў руку Эрнсту і пачаў расказваць пра сваю Бацькаўшчыну, пра вераломны напад гітлераўцаў, пра тое, як яны палілі і нішчылі гарады і вёскі, мардавалі і забівалі нявінных людзей. Нарэшце ён сказаў, што ўжо даў

свінцу праклятым катам і дасць яшчэ. Спадзяецца ўцячы адсюль і трапіць у партызаны, якія змагаюцца на тэрыторыі Расіі, і ён ведае, дзе іх дакладна шукаць, бо быў сувязным партызанскай брыгады пад Смаленскам. Каб здзейсніць задуманае, Захар'еў папрасіў раздабыць два камплекты грамадзянскага адзення.

Справа аказалася не вельмі лёгкай: купляць адзенне ў магазінах не выпадала, бо тут патрабавалі крэдытныя карты, якіх у паднявольных рабочых не было. Выручыў выпадак. Эрнста зноў выклікалі да Ёрга. Ён якраз заканчваў сняданне: на дэсерт еў тонкую лустачку хлеба, намазаную тоненькім слоем штучнага мёду. Эдмунд заўважыў яму, што пчаліны мёд лепшы за штучны, і калі Ёрг дасць яму два дні водпуску, то Эрнст прывязе цэлы фунт сапраўдага мёду і яшчэ што-небудзь на дадатак.

Хцівы Ёрг даў сябе злавіць на мёд і адпусціў Эрнста не не два, а на тры дні, уручыўшы яму білет на прад'яўніка, прыгодны да свабоднага праезду па чыгунках у межах Данцыга і Кёнігсберга. Дзякуючы дапамозе бацькі праз тры дні Эдмунд прывёз усе патрэбныя рэчы: двое штаноў, два пінжакі, кашулі і дзве шапкі. Ёрг атрымаў абяцаны мёд, дзясятак яек і чвэртку масла. Быў вельмі рады і прапанаваў Эрнсту як мага часцей карыстацца адпачынкамі.

Праз тыдзень Захар'еў са сваім таварышам уцяклі з лагера. На развітанне Захар'еў прывёў да Эдмунда расіяніна па прозвішчы Саламахін і сказаў:

– Эдзік, гэта харошы хлопец, гэта наш чалавек!

З гэтай пары з Саламахіным Эдмунд вёў доўгія шчырыя размовы, у ходзе якіх яны ўзгаднялі свае планы. Праз некалькі тыдняў Павел прывёў літоўца Францішка Станкевіча і заўважыў:

– Станкевіч, як і я, таксама камсамолец.

Пад канец ліпеня Саламахін сказаў, што не можа больш сваёй працай дапамагаць Гітлеру і задумаў уцячы на Беларусь, да партызан і забірае з сабою Станкевіча. Гаворачы гэтыя словы, уважліва глядзеў у вочы Эрнста і чакаў яго рэакцыі. Эдмунд адказаў, што ўцячэ разам з імі. Толькі трэба дакладна ўсё абдумаць і скласці план уцёкаў, каб не трапіць у пастку. Вырашылі раздабыць чыстыя бланкі дакументаў, з якімі можна было б свабодна перамяшчацца па акупіраванай тэрыторыі.

З гэтай мэтай Эдмунд зноў пайшоў да Ёрга прасіць кароткачасовага водпуску. Ёрг ахвотна згадзіўся, бо Эрнст паабяцаў яму акрамя масла, яек і мёду прывезці свінога сала. Тут зазваніў тэлефон, і Ёрг пасля кароткай размовы сказаў Эдмунду пачакаць, а сам выйшаў з пакоя. Надышла шчаслівая мінута, і хлопец скарыстаў яе. На століку ляжалі розныя пячаткі і чыстыя бланкі дакументаў. Эдмунд хуценька паставіў адбіткі на бланкі і схаваў іх у кішэнь. Чакаць давялося даволі доўга. Нарэшце Ёрг вярнуўся і ўручыў Эрнсту білет і загадаў яму быць праз тры дні «mit Butter, Spek und Eier».

Але гэтым разам апетыт Ёрга застаўся неспатоленым, бо Эрнст і яго таварышы ў лагер больш не вярнуліся. Яны з дапамогай ёргаўскіх дакументаў дабраліся ў Вільнюс, дзе Станкевіч спадзяваўся ўстанавіць сувязь з мясцовым падполлем. Задума не ўдалася, і сябры рушылі цягнікам на ўсход. У Маладзечне выйшлі з поезда – асцерагаліся праверкі дакументаў – і пешшу падаліся ў партызанскую зону. У вёсцы Курневічы, што непадалёку ад Рогава, іх сустрэлі партызанскія разведчыкі Павел Цімохін і Мікалай Рашэўскі.

У адносінах да незнаёмых людзей партызаны былі вельмі асцярожныя, бо адным з метадаў барацьбы супраць народных мсціўцаў быў засыл у атрады шпіёнаў і агентаў фашысцкай разведкі і контрразведкі – абвера і гестапа. І хаця Станкевіч і Саламахін прад'явілі моцна пашкоджаныя камсамольскія білеты, цэлы тыдзень іх правяралі і не выпускалі з-пад нагляду. З Эдмундам і яго таварышамі неаднаразова гутарыў Ілля Фёдараў. Праверыць праўдзівасць іх расказаў было немагчыма, і зноў інтуіцыя, уменне разбірацца ў людзях падказалі камісару, што хлопцы – не ворагі і шчыра імкнуцца ваяваць з фашыстамі.

Да вызвалення Беларусі сябры адважна змагаліся ў радах лясных салдат, былі храбрымі і ўмелымі байцамі. Саламахін неўзабаве загінуў, а Эдзік і Франц аказаліся любімцамі атрада. Франц стаў непрыкметным радавым байцом, а Эдзік быў падлеткам вясёлага нораву, жартаўніком, і яго добра ведалі не толькі партызаны, але і мясцовыя людзі. Яго часта запрашалі ў штаб у якасці перакладчыка, калі траплялі палонныя або добраахвотнікі: немцы, аўстрыйцы ці галандцы. Эдзіку часта даручалі вывучыць, праверыць перабежчыка, і хітры вясёлы хлопчык хутка спраўляўся і ніколі не памыляўся ў сваіх высновах. Да таго ж ён аказаўся незаменным разведчыкам.

Эдмунд Эрнст пасля вызвалення Беларусі атрымаў высокія дзяржаўныя ўзнагароды – ордэн Чырвонай Зоркі і медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» першай ступені. Ён да канца вайны быў салдатам адроджанага Войска Польскага і ў саставе разведвальнай парашутна-дэсантнай групы «Волга» здабываў важныя звесткі для

Чырвонай Арміі. Узнагароджны вышэйшым ордэнам ПНР – сярэбраным крыжам «Віртуці мілітары», яшчэ адным ордэнам Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Пасля вайны ён часта прыязджаў на традыцыйныя сустрэчы байцоў брыгады «Штурмавая», у якой атрымаў сур'ёзную ваенную падрыхтоўку, спасцігнуў навуку партызанскай вайны, што вельмі прыдалася яму ў разведвальна-дэсантнай групе «Волга».

...У канцы жніўня ў атрад «Штурм» на грузавой аўтамашыне прыехаў галандзец Рымальд дэ Юнг. Ён служыў асабістым шафёрам каменданта горада Маладзечна. Палкоўнік, якога вазіў дэ Юнг, вызначаўся крутым норавам. Перакананы нацыянал-сацыяліст, фашыст да мозга касцей, ён пагардліва ставіўся не толькі да мясцовага насельніцтва, але і да сваіх падначаленых, з усіх сіл выслужваўся перад гаўляйтарам Кубэ – катам беларускага народа. Аднойчы за нейкую правіннасць ён загадаў жорстка пакараць ацяпляльніка: мужчыну ў 30-градусны мароз раздзелі і палівалі вадой да таго часу, пакуль ён не ператварыўся ў ледзяную статую.

У хвіліны рэдкага добрага настрою камендант дазваляў сабе загаварыць са сваім шафёрам. Рымальд дэ Юнг у час такіх каменданцкіх маналогаў даведаўся ад шэфа, што у ваколіцах Мінска дзейнічае буйная «банда», як камендант называў партызан, і гаўляйтар загадаў знішчыць яе. Карная аперацыя павінна была пачацца праз некалькі дзён, і Рымальд вырашыў папярэдзіць партызан.

Думка перайсці на іх бок выспявала даўно, а жорсткае, нечалавечае пакаранне ацяпляльніка з'явілася штуршком да гэтага смелага і небяспечнага рашэння. Каталізатарам жа была небяспека, якая

навісла над дэ Юнгам з-за кар'ерных памкненняў рыжага Рауля Ляўфмана, які ўвесь час прыдзіраўся. Раней ён пагражаў данесці, што Рымальд – камуніст, і нават вымагаў за сваё маўчанне грошы. Але Рымальд на правакацыі не паддаваўся, хаця ведаў, што Ляўфман – тыповы фашыст і здольны на ўсякую подласць, каб зрабіць кар'еру. Ён даўно марыў сесеці за руль легкавушкі, на якой ездзіў камендант.

Але за гэтым рулём сядзеў галандзец дэ Юнг, якому ніякая кар'ера як іншаземцу не свеціць. Трэба пазбавіцца ад гэтага агіднага камуніста. І Ляўфман настрачыў данос каменданту на Рымальда, што «асабісты шафёр гера каменданта – камуніст, звязаны з бандытамі і ноччу ездзіць у лес». А Рымальд і сапраўды часта адлучаўся з батальёна, да якога быў прыпісаны, але ездзіў не да партызан. У драбналессі паміж Радашковічамі і пасёлкам Ілля размяшчаўся сямейны лагер радашковіцкіх яўрэяў. З адной сям'ёй з гэтага лагера і пазнаёміўся Рымальд. У ёй жыла прыгажуня Сара, у якую адразу закахаўся дэ Юнг. Вось да яе начамі і мчаўся галандзец.

Камендант не паверыў Ляўфману: вельмі не падобны быў спакойны і добрасумленны Рымальд на бандыта. Усё ж ён выклікаў дэ Юнга на допыт. Але весці допыт ён не ўмеў, толькі нагрубіў і, нічога не дабіўшыся ад Рымальда, нечакана загадаў:

– Ідзі заводзь машыну, паедзем у Мінск! Ды хутчэй, спазняемся!

Па дарозе камендант, адчуўшы сваю віну перад шафёрам, буркнуў пад нос:

– Ты прабач мне, пагарачыўся. Гэты Ляўфман, здаецца, вялікая сволач.

Прыехалі ў Мінск. Вось і камісарыят. Рымальд плаўна пад'ехаў да параднага пад'езда і, як заўсёды,

выскачыў з машыны і расчыніў дзверцы шэфу. Той падзякаваў шафёру і сказаў:

– Тры гадзіны можаш пагуляць па горадзе.

Рымальд з палёгкай уздыхнуў. Яму, здаецца, удалося на нейкі час заспакоіць падазрэнні каменданта. І ўсё ж трэба было ўцякаць. І Рымальд вырашыў шукаць партызан. Ён перасеў з «Опеля» на грузавы «Форд» і паехаў у Жукаўку. Са слоў каменданта ён прыблізна ведаў, дзе шукаць «бандытаў», і прыехаў у гэту вёску. Тут яго і сустрэлі партызанскія разведчыкі Арлоў і Гарачаў.

Яны прывялі перабежчыка ў вёску Манылы, у штаб. Ілля Мартынавіч доўга і неаднаразова гутарыў з Юнгам. Перабежчык назваўся галандскім камуністам, прасіў паверыць у шчырасць яго памкненняў, залічыць у баявы строй. Фёдараў рашыў выпрабаваць яго і даў заданне прывезці з мінскага гета ў атрад яўрэяў. Калі Эдзік пераклаў яму змест задання, ён весела ўсклікнуў:

– Зэр гут, пріма, карашо!

Развярнуў машыну і на вялікай хуткасці паехаў. Праз два дні ён прывёз 17 яўрэяў – трое мужчын, а астатнія – жанчыны. Камандаванне было перад фактам: хочаш ці не – прымай іх у атрад. У гэтай групе маглі аказацца правакатары і здраднікі. Сам шафёр па-ранейшаму заставаўся загадкай: шпіён нават з большай лёгкасцю мог выканаць такое заданне. Доўга ламалі галовы над тым, што рабіць з перабежчыкам і групай яўрэяў. І Фёдараў нарэшце прапанаваў:

– А давайце створым новы атрад і ўсю гэту групу накіруем туды. Падбяром талковага камандзіра, камісара, начальніка штаба, некалькі нашых лепшых правераных таварышаў адправім туды, і няхай ваююць.

Прапанову аднадушна прынялі. Да гэтага часу ў атрадзе «Штурм» налічвалася ўжо звыш 120 партызан і партызанак, таму без цяжкасці выдзелілі шэсць сваіх байцоў для новага атрада, камандзірам прызначылі капітана Цяцерына, камісарам – Федасеева. Атраду далі імя «Грозны», і ён адправіўся да ўказанага яму месца дыслакацыі.

А Рымальд папрасіў дазволу паехаць яшчэ на адну аперацыю. Ён расказаў, што хаця ён і быў асабістым шафёрам каменданта, але лічыўся на службе ў пэўным воінскім падраздзяленні, якое было расквартаравана непадалёку ад Маладзечна, у вёсцы Мясата. Салдаты і афіцэры жывуць там спакойна, і ў яго выспеў план паехаць туды, і калі салдаты будуць спаць у казарме, вынесці з піраміды вінтоўкі і прывезці ў атрад. Рымальд заявіў, што ў яго там многа сяброў, ён ведае ўсе хады і выхады і таму не сумняваецца ў поспеху.

Як і ў мінулы раз, дэ Юнг крута развярнуў машыну і знік у цемры. Але на другі дзень ён не вярнуўся. У атрадзе пачалі не на жарт трывожыцца. Перадумалі ўсякае, але ніхто цяпер не дапускаў і думкі, што ён – правакатар або шпіён. Прыехаў Рымальд толькі на трэці дзень, абраслы шчаціннем, змораны і вінавата сказаў:

– Таварыш камандзір, задання не выканаў. Камендант загадаў злавіць мяне і павесіць. Вакол патрулі, але сярод іх – мае сябры. Яны мяне папярэдзілі... Прывёз радыёпрыёмнік і тытунь...

Трэба было бачыць, якой радасцю засвяціліся вочы партызан, бо яны курылі ўсё, што траплялася, нават зялёны смярдзючы самасад быў вялікай раскошай. А тут духмяны сапраўдны турэцкі тытунь! У кабіне аўтамабіля быў яшчэ адзін чалавек. Рымальд

выпусціў яго з машыны і адрэкамендаваў: «Івінскі!» Чалавек трымаў у руках маленькі чамаданчык. Гэта аказаўся самаробны партатыўны радыёпрыёмнік. Івінскі проста на падножцы грузавіка пачаў настройваць сваё «апошняе слова радыётэхнікі», і неўзабаве партызаны пачулі голас Левітана.

Да гэтага часу «штурмаўцы» слухалі радыё, калі ў атрадзе спынілася разведгрупа Чырвонай Арміі, якой камандаваў капітан Васіль Шчарбіна. Пасля група пайшла на захад, і весткі з Вялікай зямлі сталі недаступнымі. Такім чынам, дэ Юнг зрабіў вялікую справу: цяпер атрад мог штодзённа слухаць Маскву. Рымальд (яго назвалі коратка – Рым) дрэнна размаўляў па-руску. Тады Эдманду Эрнсту даручылі ўсюды суправаджаць яго, і гэта пара, як Пат і Паташон, хадзіла неразлучна.

Але хутка Рым стаў разумець, а пасля і размаўляць па-руску вельмі добра і адмовіўся ад паслуг перакладчыка. Ён заявіў, што Эдзік – несур'ёзны чалавек і часта падманвае яго. Адбілася вялікая розніца ва ўзросце і характарах гэтай пары. Рым быў крыштальна сумленны, спакойны і ўраўнаважаны чалавек з вялікім жыццёвым вопытам, які не цярпеў падману і фальшы. Эдзік, наадварот, мінуты не мог пасядзець спакойна, вялікі жартаўнік і гарэза, заўсёды быў гатовы выкінуць які-небудзь фортэль, а пры неабходнасці і падмануць.

Рымальд дэ Юнг шэсць гадоў праслужыў на флоце, быў камуністам, ваяваў у саставе інтэрнацыянальнай брыгады з фашыстамі ў Іспаніі, трапіў у французскі канцлагер. Калі гітлераўцы акупіравалі Францыю і сталі з лагераў многіх палонных браць на работы, дэ Юнга адправілі ў дарожна-будаўнічую арганізацыю ТОДТ шафёрам.

Пасля ён аказаўся шафёрам маладзечанскага каменданта. Рыму часта даводзілася вазіць свайго шэфа да генеральнага камісара Кубэ, і па дарозе палкоўнік прагаварыўся, што Кубэ моцна ўшчувае яго за існаванне і дзеянні «банды», якая называецца «Штурм». І даруе яму толькі таму, што «банда» дзейнічае толькі ў Мінскім раёне.

– Таму я і вырашыў збегчы менавіта да вас, – заключыў свой аповед Рым.

Так у атрадзе «Штурм» з'явіўся адважны баец. Быў ён і разведчыкам, і падрыўніком, і кулямётчыкам. На жаль, у час апошняй блакады, прыкрываючы з кулямётам адыход сваіх таварышаў, Рымальд дэ Юнг загінуў гераічнай смерцю і навечна застаўся ў партызанскім страі на беларускай зямлі. У пасляваенныя гады па запрашэнні камісара Фёдарава родзічы дэ Юнга наведалі яго магілу, ім уручылі яго дакументы і ўзнагароды. Яны запрасілі Іллю Мартынавіча з жонкай да сябе ў госці. Да апошніх сваіх дзён камісар падтрымліваў сувязь са сваякамі свайго гераічнага партызана...

...На сустрэчы пасля вайны часта прыязджаў яшчэ адзін іншаземец, якому давялося ваяваць у «Штурмавой», – Альфрэд Цынхобль, аўстрыец. На Усходні фронт аўстрыйскі сацыял-дэмакрат Альфрэд Цынхобль трапіў у 1943 годзе ў выніку татальнай мабілізацыі. Да гэтага Альфрэд яшчэ з 1934 года знаходзіўся ў канцлагеры, як і яго саслужывец немец Герман Цынканд. Праўда, у дзеючую армію іх, нядобранадзейных, не пасылалі: баяліся, каб яны не перайшлі на бок Чырвонай Арміі. Іх накіравалі на барацьбу з партызанамі: загіне адзін-другі «палітычны» ад партызанскай кулі – страты для рэйха невялікія, на фронце ж патрэбны надзейныя салдаты.

Альфрэд Цынхобль і Герман Цынканд аказаліся ў карным батальёне ганебна вядомага Дзірлівангера, які размяшчаўся ў Лагойску. Тут у іх і выспела думка пакінуць рады вермахта. Яны знайшлі аднадумца – камандзіра свайго падраздзялення немца Леона Заўэра. А здарылася гэта так. Аднойчы Цынканд ляжаў у засадзе побач з Леонам Заўэрам. Раптам Заўэр сказаў:

– Як дрэнна пабудаваны наш свет! Мы лічым сябе культурнай нацыяй, а, як дзікія звяры, падсцерагаем рускіх, каб іх забіць. Завошта? Што дрэннае яны нам зрабілі? І, наогул, навошта мы тут, што мы тут пакінулі?

Герман спачатку падумаў, што гэта правакацыя. Але тут жа прыпомніў, што Леон ніколі не гаварыў пра свой удзел у карных экспедыцыях, не выхваляўся сваімі перамогамі, удзелам у разбоях. Наогул, ён быў не падобным на іншых. І Герман паверыў яму. У іх адразу пайшла простая і душэўная размова. Тут жа і дамовіліся перайсці да партызан. Герман сказаў, што ў яго такая дамоўленасць ужо ёсць з Альфрэдам Цынхоблем. Леон гэта адобрыў і прызнаўся, што ён камуніст, што яшчэ нядаўна быў камендантам канцлагера ў Маладзечне, але за паблажлівыя адносіны да зняволеных з пасады яго знялі, панізілі ў званні да радавога і адправілі сюды, у штрафбат да галаварэза Дзірлівангера на перавыхаванне.

Зручны момант надарыўся, калі аддзяленне, у якім служылі змоўшчыкі, 13 верасня адправілі на ахову ад партызан маста непадалёку ад Плешчаніц. На палавіне дарогі да аб'екта, у самым глухім месцы, Заўэр нечакана выйшаў са строю і скамандаваў:

– Хто згодзен са мною ісці ў партызаны – тры крокі наперад і кру-у-гом!

Цынхобль і Цынканд выйшлі і далучыліся да Леона. Астатнія схапіліся за зброю. Але трое змоўшчыкаў апярэдзілі іх: фашысты засталіся нерухома ляжаць на дарозе. Іх трупы адцягнулі ў лес і схавалі ў гушчары. Калі з нацыстамі было скончана, пайшлі шукаць партызан. Задача аблягчалася тым, што Герман Цынканд нядрэнна гаварыў па-руску. Яны сустрэліся з Паўлам Алексіевічам і Канстанцінам Макейчыкам з атрада імя Панамарэнкі.

Партызаны паслухалі іх аповед і, каб праверыць іх, запатрабавалі паказаць забітых гітлераўцаў і іх зброю. Антыфашысты з гатоўнасцю павялі партызан на тое месца, дзе нядаўна адбылася сутычка. Наўзбоч дарогі ў лесе ляжалі трупы. Доўга не маглі знайсці схаваныя ў густым ельніку вінтоўкі. Нарэшце Альфрэд Цынхобль выявіў зброю. Яе сабралі і пайшлі на базу атрада. Тут іх яшчэ раз дапрасілі камандзір і камісар і залічылі ў дыверсійную групу, камандзірам якой быў вопытны і адважны падрыўнік Уладзімір Лавец.

## КАМЕНДАНТ МАЛАДЗЕЧНА ПОМСЦІЦЬ

Сувязныя паведамілі ў штаб атрада «Штурм», што камендант горада Маладзечна валасы рваў на сабе, даведаўшыся пра дэзерцірства свайго асабістага шафёра. Добра, калі б Рымальд дэ Юнг збег дадому, але ж ён прымкнуў да лясных «бандытаў», якіх яму даручана знішчыць. Непрыемнасцей ад гаўляйтара не абярэшся! Кубэ яшчэ раней жартам папракаў яго ў спачуванні партызанам, і цяпер яго жарт набывае нежартоўны сэнс! Чаго добрага могуць і пад Сталінград паслаць. Як жа хацелася каменданту

знішчыць ненавісны «Штурм», а Рыма злавіць і павесіць.

І ён пачаў наладжваць адну карную экспедыцыю за другой. Але сіл у палкоўніка было малавата: з цяжкасцю сабраў ён і адправіў супраць партызан батальён, але экспедыцыя з трэскам праvалілася. І вось надарыўся, нарэшце, спрыяльны момант, каб раз і назаўсёды скончыць са «штурмаўцамі»: праз Маладзечна на фронт рухаўся 6-ы мотапяхотны полк. Камендат вырашыў скарыстаць сваё права, якое фюрэр даў кіраўнікам буйных гарнізонаў – пры неабходнасці прыцягваць воінскія часці, якія рухаюцца на фронт, для барацьбы з партызанамі.

У кастрычніцкі дзень 1942 года большасць байцоў атрада «Штурм» невялікімі групамі адправілася на чарговыя заданні. У штаб асобнага аб'яднання «Дзімы» паехаў і камандзір атрада Лунін. З раніцы і ўвесь дзень стаяў густы туман. Прыкладна ў дзве гадзіны дня з пасёлка Шаршуны на базу прыскакаў на сваім коніку сувязны Мікалай Уласік і паведаміў, што па дарозе на вёску Слабада прайшла калона колькасцю да 600 гітлераўцаў. На партызанскай базе заставалася не больш як 40 чалавек.

– Пры такіх суадносінах сіл уступаць у бой няма сэнсу, – сказаў начальнік штаба Іосіф Фогель. – Прапаную адступаць у лясы Лагойскага раёна.

Яго падтрымалі астатнія партызаны, якія чулі данясенне Уласіка, а Фёдараў між тым задумаўся. У яго выспеў план аперацыі, які мог прынесці лясным салдатам поспех. Кароткі і туманны дзень быў іх саюзнікам: ён даваў магчымасць зрабіць налёт на ворага там, дзе ён менш за ўсё гэтага чакаў. І камісар загадаў начальніку штаба больш дакладна

распрацаваць план аперацыі, а сам напісаў запіску і паслаў з ёй ганца ў атрад «Грозны» з заданнем зайсці ў тыл праціўніку і наладзіць засаду на вышыні Глінішча ля дарогі, што вяла на пасёлак Шаршуны. Пасля пастроіў асабовы састаў, абвясціў свой план, і атрад пайшоў на збліжэнне з карнікамі.

Як толькі выйшлі з лесу, ясна стала чуваць страляніна гітлераўскіх ваяк. Яны стралялі наўздагад, і партызанам гэта дапамагала: фашысты выяўлялі сваю дыслакацыю. Калі стрэлы сталі чуваць зусім блізка, Фёдараў з Фогелем выдзелілі групу з 16 чалавек пад камандаваннем старшыны Цімохіна і паставілі ёй задачу зайсці праціўніку ў фланг з боку Радашковіч. Але не паспела група зрабіць і двухсот крокаў, як асноўныя сілы партызан сутыкнуліся з гітлераўцамі лоб у лоб. Фашысты акапаліся на правым беразе ракі Удранкі і занялі там вышыню, а партызаны, не заўважыўшы іх у густым тумане, спусціліся з суседняй вышыні і аказаліся ў лагчыне.

Калі б яны прамарудзілі хаця некалькі хвілін, фашысты расстралялі б іх ва ўпор, і гэта імгненна зразумеў кожны.

– Ур-а-а! – партызаны рынуліся на ворага, страляючы з усёй зброі.

Адстрэльваючыся, гітлераўцы пасунуліся назад, стараючыся забраць параненых. Камандзір карнікаў капітан Моссе спрабаваў спыніць сваіх ваяк, але ўпаў пад аўтаматнай чаргой. І калі фашысты кінуліся бегчы, іх масіраваным агнём сустрэла група Цімохіна. Карнікі ў паніцы, кідаючы параненых і зброю, пабеглі на мост, але той быў ахоплены полымем і абрушыўся. Гітлерыўцы замітусіліся, а партызаны ўзмацнілі агонь, выкарыстоўваючы і трафейную зброю, і першым, хто ўдарыў з трафейнага кулямёта, быў Рымальд дэ Юнг.

Нацысты памкнуліся плыць праз раку, але і ў вадзе іх даганялі кулі. У гэты час на супрацьлеглы бераг падышлі варожыя рэзервы і адкрылі агонь з гармат і мінамётаў. Але амаль у той жа час да партызан падаспела дапамога: асобныя групы, якія раніцай пайшлі на іншыя заданні, пачуўшы гарачую страляніну, адразу ж вярнуліся. Прыйшлі на дапамогу і байцы атрада імя Фрунзэ. Цяпер сілы атакуючых узраслі, і яны спакойна сканцэнтравалі свой агонь на гарматах і мінамётах, на аўтамашынах. І хутка яны адна за адной запалалі, паступова змоўклі гарматы і мінамёты.

Рэшткі салдат ворага кінуліся ў бок Шаршун па дарозе на Новы Двор. І як толькі яны параўняліся з вышынёй Глінішча, іх накрылі кулямётным і аўтаматным агнём байцы атрада «Грозны». У вялікай паніцы гітлераўцы рассыпаліся па наваколлі, кідаючы параненых і забітых.

Багатыя трафеі падлічылі партызаны пасля гэтай пераможнай аперацыі, якая ўвайшла ў гісторыю атрада пад назвай «Удранскі бой». Баявы арсенал народных мсціўцаў папоўнілі: 45-міліметровая гармата, батальённы і 6 ротных мінамётаў, 12 ручных кулямётаў, многа вінтовак і аўтаматаў. Вораг страціў на полі бою 59 забітымі, ля вышыні Глінішча – 37, яшчэ больш было іх паранена, згарэла 5 аўтамашын з ваеннай амуніцыяй.

Радасць ад такой перамогі была азмрочана гібеллю камсамольскага важака атрада «Штурм» Мішы Шэйбака. Гэта быў вясёлы хлопец, які добра спяваў і танцаваў, таму часта нададжваў культурны адпачынак партызан. Адзіны сын у бацькоў з вёскі Малыя Бясяды, ён напярэдадні вайны закончыў педвучылішча, але лёсам яму было накавана стаць

храбрым і ўмелым палітработнікам і партызанскім разведчыкам. У апошні шлях Мішу праводзілі ўсім атрадам і пакляліся помсціць фашыстам за смерць агульнага любімца.

Акрамя гэтай вялікай страты ў партызан было яшчэ 5 параненых.

Аднак спроба маладзечанскага каменданта адпомсціць Рымальду за здраду бясслаўна правалілася. Ды гэта аказалася не адзінай няўдачай палкоўніка: неўзабаве ён і сам трапіў на мушку аўтамата свайго былога шафёра.

## ШЫРЫЦЦА ПАРТЫЗАНСКАЯ БАРАЦЬБА

...У жніўні 1942 года ў зону дзеяння атрада «Штурм» з-за лініі фронту прыбыла партызанская група пад камандаваннем старшага лейтэнанта Рыгора Гурко і камісара Івана Дубовіка. Была яна слаба ўзброена і дрэнна абмундзіравана. Група з 17 чалавек ішла са спецыяльным заданнем Цэнтральнага штаба партызанскага руху арганізаваць і разгарнуць партызанскую вайну ў Заслаўскім раёне. Калі Рыгор Гурко паведаміў пра гэта заданне камандаванню «Штурма», Фёдараў выказаў агульнае здзіўленне:

– Тут жа дзейнічае ўжо наш атрад і створаны намі атрад «Грозны», а ў паўднёвай частцы раёна ёсць і атрад імя Шчорса пад камандаваннем Станіслава Ключніка.

– Магчыма, пра гэтыя атрады ЦШПР і не ведае, – выказаў меркаванне Гурко.

Крыху паразважаўшы, Ілля Фёдараў прызнаў слушнасць такога меркавання: «Штурм» слаў

справаздачы пра сваю дзейнасць не ў партызанскі штаб, а ў Галоўнае разведупраўленне Генштаба. Ды і сам ЦШПР быў створаны толькі ў канцы мая 1942 года і яшчэ не паспеў звязацца з усімі атрадамі. Група ішла ад самых «Суражскіх варот», прабіраючыся балотамі і ляснымі сцежкамі. Гурко і яго партызаны не мелі вопыту барацьбы ў тыле ворага і сутыкнуліся з вялікімі цяжкасцямі. Дыверсіі на чыгунцы ім не ўдаваліся, і па ініцыятыве Фёдарава групе прыдалі са «Штурма» самых лепшых падрыўнікоў – Мікалая Несцяровіча, Аляксандра Сліжука, Аляксандра Шапавальскага і яшчэ некалькі чалавек.

Атраду дапамаглі ўзбраеннем і боепрыпасамі, і ён пачаў хутка расці і набірацца сілы і вопыту. Неўзабаве новаму падраздзяленню прысволі імя Фрунзэ. Так пры непасрэдным удзеле «Штурма» пачало дзейнічаць яшчэ адно партызанскае падраздзяленне, і сілы народных мсціўцаў узраслі. І гэта аказалася вельмі дарэчы, бо партызан зноў чакала «сустрэча» з фашысцкімі карнікамі.

...Агентурная разведка данесла, што паліцаі і падраздзяленні самааховы колькасцю да батальёна 26 кастрычніка 1942 года выязджаюць з Радашковіч і Заслаўя ў раён дыслакацыі партызанскіх атрадаў для правядзення карнай экспедыцыі. Камандаванне атрада «Штурм» па даручэнні штаба аб'яднання сабрала камандзіраў бліжэйшых атрадаў і распрацавала сумесную аперацыю па процідзеянні карнікам. Згодна з ёю атрад старшага лейтэнанта Гурко пры падтрымцы мінамёта, размешчанага на страсе дома Калеснікава, заняў паўднёвую паляну ў хмызняку на паўночны ўсход ад хутара і вёў назіранне за вёскай Слабодка, дзе стаяў моцны варожы гарнізон.

Капітан Цяцерын са сваім атрадам размясціўся ў засадзе на бальшаку Новы Двор – Бахметаўка сумесна з атрадам «Штурм», месца засады якога – раён вёсак Раўкуцьевічы – Шаршуны. Час выступлення на пазіцыі прызначылі на 5 гадзін раніцы. У загадзе камандавання атрада «Штурм» пра сумесную аперыцыю ўтрымліваецца і такое цікавае распараджэнне, як патрабаванне падпусціць праціўніка як мага бліжэй, каб не расходаваць дарэмна боепрыпасы: ваявалі не колькасцю, а ўменнем і майстэрствам.

Аперацыя была праведзена па плану, аказалася хуткацечнай і выніковай: карнікі панеслі цяжкае паражэнне, і нямногім з іх удалося вярнуцца жывымі ў гарнізоны...

Да фармальнага ўз'яднання ў адну брыгаду атрад «Штурм» у рамках асобага аб'яднання партызанскіх атрадаў цесна ўзаемадзейнічаў са сваімі суседзямі і часта праводзіў сумесныя баявыя аперацыі. Яскравым прыкладам такой аперацыі стаў Удранскі бой, пра які расказана вышэй. І гэта аперацыя была не апошняй. Вось толькі некалькі з іх, праведзеных «Штурмам» сумесна з іншымі атрадамі.

Пасля паражэння на рацэ Удра фашысты прыціхлі. Але пакінуць намеры знішчыць партызан гаўляйтар Кубэ не мог. Цяпер ён даручыў разграміць і знішчыць лясных салдат не маладзечанскаму каменданту, а палкоўніку Кунцэ. Апошні славіўся тым, што праяўляў «асаблівы гераізм» у барацьбе з мірнымі жыхарамі. Уварваўшыся ў вёску Мсціж Бягомльскага раёна падчас карнай аперацыі супраць партызан Барысаўска-Бягомльскай зоны, салдаты Кунцэ сагналі ўсіх вяскоўцаў у калгаснае гумно і спалілі больш як 200 старых, дзяцей

і жанчын. Такое ж злачынства яны ўчынілі ў вёсках Мрай і Волакі гэтага ж раёна.

І вось гэты канібал 17 лістапада 1942 года рушыў свае войскі супраць партызан Міншчыны. На дзень, калі карнікі пад камандаваннем Кунцэ прыбылі ў партызанскую зону, ва ўсіх атрадах налічвалася 550 народных мсціўцаў, а Кунцэ меў 6 батальёнаў і некалькі асобных рот, усяго да 6 тысяч чалавек, узброеных не толькі аўтаматамі і кулямётамі, але і гарматамі і мінамётамі. У карнікаў былі танкі і бронемашыны – усё, што прымянялася на фронце.

Войскі паявіліся вечарам з усіх напрамкаў і, ачапіўшы ўвесь лес, дзе знаходзіліся партызаны, распалілі вялізныя вогнішчы на адлегласці 50–100 метраў адно ад другога. Партызаны спрабавалі прарвацца з вогненнага кальца, але ўсе спробы не прынеслі жаданага выніку: фашысты пры кожным іх руху адкрывалі шалёны агонь.

На світанні варожыя батальёны пры падтрымцы танкаў і артылерыі пайшлі ў наступ. Яны рухаліся марудна і прачосвалі лес, нібы пад грэбень. Да позняга вечара партызаны вялі цяжкі абарончы бой і з нецярпеннем чакалі цемры, спадзеючыся ноччу прарваць кальцо акружэння. У змроку гітлераўцы спынілі наступленне і зноў распалілі вогнішчы. Партызанскія разведчыкі выйшлі ва ўсе бакі, каб знайсці месца прарыву. Неўзабаве яны вярнуліся і далажылі, што разрываў у кальцы не знайшлі. З улікам гэтага склалі новы план. Марудзіць было нельга, бо для таго, каб выйсці з акружэння і адарвацца ад пагоні, патрэбна многа часу.

Пачалі будзіць партызан, якія змучаныя боем моцна спалі. Пастроілі іх у баявыя парадкі і кожнаму атраду, асобным узводам давялі канкрэтныя месцы

прарыву. І тут прыбег адзінаццацігадовы Шура Барсук з вёскі Сярэдняя. Ён жыў і ў атрадзе «Штурм», і часта бываў у маці ў вёсцы. Днём Шура прыйшоў у свой дом. Вакол круціліся фашысты, на двары стаяла палявая кухня, гітлераўцы варылі абед. У хаце на канапе храпеў афіцэр, а на стале ляжалі яго палявая сумка, пісталет з кабурой і партупеяй. Хлопчык ціхенька ўзяў гэтыя рэчы, залез на гарышча хаты і закапаўся ў салому. І толькі ён паспеў затаіцца, як усчаўся страшэнны шум. Гітлераўцы забегалі, афіцэр моцна крычаў, лаяўся. Некалькі разоў Шура чуў, як фашысты паўтаралі: «Партызан, партызан, бандыты».

Наступіла ноч, і паступова ўсё заспакоілася. Хлопчык ціхенька разгарнуў салому на страсе і, высунуўшы галаву, агледзеўся. Асцярожна вылез на страху і па вугле хаты спусціўся на зямлю. З усіх ног пабег ён у лес, які ведаў назубок і таму мог праскочыць праз любыя заслоны і заставы. Ён прынёс з сабою палявую сумку і сказаў, што ў ёй ёсць карта і «нейкія паперы». Калі ў штабе разгарнулі карту, зразумелі, што на ёй абазначана схема карнай аперацыі, а «нейкія паперы» – гэта загад палкоўніка Кунцэ з падрабязным апісаннем усёй экспедыцыі па ліквідацыі «партызанскай банды». Загад і карта далі камандаванню народных мсціўцаў поўную інфармацыю пра ворага.

Па карце было бачна, што паміж першым і чацвёртым батальёнамі фашыстаў, якія наступалі з поўдня і паўднёвага захаду, існаваў разрыў на месцы Саўчыкава балота. Партызаны яго добра ведалі, а фашысты палічылі, што яно непраходнае, і пакінулі па-за ўвагай. Партызаны, ціхенька зняўшыся з базы, выставілі невялікую заслону

і пайшлі да балота. Падышоўшы на вызначанае месца, убачылі, што паміж вогнішчамі справа і злева ёсць каля кіламетра свабоднай прасторы. Выслалі наперад разведку і, забяспечыўшы бакавую заслону, рушылі цераз балота. Праз нейкі час партызаны аказаліся ў тыле ворага. Было каля трох гадзін ночы. Абвілі прывал, каб пачысціць адзежу, пераабуцца і крыху адпачыць.

Пакуль байцы адпачывалі, у камандавання атрада «Штурм» выспеў план напасці на 4-ы батальён гітлераўцаў, пасеяць сярод ворага паніку. З планам пазнаёмілі камандзіраў іншых атрадаў, і яны ўхвалілі яго, але папярэдзілі, што боепрыпасаў хопіць толькі на 5 мінут бою. Партызаны нечакана ўдарылі па ворагу з боку вёсак Гайдукова і Пральня, і фашысты ў паніцы кінуліся наўцёкі. Усю ноч вялі карнікі агонь, і часта па сваіх. А раніцай сабралі забітых і параненых і паспешна пакацілі ў Мінск. Атрады народных мсціўцаў адышлі ў лясы Плешчаніцкага раёна.

На другі дзень пасля ганебнага бегства Кунцэ, 19 лістапада, стала вядома пра пачатак Сталінградскай бітвы. Сабралі мітынг. Выступіў камісар Фёдараў:

– Мы вядзём агульную барацьбу супраць карычневай чумы, што паразіла чалавецтва, і наша партызанскае змаганне набывае глыбокі сэнс і значэнне, – сказаў ён. – Лясныя салдаты павінны аказваць як мага больш эфектыўную дапамогу Чырвонай Арміі, наносіць выніковыя ўдары па камунікацыях ворага, знішчаць эшалоны і аўтамашыны гітлераўцаў, якія ідуць на фронт, выводзіць са строю паветраныя і падземныя лініі сувязі Берлін – Усходні фронт. У той жа час мы павінны не даваць фашыстам і іх памагатым спакою

тут, на акупіраванай зямлі Беларусі, наносіць ім штодзённыя ўдары, сеяць паніку і страх перад немінучай расплатай...

І народныя мсціўцы з яшчэ большай сілай павялі барацьбу супраць гітлераўскіх акупантаў, з паліцэйскім збродам і рознымі нацыянальнымі фарміраваннямі фашысцкіх памагатых. Група партызан атрада «Грозны» пад камандаваннем камісара Фёдара Федасеева разграміла гітлераўскі маёнтак «Малайкі», атрады «Штурм», «Грозны» і «За Айчыну» ноччу на 12 снежня напалі на буйную нямецкую гаспадарку «Абадоўка» паблізу пасёлка Ілля Вілейскага раёна, якая ахоўвалася моцным гарнізонам гітлераўцаў.

Перамога партызанам тут дасталася амаль без бою. Паліцаі пры першых жа стрэлах разбегліся, а ўпраўляючы маёнтка обер-лейтэнант дэ Компф, галандзец па нацыянальнасці, быў захоплены ў палон. Ён толькі што вярнуўся з лазні і ў добрым гуморы сеў вячэраць, выпіў чарку рому, як раптам у дом зайшлі партызаны і скамандавалі:

– Хэндэ хох!

Ён адразу не паверыў, засмяяўся і сказаў:

– Кіньце, панове, жартаваць. Сядайце лепш да стала, я налью вам шнапс.

Обер-лейтэнант не разумеў, што здарылася, бо наперадзе групы быў Рымальд дэ Юнг, які заўсёды хадзіў у нямецкай форме і размаўляў па-нямецку. Дэ Комф зразумеў, што з ім не жартуюць, толькі тады, калі ў яго адабралі пісталет, вінтоўку, 4 гранаты і прывялі да камандзіра атрада «Штурм». На допыце галандзец не хаваў сваёй варожасці і заявіў, што ён член нацыянал-сацыялістычнай партыі, літасці не прасіў і заявіў, што загіне з гонарам, а «бандытаў» чакае суровая кара.

Акупацыйныя ўлады не маглі змірыцца з разгромам сваіх маёнткаў і гаспадарак. Каб адпомсціць партызанам, яны рабавалі насельніцтва. Гарнізоны Лагойска, Радашковіч, Казекава, Рогава і іншыя сталі нечакана нападаць на вёскі, зганяць і расстрэльваць мірных жыхароў, грабіць, забіраць скаціну. Гітлераўцы і паліцаі Лагойскага гарнізона ўварваліся ў Малыя Бясяды, аграбілі жыхароў, сагналі жанчын, старых і дзяцей, хто не паспеў схавацца ў лесе, у цэнтр вёскі і пачалі падпальваць дамы і прыбудовы. Атрад «За Айчыну», які знаходзіўся паблізу, кінуўся ратаваць Малыя Бясяды. Камандзір атрада лейтэнант Захараў паслаў сувязных за дапамогай у атрады «Штурм» і «За Радзіму».

Атрады «За Айчыну» і «За Радзіму» смела ўступілі ў бой з карнікамі, якія любой цаной спрабавалі ўгнаць вялікі абоз з награбленым дабром. Але «Штурм», падаспеўшы на месца бою, нанёс нечаканы ўдар, і фашысты пабеглі, пакінуўшы ўсё нарабаванае, забітых, мінамёт і міны, многа патронаў. Жыхары вёскі, якіх збіраліся расстраляць, і іх дабро былі выратаваны. А праз некалькі дзён лагойскія паліцэйскія пад камандаваннем свайго начальніка Голаса ўварваліся ў вёску Віпраты, забралі ў вяскоўцаў двух кароў, тры вазы зерня, мукі, адзежы і схаваліся ў Лагойску.

## РАЗГРОМ ЛАГОЙСКАГА ГАРНІЗОНА

У другой палавіне снежня ў атрад «Штурм» прыехаў камандзір суседняга атрада «За Айчыну» лейтэнанат Захараў. За сяброўскай гутаркай абмяняліся інфармацыяй пра баявыя справы сваіх

падраздзяленняў, пра абстаноўку ў сваіх зонах дзеяння. Жартам Фёдараў папракнуў госця, што той, напэўна, заключыў перамір'е з лагойскімі паліцаямі, бо тыя свабодна разгульваюць у зоне дзеяння яго атрада.

У Іллі Мартынавіча быў свой асобны рахунак да Лагойскага гарнізона. Яшчэ ў чэрвені на базе атрада «Штурм» з'явіўся незнаёмец, назваўся акружэнцам Баранавым і папрасіў прыняць яго ў атрад. Вечарам таго ж дня атрад пайшоў граміць маёнтак «Гранічы» Радашковіцкага раёна. На аперацыю «Штурм» павёў Іван Гламаздзін. З атрадам пайшоў і Баранаў. Фёдараў застаўся ў лагеры, дзе былі трое параненых і трое вартавых для аховы базы. З аперацыі Баранаў не вярнуўся, а на партызанскі лагер, як толькі туды прыйшоў атрад, напалі фашысты. На шчасце, Фёдараў хуценька адвёў атрад у бяспечнае месца, і карнікам не ўдалося яго знішчыць. На другі дзень, вярнуўшыся ў лагер, выявілі, што фашысты забралі і вывезлі ўсю зімовую вопратку і абутак.

Гэта выклікала немалое здзіўленне. Неўзабаве ўсё высветлілася: разведчыкі, вярнуўшыся на базу, далажылі, што гітлераўцы хваліліся перад мясцовым насельніцтвам сваёй перамогай над «бандытамі» і паказвалі адзенне партызан, якіх яны нібыта ўсіх знішчылі. А лагойскія паліцаі, што прымалі ўдзел у карнай аперацыі, падчас папойкі хваліліся сваімі подзвігамі. Асабліва выхваляўся адзін з іх, сцвярджаючы, што толькі дзякуючы яму аперацыя прайшла паспяхова: гэта ён пранік на базу партызан, усё разведаў і нават «асабіста пазнаёміўся з камандзірам і камісарам атрада, якіх цяпер захапілі і павесілі на сасне».

І Фёдарава нібы токам ударыла:

– Таварышы, а дзе Баранаў? Бачыў яго хто-небудзь у Гранічах ці па дарозе?

– Учора, як толькі мы выйшлі з лагера, – сказаў Аляксандр Бурло, – ён ішоў наперадзе мяне. Потым адышоўся ўбок і стаў пераабувацца. А вось ці вярнуўся ён у строй, я не бачыў.

Усё стала зразумелым: у лагеры пабываў шпіён, лёгка і проста разведаў і дыслакацыю атрада, і ўзбраенне, і колькасць асабовага саставу. Гэта паслужыла добрым урокам. Правялі гутаркі на тэму асцярожнасці і абачлівасці не толькі з партызанамі, але і з мясцовым насельніцтвам. Ад сувязных даведаліся, што ў распрацоўцы «плана ліквідацыі партызанскай банды» непасрэдны ўдзел прымаў начальнік лагойскай паліцыі Голас. Гэта па яго заданні ў лагер пранік шпіён Баранаў, сапраўднае прозвішча якога – Шульговіч.

Цяпер, падчас візіту Захарава ў штаб «Штурма», зайшла размова пра сумесныя дзеянні супраць лагойскага гарнізона. Лейтэнант паскардзіўся, што з-за невялікай колькасці байцоў у атрадзе ён не можа паставіць у кожнай вёсцы сваёй зоны партызанскія пасты і абараніць насельніцтва ад карнікаў.

– Ідэя твая, Уладзімір Дзмітрыевіч, правільная, але здзейсніць яе трэба па-іншаму, – заўважыў Фёдараў. – Так мы ўсе атрады расфарміруем, калі будзем партызан ставіць вартавымі ў кожнай вёсцы.

– А што вы прапануеце? – запытаў Захараў.

– Трэба, каб само насельніцтва ў кожнай вёсцы выставіла свае пасты для кругласутачнага дзяжурства. І калі з'явяцца фашысты, яны адразу паведамяць партызанам.

– Вось гэта ідэя! – усклікнуў начштаба Фогель. – У кожнай вёсцы ёсць нямала юнакоў і дзяўчат, і яны з задавальненнем будуць несці такую службу.

– Нам варта таксама паставіць там сваіх партызанскіх старастаў, якія арганізоўвалі б каравульную службу і адказвалі б за поўны парадак, – прапанаваў Гламаздзін.

Прыступілі да абмеркавання плана па разгроме Лагойскага гарнізона. Захараў расказаў, што яго разведка ўстанавіла колькасць узброеных сіл у Лагойску, дзе засталіся, галоўным чынам, жандармерыя, паліцэйскія і тылавая часць – усяго 240 салдат і паліцаяў. У атрадах «Штурм», «Грозны» і «За Айчыну» налічвалася да 500 партызан. Але непасрэдна ў аперацыі маглі ўдзельнічаць не больш за 350 байцоў, бо ў кожным атрадзе значная частка партызан была занята ўнутранымі справамі: кухары, ахова лагераў, персанал шпіталяў, параненыя.

Справа ўскладнялася тым, што праціўнік у Лагойску добра акапаўся, пабудаваў дзоты, выкапаў акопы, траншэі, хады зносін, а вакол службовых памяшканняў паставіў у некалькі радоў драцяныя агароджы. Давядзецца, значыць, пераадолець гэтыя перашкоды і выбіваць ворага з укрыццяў. Дамовіліся нанесці ўдар па гарнізоне ноччу 22 снежня 1942 года. Агентурную разведку праводзілі ў асноўным партызаны атрада «За Айчыну» Мікалай Дзядзюля, Пятро Паўлоўскі і іншыя ўраджэнцы Лагойска, якія добра ведалі ўсе хады і выхады з горада, мясцовых жыхароў і некаторых паліцаеў.

Былі ўстаноўлены дакладная колькасць і ўзбраенне праціўніка, сістэма яго абароны, месцы патруліравання ў розныя гадзіны сутак, паролі, размяшчэнне складоў з боепрыпасамі і прадуктамі.

Даведаліся, дзе размешчаны раённая ўправа, пошта, банк, памяшканні камендатуры, жандармерыі і паліцыі. Камандзір разведкі атрада «За Айчыну» Міхаіл Уласаў і палітрук Мікалай Тарасевіч праз сваіх разведчыкаў звязаліся з лагойскімі падпольшчыкамі Анатолем Фурсам, Барысам Сасноўскім, Мікалаем Апалінскім і іншымі, праз якіх удалося завербаваць некаторых паліцэйскіх і ўпраўляючага банка. Падпольшчыкі і сувязныя сталі выдатнымі праваднікамі.

У 21 гадзіну па плану атрады «Штурм», «Грозны» і «За Айчыну» сканцэнтраваліся ў лесе на паўднёвы ўсход ад пасёлка Лагаза-2. Раздзяліўшыся на дзве калоны, яны рушылі ў наступ. Першая калона, якой камандаваў Іосіф Фогель, павінна была знішчыць праціўніка ў памяшканнях паліцыі і жандармерыі. Другая, пад камандаваннем Уладзіміра Захарава, выконвала галоўную і асноўную задачу – разбіць гарнізон артскамендатуры, размешчанай у будынку былога райвыканкама.

Па сігнале белай ракеты калоны кінуліся наперад, абрынулі агонь з усіх відаў зброі па агнявых кропках і хутка іх падавілі. Захоплены знянацку вораг не аказаў сур'ёзнага супраціўлення. Але асноўныя яго сілы знаходзіліся ў добра ўмацаваных памяшканнях жандармерыі, паліцыі і камендатуры. Адтуль гітлераўцы адкрылі моцны кулямётны і аўтаматны агонь, закідвалі атакуючых гранатамі. Партызаны былі вымушаны залегчы, схавацца за сценамі дамоў. У гэты час камандзір гарматы Аляксей Косараў далажыў Фогелю, што гатовы да бою.

– Прамой наводкай агонь! – скамандаваў Фогель.

Стрэл – і ўзрыў у памяшканні жандармерыі, там вылецелі вокны. Партызаны кінулі туды некалькі гранат і ўварваліся ў памяшканне. Некалькі аўтаматных чэргаў, і гітлераўцы былі знішчаны. А Косараў устанавіў ужо гармату перад памяшканнем паліцыі, з якога сыпаў град трасіруючых куль. Праўда, паліцаі стралялі ўсляпую, і кулі ляцелі высока над галовамі партызан. У Лагойску стала светла як днём: памяшканне жандармерыі гарэла, а партызаны, якім было даручана парваць сувязь Лагойск–Мінск і Лагойск–Плешчаніцы, выканаўшы сваю задачу, падпалілі стагі неабмалочанага хлеба і сена каля памяшкання атрскамендатуры. Загарэлася і памяшканне паліцыі. З яе гарнізонам таксама было скончана.

Разграміўшы жандармерыю і паліцыю, Фогель павёў сваіх партызан на дапамогу Захараву. Гітлераўцы заселі ў каменным будынку, які некалі належаў графу Тышкевічу. Сцены тут былі пад метр таўшчынёй, і выбіць адтуль ворага аказалася амаль немагчыма. Фашысты адчувалі тут сябе ў поўнай бяспецы і вялі прыцэльны агонь. Бой прымаў зацяжны характар. Загінуў кулямётчык Барыс Ткачук, за кулямёт лягла медсястра Надзя Харчанка. Яна старалася біць па вокнах, але фашысты хаваліся за прасценкамі. Раптам Надзя панікла галавой: варожая куля трапіла ёй у вісок.

Гармата не давала тут чаканага эфекту, ды і снарады хутка скончыліся, а гранаты не далятталі да другога паверха, і Захараў загадаў не расходаваць іх дарэмна, да таго ж яны маглі паразіць і саміх гранатамётчыкаў.

Набліжалася раніца, і расла трывога, што ворагу можа падысці падмога з Мінска ці Плешчаніц: хаця

сувязь і была перарвана, але ж хто-небудзь з паліцаяў мог знікнуць і прывесці фашыстаў. Захараў і Фогель хацелі ўжо даць каманду на адыход, але падышоў сакратар партарганізацыі атрада «За Айчыну» Васіль Патомскі і прапанаваў:

– Давайце закінем у акно пару тэрмітных шарыкаў.

– Фу, чорт, як гэта я сам не дадумаўся! – усклікнуў Фогель. – А яны ў вас ёсць?

Але Патомскі ўжо не чуў гэтага пытання. Ён, Уласаў і палітрук Загід Айгістаў былі ўжо ля сцяны, закінулі ў вокны спачатку некалькі гранат, а пасля і тэрмітныя шарыкі. І як толькі па падлозе пачала расцякацца расплаўленая маса, гітлераўцы сталі збягаць з другога паверха і, адкрыўшы зрашэчаныя кулямі і снарадамі дзверы, спрабавалі выратавацца, страляючы з аўтаматаў і ручных кулямётаў. Тут ужо не давалі промаху партызанскія кулямётчыкі і аўтаматчыкі.

І вось усё замоўкла. Партызаны пачалі збірацца ў дарогу. Падышлі два паліцэйскія – партызанскія сувязныя – і прывялі свайго «калегу» Баранава-Шульговіча. Яны яго самі абяззброілі і звязалі. Шульговіч толькі цяпер зразумеў, што наступае час расплаты. Ён упаў на калені перад партызанамі і заскуліў:

– Браточкі, змілуйцеся нада мной! Я не па сваёй волі, мяне Голас прымушаў!

– А дзе Голас?

– Ой, браточкі, не ведаю, ён дзе-небудзь у падвале сядзіць. Памілуйце мяне, пашкадуйце маіх жонку і дзяцей, не сірацце іх!

– Сваіх дзяцей успомніў! А чужых дзяцей ты не сіраціў? Ану, хлопцы, канчайце яго...

Так загінуў здраднік і шпіён Шульговіч. А вось Голаса сярод 38 забітых жандармаў і паліцаяў не знайшлі: таму ўдалося збегчы.

Пазней сувязныя расказалі, што для пахавання забітых гітлераўцаў заказалі 104 труны, а загінуўшых жандармаў і паліцаяў аддалі іх родзічам...

А партызаны хавалі сваіх герояў – кулямётчыка Барыса Ткачука і медсястру Надзю Харчанка. Горка было перажываць такія цяжкія страты, асабліва Надзейкі, як называлі яе мясцовыя жыхары. Яна нароўні з мужчынамі хадзіла ў разведку, удзельнічала ў баях. Надзю вельмі любілі ў вёсках партызанскай зоны, асабліва дзеці і жанчыны. Для іх яна была гонарам, прыкладам мужнасці і адвагі. Для дзяцей у Надзі заўсёды знаходзіліся гасцінцы ці ласкавыя словы. Малых яна любіла браць на рукі. Нярэдка Надзя прыходзіла ў вясковыя хаты як урач з медыцынскай дапамогай хворым.

Хавалі Надзю Харчанка на могілках у вёсцы Беларучы. На пахаванне сабраліся партызаны з усіх атрадаў і вясковыя жыхары. Адна жанчына прынесла на абіўку труны чатыры метры кумачовай тканіны. Жанчыны плакалі наўзрыд, не маглі стрымацца і мужчыны: цішком змахвалі слёзы. Пасля кароткіх развітальных слоў партызаны ціха і асцярожна апусцілі труну ў магілу, і пакуль мужчыны ўзяліся за рыдлёўкі, кожная жанчына кінула туды жменю роднай зямлі. Раздаўся трохкратны салют, і народныя мсціўцы разышліся, а дзеці і жанкі Беларучаў засталіся прыбіраць магілу.

Прайшлі гады, даўно адгрымела вайна, нарадзілася новае пакаленне вяскоўцаў, якое не бачыла і не ведала ваеннага ліхалецця, а на магіле Надзі Харчанка і цяпер можна ўбачыць жывыя

кветкі, прынесеныя не толькі тымі, хто яшчэ памятае гераіню, але і іх дзецьмі і ўнукамі...

## СТАНАЎЛЕННЕ БРЫГАДЫ

Напярэдадні Новага года, 29 снежня 1942-га, быў падпісаны загад па асобаму аб'яднанню партызанскіх атрадаў аб стварэнні на базе атрадаў Луніна, Захарава і Гаранава брыгады «Штурмавая», зацверджана яе камандаванне. Камбрыгам прызначылі Барыса Луніна, камісарам – Іллю Фёдарава, начальнікам штаба – Іосіфа Фогеля, г. зн. усё былое камандаванне атрада «Штурм», якое і да гэтага часу каардынавала баявую дзейнасць атрадаў сваёй зоны. У сувязі з гэтым у «Штурм» загадам па брыгадзе прызначылі новае камандаванне: камандзірам стаў Іван Гламаздзін, камісарам – Анатоль Юлін, начальнікам штаба – Ілля Худзякоў.

Адразу пасля Новага года, 10 студзеня, у састаў брыгады увайшоў атрад пад камандаваннем старшага лейтэнанта Гурко. Неўзабаве пры брыгадным шпіталі ўзнікла рота пад камандаваннем маёра Родзькіна і агульным кіраўніцтвам начальніка шпіталя ваенурача 2-га ранга Д. С. Рыдлеўскага, якая з цягам часу перарасла ў атрад імя Панамарэнкі. Камісарам гэтага атрада быў прызначаны старшы палітрук Чарненка.

Наступіў 1943 год. Пад уздзеяннем поспехаў Чырвонай Арміі ў Сталінградскай бітве і вялікай палітмасавай работы, якую праводзілі палітработнікі і ўсе камуністы брыгады сярод насельніцтва, пачаўся масавы прыток людзей у атрады. Ішлі не толькі мясцовыя жыхары, ваеннапалонныя, якія

збеглі з канцлагераў, і так званыя прыпіснікі. Сувязі з партызанамі пачалі шукаць паліцэйскія і іншыя пасобнікі акупантаў.

У атрад «Штурм» з Заслаўскага гарнізона перайшоў у поўным саставе са зброяй узвод паліцэйскіх на чале са сваім камандзірам Длатоўскім. З Лагойска ў атрад «За Айчыну» ўлілася вялікая група ўласаўцаў і ўкраінскіх нацыяналістаў. Прыбывалі і ваеннапалонныя з канцлагераў. Група вязняў Рогаўскога лагера звязалася з разведчыкамі атрада «Штурм» Генадзем Трыгубавым, Мікалаем Рашэўскім і Архіпам Кавалёвым, атрымала ад іх 2 пісталеты і гранаты, перабіла ўсю лагерную ахову і прыйшла ў партызаны.

Узнікла неабходнасць арганізаваць новыя атрады. Кіраўнікі падпольнага райкама камсамола прапанавалі накіроўваць у адзін з новых атрадаў галоўным чынам моладзь, каб ён называўся камсамольска-маладзёжным. Камандаванне ахвотна падтрымала ініцыятыву камсамольскіх важакоў, і 13 студзеня загадам па брыгадзе было абʼяўлена пра стварэнне пятага партызанскага атрада імя Жукава. Яго камандзірам прызначылі камсамольца старшага лейтэнанта Валянціна Багданава, камісарам – палітрука Фёдара Сядога, начальнікам штаба – Міхаіла Чхэідзэ. Усе яны да гэтага ваявалі ў атрадзе «Штурм», удзельнічалі ў многіх баявых аперацыях.

Атрад пачаў вельмі хутка расці і ўмацоўвацца. Ён абасноўваўся на тэрыторыі Радашковіцкага раёна і смела ўзяў пад сваю абарону насельніцтва сваёй зоны ад набегаў акупантаў, якія на гэты час, у канцы 1942 года, памянялі тактыку барацьбы з партызанамі. Пасля няўдалай аперацыі штутгарцаў

на рацэ Удра і правалу яшчэ больш маштабнай карнай экспедыцыі штандартэнфюрэра Кунцэ камендант Маладзечна пачаў прымяняць рэкамендацыі генерал-маёра Чамер-Остэна, які на нарадзе ў Мінску зрабіў даклад «Пра барацьбу з бандамі партызан у тыле армій "Цэнтр"». Ён падкрэсліваў, што «асновай барацьбы з партызанамі... з'яўляецца агентурная разведка».

І маладзечанскі камендант загадаў камандзірам ахоўных батальёнаў у Радашковічах, Красным і Канатопе стварыць разведвальную агентуру з мясцовага насельніцтва. Ім удалося завербаваць некалькі чалавек у вёсках Буцькі, Дзякшняны, Пяцюлі, Краснае і ў Радашковічах. Лазутчыкі сістэматычна паведамлялі сваім гаспадарам пра дыслакацыю партызанскіх атрадаў і асобных баявых груп. Як толькі партызаны аказваліся далей ад той ці іншай вёскі, гітлераўцы неадкладна ўрываліся туды, рабавалі, палілі, хапалі ці забівалі людзей. Пакуль лясныя салдаты прыходзілі на дапамогу, бандыты збягалі.

Стала ясна, што вораг мае ў атрадах сваіх агентаў. Фёдараў склікаў у атрадах адкрытыя партыйныя і камсамольскія сходы, на якіх паставіў толькі адно пытанне – аб пільнасці. Абмеркаванне паказала, што сярод партызан яшчэ многа разявак, лагоднасці, неапраўданай даверлівасці. Вырашылі абмеркаваць гэта пытанне і на сходах сельскіх падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, якія на той час пачалі стварацца ў Заслаўскім і Радашковіцкім раёнах пры дапамозе прадстаўнікоў Мінскага падпольнага міжрайкама КП(б)Б Сямёна Балабуткіна, Паліны Патоцкай і інструктара ЦК ЛКСМБ Анатоля Дзенісевіча.

Разам са стварэннем падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый у кожнай вёсцы пачалі арганізоўваць дружыны самаабароны, выбралі або прызначылі партызанскіх стараст вёсак, у найбольш буйныя населеныя пункты направілі ваенных камендантаў. У гэтай важнай справе актыўна ўдзельнічаў увесь палітсастаў брыгады. Другім сакратаром Заслаўскага падпольнага райкама партыі быў абраны камісар брыгады «Штурмавая» І. Фёдараў, членамі райкама – камісар атрада імя Фрунзэ І. Петрашкевіч, сакратар партарганізацыі атрада «За Айчыну» В. Патомскі і начальнік асобага аддзела П. Качан.

Стварэнне падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, добраахвотных дружын самаабароны, выбары стараст у вёсках і прызначэнне партызанскіх камендантаў далі новы штуршок далейшаму разгортванню палітыка-масавай работы з насельніцтвам. Сельскія партыйныя і камсамольскія арганізацыі аказвалі неацэнную дапамогу атрадам, узнікла сапраўднае сяброўства і ўзаемаразуменне. Партызаны пачалі адчуваць большую адказнасць за абарону сваёй зоны ад нападаў ворага, ад угону людзей у рабства.

Цяпер фашыстам з кожным днём станавілася ўсё цяжэй весці разведку супраць партызан і рабіць нечаканыя наскокі на вёскі. Пры кругласутачным дзяжурстве дружыннікаў, пры наяўнасці партызанскіх стараст і камендантаў населеныя пункты аказаліся пад поўным кантролем партызан. Фашысцкім халуям стала немагчыма перадаваць звесткі ў гарнізоны. Тыя, хто спрабаваў гэта рабіць, былі выкрыты і пакараны. Дружыны сталі рэзервам для папаўнення атрадаў.

З Галавачоўскай дружыны ў атрад імя Фрунзэ ўступілі Рыгор Клімантовіч, Уладзімір Туромша, Сцяпан Драгун і многія іншыя. Раўкуцьеўская папоўніла рады «Штурма» – сюды прыйшлі Яўген Бекіш, Віктар Тарасевіч, брат і сястра Пуцейкі. Многія дружыннікі ішлі і ў іншыя атрады. У дружынах заставаліся галоўным чынам дзяўчаты, маладыя жанчыны і сталыя мужчыны, якія калісьці служылі ў арміі і ведалі ваенную службу, армейскі парадак і дысцыпліну. Гэта яны стараліся падтрымліваць і ў сваіх дружынах.

Партызаны наносілі ўсё новыя ўдары па ворагу, сеялі паніку ў яго радах, распраўляліся з фашысцкімі халуямі. Брыгада кожны дзень папаўняла свой баявы рахунак, пра што яскрава сведчаць цяпер архіўныя дакументы.

*З архіўных дакументаў:*

*«Загад ад 19.02.43 г. Падведзены вынікі барацьбы за перыяд з 06.42 г. па 02.43 г.: знішчана 633 гітлераўцы, 44 аўтамашыны, 42 масты, самалёт і дарожны трактар, 47 паравозаў, 111 вагонаў з боепрыпасамі, 129 – са збожжам, 140 – з жывой сілай, пушчана пад адхон 55 эшалонаў. Разгромлена 14 валасцей, 14 малачарань, 17 гаспадарак, 18 прадпрыемстваў, 2 гарнізоны, з іх – райцэнтр Лагойск.*

*Улічваючы вялікі ўклад у барацьбу з ворагам прадставіць да ўзнагароджання ордэнам Леніна наступных таварышаў: Гламаздзін І. А., Фёдараў І. М., Фогель І. Л., Рыдлеўскі Д. С., Гаранаў Н. М., Брэчка В. Г. Загінуўшага т. Кулаковіча С. В. – да звання Героя Савецкага Саюза.*

*Камандзір брыгады ЛУНІН, камісар ФЁДАРАЎ, начштаба ФОГЕЛЬ».*

## РЫМАЛЬД ДЭ ЮНГ ЗВОДЗІЦЬ РАХУНАК

Пахмурным днём на самым пачатку студзеня ў штабную зямлянку зайшоў разведчык і храбры кулямётчык Рымальд дэ Юнг.

– Таварыш камісар брыгады, у вас ёсць трафейны нямецкі аўтамат, дайце яго мне на вельмі важную аперацыю, – звярнуўся ён да Іллі Мартынавіча.

– На якую аперацыю? – пацікавіўся Фёдараў.

– О, таварыш камісар, гэта – ваенная тайна.

– Што, нават камандаванню брыгады нельга пра яе ведаць?

Рымальд пачырванеў да вушэй, але рашуча заявіў:

– Да яе выканання не магу сказаць, таварыш камісар.

– Ну добра, Рым, табе я не магу адмовіць, – і Фёдараў працягнуў яму трафейны аўтамат і запасны магазін з патронамі.

Трэба было бачыць, як заблішчэлі ў храбрага галандца вочы, якой светлай усмешкай асвяціўся яго твар. Ён адразу накінуў пас аўтамата на шыю, а запасны магазін засунуў за халяву і ператварыўся ў тыповага салдата гітлераўскай арміі. Хаця Рымальд і карыстаўся вялікім аўтарытэтам і абсалютным даверам, усё ж у Фёдарава ўзнікла трывога: што задумаў Рым, куды ён адпраўляецца?

І Фёдараў пайшоў да камандзіра атрада «Штурм» Івана Гламаздзіна высвятляць гэта. Але Гламаздзін нічога не ведаў: ён таксама палічыў нетактычным выпытваць у Рыма пра «вельмі важную аперацыю». Абмеркаваўшы сітуацыю, вырашылі паслаць следам за Рымальдам 3–4 лепшых партызан, якія павінны былі ісці за ім на такой дыстанцыі, каб ён іх не

прыкмеціў, але ў выпадку якой-небудзь бяды маглі яму дапамагчы. Партызаны Гарачаў, Бурло, Арлоў і Злобін, атрымаўшы строгі інструктаж, энергічным маршам пашлі следам за дэ Юнгам.

Мінуўшы вёску Буцькі, яны хутка ўбачылі наперадзе яго адзінокую постаць. Вось ён паварочвае направа ад Радашковіч, туды, дзе на некалькі кіламетраў амаль да самай Іллі цягнецца дробналессе. Рымальд дайшоў да прыдарожных кустоў і дрэўцаў і схаваўся ў густых елачках каля моста.

– Няўжо ён вырашыў зрабіць засаду супраць аўтакалоны? – спытаў Арлоў.

– Падобна на тое, – сказаў Гарачаў. – Давайце замаскіруемся ў кустах і будзем за ім назіраць.

На дарозе – ні душы. Прайшло нямала часу, і з боку Маладзечна пачулася гудзенне многіх матораў. Машыны сталі праскокваць адна за адной, а Рымальд нават не варухнуўся.

– Не магу зразумець, што ён задумаў! – усклікнуў Саша Бурло.

– А што тут разумець: не будзе ж ён адзін нападаць на цэлую калону, – разважыў Гарачаў.

На дарозе зноў усталявалася цішыня. Партызаны пачалі замярзаць. Вылез са сховішча і Рым, пачаў падскокваць і танцаваць, каб сагрэцца. Час цягнуўся марудна. Нарэшце з боку Мінска пачулася ледзь чутнае гудзенне. Рымальд рашуча ўстаў, зняў з шыі свой чорны шалік, павязаў яго на галаву і твар, зверху надзеў пілотку – так рабілі ўсе гітлераўцы, ратуючыся ад холаду. Выйшаў на дарогу. Паказалася легкавушка. Рымальд пачаў хадзіць узад-уперад узбоч дарогі, а калі машына наблізілася да яго, падняў правую руку з аўтаматам, стаў «галасаваць».

Машына спынілася, і вадзіцель адчыніў дзверцы. Рымальд падбег і, сагнуўшыся, нібы жадаючы залезці ў машыну, даў кароткую чаргу з аўтамата. Пакончыўшы з шафёрам, ён скамандаваў пасажыру, які сядзеў на заднім сядзенні:

– Хэндэ! – і абяззброіў яго. Адступіўшы на крок, скамандаваў: – Вэг! Вылазь з машыны!

З машыны вылез нямецкі палкоўнік.

– Вось мы і сустрэліся, гер камендант. Я чуў, што вы вельмі хацелі мяне бачыць.

– Рымальд, гэта ты? Я цябе не пазнаў... Рады цябе бачыць!

– Ды ўжо ж відаць: нават дрыжыш ад радасці.

– Я спачатку спалохаўся, бо адразу цябе не пазнаў, а цяпер сапраўды рады. О, майн гот: што было б са мной, каб я не табе, а іншаму партызану трапіў бы ў рукі?

– Не прыкідвайся дурнем, пан палкоўнік! Раздзявайся!

– О, пан дэ Юнг, змілуйся!

– А ты памілаваў бы мяне, калі б я трапіў табе ў лапы?

– Дальбог, памілаваў бы!

– А хто даваў каманду злавіць мяне жывым ці мёртвым? Ану, хутчэй здымай усё да бялізны, а то зараз прашыю з аўтамата. Памятаеш ацяпляльніка Адамейку? Ты загадаў салдатам распрануць яго на 30-градусным марозе і паліваць вадой, пакуль ён не ператварыўся ў ледзяную статую. Хачу, каб ты сёння сам паспрабаваў гэта задавальненне, пан камендант. Тваё шчасце, што цяпер слабы марозік, ды і вады паблізу няма.

Дзень падыходзіў да канца, і мароз узмацняўся. Тлустае цела каменданта сінела на вачах. Фашыст,

пераступаючы з нагі на нагу, упрошваў Рымальда даць яму магчымасць надзець форму шафёра Рауля Ляўфмана, каб сагрэцца. Замест гэтага Рымальд дазволіў яму бегаць на дыстанцыю 25 метраў ад машыны і назад. Гітлеравец з радасцю пабег. Зрабіўшы некалькі забегаў, ён у чарговы раз не павярнуў назад, а прыпусціў з усіх ног у бок Мінска. Тады Рымальд падняў аўтамат і прашыў яго чаргой справа налева, і ўся спіна фашыста афарбавалася крывёю.

Рымальд дэ Юнг падышоў да яго, пераканаўся, што ён мёртвы, вярнуўся да машыны і агледзеў яе. Але акрамя скрынкі з крыжамі і фашысцкімі медалямі ў ёй нічога не аказалася. Значыць, камендант атрымаў ад Вільгельма Кубэ ўзнагароды для ўручэння сваім верным служакам. Масты і дарогі ў партызанскай зоне былі разбураныя, Рымальд спаліў машыну разам з трупам Ляўфмана, узваліў на плячо адзежу каменданта і скрынку з узнагародамі, хутка накіраваўся на базу атрада.

Насустрач яму з кустоў падняліся партызаны, якія ўвесь гэты час назіралі за дзеяннямі Рымальда.

– Ты, Рым, не толькі каменданта, але і нас замарозіў. І была табе ахвота столькі часу з ім валаводзіцца? – паўжартам спытаў Гарачаў.

– Гэта я з ім расправіўся яго ж метадам.

Камендант Маладзечна прынёс партызанам многа зла, не раз спрабаваў знішчыць іх, па яго загадах палілі вёскі і расстрэльвалі мірных безабаронных людзей – жанчын, дзяцей, – і лясныя салдаты не адзін раз думалі, як ад яго пазбавіцца, але так нічога і не прыдумалі. Рымальд жа вырашыў гэту задачу лёгка і проста: ён дакладна ведаў, у якія дні і гадзіны «гер камендант» ездзіў са справаздачай да Вільгельма Кубэ...

## ...І СВІНЦОМ З НАБОРНАЙ КАСЫ

Мінскія падпольшчыкі Канстанцін Няхай, Міхаіл Гарачун разам з разведданымі калі-нікалі прысылалі ў штаб і фашысцкія газеты «Мінскер цайтунг», «Беларускую газету» і «Руль», каб партызаны маглі не толькі пасмяяцца з грубай, беспардоннай маны гітлераўцаў і іх прыспешнікаў, але і знайсці ў гэтым патоку ілжы і паклёпу «рацыянальнае зерне» і факты, якія можна было выкарыстаць супраць фашыстаў. Аднойчы ў «Беларускай газеце» прачыталі: «Войскі вермахта сумесна з ахоўнымі падраздзяленнямі разграмілі банду "Штурм", якая дзейнічала на тэрыторыі Заслаўскага і Лагойскага раёнаў. Забіта больш як 100 бандытаў і многа захоплена ў палон, у тым ліку радыстка з рацыяй».

Гэта была нахабная мана. Да студзеня 1943 года страты атрада «Штурм» за ўвесь час барацьбы з акупантамі складалі толькі адзінкі, а сваёй радысткі з рацыяй у партызан не было наогул. На чарговай нарадзе камандна-палітычнага саставу брыгады Фёдараў зачытаў фашысцкую заметку пра «разгром банды "Штурм"». Яна выклікала спачатку смех, пасля абурэнне ў прысутных. Камандзір атрада «За Айчыну» Уладзімір Захараў усклікнуў:

– Трэба знішчыць галоўнага брахуна, рэдактара «Беларускай газеты» фашысцкага халуя Казлоўскага! Даручыце гэта майму атраду!

Супраць гэтага ніхто не спрачаўся: тут жа на нарадзе Казлоўскаму вынеслі смяротны прысуд, і Уладзімір Захараў па ўласнай ініцыятыве ўзяўся выканаць такую нялёгкую аперацыю. У рэдакцыі «Беларускай газеты» працаваў тэхрэдактарам агентурны разведчык атрада «За Айчыну» пад-

польшчык журналіст Алесь Матусевіч. Ён часта па службе сустракаўся з Уладзіславам Казлоўскім, бываў у яго на кватэры, ведаў пра яго ўсё і велізарным намаганнем волі хаваў сваю нянавісць да гэтага заклятага ворага беларускага народа, стараючыся па заданні партызан увайсці да яго ў поўны давер.

Алесь марыў перайсці ў атрад, але камандаванне настаяла на тым, каб ён заставаўся ў Мінску і здабываў каштоўную інфармацыю. Работа ў газеце беларускіх нацыянал-сацыялістаў давала магчымасць знаходзіць неабходныя звесткі і наводзіць сувязі з патрэбнымі людзьмі. Дарэчы, ад Матусевіча камандаванне партызан даведалася, што перакладчыцай у генеральнага камісара Вільгельма Кубэ працуе сумленная савецкая патрыётка, камсамолка, дачка вядомага акадэміка М. А. Прыляжаева – Ірына. Яе не давялося доўга ўгаворваць дапамагчы партызанам, і неўзабаве каштоўная падрабязная інфармацыя пра дзейнасць фашысцкага ката ў Беларусі і пра яго акружэнне стала рэгулярна паступаць у штаб брыгады.

Матусевіч, бываючы ў атрадзе «За Айчыну», бачыў, як цяжка камісару Міхаілу Мартынаву і парторгу Васілю Патомскаму перапісваць ад рукі дзясяткі экзэмпляраў зводак Саўінфармбюро. Такое становішча было і ў іншых атрадах брыгады. Ён як журналіст добра ведаў кошт і цану друкаванаму слову. І Алесь Матусевіч вырашыў дапамагчы палітработнікам: кожны дзень ён выносіў з друкарні шрыфты. Такім чынам ён назапасіў столькі літар, прабельнага матэрыялу, што хапіла б на дзве друкарні. Пляменнікі Матусевіча – разведчык Мікалай Дзядзюля і жыхар вёскі Мачаны Лагойскага

раёна Васіль Карповіч – даставілі шрыфт у гэту вёску, дзе ён і ляжаў мёртвым грузам.

Цяпер пытанне пра пераезд Матусевіча ў атрад вырашалася само сабой. Калі яго запрасілі ў атрад, Захараў сустрэў яго словамі:

– Ну вось, цяпер, здаецца, прыйшоў час, калі вам можна будзе перабрацца з Мінска ў атрад, але пры адной умове: калі вы выканаеце адно наша заданне.

І Захараў патлумачыў сутнасць задання. Алесь з радасцю згадзіўся. Тут жа распрацавалі план аперацыі, прызначылі памочнікаў – Грышу Страшко і Сяргея Прылепку. Да выканання прыгавору над фашысцкім памагатым – Казлоўскім сям'ю Матусевіча перавезлі ў атрад.

Заданне аказалася надзвычай небяспечным: памяшканне, дзе знаходзілася рэдакцыя «Беларускай газеты» і кватэра Казлоўскага, было ў самым цэнтры Мінска, на рагу Рэвалюцыйнай і плошчы Свабоды. На другім паверсе размяшчалася казарма, а побач – гарадская паліцыя. Каб трапіць у кватэру рэдактара, трэба было прайсці каля казармы і паліцэйскага вартавога. Калі б паставы або любы нямецкі салдат абшукаў Матусевіча і Страшко, у іх кішэнях знайшлі б пісталеты, і – канец абодвум. А тут справа ўскладнілася яшчэ і тым, што Казлоўскі ў тую раніцу быў у кватэры не адзін.

Дзверы адчыніў не сам гаспадар, а яшчэ больш агідны тып – Фабіян Акінчыц – фюрэр беларускіх нацыяналістаў, фашыст да мозгу касцей, закляты вораг савецкага народа, які спачатку служыў польскай дыфензіве, а пасля – нямецкім акупантам. Яшчэ задоўга да Вялікай Айчыннай вайны ён перабраўся ў Берлін і рыхтаваў там шпіёнаў

і дыверсантаў супраць Савецкага Саюза. Таму Алесь вырашыў адправіць на той свет і Акінчыца. Ён хутка прайшоў у пакой паглядзець, ці няма каго-небудзь там яшчэ, і крыкнуў Грышу Страшко:

– Пачынай!

Страшко выхапіў пісталет і стрэліў у Акінчыца. Той зароў, але не ўпаў, а накінуўся на Матусевіча, памкнуўся адабраць у яго пісталет. Алесь некалькі разоў стрэліў ва ўпор, і Акінчыц зваліўся на падлогу. Усё адбылося на працягу некалькіх секунд. Казлоўскі яшчэ ляжаў у ложку ў наступным пакоі. Але як толькі прагучаў першы стрэл, ускочыў, схапіў свой пісталет і стрэліў у Страшко, ды са страху прамазаў, хаця куля празвінела ля самага вуха Рыгора і нават злёгку абпаліла скуру. Страшко націснуў на курок, але пісталет даў асечку. Казлоўскі зачыніў дзверы і пачаў страляць праз іх усляпую.

Матусевічу і Страшко нічога не заставалася, як хуценька адыходзіць: на шум і стрэлы маглі прыбегчы салдаты. Яны выскачылі на вуліцу, дзе іх чакаў грузавік з нявыключаным рухавіком. З месца аўтамашына рванула да Лагойскага тракта. Праехалі кіламетраў 15, адпусцілі грузавік і пайшлі далей пешшу. У партызанскім лагеры Матусевіч расказаў пра ход і вынікі аперацыі, і Захараў усклікнуў:

– Усё роўна мы павінны яго знішчыць!

Нарэшце Алесь Матусевіч узяўся за абсталяванне друкарні. Зрабіў касы і пачаў разбіраць і раскладваць па ячэйках шрыфт. Некалькі дзён прайшло, а разабраным аказалася толькі яго невялікая частка. Задача аказалася не з лёгкіх, і ён звярнуўся да камандавання з прапановай прывезці кваліфікаванага наборшчыка з Мінска, дзе ў яго быў надзейны патрэбны чалавек: у друкарні імя Сталіна

працавала непрыкметная сціплая дзяўчына Бася Чарняк. Яе і вырашыў Алесь запрасіць у брыгаду. Бася з радасцю прыняла гэту прапанову. Знайшоўся сярод партызан і яшчэ адзін чалавек, крыху знаёмы з друкарскай справай, – Сяргей Сіланцьеў. Утраіх яны за тыдзень разабралі шрыфты і падрыхтавалі друкарню да работы.

Спачатку набралі і надрукавалі некалькі лістовак і пракламацый – зваротаў да насельніцтва, а ў канцы сакавіка выйшаў і першы нумар шматтыражкі «Мы адпомсцім». Рэдактарам газеты стаў Алесь Матусевіч. Дзякуючы яму з'явіўся друкаваны орган Заслаўскага падпольнага РК КП(б)Б і партызанскай брыгады «Штурмавая». Але неўзабаве Матусевіч атрымаў новае адказнае заданне ў Мінску, і рэдактарам прызначылі справавода штаба брыгады Фёдара Ярастава, які рэдагаваў газету да канца партызанскай барацьбы. Дзякуючы вялікай тэматычнай і жанравай разнастайнасці газета карысталася вялікім попытам і папулярнасцю. Яе з нецярплівасцю чакалі партызаны і суседніх брыгад, насельніцтва, на яе прыходзілі шматлікія заяўкі ад партызанскіх сувязных і агентурных разведчыкаў з навакольных гарнізонаў і асабліва з Мінска. Вялікімі пачкамі неслі яе з сабою ў Літву рэйдавыя групы падрыўнікоў. Яны пасля распавядалі, што дзякуючы газеце і лістоўкам літоўскія сяляне і чыгуначнікі сустракалі іх гасцінна і дапамагалі як маглі. Такую сілу мае друкаванае слова.

Неўзабаве па ініцыятыве намесніка камісара па камсамолу, другога сакратара Заслаўскага падпольнага райкама камсамола Максіма Собалева вырашылі выдаваць маладзёжную газету – орган Заслаўскага падпольнага РК ЛКСМБ і брыгады

«Штурмавая». Першы нумар газеты «Партызан-камсамолец» выйшаў на дзень 25-годдзя камсамола – 29 кастрычніка 1943 года. Газета была таксама штотыднёвай, але друкавалася на дзвюх старонках. Акрамя газет выпускалася больш як 250 розных лістовак і зваротаў, тыраж кожнага з іх складаў паўтары-дзве тысячы экзэмпляраў. У тым, што на бок партызан пераходзілі цэлымі падраздзяленнямі паліцэйскія, уласаўцы, украінскія нацыяналісты, а таксама чэхі, славакі, палякі, французы, галандцы, бачыцца таксама ўздзеянне газет і лістовак.

Пачатак 1943 года пазначаны яшчэ большай баявой актыўнасцю атрадаў. Гэта было вынікам поспехаў Чырвонай Арміі на франтах, аб'яднання атрадаў у брыгаду, узмацнення і ўдасканалення масава-палітычнай работы з ляснымі салдатамі, у якой першую скрыпку іграў камісар Фёдараў. Тым не менш Ілля Мартынавіч не пакідаў баявой дзейнасці, быў ініцыятарам многіх баявых аперацый, прычым не толькі ўдзельнічаў у распрацоўцы іх планаў у штабах, але і хадзіў у бой амаль з кожным атрадам...

...У Нацыянальным архіве Беларусі захоўваюцца і дакументы штаба брыгады «Штурмавая». Некалькі месяцаў я знаёміўся з імі, рабіў выпіскі, аналізаваў і толькі тады пачаў пісаць гэту аповесць. Мне здаецца, што чытач з цікавасцю пазнаёміцца з данясеннямі пра баявую дзейнасць атрадаў «Штурмавой».

*Хроніка баявых дзеянняў брыгады:*

*«04.01. Атрад "За Айчыну" разграміў торфапрадпрыемства "Раманава" ў вёсцы Паперня. Знішчана ўсё абсталяванне, захоплены 2 тоны мукі*

*і круп, двое коней з павозкамі, бухгалтарскія дакументы. Ахова прадпрыемства разбеглася.*

*05.01. Разгромлена нямецкая гаспадарка ў былым саўгасе "Лагаза"(кіраваў аперацыяй т. Кочкін).*

*07.01. Група партызан атрада "Штурм" разграміла паліцэйскі ўчастак торфазавода "Змееўка" Заслаўскага раёна. Знішчаны казармы, хлебапякарня, каравульнае памяшканне, забіты 4 паліцэйскія, захоплены 3 вінтоўкі, 5 гранат. Адзін партызан загінуў (кіраваў аперацыяй т. Шубін).*

*15.01. Група партызан атрадаў "Штурм" і імя Фрунзэ знішчыла самалёт Фоке-Вульф, які зрабіў аварыйную пасадку ў раёне вв. Камянец–Латыгаўка. Захоплены бартавыя дакументы...*

*10.02. Атрады "Штурм", імя Фрунзэ і "Грозны" вялі бой ля вёскі Максімаўка Радашковіцкага раёна. Забіта 9 гітлераўцаў і некалькі паранена, захоплены ручны кулямёт, вінтоўка і 300 патронаў (кіраваў аперацыяй Лунін).*

*13.02. На перагоне Аляхновічы–Радашковічы каля вёскі Гурневічы спушчаны пад адхон эшалон, разбіта 25 платформ з аўтамашынамі і танкамі, 15 платформ пашкоджана.*

*20.02. Група партызан атрада "Штурм" узарвала мост даўжынёй 25 пагонных метраў на дарозе Грыні–Казекава, парвана сувязь.*

*27.02. Разведгрупа атрада "За Айчыну" разграміла Папярнянскую валасную ўправу і малочны завод. Маёмасць завода знішчана, захоплена 50 пудоў мукі і 30 – аўсу...»*

## ЖОНКА КАМІСАРА

Апошні дзяржаўны экзамен навучэнцы Мінскага педвучылішча здавалі 24 чэрвеня пад грукат бамбёжкі і свіст бомбаў. Дыплом настаўніка пачатковай школы атрымала і Марыя Пуцейка. Праз тры дні яна адправілася да родзічаў у Заслаўе, бо ісці праз лес у Раўкуцьевічы, дзе жылі яе бацькі, яна пабаялася. Толькі назаўтра, 29 чэрвеня, Марыя вырашыла вярнуцца ў родную вёску. Шлях ляжаў цераз лес і вялікую дарогу, што вяла на Маскву. Па ёй патокам рухаліся калоны гітлераўцаў. Падышоўшы да трасы, Марыя спынілася, і яе акружылі фашысцкія салдаты. Яны былі ў добрым настроі і з гумарам спыталі, колькі кіламетраў да Масквы.

– Я ніколі не была ў Маскве і не ведаю, колькі туды кіламетраў, – адказала спалоханая дзяўчына. – У вас жа ёсць карта, і там пазначана адлегласць, – дадала яна.

Салдаты засмяяліся, паляпалі яе па плячы, сказалі: «Гут, паненка!» – і пайшлі далей.

У Раўкуцьевічах на вуліцы і ў дварах сабраўся натоўп, людзі сачылі за паядынкам фашысцкіх знішчальнікаў з нашым бамбардзіроўшчыкам. Праўда, паядынкам гэта можна была назваць з цяжкасцю: нямецкія груганы нібы клявалі безабаронны савецкі самалёт, які ўжо гарэў. Марыя залезла на высокую бярозу ў двары роднага дома і з трывогай сачыла за няроўнай дуэллю. Вось ад бамбардзіроўшчыка аддзялілася кропка, над якой неўзабаве распусціўся купал парашута, і знішчальнікі пачалі паляваць на парашутыста. Але таму ўдалося ашукаць ворага і шчасліва прызямліцца на ўскраіне суседняй вёскі Камянец. З дапамогай вяскоўцаў, якія яго перавязалі і пераапранулі

ў сялянскую адзежу, ён не без прыгод дабраўся да свайго аэрадрома.

Выратаваўся і яшчэ адзін авіятар. Ім аказаўся стралок-радыст Дзмітрый Янаў, якога забраў да сябе Кандрат Ангалевіч з Латыгаўкі. Янаў быў цяжка паранены, страціў многа крыві, яго перавязалі і палажылі на духмянае сена ў адрыне Кандрата. Вясковая моладзь пачала клапатліва даглядаць лётчыка. Наступным днём яго наведала і Марыя Пуцейка. Яна пайшла да сваёй сяброўкі, мясцовай настаўніцы Ані Спецыян, і папрасіла правесці яе ў адрыну да Янава. З гэтага часу і пачаліся рэгулярныя палітгадзіны на тэму дня. Дзіма даводзіў вясковай моладзі, што акупацыя не надоўга, што ворага хутка пагоняць з нашай зямлі і вайна закончыцца перамогай Чырвонай Арміі на чужой тэрыторыі.

Моладзь навакольных блізкіх вёсак пачала падпольную барацьбу. Арганізавалася падпольная маладзёжная група, аснову якой склалі мясцовыя настаўнікі. Яны збіралі і назапашвалі зброю і боепрыпасы. У жніўні Марыя Пуцейка знайшла газету з вядомай прамовай Сталіна, прынесла яе Янаву, і той параіў перапісаць тэкст і распаўсюдзіць у навакольных населеных пунктах. Неаднаразова па заданні падпольшчыкаў Марыя хадзіла ў Мінск на разведку і з мэтай сувязі з мінскімі падпольнымі групамі.

...Па вясковай вуліцы ад хаты да хаты паволі крочылі мужчына і жанчына, яны заходзілі ў дамы, затрымліваліся там на кароткі час і зноў выходзілі на вуліцу, каб працягваць свой шлях. Насустрач незнаёмцам ішла Марыя Пуцейка.

– Ну, вось гэта камсамолачка возьме нас на начлег! – весела сказаў мужчына.

– А хто і адкуль вы будзеце, добрыя людзі? – спытала іх Марыя.

– Мы мінчане, – адказала жанчына, – вымушаны ўцякаць ад фашыстаў і таму цяпер шукаем страху над галавой, каб прытуліцца нанач. Можа, пусціце нас з мужам пераначаваць?

Марыя прывяла сямейную пару Адзінцовых, якой пагражала небяспека ад акупацыйных карных органаў, у бацькаву хату. Яны засталіся кватараваць у Пуцейкаў. Гэта было рызыкоўна, бо фашысцкія ўлады спецыяльным загадам забаранілі даваць прытулак незнаёмым і пагражалі за гэта расстрэлам. Таму ў іншых хатах падарожнікам і адмаўлялі.

Васіль Мікалаевіч з жонкай як найбольш вопытныя падпольшчыкі пачалі кіраваць мясцовай моладдзю. Яны накіроўвалі сувязных у Мінск, адкуль атрымлівалі літаратуру і распаўсюджвалі ў вёсках. Неаднаразова да сястры Адзінцова ў горад хадзіла і Марыя Пуцейка.

У красавіку быў разгромлены варожы гарнізон у Боўблях, і па наваколлі пайшлі чуткі, што зрабіў гэта дэсант Чырвонай Арміі, які высадзілі савецкія самалёты. Адзінцоў даручыў Марыі схадзіць у суседнюю каля Боўбляў вёску Крыніцу і разведаць, што ж там адбылося на самай справе. Так Марыя Пуцейка ўпершыню даведалася пра партызан з атрада «Штурм». А неўзабаве партызаны з'явіліся і ў Раўкуцьевічах. Адзін з членаў мясцовай падпольнай групы, Мікалай Дзядзюля, быў сувязным атрада «За Айчыну» і перадаваў партызанам розныя разведданыя пра рух эшалонаў па чыгунцы. Да гэтай работы паступова падключыліся і астатнія падпольшчыкі.

Муж і жонка Адзінцовы сталі разведчыкамі атрада «Штурм», і ў хуткім часе Васіль Мікалаевіч зусім перайшоў у атрад. Ён трапіў у штабную

зямлянку, дзе жыў і Фёдараў. Адзінцоў расказаў Іллі Мартынавічу пра смелую падпольшчыцу-камсамолку, якая не пабаялася узяць на кватэру незнаёмых людзей, усяляк нахвальваў прыгажуню-дзяўчыну. А хутка Фёдараў і сам пазнаёміўся з маладой настаўніцай. Яна прыйшла ў госці да сваёй цёткі, што жыла ў Гайдукоўцы, куды партызанскі камісар прыехаў праводзіць чарговую палітінфармацыю.

Дзяўчына спадабалася сваёй адкрытасцю, лёгкім гумарам, прыгажосцю, і калі камандзір атрада «За Айчыну» Уладзімір Захараў прапанаваў запрасіць яе на вечарыну 22 сакавіка, прысвечаную гадавіне ўцёкаў з няволі, з канцлагера ў Масюкоўшчыне, Фёдараў не стаў пярэчыць. Тым больш, што на гэты час над вясковай моладдзю навісла пагроза фашысцкай няволі: юнакоў і дзяўчат пачалі хапаць і прымусам вывозіць у нямецкае рабства. Хмары згусціліся над моладдзю Раўкуцьевіч і навакольных вёсак, і Марыя разам з іншымі маладымі вяскоўцамі вырашыла перайсці ў атрад «Штурм».

Паступова ляснымі салдатамі сталі і ўсе падпольшчыкі, у вёсках засталіся толькі разведчыкі-сувязныя. Янава перавялі нарэшце ў Шаршунскую ўчастковую бальніцу, дзе раны яго падлячылі, і ён стаў выконваць абавязкі сувязнога. Аднак неўзабаве яго выдаў здраднік, і Дзмітрый Янаў стаў вязнем канцлагера ў Масюкоўшчыне...

Вечарына 22 сакавіка адбывалася ў доме Барсукоў, на ёй прысутнічала ўсё камандаванне брыгады: Лунін, Фогель, Фёдараў, – іншыя ўцекачы, усе, хто марозным сакавіцкім днём вырваўся з фашысцкага пекла і заснаваў атрад «Штурм». Марыя Пуцейка засталася ў атрадзе, а хутка стала і жонкай камісара...

## КАРНІКІ ПАЧЫНАЮЦЬ «КОТБУС»

...Нямецка-фашысцкія захопнікі сістэматычна праводзілі карныя экспедыцыі супраць партызан і мірнага насельніцтва. Буйным аперацыям яны давалі кодавыя назвы. Толькі ў Беларусі было праведзена больш як дзясятак такіх аперацый: «Балотная ліхаманка», «Трохкутнік», «Гамбург», «Альтона», «Лясная зіма», «Котбус», «Герман», «Фрыц», «Стракаты дзяцел», «Кармуран».

Асабліва маштабнымі сталі аперацыі «Котбус» і «Кармуран». «Котбус» праводзіўся з 4 красавіка і да пачатку ліпеня 1943 года. У ім удзельнічала больш за 80 тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў, у тым ліку часці СС, паліцыі, жандармерыі, ахоўных войск, фашысцкіх нацыяналістычных фарміраванняў тыпу самааховы, Расійскай вызваленчай арміі (РВА). Шырока прымяняліся цяжкая артылерыя, танкі і авіяцыя, знятыя з фронту. Аперацыя праводзілася па загаду фашысцкага ката фон дэм Бах-Залеўскага, асоба-ўпаўнаважанага Гімлера па барацьбе з партызанамі на Усходзе. Агульнае кіраўніцтва аперацыяй здзяйсняў такі ж кат – генерал-маёр паліцыі фон Готберг.

Пачынаючы новую карную экспедыцыю, фашысты ставілі перад сабой тры мэты: знішчыць партызанскі рух у Беларусі, нарабаваць як мага больш прадуктаў, сабраць і вывезці ў Германію, у фашысцкае рабства, тысячы людзей. Была і яшчэ адна тайная мэта, зафіксаваная ў зусім сакрэтных дакументах і ваенных планах «Ост» і «Барбароса», – масавае вынішчэнне савецкіх людзей.

Брыгада «Штурмавая» размяшчалася паблізу Мінска і таму заўсёды першай прымала на сябе

ўдары. Наогул вораг ні на адзін дзень не пакідаў без увагі «назойлівую» брыгаду і сістэматычна пасылаў супраць яе значныя сілы карнікаў. Пра аперацыю «Котбус» у штабе ведалі яшчэ ў сакавіку 1943 года з данясенняў агентурных разведчыкаў «Пікуса», «Молата» і іншых. Яны паведамлялі, што фон Готберг тайна рыхтуе велізарную па маштабе аперацыю, падобнай на якую яшчэ не было. Невядомымі заставаліся толькі дата і зона правядзення карнай экспедыцыі. Камандаванне брыгады не паверыла, што пасля цяжкага паражэння на Волзе фашысты змогуць зняць з фронту вялікія сілы і кінуць іх супраць партызан.

А фронт патрабаваў ад Германіі ўсё больш рэсурсаў: хлеба, мяса, воўны, скуры і іншых прадуктаў і прамысловай сыравіны. Насельніцтва ж акупіраваных тэрыторый не выконвала фантастычных планаў паставак, а з партызанскіх раёнаў і зон прадукты наогул не паступалі на нямецкія склады. Партызаны не толькі зрывалі пастаўкі, але і не давалі правезці спакойна грузы на фронт і з фронту.

З-за вялікіх страт жывой сілы – толькі пад Сталінградам была згублена 330-тысячная армія Паўлюса – вермахту прыйшлося правесці дадатковую мабілізацыю і адправіць на фронт тых, хто да гэтага атрымліваў адтэрміноўку па вытворчай неабходнасці. На іх месцы гітлераўцы павінны былі ставіць ваеннапалонных, большасць з якіх, замардаваных ў канцлагерах, аказаліся непрыгоднымі да працы. Тады фашысцкія рабаўнікі і паставілі сабе задачу насільна захапіць працаздольных людзей на акупіраваных тэрыторыях і зрабіць іх рабамі сваёй імперыі.

Зазначым, што «Штурмавая» ў нейкай меры прывыкла да частых наскокаў ворага, да розных аперацый і экспедыцый. Нядрэнна працавала брыгадная агентурная разведка, і ў штабе заўсёды своечасова атрымлівалі паведамленні пра будучую небяспеку. Таму партызаны сустракалі ворага там, дзе ён менш за ўсё гэтага чакаў, і наносілі яму адпаведныя ўдары. А калі народным мсціўцам станавілася вельмі туга, яны пакідалі заслоны і засады, а самі непрыкметна выводзілі атрады з бою. Як толькі атрады адрываліся ад праціўніка, хутка здымаліся і заслоны ды ішлі ў які-небудзь іншы раён, каб замесці сляды. Вораг жа сціскаў кальцо на пустым месцы.

Звычайна карнікі з'яўляліся ў партызанскай зоне пасля 9 гадзін раніцы. А вось пры правядзенні аперацыі «Котбус» яны ціха, нібы змеі, упаўзлі ў зону партызан красавіцкай ноччу калонамі з Радашковіч, Новага Двара, Астрашыцкага Гарадка і Лагойска. 4 красавіка ў 5 гадзін раніцы калона з Новага Двара ўварвалася ў вёску Бахметаўка і ўчыніла дзікую расправу над мірнымі яе жыхарамі: забівалі па-зверску ўсіх, хто трапляў на вочы, кідалі ў агонь. Вёску спалілі дашчэнту. Калона з Астрашыцкага Гарадка тым часам такім жа чынам «гаспадарыла» ў Карпілаўцы Лагойскага раёна.

Каля 6 гадзін раніцы атрады «Штурм», імя Фрунзэ, імя Жукава і «Грозны» па трывозе занялі абарону на подступах да вёсак Сярэдняя і Кукалеўшчына. Чакаць давялося нядоўга – неўзабаве на лясной дарозе Пральня–Кукалеўшчына паказалася калона гітлераўцаў. Рухалася яна павольна, за бронемашынай, грузавікамі і матацыкламі ішла пяхота. Развіднела, але ранішні туман перашкаджаў

бачыць усю калону. Вось галава калоны спынілася, і ад яе аддзяліліся 5 матацыклістаў. Трое з іх пакацілі ў вёску Сярэдняя, двое – у Кукалеўшчыну.

Камбрыг загадаў прапусціць варожых разведчыкаў. Як толькі матацыклісты заехалі ў вёскі, калона зноў пачала рух. Яе пярэднія парадкі амаль дасягнулі падножжа вышыні, на якой залеглі партызаны, а хваста калоны ўсё яшчэ не было відаць. Ужо і без бінокля партызаны выразна бачылі кожнага салдата і афіцэра. Фашысты прыкметна павесялелі: іх разведка праехала бесперашкодна, значыць, партызан паблізу няма. І раптам – чырвоная ракета і каманды: «Агонь! Агонь! Агонь!» Да гэтага часу мірная непрыкметная вышыня раптам нібы ўзарвалася. Білі мінамёты, гарматы, ПТР, вінтоўкі і аўтаматы. Такога фашысты не чакалі, і гэта іх ашаламіла.

Варожая пяхота ў паніцы кінулася наўцёкі, пакідаючы забітых і параненых. Грузавікі спыніліся, пачалі адпаўзаць у лес, каб схавацца. Толькі бранявік адкрыў агонь у адказ. Гітлераўцы хутка ачомаліся, пачалі разварочваць гарматы і ўстанаўліваць мінамёты, пяхота павяла інтэнсіўны агонь. Загрымела варожая артылерыя, пачуўся гул танкаў. Сілы праціўніка аказаліся намнога большымі, чым партызанскія. Лясныя салдаты спынілі страляніну, бо фашысты схаваліся ў лесе і акапаліся.

На ўзмыленым кані прыскакаў начальнік брыгаднай разведкі Мікалай Казлоў і паведаміў, што з Радашковіч праз Удранку рухаецца да месца бою вялікая аўтакалона з танкаў і бронетранспарцёраў, гармат розных калібраў, мінамётаў і кулямётаў. Праз некалькі мінут паказаліся танкі і бронетранспарцёры. Пад іх прыкрыццём пяхота смела рушыла наперад,

страляючы з аўтаматаў і ручных кулямётаў. Танкі таксама бесперапынна вялі агонь з буйнакаліберных кулямётаў і гармат. Калі вораг наблізіўся на 200 метраў, народныя мсціўцы абрынулі на яго ўсю моц свайго агню. Вось адзін танк закруціўся на месцы і спыніўся, за ім другі, трэці…

Вораг зноў запанікаваў. Пяхота адарвалася ад танкаў, і многія гітлераўцы кінуліся назад. Іх касілі партызанскія кулямётчыкі. Іншыя салдаты заляглі і пачалі хутка акопвацца. Танкі спыніліся, але працягвалі страляць. У партызан было малавата боепрыпасаў, і нельга было, захапіўшыся боем, выпусціць увесь боезапас і застацца ні з чым. Заўсёды трэба памятаць пра «чорны дзень». З новай калоны спешыліся гітлераўцы і, нягледзячы на інтэнсіўны партызанскі агонь, пайшлі ў атаку. Трэба было адыходзіць, але партызаны чакалі падмацавання суседніх брыгад – «Народныя мсціўцы» і імя Фрунзэ, на сувязь з якімі паскакаў з ардынарцам і падраздзяленнем аховы камбрыг. Чакалі таксама падыходу атрада «За Айчыну». Камандаванне брыгадай і боем прыняў камісар Фёдараў.

Нарэшце прыскакаў сувязны атрада «За Айчыну» і паведаміў, што атрад з 5 гадзін раніцы вядзе бой з карнікамі. Гітлераўцы і там паляць вёскі – Карпілаўку і Харужанцы, а цяпер рухаюцца на Малыя Бясяды, дзе атрад заняў абарону.

Фёдараў загадаў:

– Усім атрадам пакінуць узмоцненыя кулямётамі і ПТР заслоны і ва ўстаноўленым раней парадку адысці на вёску Жабічы.

Камандзіры атрадаў Гламаздзін, Гурко і Багданаў непрыкметна адвялі свае атрады на паўночна-заходні схіл вышыні і далей у лес, а камандзір

атрада «Грозны» Мікалай Гаранаў папрасіў дазволу затрымацца на вышыні і прыкрыць адыход іншых атрадаў. Фёдараў згадзіўся. Ён і сам затрымаўся на вышыні, стараючыся разгадаць тактыку карнікаў. Запаволілі ход і зусім спыніліся танкі, пяхота залегла. І раптам да Фёдарава прыйшла здагадка: «Гэта яны спецыяльна імкнуцца ўцягнуць нас у бой і тым часам адрэзаць нам шляхі адыходу ў Руднянскі лес».

Ад Лагойскай шашы праз вёскі Дзяніскі, Крамянец і Крайск праходзіў старажытны тракт, які на той час ужо згубіў сваё транспартнае значэнне. Калі фашысты даведаюцца пра яго і рушаць туды, будуць адрэзаны ўсе шляхі адыходу. Камісар прапанаваў Гаранаву здымаць атрад і заслоны, а сам паскакаў даганяць атрады. Нагнаў іх ужо ў Жабічах. Там партызаны адпачывалі і чакалі разведчыкаў, якія пайшлі на Даўгінаўскі тракт. Падышоў і атрад «Грозны». Камісар яго Фёдар Федасееў паведаміў сумную вестку: загінуў Мікалай Гаранаў! Гэта навіна ўзрушыла ўсіх: Гаранаў быў любімцам усёй брагады.

Да лістапада 1942-га атрадам камандаваў капітан Цяцерын, які часта прыкладваўся да бутэлькі і не вельмі клапаціўся пра атрад і яго баявую дзейнасць. Яго адхілілі ад пасады і на яго месца прызначылі лейтэнанта Гаранава. І «Грозны» з цягам часу стаў адным з самых баявых у брыгадзе. І людзі ў ім сталі жыццярадаснымі, падцягнутымі, гатовымі ў любую мінуту кінуцца ў бой. Тут выраслі сапраўдныя героі, такія як Васіль Брычка, Іван Чугуй, Мікалай Белякоў, Аляксей Фёдараў і іншыя.

Вось і сёння атрад прыкрываў адыход іншых да апошняй магчымасці. І толькі калі першыя тры атрады адышлі далёка, а танкі і пяхота фашыстаў

рушылі ў чарговы наступ, Мікалай Гаранаў аддаў загад на адыход. Сам ён вырашыў абысці лінію абароны і пераканацца, ці ўсе яе пакінулі. Вакол яго рваліся снарады і міны, свісталі кулі, а ён быццам не заўважаў гэтага. Раптам зусім нечакана да яго падбеглі гітлераўскія салдаты. Гаранаў не паспеў нават узняць свой аўтамат і ўпаў ад фашысцкай кулі. Цяжка перажывалі гэту страту байцы яго атрада, а Брычка і Чугуй плакалі наўзрыд...

Прыскакалі разведчыкі і паведамілі, што па дарозе Мінск–Бягомль бесперапынна рухаюцца войскі праціўніка, а Даўгінаўскі тракт пусты. Хуткім маршам партызаны рушылі па ім у вёску Глыбачаны, якая з усіх бакоў была акружана лесам. На маршы іх сустрэў камбрыг і расказаў, што брыгад імя Фрунзэ і «Народныя мсціўцы» застаць на месцы не ўдалося, яны пакінулі свае базы і пад напорам карнікаў адышлі ў лясы Бярэзінскага запаведніка. Стала зразумела, што акупанты праводзяць шырокамаштабную, буйную карную аперацыю.

У Глыбачанах спыніліся на адпачынак. Раніцай 5 красавіка вярнуліся разведчыкі і далажылі, што фашысты невялікімі атрадамі занялі вёскі партызанскай зоны і бязлітасна рабуюць несельніцтва. Жыхары гэтых населеных пунктаў схаваліся ў лясах, забралі з сабой усё самае каштоўнае, і таму гітлераўцы мала чым пажывіліся. Вораг зноў стварыў вялікую колькасць новых гарнізонаў, аднавіў і яшчэ больш умацаваў старыя, адрамантаваў масты і дарогі, выправіў сувязь. Праціўнік стаў прымяняць авіяцыю, і партызаны вымушаны былі маскіравацца ў лясах. Некалькі дзён атрады «Штурмавой» манеўрыравалі па тэрыторыі Плешчаніцкага і Бягомльскага раёнаў, ухіляючыся ад кантактаў з ворагам.

Фашысты і тут гойсалі і рабавалі насельніцтва. 18 красавіка народныя мсціўцы сутыкнуліся з імі каля вёскі Задроздзе. Успыхнула схватка, і вораг адступіў, пакінуўшы на полі бою параненых. У партызан заканчваліся боепрыпасы, таму праследаваць гітлераўцаў яны не сталі. Нечакана на авіяпляцоўку брыгады імя Жалезняка БШПР прыслаў для «Штурмавой» баявы груз: 80 тысяч вінтовачных патронаў, 12 аўтаматаў і 12 тысяч патронаў да іх, супрацьтанкавае ружжо (ПТР) і 100 патронаў да яго. Радасці партызан не было межаў: Радзіма ўспомніла пра іх у самы цяжкі для іх час.

Набліжалася Першамайскае свята. Прыйшла вестка, што карнікі схлынулі з зоны былога размяшчэння брыгады, і партызаны вырашылі вярнуцца «дамоў». За ноч з 26 на 27 красавіка партызаны зрабілі 60-кіламетровы марш і спыніліся на днёўку ў вёсцы Хадакі. Толькі размясціліся адпачываць, як разведчыкі Праслаў і Рашэўскі далажылі пра вялікую калону фашыстаў, якая рухалася да гэтага населенага пункта. Прыйшлося прыняць бой... На світанні 28 красавіка атрады ўвайшлі ў свой лес. Навокал панавала цішыня, разгараўся ясны і цёплы вясновы дзень, калі ўся прырода ажывае ад зімовай спячкі. Пасля доўгіх блуканняў па прасёлкавых дарогах і вёсках, цяжкіх баёў свой лес здаваўся зямным раем. Як толькі атрады ўцягнуліся ў яго, абвявілі прывал. Людзі падалі на зямлю і адразу засыналі. Не спалі толькі разведчыкі, вартавыя, кухары ды камандаванне брыгады, якое абмяркоўвала план баявых дзеянняў на бліжэйшыя 2–3 дні.

Прааналізавалі данясенні разведкі, вырашылі знішчыць варожыя гарнізоны ў Канатопе і Удранцы,

якія фашысты аднавілі за час свайго апошняга паходу. Гэтыя фарміраванні знаходзіліся ў зоне дзеяння атрада «Грозны» і вельмі перашкаджалі партызанам. Увесь дзень 29 красавіка рыхтаваліся да баявых дзеянняў: чысцілі зброю, рамантавалі абмундзіраванне і абутак. Вечарам разведчыкі далажылі, што хаця гарнізоны і былі павялічаны ў некалькі разоў, але за апошнія дні нікуды не выязджалі, а «рыхтаваліся» да 1 Мая, бо чакалі баявых дзеянняў партызан.

Лютаваў толькі адзін батальён, якім камандаваў фашысцкі галаварэз – любімчык фюрэра штурмбанфюрэр Дзірлівангер. Увесь яго батальён складаўся з крымінальных элементаў, бандытаў, для якіх забіваць людзей, вешаць іх, спальваць стала прафесіяй. Нібы смерч, насіўся ён па паўночна-заходніх і заходніх раёнах вобласці, сеючы смерць, пажары, спусташэнні. Раніцай 30 красавіка батальён уварваўся ў пасёлак Трусавічы і пачаў расправу над мірнымі жыхарамі. Нягледзячы на колькасную і тэхнічную перавагу ворага, «Штурмавая» пайшла на карнікаў. Выйшаўшы на пагорак, убачылі калону гітлераўцаў, расцягнутую амаль на кіламетр.

Фашысты ўжо зрабілі сваю чорную справу і ад'язджалі на вёску Буцькі. Народныя мсціўцы лесам уздоўж дарогі, па якой рухалася калона, пайшлі хуткім маршам, маскіруючыся, каб заўчасна не выявіць сябе. Галаўным ішоў атрад «Грозны», пасля – імя Жукава, далей – «Штурм», імя Фрунзэ. Хутка атрады параўняліся з калонай і рухаліся паралельна ёй. Да вёскі Буцькі было ўжо зусім блізка, і партызаны вырашылі не дапусціць туды фашысцкіх галаварэзаў.

Вось галаўны атрад абагнаў варожую калону. Камандзір Брэчка расставіў «пэтээраўцаў», куля-

мётчыкаў, мінамёты. Побач залеглі байцы атрада імя Жукава. Гламаздзін таксама хутка вызначыў пазіцыю свайго атрада «Штурм»: ён будзе біць па цэнтры калоны. Гурко са сваім атрадам атрымаў заданне ўдарыць па хвасце фашысцкай змяі. Гламаздзін выдзеліў роту аўтаматчыкаў і пад камандаваннем Захара Цыклаурыя адправіў у Буцькі. Яна ў выпадку зацяжнога бою павінна была падняць там страляніну і шум, каб стваралася ўражанне, што да партызан спяшаецца падмацаванне.

Па сігнале белай ракеты ўсе чатыры атрады адкрылі агонь па ворагу, фашысты замітусіліся і як гарох пасыпаліся з аўтамашын. Партызаны ўскочылі, каб праследаваць галаварэзаў, але тыя залеглі і навялі такую страляніну, што прымусілі партызан таксама залегчы. У гітлераўцаў было некалькі гармат, мінамёты, кулямёты, танк і бронемашына. Раптам бранятэхніка аддзялілася і рушыла на партызанскія рады. Васіль Брэчка не сцярпеў, схапіў у пэтээраўцаў ружжо і пабег наўздагон за браневіком. З двух стрэлаў ён падбіў яго. Наперад вырваўся танк. Стрэл – і ён таксама спыніўся, другі – і з танка паваліў густы чорны дым, танкісты пачалі ратавацца бегствам, але падалі ад кулямётных чэргаў.

Раптам бронемашына крута павярнула і пачала адаляцца. Узваліўшы ПТР на плячо, Брэчка зноў пабег за ёй. Вось ён зайшоў справа, каб ударыць у бок, дзе браня слабейшая, прыцэліўся і стрэліў – машына загарэлася. З яе выскачылі два фашысты. Першы тут жа ўпаў на зямлю, пасля ўсхапіўся і што было сілы пабег, пятляючы нібы заяц, да сваіх. Партызаны выпусцілі па ім не адзін дзясятак куль, але ён, падаючы і ўскокваючы, дабег і ўпаў у кювет.

У гэты момант з вёскі Буцькі павёў у атаку сваю роту Цыклаурыя: ён вырашыў, што прыйшоў час «падымаць шум». З крыкам «ура» разгорнуты ланцуг партызан набліжаўся да ворага. Было відвочна, што камроты паспяшаўся: яшчэ крыху – і аўтаматчыкі势 стануць выдатнай мішэнню для фашыстаў. Трэба было штосьці рабіць, і Фёдараў скамандаваў атаку. І вось ужо ўся брыгада са зброяй наперавес кінулася на гітлераўскую банду. Узраўлі маторы, карнікі ўскочылі ў аўтамашыны і кінуліся ўцякаць. Першым ускочыў у машыну той, хто выратаваўся бегствам. А другога з бронемашыны партызаны захапілі жывым. На допыце карнік расказаў, што ён – вадзіцель бронемашыны, а другім быў ніхто іншы, як штурмбанфюрэр СС Дзірлівангер. Стала вельмі шкада, што жорсткаму кату ўдалося збегчы!

Гарнізоны, адноўленыя гітлераўцамі на Удранцы і ў Канатопе, аказаліся ў самым цэнтры дзеяння атрада «Грозны». Больш за тое, аднавіўшы мост на рацэ Удранцы, фашысты ўстанавілі прамы рух па дарозе Радашковічы – Ілля. Цяпер яны маглі лёгка закупорыць партызан у невялікім чатырохкутніку: Астрашыцкі Гарадок – Радашковічы – Ілля – Лагойск – Астрашыцкі Гарадок. Каб не дапусціць гэтага, трэба было ў першую чаргу знішчыць гэтыя гарнізоны, мост на Удранцы і вывесці са строю дарогу Радашковічы – Ілля.

У гонар Першамайскага свята брыгада ноччу разграміла гэты моцны гарнізон на рэчцы Удранка. Галоўны ўдар нанёс атрад «Грозны» пры падтрымцы атрадаў «Штурм», імя Фрунзэ і падраздзялення атрада «За Айчыну». Партызаны спалілі памяшканні гарнізона, знішчылі мост, забілі 11 салдат і 2 паранілі. Група байцоў атрада «Штурм», прыкрываючы

дзеянні асноўных сіл, замініравала шасейную дарогу Удранка – Канатоп і ўзарвала 2 аўтамашыны. Пры гэтым загінула 40 варожых салдат і афіцэр.

З 2 па 15 мая брыгада ўмела манеўравала, ухілілася ад буйных карных падраздзяленняў фашыстаў колькасцю да 10 000 чалавек...

*Хроніка баявых дзеянняў брыгады:*

*«18.05. Пры нападзе атрада "Штурм" на гарнізон вёскі Канатоп спалены ўмацаваныя казармы і гараж, забіта 46 гітлераўцаў, паранена 16. У гаражы згарэлі танк і бронемашына. Страты партызан – 4 забітых і 3 параненых. (Аперацыяй кіравалі т.т. Гламаздзін і Гурко). На ўчастку чыгункі супраць вёскі Шавалі пад адхон спушчаны эшалон. Пашкоджаны паравоз, разбіта 5 вагонаў з вугалем, 3 вагоны пашкоджаны (аперацыяй кіраваў т. Абрамчык).*

*19.05. Атрад "Грозны" зрабіў налёт на гарнізон у в. Удранка. Забіта 5 і цяжка паранена 14 гітлераўцаў, знішчана бронемашына. Страты партызан – 2 забітых і 3 параненых. (Кіравалі аперацыяй т.т. Брэчка і Багданаў).*

*21.05. Група партызан з атрада "Штурм" (старшым быў Ямелін) трапіла на засаду і прыняла бой каля вёскі Путнікі Радашковіцкага раёна. Забіта 3 і паранены 2 паліцэйскія.*

*21.05. Падрыўнікі атрада імя Жукава спусцілі пад адхон эшалон, разбіты паравоз і 6 вагонаў.*

*22.05. Група атрада імя Фрунзэ з засады каля вёскі Грыні абстраляла калону аўтамашын. Забіта 17 і паранены 4 фашысты (кіраўнік т. Руткоўскі).*

*24.05. Група атрада імя Жукава ўзаравала мост даўжынёй 20 пагонных метраў на шасэ Маладзечна – Барысаў ля вёскі Грыні (т. Ціцкі).*

*25.05. Атрад "За Айчыну" разбіў ваенны гарнізон у гаспадарцы былога саўгаса "Прырэз" Лагойскага раёна, Забіта і спалена 37 паліцэйскіх, адзін нямецкі афіцэр і 1 жандарм. Спалены ўсе гаспадарчыя пабудовы, 3 трактары, забралі 80 коней, 120 авечак, 170 кароў. Узяты трафеі: ротны мінамёт, 16 мін, станкавы кулямёт, 7 вінтовак, 3,5 тыс. патронаў, 9 веласіпедаў... Страты партызан: двое забітых. (Камандзір т. Захараў).*

*26.05. Група атрада імя Жукава разграміла Сёмкаўскі малаказавод (кіраўнік т. Власаў).*

*29.05. Група атрада "Штурм" у засадзе на шасэ каля вёсак Новы Двор – Казекава знішчыла 2 легкавыя аўтамашыны, забіты 3 афіцэры і 9 салдат. Абстрэляна і трэцяя аўтамашына, у якой былі забітыя і параненыя. Колькасць іх не ўстаноўлена. (Кіраўнік т. Шубін)».*

Як бачна, амаль кожны дзень партызаны выходзілі на баявыя аперацыі, не давалі спакою ворагу, наносілі яму страты, бралі трафеі. Заўважым, што такія выніковыя баявыя дзеянні брыгада вяла ва ўмовах карнай экспедыцыі ворага. Прычым кожная аперацыя праводзілася пасля дакладнай разведкі, якой у брыгадзе кіраваў Мікалай Іванавіч Казлоў, а ў кожным атрадзе быў створаны ўзвод разведчыкаў. У кожным гарнізоне, у кожным населеным пункце працавалі сувязныя і агенты пад агульным кіраўніцтвам начальніка асобага аддзела брыгады сяржанта дзяржбяспекі Беліка.

Перад чарговай аперацыяй разведданыя скрупулёзна аналізавалі ў штабах, і калі ў ёй павінен быў удзельнічаць амаль увесь састаў брыгады, аперацыю дэталёва абмяркоўвалі ў штабе брыгады,

дзе прысутнічала камандаванне кожнага атрада, складалі падрабязны план, які пасля афармляўся загадам, падпісаным камандаваннем брыгады. Вось як, напрыклад, у чарговым загадзе кіраўніцтвам брыгады распланавана аперацыя па разгроме варожага гарнізона ў Хаценчыцах, якая была праведзена ноччу з 22 на 23 чэрвеня 1943 года.

*З архіўных дакументаў:*

*«...Атрады "Штурм", імя Фрунзэ акружаюць гарнізон Хаценчыцы, арганізуюць сістэму абароны ва ўсе бакі па ўзводах і аддзяленнях. Правесці рэкагнасцыроўку мясцовасці. Скрытна заняць баявыя парадкі і выставіць пасты назірання. Сусед справа – атрад імя Фрунзэ (старшы лейтэнант Гурко) займае населены пункт Цесны (на паўднёва паўднёвы ўсход ад Раёўкі 1,5 км). Калі гарнізон Раёўкі выйдзе раніцай на падмогу да Хаценчыц, днём сілай аднаго ўзвода знішчыць ахову гарнізона Раёўка. Забяспечыць заслонамі сілай двух аддзяленняў дарогі Раёўка – Краснае, Раёўка – Ілля – Хаценчыцы. Астатнім прыступіць да знішчэння кардоннага і лесапільнага заводаў, казарм, вялікіх пабудоў, мастоў і ўстаноў.*

*Атраду "Грозны" заняць хутар Баравы (зыходны пункт паміж Хаценчыцамі і Зачарэтам). Дзейнічаць у тыле праціўніка, які выйдзе з гарнізона Ілля. Забяспечыць сябе дазорамі па дарозе на паўднёвы ўсход населенага пункта Казлы за 2 кіламетры на ўзлеску.*

*Пункт медыцынскай дапамогі размясціць у в. Дварэц. Параненых адпраўляць на падводах.*

*Сігналы: б'ю з тылу – адна чырвоная і адна зялёная ракеты, адступаю – 2 зялёныя, прашу дапамогі – 2 чырвоныя ракеты.*

*Камбрыг ЛУНІН, Камісар ФЁДАРАЎ, Начштаба ФОГЕЛЬ».*

Такая дакладная прапрацоўка тактыкі аперацый прыносіла поспех: перамогай народных мсціўцаў закончыўся і гэты бой. Баявым поспехам атрадаў, безумоўна, садзейнічала і вучоба партызан, арганізаваная ў кожным атрадзе па прапанове камісара Фёдарава. Была зацверджана 28-гадзінная праграма заняткаў па тактыцы партызанскай барацьбы, страявой і стралковай падрыхтоўцы, інжынернай справе. На занятках па тактыцы разглядаліся такія тэмы: засады, марш па дарозе і бездарожжы, дысцыпліна, узаемадапамога і ўзаемаадносіны на маршы, часовыя прыпынкі, адкрыты бой з праціўнікам, разгром гарнізонаў, прарыў і выхад з акружэння.

Баявы рахунак брыгады з 1 красавіка па 1 чэрвеня 1943 года павялічыўся на 7 разгромленых гарнізонаў, 11 спушчаных пад адхон эшалонаў, 27 падбітых аўтамашын, 4 танкі і дзве танкеткі, 12 узарваных і спаленых чыгуначных і шасейных мастоў, 1144 тон паліва. У баях з карнікамі, пры крушэнні эшалонаў і знішчэнні аўтамашын забіта 672 і паранена 248 гітлераўскіх салдат і афіцэраў.

...Фёдараў стараўся трымаць пад сваім кантролем нават дробязі брыгаднага жыцця і быту, часта быў у атрадах, дзе стварылі партыйныя арганізацыі або ячэйкі, склікаў агульныя партыйныя сходы. На адным з партыйных сходаў Ілля Мартынавіч зноў паставіў пытанне аб воінскай дысцыпліне, аб паводзінах партызан у населеных пунктах, у паўсядзённым побыце. Прыпомнілі выпадкі, калі з-за нізкай дысцыпліны, п’янак двое партызан з атрада Захарава былі забіты, а адзін заснуў на варце і трапіў у палон.

– Аднымі выхаваўчымі мерамі з гэтым злом змагацца цяжка, – сказаў Фёдараў. – Таму прапаную падумаць і пра спосабы дысцыплінарнай адказнасці.

– Што тут доўга думаць і абмяркоўваць, – падаў голас начальнік асобага аддзела Белік. – Каб захаваць прынцып законнасці, трэба стварыць ваенна-рэвалюцыйны трыбунал, і справы па ўсіх сур'ёзных парушэннях разглядаць на пасяджэнні гэтага прававога органа.

Па загаду ад 25 красавіка 1943 года ваенна-рэвалюцыйны трыбунал узначаліў батальённы камісар Патомскі (камісар атрада «За Айчыну»), следчым прызначылі Данскога (упаўнаважаны асобага аддзела атрада імя Жукава), членамі трыбунала сталі Чугуеў (начальнік штаба атрада «Грозны»), Петрашкевіч (камісар атрада імя Фрунзэ), сакратаром – загадчык спраprojectводства штаба брыгады Ярастаў.

І ўжо ў маі 1943 года трыбунал разгледзеў справу партызан атрада імя Фрунзэ Канстанціна Л. і Соф'і Ж. Старшы лейтэнант Л. сістэматычна парушаў воінскую дысцыпліну, п'янстваваў, на заўвагі камандзіраў не рэагаваў, займаўся марадзёрствам. З мэтай уцёкаў з атрада стаў згрупоўваць вакол сябе такіх жа п'яніц. У сакавіку яго выключылі з партыі, але і гэта сур'ёзная мера не дала жаданых вынікаў. Ён стаў яшчэ больш прыкладвацца да чаркі, звязаўся з Соф'яй Ж., якая вяла амаральны спосаб жыцця. Трыбунал абодвум фігурантам вынес справядлівы прыгавор.

Судовы орган брыгады разглядаў справы не толькі партызан, але і жыхароў вёсак сваёй зоны, якую надзейна кантралявала «Штурмавая» і яе атрады. На разгляд трыбунала, напрыклад, была

вынесена справа па абвінавачанні сям'і з адной з вёсак Лагойскага раёна ў супрацоўніцтве з фашыстамі. Пад следства трапіў гаспадар, яго жонка, сын і дачка. Падставай для падазрэння паслужыў той факт, што у час карнай экспедыцыі ў Прудзішчанскай воласці, сям'я не выехала са сваёй вёскі, а часта бесперашкодна наведвала Лагойск, і карнікі яе чамусьці не чапалі.

За час карных мерапрыемстваў фашыстаў тут былі спалены 64 дамы, 21 чалавек загінуў у пажарах. Хтосьці выдаў мясцовую падпольную камсамольска-маладзёжную групу, і яе членаў разам з сакратаром камсамольскай арганізацыі Верай Качан расстралялі. Падазрэнні ў гэтай цяжкай здрадзе са слоў мясцовых «добразычлівыўцаў» таксама ляглі на гэту сям'ю. На пасяджэнні ваенна-рэвалюцыйнага трыбунала скрупулёзна разглядаліся ўсе доказы следства і паказанні саміх абвінавачаных. Следства і члены трыбунала не знайшлі пераканаўчых фактаў здрады, і сям'я была апраўдана...

*З архіўных дакументаў:*

*«27.05. Загад № 00-42. За апошнія дні з Мінска ў партызанскія раёны выпушчана 300 шпіёнаў, узброеных асабістай зброяй, вінтоўкамі і ядамі – мыш'як, стрыхнін і да т. п. Прыём у атрады людзей з Мінска скараціць да мінімуму, прыбыўшых правяраць у асобым аддзеле. У нарад на кухню – толькі правераных людзей, не дапускаць туды прынятых у атрады нядаўна».*

На пачатку ліпеня 1943 года карныя падраздзяленні фашыстаў зноў запоўнілі мінскую партызанскую зону. Яны вярталіся

ў Мінск з Дамжэрыцкіх і Палікоўскіх балот, дзе беспаспяхова вялі барацьбу з лясымі салдатамі брыгад «Народны мсцівец», імя Фрунзэ, «Жалязняк», «Дзядзі Колі», Лабанка, Дуброўскага, Мельнікава і іншых. Яны спадзяваліся мімаходзь агульнымі сіламі расправіцца з брыгадай «Штурмавая», але наткнуліся на шматлікія перакопы дарог, лясныя завалы, на ўзарваныя або спаленыя масты.

Двое сутак яны рамантавалі дарогі і масты, а на трэція нечакана зніклі. Партызаны спачатку не маглі зразумець такога паспешлівага адыходу ворага, толькі вечарам 5 ліпеня па радыё пачулі, што гітлераўская армія пачала наступленне на курска-арлоўскім напрамку. Наступленне, як мы ведаем, адразу ж захлынулася, і таму фашыстам было не да экспедыцый. Так бясслаўна завяршылася яшчэ адна карная аперацыя – пад кодавай назвай «Котбус».

...Ілля Мартынавіч часта наведваў вёскі сваёй зоны, праводзіў там мітынгі, сустракаўся з мясцовымі падпольшчыкамі і сувязнымі, камендантамі і старастамі. Гэта давала магчымасць дасканала з першых рук ведаць абстаноўку ў наваколлі, пажаданні і патрэбы людзей, своечасова дапамагаць ім. Такая зваротная сувязь прыносіла ўзаемную карысць. Цяпер, напярэдадні жніва, трэба было вызначыць, якімі сіламі дапамагчы сялянам сабраць тое, што вырасла на іх ніве, надзейна схаваць і зберагчы ўраджай. Удзел у пасяўной і жніве стаў ужо добрай партызанскай традыцыяй брыгады «Штурмавая», і першую скрыпку тут заўсёдыігралі партыйныя і камсамольскія арганізацыі і, зразумела ж, важак камуністаў і камісар Фёдараў.

Выслухаўшы і занатаваўшы пажаданні сялян, Ілля Мартынавіч адправіўся на базу. У штабе бры-

гады нікога не аказалася, акрамя радыста, які якраз прымаў чарговую радыёграму. Закончыўшы прыём, радыст падаў Фёдараву бланк з тэкстам расшыфраванай дэпешы і па знаку камісара вярнуўся ў свой пакойчык. Фёдараў уважліва прачытаў радыёграму, якую падпісаў Р. Н. Мачульскі. У ёй гаварылася пра школы гестапа, што перадыслацыраваліся ў Мінск з вызваленых гарадоў Расіі.

Камісар выклікаў дзяжурнага па штабе і загадаў паслаць сувязнога за начальнікам разведкі брыгады і начальнікам асобага аддзела, якія ў гэты час заканчвалі нараду з партызанскімі разведчыкамі. У штаб зайшоў намеснік камандзіра брыгады па разведцы А. М. Клюй – да вайны дырэктар Траскоўскай школы. У канцы чэрвеня былы камандзір брыгаднай разведкі М. І. Казлоў выбыў з брыгады, і на гэту пасаду быў прызначаны яго намеснік.

– Што думаеш, Аляксей Максімавіч? – спытаў яго Фёдараў, пасля таго як той прачытаў тэрміновую дэпешу ўпаўнаважанага ЦК КП(б)Б.

– Я даўно прапаноўваў яшчэ больш узмацніць нашу агентурную разведку ў ваколіцах Мінска і ў самім горадзе. Тое-сёе ў гэтым кірунку зроблена, але, відаць, недастаткова, раз пра такія факты мы даведваемся не ад сваіх агентаў, а з радыётэлеграм вышэйшага кіраўніцтва.

У суправаджэнні пасыльнага ў штаб увайшоў начальнік асобага аддзела брыгады лейтэнант дзяржбяспекі Белік, яго толькі нядаўна павысілі ў званні. Фёдараў падаў яму тэлеграму і загадаў далажыць пра стан агентурнай разведкі ў Мінску.

– Пра школы гестапа з вызваленых гарадоў у нас вестак малавата. Ведаем толькі, што яны

размясціліся на былой Інтэрнацыянальнай, але нашым разведчыкам не ўдалося пакуль больш дакладна ўстанавіць іх састаў і напрамак падрыхтоўкі агентуры. Думаю, неўзабаве мы гэта зробім і адразу ж паведамім у штаб партызанскага руху.

– Мы дакладна ўстанавілі, што штаб Мінскага СД стварыў разведцэнтр з філіяламі ў Баранавічах, Вілейцы, Ганцавічах, Маладзечне і Лідзе, – заўважыў Аляксей Максімавіч. – Іх задача – арганізацыя шпіянажу ў партызанскіх атрадах. У сярэдзіне снежня пад выглядам перабежчыкаў у зоны Баранавіцкай і Мінскай абласцей накіравана 50 дыверсантаў-разведчыкаў са зброяй. Яны закончылі спецыяльныя курсы і павінны ўстанавіць дыслакацыю атрадаў і брыгад, іх колькасны і камандны састаў, узбраенне. Наша разведка цяпер узмоцнена працуе, каб выявіць такіх агентаў.

– Значыць, іх тактыка з засылкай дробных груп пад выглядам партызан, якія нібы адсталі ад сваіх атрадаў, не спрацавала, – задуменна вымавіў Фёдараў. – Памятаю, у сакавіку была выяўлена і ліквідавана такая група. Цяпер, таварышы, нам трэба дапамагаць нашай гераічнай Чырвонай Арміі не толькі ўзмацненнем баявой і дыверсійнай дзейнасці, але і глыбокай, усебаковай і дакладнай разведкай. Гэта задача не толькі ваша, Аляксей Максімавіч, але і нашых асабістаў. Трэба падрыхтаваць адпаведны загад па разведцы і контрразведцы. У ім – спасылацца на гэту радыёграму і дэпешу т. Калініна.

Неўзабаве такі загад па брыгадзе «Штурмавая» быў падрыхтаваны і даведзены да ведама камандавання атрадаў і іх разведак.

*З архіўных дакументаў:*

*«16.07.43 г. Атрадам брыгады неадкладна правесці работу згодна з радыёграмамі т. Мачульскага: "Камандзірам і камісарам брыгад і атрадаў. Па апошніх даных разведкі з вызваленых раёнаў Арла, Бранска, Смаленска, Рослаўля, Клінцоў і іншых гарадоў немцы перадыслацыравалі школы гестапа на тэрыторыю Беларусі. Прыміце меры па ўстанаўленні месцаў дыслакацыі гэтых школ, іх колькаснага саставу. Каго рыхтуюць – разведчыкаў, дыверсантаў, тэрарыстаў, у якія тэрміны робяць выпуск, куды закідваюць агентуру? Вынікі далажыце неадкладна"; і т. Калініна: "Па нашых даных у Мінску фарміруецца батальён СС. Арганізуйце праверку гэтых даных, устанавіце колькасны і нацыянальны састаў, месца дыслакацыі, яго нумерацыю і мэты фарміравання.*

*За камбрыга – ваенкам ФЁДАРАЎ».*

– Справімся мы і са шпіёнамі, падрыхтаванымі разведцэнтрам Мінскага СД і яго філіяламі, – запэўніў Белік. – Мы вельмі скрупулёзна правяраем усіх навічкоў, што паступаюць да нас, асабліва з Мінска. Ва ўсіх гарнізонах працуюць нашы агенты, і ім будуць даведзены новыя задачы.

– Разведчыкі ўстанавілі, што ў Заслаўскі гарнізон прыбыло каля паўтары тысячы рэгулярных войск, – далажыў Аляксей Максімавіч. – Па папярэдніх звестках, яны накіроўваюцца на ўсход. Ёсць думка ўзмацніць дыверсіі на чыгунцы па шляху эшалонаў. Трэба зрабіць так, каб як мага менш фашысцкіх ваяк трапіла на фронт, і гэта будзе нашай партызанскай дапамогай гераічнай Чырвонай Арміі.

Гэта прапанова начальніка брыгаднай разведкі неўзабаве набыла канкрэтае напаўненне: брыгада

амаль усім саставам прыняла ўдзел у слаўнай баявой аперацыі беларускіх партызан, якая атрымала кодавую назву «Вайна на рэйках».

## ВАЙНА НА РЭЙКАХ

У ліпені 1943 года ў штаб брыгады прыскакаў пасыльны брыгады «Народныя мсціўцы» і запытаў:

– Ці магу я бачыць камандзіра брыгады?

– Яго няма, ёсць камісар, – адказаў справавод штаба Фёдар Ярастаў і кіўком галавы паказаў у бок Іллі Мартынавіча.

– Таварыш камісар, камбрыг Варанянскі просіць вас прыбыць да яго неадкладна!

Фёдараў з ардынарцам хутка засядлалі коней і ў суправаджэнні пасыльнага накіраваліся ў штаб «Народных мсціўцаў». Брыгада гэта размяшчалася за 70–75 кіламетраў ад «Штурмавой», непадалёку ад вёскі Гаравец былога Бягомльскага раёна. Штаб брыгады займаў домік лясніка. Маёр Варанянскі выйшаў насустрач гасцям і павёў Фёдарава ў хату, дзе, акрамя камісара Сямёнава, нікога не было. Васіль Трафімавіч, не спяшаючыся, адкрыў сваю планшэтку і выняў з яе невялікі пакет.

– Прачытай уважліва і знішчы. Усе, каго гэта тычыцца, ужо азнаёмлены з гэтым дакументам.

У канверце аказалася шэранькая паперка – пісьмо Беларускага штаба партызанскага руху з грыфам «зусім сакрэтна». Тое, пра што ў ім гаварылася, было для Фёдарава нечаканым. Паведамлялася, што ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне ўзмацніць партызанскія ўдары па камунікацыях ворага, каб зрабіць немагчымымі перавозкі на фронт

войскаў праціўніка, баявой тэхнікі, боепрыпасаў, паліва і прадуктаў харчавання. З гэтай мэтай усе партызанскія фарміраванні павінны адначасова выйсці на вызначаныя ўчасткі чыгункі і вывесці са строю жалезныя дарогі Беларусі, спаліць або прывесці ў непрыгоднасць чыгуначныя збудаванні, запасы шпал і рэек. Аб'яўлялася «рэйкавая вайна».

Гэта было новае ў партызанскай барацьбе, бо да гэтага часу кожнае фарміраванне народных мсціўцаў дзейнічала на камунікацыях праціўніка на свой погляд і ад выпадку да выпадку. Таму гітлераўцам удавалася даволі лёгка і хутка ліквідаваць пашкоджанні на чыгунках і дарогах. Цяпер вайна на камунікацыях прыме арганізаваны і мэтанакіраваны характар, разважаў на зваротным шляху Фёдараў і ўяўляў сабе, што адной бліжэйшай ноччу ўсе партызанскія атрады адначасова выйдуць на «жалезку», і фашыстам прыйдзецца шукаць многа рэек для рамонту чыгункі, а эшалоны будуць стаяць нерухома, і фронт не атрымае падмацаванняў і боепрыпасаў.

Фёдараў радаваўся, што цяпер брыгада будзе дзейнічаць не сама па сабе, а па заданні ЦК КП(б) Б, што яна атрымала адказнае, але цалкам рэальнае заданне. І толькі цяпер да яго дайшло разуменне, што далёка не ўсе лясныя салдаты ўмеюць абыходзіцца са ўзрыўчаткай, і перш чым ісці на чыгунку, трэба літаральна ўсіх партызан і партызанак навучыць падрыўной справе. Яны павінны ўмець ставіць зарады, хутка па камандзе падпальваць бікфордаў шнур і арганізавана па камандзе адыходзіць.

Пасля вяртання камісара ў штаб адразу ж склікалі нараду каманднага саставу атрадаў і сакратароў партарганізацый, на якой Фёдараў

зрабіў падрабязны даклад пра адказнае баявое заданне ЦК КП(б)Б і задачах па яго рэалізацыі. На наступны дзень камісар і начальнік штаба брыгады пабывалі ў кожным атрадзе і назіралі, як старшыя падрыўных груп і вопытныя лепшыя мінёры на лясных палянках паблізу сваіх лагераў праводзілі заняткі. Тут навучаліся ўсе – ад радавога байца да камандзіра і палітрука роты.

Прайшло некалькі дзён, і ў штабе «Штурмавой» атрымалі паведамленне ад камандавання брыгады імя Жалезняка, што на Бягомльскі аэрадром з Вялікай зямлі прыбыў груз для ўсёй Бягомльска-Барысаўскай зоны, у тым ліку і для іх брыгады. За грузам адправілі некалькі падвод. У пасылцы з Вялікай зямлі аказаліся не толькі тол, бікфордаў шнур і ўзрывальнікі, але і аўтаматы, два ручныя кулямёты і патроны. Было прыемна ўсведамляць, што таварышы з БШПР паслалі груз з глыбокім веданнем справы: акрамя ўзрыўчаткі не забыліся адправіць зброю і боепрыпасы для падаўлення агнявых кропак і ахоўнікаў чыгункі.

Сігнал да пачатку рэйкавай вайны «Штурмавая» атрымала за суткі да аперацыі – вечарам 1 жніўня. Гэтага сігналу чакалі і былі гатовыя да выкананя задання. Тым больш, што ўчастак чыгункі, на які павінны былі выйсці падрыўнікі брыгады, аказаўся яе байцам добра знаёмым: перагон ад Маладзечна да Мінска, дзе заўсёды яны і дзейнічалі. Тут усё было вядома – кожны кусцік, кожная сцяжынка. Праўда, быў ён і самым небяспечным: праціўнік насадзіў тут гарнізоны на ўсіх станцыях, паўстанках і прыдарожных населеных пунктах. Акрамя таго, тут размясціліся і прамежкавыя гарнізоны ў дотах, дзотах і бліндажах.

Штаб напісаў загад, згодна з якім уся брыгада (1400 чалавек) 2 жніўня канцэнтруецца паміж вёскамі Чыравічы, Галавачы і Танелева і адтуль кожны атрад пры наступленні змроку выходзіць на свой участак чыгункі: «За Айчыну» – перагон Ратамка–Заслаўе, «Штурм» – Недраска–Пятрышкі, імя Фрунзэ – Пятрышкі–Слёдчыкі, «Грозны» – Аляхновічы–Баяры, імя Жукава – Баяры–Плябань і імя Панамарэнкі – Кляпчаны–Маладзечна. Усе атрады своечасова прыбылі на подступы да ўказаных участкаў, і пасля невялікага адпачынку іх ударныя групы пайшлі наперад, а ўслед за імі адправіліся і падрыўнікі. Стаяла ціхая летняя ноч, у змроку чуваць былі толькі крыкі начных птушак ды лёгкі посвіст ветру.

На чыгунцы – таксама цішыня. Толькі ледзьве прыкметныя сілуэты патрулёў, што то сходзяцца, то разыходзяцца ў розныя бакі. Загадам устанавілі ўмоўны час штурму агнявых кропак ворага, адначасовы для ўсіх атрадаў, – 00.30 трэцяга жніўня, каб на ўсім участку ад Маладзечна да Мінска аперацыя стала для гітлераўцаў поўнай нечаканасцю. Раптоўнасць і хуткасць атакі – аснова партызанскай стратэгіі і тактыкі. І вось наступіла доўгачаканая мінута. Камандзіры атрадаў выгукнулі: «Наперад! Ура!» – і на ворага абрынуўся шквал кулямётнага і аўтаматнага агню. Удар аказаўся такім імклівым, што ахова нават не змагла адкрыць арганізаванага агню ў адказ, а ў паніцы збегла ці была знішчана.

Услед за ўдарнымі групамі на насып уварваліся падрыўнікі і хутка разбегліся ўправа і ўлева ўздоўж каляі, сталі падкладваць пад рэйкі толавыя шашкі. Каманда: «Падпальвай!» – і над чыгункай замільгалі агеньчыкі. Не прайшло і мінуты – новая каманда:

«Адыходзь!» – і партызан змяло з насыпу нібы ветрам. А на ім пачалося нешта, што нельга было і ўявіць, – загрымелі ўзрывы, паветра задрыжэла, цераз галовы партызан паляцелі са свістам і фырканнем кавалкі металу, дрэва, каменне і пясок.

– Вось гэта канцэрт! – усклікнуў разведчык атрада «Грозны» Фёдар Янкоўскі. Ён і не падазраваў, што яго трапная назва аперацыі стане потым кодавым найменнем наступнага этапа «рэйкавай вайны».

А ў тую ноч брыгада перабіла 1556 рэек, паваліла больш як 100 тэлеграфных слупоў, спаліла штабелі запасных шпал, забіла 47 і параніла 29 салдат, якія ахоўвалі чыгунку. Больш за тое, эшалон з жывой сілай, які ішоў на фронт, пры ўзрывах спыніўся, і ў яго ўрэзаўся другі, з ваеннай тэхнікай. Пры сутыкненні разбіліся паравоз, 6 платформ з танкамі другога эшалона і 6 вагонаў з жывой сілай першага. Загінула 48 і было паранена 14 салдат і афіцэраў. Пад канец наступнага за аперацыяй дня сувязныя на чыгунцы паведамілі пра разгубленасць фашыстаў і пра тое, што яны злыя і нікога, апроч майстроў, на чыгунку не падпускаюць. А партызаны працягвалі наносіць удары.

*Хроніка баявых дзеянняў брыгады:*

*«06.08.43. Атрад "За Айчыну" зрабіў 115 узрываў на перагоне паміж станцыяй Ратамка і паўстанкам Зялёнае.*

*11.08.43. Атрад імя Жукава на перагоне Аляхновічы–Пятрышкі перабіў 180 рэльсаў, знішчана 6 ахоўнікаў чыгункі».*

У загадзе начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху генерал-лейтэнант П. К. Пана-

марэнка пісаў: «За перыяд правядзення аперацыі на чыгуначна-дарожных камунікацыях праціўніка асабліва вызначыліся партызаны васямнаццаці партызанскіх аб'яднанняў, у тым ліку брыгада "Штурмавая", якія перавыканалі баявыя заданні. Аб'яўляю падзяку. Камандзірам і камісарам прадставіць да ўрадавых узнагарод партызан, якія асабліва вызначыліся». Вытрымку з гэтага дакумента лясныя салдаты атрымалі па радыё, і загад выклікаў вялікі ўздым і энтузіязм у брыгадзе.

У другой палавіне жніўня і першай палавіне верасня 1943 года брыгада з-за адсутнасці ўзрыўчаткі часова спыніла дыверсіі на чыгунцы і пераключылася на іншыя формы барацьбы з акупантамі (засады, разгром гарнізонаў і дзяржаўных маёнткаў). Пасля разведкі і адпаведнай падрыхтоўкі атрад «Штурм» і адзін узвод атрада імя Фрунзэ 25 жніўня разграміў моцны гарнізон ворага ў вёсцы Рогава. Тут, як мы ўпаміналі вышэй, з ліпеня 1941 да 12 студзеня 1943 года знаходзіўся канцлагер для ваеннапалонных. Пасля таго як ваеннапалонныя перабілі лагерную ахову і ўцяклі ў партызаны, акупанты стварылі тут свой апорны пункт супраць народных мсціўцаў.

Вёска Рогава размешчана па абодвух баках шасейнай дарогі Мінск–Маладзечна і займае вельмі выгаднае для гітлераўцаў становішча. Партызанам гэты гарнізон моцна перашкаджаў, бо быў самым блізкім да размяшчэння атрадаў і стаяў на іх шляху да чыгункі. У ходзе аперацыі лясныя салдаты забілі 33, паранілі 4 гітлераўцаў, захапілі 3 кулямёты, мінамёт, больш як 40 вінтовак і аўтаматаў, 6 тысяч патронаў, 50 гранат, 8 падвод з коньмі, 800 пудоў збожжа (500 пудоў раздалі насельніцтву). Былі

знішчаны казарма, канюшня, доты і ўсе ўмацаванні, 3 вузкакалейныя паравозы, дзве паравыя машыны, дзве аўтамашыны, гараж. Атрад страт не меў.

30 жніўня атрад «За Айчыну» Уладзіміра Захарава разграміў буйны дзяржаўны маёнтак «Дубаўляны», які ахоўвалі 409 нямецкіх салдат і афіцэраў і 11 паліцаяў. Было забіта 19 і паранена 5 гітлераўцаў, спалены ўсе гаспадарчыя пабудовы і 4 тыс. пудоў збожжа ў стагах і скірдах. З Мінска на аўтамашынах спяшалася падмацаванне акупантам. Але першая машына ўзарвалася на міне і трапіла пад абстрэл патрызан з засады, астатнія тры развярнуліся і зніклі.

У гэту ж ноч група партызан з атрада імя Панамарэнкі пад камандаваннем камузвода Васіля Краўчанкі сумесна з разведчыкамі атрада «Грозны» напала на гарнізон у вёсцы Красоўшчына пад Радашковічамі. Партызаны вызвалілі 53 грамадзян, якіх фашысты планавалі забраць у рабства...

## У БАЯВЫМ СТРАІ – МЕДЫЦЫНА

Ці трэба гаварыць, як важна для салдата ўсведамленне таго, што ў выпадку ранення яго абавязкова выратуюць, вылечаць і зноў паставяць у баявы строй. Малады атрад «Штурм» сутыкнуўся з бядой яшчэ ў красавіку 1942 года, калі падабраў цяжка параненага палітрука Федасеева пасля разгрому атрада Асташонка. Разрыўная куля раздрабіла Федасееву ніжнюю сківіцу і пашкодзіла гартань. Лясныя салдаты моўчкі абступілі палітрука, але ніхто нічым дапамагчы яму не мог. Сам ён аказаўся энергічным і знаходлівым чалавекам,

і вырашыў адправіцца ў Мінск, дзе яшчэ заставаліся яго сябры і паплечнікі па падпольнай барацьбе.

Федасееў у суправаджэнні мінчаніна Сакалова шчасліва дабраўся ў сталіцу і прыйшоў да Ігната Барсука, у якога аказаўся добра знаёмы ўрач-хірург Дзмітрый Савельевіч Рыдлеўскі. Ён і пачаў лячыць палітработніка Фёдара Федасеева.

А ў «Штурме» яшчэ нейкі час медыкаў не было. Абставіны між тым вымагалі... У засадзе ля вёскі Новы Двор цяжка параніла камандзіра ўзвода Мікалая Казіцына, пры мініраванні чыгункі цяжкую траўму вачэй атрымаў Аляксей Клюй, з групай Сямёна Кулаковіча ў атрад прыйшлі два параненыя. Іх колькасць павялічвалася, а лячыць іх не было каму. Гэта пачало адбівацца на баяздольнасці атрада: партызаны больш за ўсё баяліся ранення. Ды і глядзець на пакуты параненых было цяжка. Асабліва пакутаваў ад болю Казіцын: разрыўная куля раздрабіла яму бядро вышэй калена.

Вырашылі запрасіць на дапамогу Рыдлеўскага, які лячыў Федасеева. Апошні, вярнуўшыся у атрад, многае расказаў пра гэтага адважнага патрыёта. І вось па атрадзе разнеслася вестка: «Да нас едзе доктар!» Гэта быў зусім яшчэ малады чалавек, з твару якога, здавалася, ніколі не сыходзіла прыязная ўсмешка. Усё ў яго абліччы гаварыла пра тое, што Рыдлеўскі – чалавек, народжаны для мірнай і высакароднай дзейнасці, і ніхто з народных мсціўцаў пры першай сустрэчы з ім не мог сабе ўявіць, што гэты зусім грамадзянскі прадстаўнік мірнай прафесіі арганізуе і ўзначаліць партызанскі шпіталь і, больш за тое, стане адначасова і камандзірам буйнога атрада.

Дзмітрый Савельевіч перад вайной працаваў асістэнтам кафедры анатоміі Мінскага меды-

цынскага інстытута, удасканальваўся па хірургіі ў 2-й клінічнай бальніцы. А ў пачатку вайны, адправіўшы сям'ю ў тыл, не паспеў ні эвакуіравацца, ні ўліцца ў рады Чырвонай Арміі і апынуўся на акупіраванай тэрыторыі. Ён пачаў шукаць сувязі з падпольшчыкамі і хутка сустрэў свайго добра знаёмага камуніста Ігната Барсука. Так Дзмітрый стаў падпольшчыкам. Па заданні сваёй групы ён паступіў на работу ў Мінскую чыгуначную бальніцу, дзе тайна лячылася многа параненых чырвонаармейцаў. Рыдлеўскаму ўдалося ўладкавацца ў рэнтген-кабінет гэтай бальніцы, і ноччу ён тайком ад адміністрацыі і малазнаёмых супрацоўнікаў станавіўся да хірургічнага стала і рабіў аперацыі тым, хто падпольна трапляў сюды на лячэнне. Неўзабаве яму ўдалося перайсці ў цэнтральную паліклініку на вуліцы Мяснікова па хірургам. Тут ён і лячыў палітрука Федасеева, як і многіх іншых патрыётаў, якіх накіроўвалі сюды падпольшчыкі.

У атрад Дзмітрый Савельевіч прыйшоў не з пустымі рукамі, прывёз неабходны хірургічны інструмент і адразу папрасіў паказаць яму параненых. Неабходна было неадкладна рабіць аперацыю Мікалаю Казіцыну. Тут жа, пад адкрытым небам абсталявалі аперацыйны стол, і Рыдлеўскі прыступіў да работы. Назіраючы за рукамі хірурга, партызаны адразу зразумелі: гэта майстар сваёй справы. Аперацыю рабілі пад мясцовым наркозам, і хірург вясёлымі жартамі стараўся падбадзёрыць пацыента, усяліць у яго веру ў добры зыход справы. Як толькі аперацыю закончылі, спакойны Казіцын заснуў глыбокім сном.

Доктар агледзеў іншых параненых, многім пачысціў раны, памяняў павязкі і, ад'язджаючы, сказаў:

– Буду прыязджаць і назіраць за параненымі, зусім пераехаць пакуль не магу: у Мінску ў мяне таксама многа хворых.

Ён яшчэ двойчы прыязджаў на веласіпедзе ў атрад, аперыраваў новых пацыентаў, лячыў іх, даваў указанні і рэкамендацыі медыцынскім сёстрам Марыі і Надзі Барсук. Аднак доўга так працягвацца не магло. Гітлераўцы і іх пасобнікі прыкмецілі, што Рыдлеўскі выязджае за горад, і яго паводзіны здаліся ім падазронымі. Неўзабаве ён заўважыў, што за ім вядуць слежку. Атрымаўшы дазвол падпольнай групы, Рыдлеўскі жнівеньскім ранкам пакінуў Мінск і праз некалькі гадзін быў ужо ў атрадзе.

У Дзмітрыя Савельевіча акрамя залатых рук аказаўся яшчэ адзін бясцэнны дар – бадзёры і вясёлы нораў. Неўзабаве пад яго кіраўніцтвам у самым прыгожым і добра замаскіраваным ад варожай авіяцыі месцы ў лесе, паблізу светлай рачулкі ў прасторных і светлых зямлянках абсталявалі аперацыйную, ізалятар, палаты для параненых, лазню і іншыя дапаможныя памяшканні. Казіцын, Савельеў і іншыя пацыенты доктара хутка выздараўлівалі, і партызаны глядзелі на Рыдлеўскага як на мага і чараўніка. Цяпер яны сталі яшчэ больш бясстрашнымі і смела ішлі на любую баявую аперацыю.

Дарэчы, знаёмячыся з архіўнымі дакументамі брыгады, я звярнуў увагу на загад па атрадзе «Штурм», якім аб'яўлялася падзяка некалькім партызанам, у тым ліку Міхаілу Буглаку і Пятру Лісаву, за вялікі ўклад у будаўніцтва і абсталяванне зямлянак для шпіталя. Абодвух гэтых людзей я добра ведаў: пасля вайны, у 80-х гадах мінулага стагоддзя

мне давялося працаваць у Мінскай раённай газеце, дзе фотакарэспандэнтам быў Міхаіл Канстанцінавіч Буглак, які падлеткам ваяваў у атрадзе «Штурм». Пётр Лісаў, былы камандзір роты падрыўнікоў атрада, часта прыходзіў да свайго баявога таварыша, і ад іх я многае даведаўся пра гісторыю брыгады, яе ваенныя подзвігі, пра камісара Фёдарава, з якім мне пашчасціла потым пазнаёміцца і пасябраваць.

Калі атрады аб'ядналіся ў брыгаду, шпіталь таксама стаў брыгадным, а Рыдлеўскі – яго начальнікам. Але работа шпіталя выходзіла далёка за рамкі брыгады: сюды прывозілі цяжка параненых з іншых брыгад і атрадаў, а з 1943 года і хворых з бліжэйшых населеных пунктаў. У шпіталі працавалі не толькі хірургічнае і тэрапеўтычнае аддзяленні, але і стаматалагічны кабінет. Спачатку персанал складаўся толькі з 4 чалавек, а са жніўня сюды дабавіліся два хірургі – Мікалай Макееў і Аляксандр Гладкі, тэрапеўт Надзея Гладкая і стаматолаг Марыя Шымагонава, медсёстры Марыя Сазановіч і Вольга Таргонская, фармацэўт Вера Ганеева.

У кожным атрадзе абсталявалі шпіталі, дзе пацыенты атрымлівалі першую медыцынскую дапамогу і лячыліся лёгка параненыя. Там таксама працавалі кваліфікаваныя і вопытныя медработнікі: у атрадзе «За Айчыну» – Станіслаў Севярын, Таццяна Тарасік і Дора Альпяровіч, у атрадзе імя Жукава – Ганна Шавель, у атрадах «Штурм» і «Грозны» палявыя шпіталі ўзначалілі фельчары. Усе яны кожную мінуту маглі атрымаць кансультацыю і непасрэдную дапамогу ад брыгаднага шпіталя. Для аказання дапамогі работнікі ўсіх медустаноў сістэматычна выязджалі ў населеныя пункты сваёй зоны па графіку і па экстраных выкліках.

Брыгадны шпіталь меў шырокую і пастаянную сувязь з мінскімі падпольшчыкамі, ад іх сістэматычна атрымліваў медыкаменты, перавязачныя матэрыялы, хірургічныя інструменты, розныя прэпараты, а таксама зброю, боепрыпасы, абмундзіраванне, соль, тытунь, паперу і, безумоўна, звесткі пра ворага. Адной з першых звязалася са шпіталем атрада «За Айчыну» супрацоўніца прафесара Я. В. Клумава – Ганна Гаўрылаўна Навіцкая. Праз яе і сам Клумаў дапамагаў брыгадзе ўсім неабходным. Ён перасылаў медыкаменты і хірургічныя інструменты, здаралася, што ў сваёй клініцы лячыў і хаваў сувязных і партызан.

У баі быў цяжка паранены і захоплены ў палон баец атрада «За Айчыну» Сяргей Радчанка. Гітлераўцы задумалі падлячыць яго і выкарыстаць у якасці праваднікa да размяшчэння партызанскай брыгады. Прывезлі ў клініку прафесара Клумава і загадалі любой цаной вылечыць «бандыта». На другі дзень прафесар паведаміў фашыстам, што «бандыт» памёр, не прыйшоўшы ў прытомнасць. На самай справе Клумаў са сваімі надзейнымі памочнікамі ноччу перанеслі Радчанку ў іншую палату, а ў моргу замест яго для паказу гітлераўцам падрыхтавалі падыходзячы труп. А Радчанку вылечылі і пераправілі ў атрад.

Для аховы шпіталя спачатку выдзелілі спецыяльны ўзвод, на які крыху пазней ляглі і іншыя абавязкі. Таму Дзмітрый Рыдлеўскі спачатку павялічыў яго ўдвая, даручыўшы яму праводзіць гаспадарчыя нарыхтоўкі і баявыя аперацыі супраць ворага. Узводператварыўся ў роту, а пасля і ў буйны атрад, які праводзіў любыя баявыя аперацыі, як у саставе брыгады, так і самастойна. Атраду

прысвоілі імя Панамарэнкі і камандзірам прызначылі ініцыятара яго стварэння – Д. С. Рыдлеўскага, а камісарам – палітрука А. В. Чарненку, які прыйшоў з мінскага падполля.

Атрад імя Панамарэнкі, нягледзячы на тое, што частка яго байцоў пастаянна займалася гаспадарчымі нарыхтоўкамі і доглядам пацыентаў, заняў ганаровае месца сярод іншых атрадаў брыгады. Сам Рыдлеўскі прымаў удзел у многіх буйных аперцыях атрада, кіраваў імі. Ён удзельнічаў у разгроме гарнізонаў Канатопа, Рогава, кіраваў атрадам у «рэйкавай вайне», а нярэдка здаралася, што, вярнуўшыся з бою, надзяваў белы халат і спяшаўся да хірургічнага стала.

За ўсе гады акупацыі і партызанскай барацьбы ў атрадах брыгады і сярод мірнага несельніцтва здарыліся толькі адзінкавыя выпадкі інфекцыйных захворанняў. Калі ў гарнізонах праціўніка і суседніх з імі населаных пунктах сыпны тыф быў павальным бедствам, то ў атрадах і ва ўсёй партызанскай зоне сыпняк, дыфтэрыя і іншыя інфекцыі сустракаліся вельмі рэдка. Партызанскія медыкі сістэматычна праводзілі прафілактычныя мерапрыемствы. У кожным атрадзе абсталявалі лазні з парылкамі, дзе па графіку праводзілі санапрацоўку ўсяго асабовага саставу і абмундзіравання.

Медработнікі шпіталяў настаялі, каб лазні былі пабудаваны ва ўсіх населеных пунктах партызанскай зоны. Яны сістэматычна праводзілі абследаванне насельніцтва і рабілі прафілактычныя прышчэпкі вяскоўцам. Ва ўсім гэтым несумненная заслуга партызанскага камандзіра і начальніка брыгаднага шпіталя Д. С. Рыдлеўскага. Пасля вайны Дзмітрый Савельевіч працаваў дацэнтам Мінскага медыцынскага інстытута.

*Хроніка баявых дзеянняў брыгады:*

*«13.11. У восем гадзін раніцы карная экспедыцыя з 1000 чалавек уварвалася ў партызанскую зону з мэтай абрабаваць вёскі, спаліць іх, насельніцтва часткова знішчыць, а астаніх забраць у нямецкае рабства. Атрады імя Фрунзэ, "Штурм", "Грозны", 2-я рота атрада "За Айчыну", 3-ці ўзвод атрада імя Панамарэнкі ў шасцігадзінным баі разбілі ворага і прымусілі яго ў паніцы адступіць. Вораг страціў 67 чалавек забітымі і 93 параненымі, кінуў частку ўзбраення і ўсё награбленае.*

*Камандзірам атрадаў аб'яўлена падзяка і загадана прадставіць да ўзнагароджання партызан, якія асабліва вызначыліся.*

*17.11. У сувязі з намечанай карнай экспедыцыяй колькасцю звыш 30 тысяч чалавек гітлераўцаў у партызанскую зону атрад "За Айчыну" вывеў са строю дарогу Астрашыцкі Гарадок – Лагойск на 4–5 сутак.*

*27.11. Прыступілі да пабудовы акопаў у дзве лініі. У сувязі з ускладненнем абстаноўкі з-за прыбыцця рэгулярных часцей ворага з вялікай колькасцю салдат у Заслаўе, Радашковічы, Аляхновічы, вёскі Новы Двор, Жукі, Грыні партызанскі шпіталь перабазіраваны на запасную базу ў Руднянскі лес. Па брыгадзе аб'яўлена баявая трывога...»*

## САКРАТАР МІНСКАГА АБКАМА ПАРТЫІ

...У жніўні 1943 года, калі Фёдараў з атрадам «Штурм» хадзіў граміць варожы гарнізон у вёсцы Рогава, у штабе брыгады з'явіўся ганец з брыгады «Жалязняк» з весткай, што з Масквы прыляцелі

сакратар ЦК КП(б)Б Ганенка і сакратар Мінскага падпольнага абкама партыі, прадстаўнік БШПР Мачульскі. Яны выклікалі ўсіх камандзіраў і камісараў брыгад і атрадаў, сакратароў падпольных райкамаў партыі і камсамола, сакратароў партыйных і камсамольскіх арганізацый і лепшых гераічных партызан на нараду. Пра гэта Фёдараву далажыў начштаба брыгады Іосіф Фогель, як толькі Ілля Мартынавіч вярнуўся з аперацыі.

Камбрыг Лунін і тыя, хто з ім быў на нарадзе, прыехалі толькі наступным днём, узбуджаныя і радасныя. Па даручэнні ЦК КП(б)Б таварыш Ганенка ўсім уручыў медалі «Партызану Айчыннай вайны».

Іван Пятровіч Ганенка і Раман Навумавіч Мачульскі прыбылі ў партызанскую зону па заданні першага сакратара ЦК КП(б)Б, начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху генерал-лейтэнанта П. К. Панамарэнкі. Іх мэта была – палепшыць кіраўніцтва партызанскім рухам у паўночнай частцы Мінскай вобласці. І. П. Ганенка прыбыў толькі на два тыдні, а Р. Н. Мачульскі – на ўвесь час, да вызвалення Беларусі, у якасці першага сакратара абкама партыі, камандуючага партызанамі Барысаўска-Бягомльскай зоны.

Гэта было вельмі важнай падзеяй: цяпер устанаўлівалася рэгулярная сувязь з Масквой не толькі па радыё, але і пры дапамозе авіяцыі. Радавала, што цяпер будзе цэнтралізаванае партыйнае кіраўніцтва. Праўда, каму-нікаму было гэта не па душы: асобныя камбрыгі адразу зразумелі, што прыйшоў канец іх «удзельнаму княжанню».

А пераважная большасць камандзіраў, камісараў і радавых партызан радасна віталі з'яўленне

сакратара падпольнага абкама партыі. Усе, хто прысутнічаў на нарадзе, былі ачараваныя воблікам Р. Н. Мачульскага. Яго даступнасць, адсутнасць усялякай рысоўкі і кічлівасці, глыбокае веданне партызанскага жыцця і барацьбы падкуплялі. Некалькі дзён у брыгадзе толькі і гаварылі пра палкоўніка Мачульскага. Слухаючы аповеды партызан пра сустрэчу з сакратаром абкама, Фёдараў вельмі шкадаваў, што яму не давялося з ім пазнаёміцца і паслухаць яго даклад.

Але неўзабаве Іллю Мартынавічу выпала такая магчымасць. Перад адлётам у Маскву 9 верасня І. П. Ганенка вырашыў яшчэ раз сабраць нараду камандзіраў і камісараў брыгад і асобных атрадаў, спецгруп, сакратароў райкамаў партыі і камсамола, перш за ўсё тых, хто адсутнічаў на мінулай сустрэчы. Каля вёскі Баяры Бягомльскага раёна ў лесе сабралася каля 50 чалавек. Іван Пятровіч расказаў пра рашэнні ЦК КП(б)Б і мерапрыемствы БШПР па далейшым правядзенні «рэйкавай вайны» ў такіх маштабах, каб да мінімуму звесці перавозкі грузаў і жывой сілы праціўніка па беларускіх дарогах.

– Цяпер, калі Чырвоная Армія развівае імклівае наступленне і ўшчыльную падышла да граніц нашай рэспублікі, – гаварыў Ганенка, – неабходна нанесці другі, яшчэ больш магутны ўдар па камунікацыях ворага.

Р. Н. Мачульскі заклікаў падпольныя партыйкамітэты, камандзіраў і палітработнікаў брыгад і атрадаў узмацніць палітыка-выхаваўчую работу сярод насельніцтва, каб пашырыць размах барацьбы з акупантамі, уцягнуць у яе увесь беларускі народ. Ён заўважыў, што некаторыя камандзіры брыгад і атрадаў дапускаюць валюнтарызм і, як

следства, беспадстаўныя рэпрэсіі ў адносінах да падначаленых, злоўжываюць сваёй уладай, што толькі на руку ворагу. Такога больш не павінна быць у партызанскіх зонах.

– Падпольны абкам партыі, – сказаў Раман Навумавіч, дазваляе партарганізацыям атрадаў заслухоўваць справаздачы сваіх камандзіраў на партсходах, а райкамам партыі – справаздачы камбрыгаў на пасяджэннях бюро і прымаць адпаведныя рашэнні па іх дзейнасці і паводзінах. Катэгарычна забараняю камандзірам брыгад і каму бы там ні было прымяняць вышэйшую меру пакарання – расстрэл – без санкцыі райкама партыі!

І. П. Ганенка сабраў ад прысутных справаздачы пра першы этап «рэйкавай вайны» і паехаў на аэрадром. Удзельнікі нарады таксама пачалі раз'язджацца, а Фёдарава і сакратара Заслаўскага падпольнага райкама партыі І. Ф. Дубовіка Раман Навумавіч папрасіў затрымацца. Развітаўшыся з апошнім ад'язджаючым, ён падышоў з усмешкаю да Дубовіка і Фёдарава і запрасіў іх на сваю кватэру:

– Пойдзем да мяне у хату, гасцямі будзеце.

Паехалі ў недалёкую вёску. Па дарозе ён узяў Фёдарава за локаць і сказаў:

– Я цябе, камісар, затрымаў, каб пазнаёміцца бліжэй, ты ж на мінулай нарадзе не прысутнічаў. А Дубовіка затрымаў для таго, каб табе на зваротным шляху не было сумна.

І цяжка было зразумець, гаворыць ён усур'ёз або жартам. Раман Навумавіч наогул увесь час і амаль з усімі падначаленымі гаварыў з гумарам, жартамі і прыказкамі. Гэта рыса характару прыцягвала да яго людзей, а падначаленым станавілася з ім лёгка і свабодна, хацелася яму ўсё расказаць, падзяліцца

самым патаемным. Увайшоўшы ў хату, ён яшчэ з парога крыкнуў:

– Аня, прымай гасцей!

Насустрач выйшла дзяўчына невялікага росту гадоў 25-ці і адразу ж пайшла на кухню.

– Гэта – мая памочніца, Панцеляймон Кандратавіч з-за лініі фронту прыслаў, – заўважыў Раман Навумавіч.

– А што, тут хіба дзяўчат няма? – спытаў са здзіўленнем Фёдараў.

– Ёсць, але тут я выбраў бы сам, тады жонка мая не магла б спаць спакойна, – сказаў, весела смеючыся, Мачульскі, – а так там мне падабралі, як бачыце, такую, што шуры-муры разводзіць не захочаш. Мая Оля зусім сур'ёзна сказала, што спецыяльна пойдзе на прыём да Панамарэнкі, каб падзякаваць яго за такі выбар.

І зноў цяжка было зразумець, сапраўды гэта было ці ён жартуе. Увайшла Аня, прынесла хлеб, талеркі, нажы і відэльцы, а Раман Навумавіч працягваў:

– Вы, хлопцы, малайцы! Амаль кожны дзень спускаеце пад самым носам у Кубэ эшалоны, громіце гарнізоны, а ён і зрабіць з вамі нічога не можа.

І калі Аня падала ўсё на стол і выйшла, Раман Навумавіч дастаў з-пад ложка паўлітра самагонкі, падняў яго на ўзровень вачэй і сказаў:

– Вось сукіны дзеці навучыліся гнаць: як слязінка чыстая. Зараз адведаем!

Ён наліў гасцям па поўнай шклянцы, а сабе лінуў толькі на донца. Фёдараў запратэставаў:

– Гэта несумленна! Наліваць – дык усім аднолькава.

– Э-э, брат, яйка курыцу не вучыць. Вось калі я ў цябе буду ў гасцях, там ужо ты будзеш распараджацца. Я, калі ты хочаш ведаць, зусім не п'ю, а трымаю яе толькі для гасцей. А мне хлопцы расказалі, што ў вас у кожным атрадзе некалькі самагонных апаратаў кругласутачна працуюць, і першачок, як даніна, прысылаецца камандаванню брыгады.

У Фёдарава вочы на лоб палезлі: хто ж мог сакратару абкама такое накляпаць на яго брыгаду? А ён, выціраючы вочы ад смеху, спакойна заўважыў:

– Гэта я пажартаваў. Ведаю, камісар, што ты сам не п'еш і іншым не дазваляеш.

Пасля Мачульскі пачаў задаваць розныя пытанні жартоўным тонам, і кожны адказ Фёдарава ўдакладняў у Дубовіка, а адказы апошняга – у Фёдарава. Стала ясна, што, хаця ён ім і верыць, але ўсё ж правярае, ідзе па прынцыпе: «давярай, ды правярай». І гэта Іллю Мартынавічу спадабалася. Праводзчы гасцей, Мачульскі сказаў:

– Цяпер я маю нейкае ўяўленне пра вашу брыгаду і пра падпольны райкам партыі. Але для больш поўнага знаёмства пастараюся ў бліжэйшы час пабываць у вас. За баявы дух і добрае маральнае аблічча вашых байцоў хвалю. Хвалю і вашу газету-шматтыражку і вашы лістоўкі. Я іх з задавальненнм чытаў. Яны ў вас – баявыя, палітычна вострыя і пісьменныя.

Ад'язджалі госці радасныя і акрыленыя не толькі пахвалой сакратара абкама партыі, але і ад таго, што абедзве павозкі былі поўнасцю нагружаны ўзрыўчаткай і боепрыпасамі, і ад таго, што цяпер у партызанскай зоне ёсць кіруючы

цэнтр – падпольны абкам партыі і што на чале гэтага цэнтра – выдатны чалавек, просты і разумны, вельмі добры і адначасова патрабавальны і ўважлівы...

## ПАДЧАС ЦЯЖКІХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

...Чырвоная Армія імкліва наступала на Цэнтральным і іншых франтах, былі вызвалены некаторыя ўсходнія гарады Беларусі. Лінія фронту набліжалася, і прыфрантавыя гітлераўскія фарміраванні апынуліся ўжо на беларускай зямлі. Мінск, Маладзечна, Вілейка і іншыя прамежкавыя апорныя пункты навадняілі фашысцкія разбітыя часці, адведзеныя з перадавой для перафарміравання і адпачынку. Тут жа размясціліся ўсялякія вучэбныя батальёны, лазарэты, штабы.

Партызанскія разведчыкі К. Няхай, М. Гарачун і іншыя дакладвалі, што франтавыя гітлераўцы – абарваныя, брудныя, галодныя і вельмі злыя. Некаторыя з іх шукаюць сувязі з савецкімі людзьмі. Першыя, хто ў 1943 годзе пачаў пераходзіць на бок партызан, былі чэхі, славакі, палякі, галандцы, пасля – французы, італьянцы і, нарэшце, самі немцы. Ішлі са зброяй у руках і, як правіла, пасля выканання якога-небудзь партызанскага задання.

Напачатку верасня ў атрад імя Фрунзэ прыйшлі славакі Іван Мінярчыц і Густаў Сядладчык – ураджэнцы Браціслаўскага краю, Людвік Лажакоўскі – з горада Пячэны. 9 верасня разведчык атрада Рыгор Сташкевіч прывёў з Мінска шэсць чэхаславакаў са зброяй, а начальнік разведкі гэтага ж атрада Чарнецкі – 8 чэхаславакаў з мястэчка Краснае. Так у атрадзе з'явіўся асобны чэхаславацкі

ўзвод, які паказаў прыклад дысцыпліны, адвагі і мужнасці.

13 верасня без папярэдняй сувязі ў атрад імя Панамарэнкі з батальёна Дзірлівангера прыйшлі, як мы расказвалі пра гэта ўжо вышэй, аўстрыец Альфрэд Цынхобль і два немцы – Леон Заўэр і Герман Цынканд. Гэта быў новы ўдар па прэстыжы любімчыка Гітлера. Штурмбанфюрэр раней часта зларадніча з тых камандзіраў, у якіх былі выпадкі непадпарадкавання або дэзерцірства салдат і унтэр-афіцэраў. А тут здарылася праява яшчэ больш ганебная, чым нават дызерцірства: пераход немцаў на бок партызан – надзвычайная падзея. Гэта група таксама здзейсніла многа слаўных спраў, асабліва нямецкія таварышы.

Былі і такія немцы, якія заставаліся на службе і тайна ўступалі на шлях антыфашысцкай барацьбы. Начальнік станцыі Беларусь са жніўня 1943 года пачаў рэгулярна перадаваць партызанскай агентуры весткі пра рух эшалонаў па чыгунцы Вільнюс–Мінск: колькасць эшалонаў, найменне грузаў, колькасць і нумарацыю воінскіх часцей, якія ішлі на фронт. Ён кожны раз перасылаў распарадак руху цягнікоў, які часта мяняўся ў сувязі з пастаяннымі дыверсіямі партызан. А салдат Заслаўскага гарнізона Генрых Шмугле дапамагаў боепрыпасамі: 10 кастрычніка ён перадаў праз сувязную атрада імя Жукава 150 патронаў і 5 гранат.

Узрос прыток у партызаны і суайчыннікаў, якія вольна або нявольна трапілі на службу да ворага. Так, разведчык атрада «За Айчыну» Чорны прывёў у свой атрад з ахоўнага батальёна 10 украінцаў са зброяй і 9 ваеннапалонных, якім яны дапамаглі збегчы з канцлагера. Пасля працяглай агітацыі,

якую праводзіў разведчык атрада «Штурм» Мікалай Рашэўскі, да партызан перайшоў загадчык гандлёвага аддзела Заслаўскай управы Токараў. Ён разам з шафёрам прывёз на грузавіку 300 кг солі і 250 м мануфактуры.

Сувязныя з Заслаўя паведамілі, што галоўны ўрач мясцовай бальніцы Абражэвіч шукае дарогі да партызан і гатовы разам з усім персаналам і асноўным абсталяваннем і маёмасцю ўстановы перайсці ў партызанскі шпіталь. Гэта было дзіўна, бо Абражэвіч верай і праўдай служыў акупантам. А між тым зубны ўрач гэтай бальніцы Марыя Шымагонава і некаторыя іншыя супрацоўнікі даўно былі партызанскімі сувязнымі і перадавалі ў атрад медыкаменты і звесткі з гарнізона. Абражэвіч ведаў пра гэта, пагражаў, але нікога не выдаў. Было вырашана звязацца з ім і, калі ён сапраўды захоча перайсці на бок партызан, вывезці з цэнтра гарнізона персанал і маёмасць бальніцы. Аперацыя магла быць рызыкоўнай, бо не было гарантыі, што Абражэвіч не правакатар.

Весці перамовы з ім непасрэдна камандаванне «Штурма» даручыла начальніку асобага аддзела атрада Фёдару Крастову. Фёдар Іванавіч прама сказаў Абражэвічу, калі яны спаткаліся:

– Мы вядзем з вамі перамовы толькі таму, што шкадуем былога ваенурача другога ранга, які заблытаўся і пайшоў на здраду Радзіме. У нас у атрадзе і ў брыгадзе дастаткова высокакваліфікаванага медперсанала, а абсталяванне брыгаднага шпіталя такое, што пазайздросціць любы ваенны шпіталь.

Трэба адзначыць высокія прыроджаныя дыпламатычныя якасці Ф. І. Крастова. У яго быў багаты жыццёвы вопыт, веданне псіхалогіі людзей,

разважлівасць, і пры самых вострых формах размовы ён усміхаўся і спакойна размаўляў, так, быццам у яго ў гэтай справе няма ніякай зацікаўленасці.

– Чырвоная Армія падышла ўжо ўшчыльную да румынскай граніцы, – мімаходзь заўважыў Крастоў, – а на цэнтральным фронце баі ідуць на тэрыторыі Беларусі. Неўзабаве наша армія ўжо будзе тут, і што тады? З немцамі пабяжыце?

– Не, з гітлераўцамі мне шляху няма, – адказаў Абражэвіч. – Спачатку мне сапраўды ўсё падабалася ў немцаў: іх арганізаванасць, патрабавальнасць, пунктуальнасць. Гэта таму, што я дрэнна ведаў іх. Цяпер я ведаю іх лепш, і гэта дапаможа мне з імі змагацца.

Трэцяга кастрычніка цёмнай ноччу партызаны Імполь Пятліцкі, Леанід Тарлецкі і галоўны ўрач Шаршунскай бальніцы пад кіраўніцтвам Фёдара Крастова ціха і непрыкметна на трох падводах заехалі ўдвор Заслаўскай бальніцы. Іх чакалі галоўны ўрач Абражэвіч, стаматолаг Шымагонава і іншыя супрацоўнікі. Без спешкі пагрузілі абсталяванне кабінетаў, медінструменты і спакойна прыехалі на базу партызанскага брыгаднага шпіталя. Марыя Ігнатаўна Шымагонава лячыла не толькі партызан, але і жыхароў блізкіх населеных пунктаў.

Масавы пераход на бок партызан не толькі суайчыннікаў, але і іншаземцаў сведчыў пра пачатак развалу фашысцкай ваеннай машыны. Але гэта быў яшчэ не канец вайны, і трэба было рабіць усё, каб наблізіць перамогу, узмацніць удары па камунікацыях ворага, граміць гарнізоны. І, нягледзячы на ўзмоцненую падрыхтоўку атрадаў да наступнага этапу «рэйкавай вайны», баявыя аперацыі не перапыняліся ні на адзін дзень.

*З архіўных дакументаў:*

*«07.09.43 г. Партызаны атрада імя Жукава Васіль Мацуральнік, Іван Бацян і Яўген Ліпніцкі зрабілі налёт на гарнізон Ждановічы. Гітлераўцы збеглі ў Мінск, мяркуючы, што партызан не тры чалавекі, а цэлы батальён. Захоплена 55 кароў, 60 авечак, 22 свінні, 15 коней. Спалены пабудовы для скаціны, склад са збожжам, 3 жняяркі, 2 малатарні, малочны пункт.*

*10.09.43 г. Камандзір узвода атрада імя Жукава І. І. Бацян з групай падрыўнікоў з трох чалавек пусціў пад адхон эшалон з жывой сілай і баявой тэхнікай. Забіта 68 гітлераўцаў.*

*12.09.43 г. Па заданні сувязной атрада імя Панамарэнкі Дзіны Пілкоўскай ваеннаслужачы вермахта галандзец Петэр Рос спусціў пад адхон эшалон, які ішоў на фронт. Разбіты паравоз і 8 платформаў з танкамі "Тыгр".*

*17.09.43 г.Чацвёртая рота атрада "За Айчыну" ў саставе 30 чалавек разграміла гарнізон праціўніка на торфапрадпрыемстве "Раманаўка" Мінскага раёна. 10 гітлераўцаў забіта, захоплены станкавы і 4 ручныя кулямёты, 6 вінтовак і больш як 10 тыс. патронаў, 59 гранат, грузавая машына. Спалены ўсе пабудовы».*

Нарэшце 24 верасня партызаны атрымалі загад камандуючага Барысаўска-Бягомльскай зоны Р. Н. Мачульскага правесці ноччу з 25 на 26 верасня аперацыю «Канцэрт». Да яе ўсе атрады падрыхтаваліся і чакалі толькі сігналу. Цяпер у іх ужо быў вопыт выхаду на «жалезку», і таму вялікай падрыхтоўкі не спатрэбілася. Кожны атрад зноў павінен быў дзейнічаць на сваім папярэднім участку. Да гэтага часу гітлераўцы аднавілі чыгунку,

і эшалоны адзін за адным зноў ішлі на фронт. Была значна ўзмоцнена ахова дарогі, больш выкапана траншэй, пабудавана дзотаў і іншых умацаванняў. Але гэта мала дапамагло фашыстам.

Ночы сталі даўжэйшыя і цямнейшыя, і гэта паспрыяла партызанам. Іх ударныя групы пад покрывам начной цемры падпаўзлі амаль ушчыльную да траншэй і дзотаў, пусцілі ў ход гранаты, уварваліся ва ўмацаванні і ўдарылі з аўтаматаў. На працягу некалькіх мінут ворага змялі і знішчылі, і толькі адзінкавым гітлераўцам удалося збегчы. Падрыўнікі хутка рассыпаліся ўздоўж палатна і залажылі тол пад рэйкі, па камандзе падпалілі канцы бікфордавых шнуроў і скаціліся з насыпу. І вось на сотні метраў уздоўж палатна заблішчалі агеньчыкі і загрымелі ўзрывы. Гэта было прыгожае відовішча.

Аперацыю на гэты раз правялі яшчэ хутчэй, чым у мінулы. У партызан цяпер не было ніякіх страт, а вынік аказаўся яшчэ больш значным. Брыгада «Штурмавая» перабіла каля 2300 рэек і больш як 5 тысяч шпал, знішчыла больш за 80 гітлераўцаў. На ўчастку Маладзечна–Мінск чыгунка не працавала да 5 кастрычніка, толькі ноччу з 4 на 5-е да станцыі Ждановічы дабраўся эшалон з жывой сілай. Далей ён не пайшоў: байцы атрада імя Жукава пад кіраўніцтвам камандзіра ўзвода Івана Бацяна наляцелі на станцыю, знішчылі ахову, спалілі ўсе станцыйныя пабудовы. З супрацьтанкавага ружжа яны падбілі паравоз, ружэйна-кулямётным агнём абстралялі вагоны. Было забіта 87 і паранена 120 салдат і афіцэраў.

*З архіўных дакументаў:*

*«08.11.43 г. Па даручэнні тав. Калініна выведзены са строю адрэзак дарогі Краснае – Астрашыцкі Гарадок – Лагойск. Знішчаны масты, зроблены перакопы, завалы, асобныя ўчасткі замініраваны.*

*10.11.–11.11. Поўнасцю выведзены са строю адрэзак дарогі Краснае – Астрашыцкі Гарадок – Лагойск. Па загадзе Беларускага штаба партызанскага руху тут узарваны і спалены ўсе масты, зроблены глыбокія равы, завалы, асобныя ўчасткі замініраваны. На працягу некалькіх сутак ніводная аўтамашына праціўніка не прайшла тут да фронту».*

Партызаны перанеслі свае дзеянні на іншыя ўчасткі барацьбы з ворагам: перасякалі кабель сувязі Берлін – фронт, выходзілі на засады да шасэйных дарог, праводзілі дыверсіі ў Мінску. Пад кіраўніцтвам разведчыка атрада «За Айчыну» Еліна сувязныя Гоман і Раманоўскі трэцяга кастрычніка ўзарвалі цэх радыёзавода ў Мінску, а сувязны гэтага атрада Юдзінскі ў той жа дзень на Слонімскім тупіку спаліў цыстэрну з 16 тонамі бензіну.

## САМАЯ ВАЖНАЯ АПЕРАЦЫЯ «ШТУРМАВОЙ»

У Сёмкавым Гарадку, які размясціўся крыху больш як за 10 кіламетраў ад беларускай сталіцы, да вайны быў дзіцячы дом. Фашысты ператварылі яго ў свайго роду канцлагер для здзекаў і знішчэння маленькіх насельнікаў. Сюды звозілі дзяцей з іншых «прытулкаў» – Ратамскага, Астрашыцка-Гарадоц-

кага, Дукорскага, Слуцкага, дзе былі гадаванцы амаль з усёй акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза.

Вось што расказала Ангеліна Скобелева-Зайцава, якая прайшла праз пякельныя колы Слуцкага, а пасля і Сёмкава-Гарадоцкага дзіцячага канцлагера: «Я, мой брат Барыс і сястра Вера нарадзіліся і жылі ў горадзе Ржэве. Бацьку фашысты замучылі, а мама памерла з голаду. Мне было 12, Барысу – 6, а Веры – 3 гады. Фашысты ўсё разрабавалі, быў страшэнны голад. Нас схапілі фашысты і прывезлі ў Слуцкі лагер, дзе пакутавалі некалькі тысяч дзяцей і падлеткаў: брудныя, апухлыя ад голаду, абарваныя. Акрамя нас, Скобелевых, у Слуцкім канцлагеры былі Кабанавы Клава і Ніна, Паяркова Зоя, Някрасаў Коля, Заяц Паша і многія іншыя. Я памятаю толькі тых, з кім мяне перавезлі ў Сёмкаў Гарадок».

Тут былі нават дзеці з іншых краін – аўстрыйскі хлопчык Уладлен Бадзіян, румын Уладзік Макараў і іншыя. Іх вайна застала ў інтэрнацыянальным піянерскім лагеры пад Баранавічамі. Умовы жыцця дзяцей у Сёмкавым Гарадку ператварыліся ва ўмовы выжывання. Успамінае вязень Сёмкава-Гарадоцкага лагера Ніна Казлова-Басыгіна: «Нас сустрэлі голад, холад і хваробы... Я многа хварэла: залатуха з калтуном, кароста, цынга. Ногі былі абмарожаныя і распухлі. А голад рабіў сваё... І мы босымі поўзалі па снезе, шукалі ліпавыя зярняткі, каб наталіць голад».

Дырэктарам Сёмкава-Гарадоцкага «прытулку» немцы прызначылі нейкага Генералава. Абслуговы персанал ён набраў у большасці з такіх жа, як і сам, здраднікаў і прахадзімцаў, якія нажываліся на дзіцячым горы і пакутах. Кожны дзень яны наладжвалі папойкі, цягнулі з дзетдома ўсё, што

маглі, а дзяцей марылі голадам. Каб выратаваць насельнікаў «прытулку» ад немінучай смерці, партызаны вырашылі ўзяць шэфства над маленькімі вязнямі. Яны прыйшлі ў Сёмкаў Гарадок летам 1942 года, пагутарылі з тымі, хто заставаўся патрыётамі, і з маленькімі насельнікамі лагера.

Пасля агляду памяшканняў і знаёмства з умовамі жыцця дзяцей партызаны папярэдзілі Генералава, што ўстанова цяпер будзе пад іх кантролем, што адміністрацыя яе павінна выконваць толькі распараджэнні народных мсціўцаў і павінна неадкладна і рэзка палепшыць умовы жыцця дзяцей і карміць іх згодна з даваеннымі нормамі. Дырэктар абяцаў выканаць усе распараджэнні, але, як толькі партызаны паехалі, стаў яшчэ больш здзекавацца з вязняў і выхавальнікаў, якія заставаліся людзьмі. Ён паехаў у Мінск прасіць узброенай аховы. Ва ўправе аховы яму не далі, а ўручылі зброю і загадалі паведамляць пра візіты партызан.

Даведаўшыся пра гэта, лясныя салдаты неадкладна прыехалі ў Сёмкаў Гарадок. Яны запатрабавалі ад Генералава здаць зброю і адразу ж знікнуць з дзетдома. Перапалоханы да смерці здраднік поўзаў на каленях і прасіў літасці. Узрадаваны, што партызаны яго не расстралялі, ён уцёк у Мінск пад ахову сваіх гаспадароў.

На яго месца прыбыў І. С. Канькоў, да вайны начальнік планава-фінансавага сектара Мінскага аблана. Ён заверыў, што будзе працаваць у цесным кантакце з партызанамі, калі яму ўдасца ашукаць акупантаў. Цяпер народныя мсціўцы прыходзілі ў Сёмкаў Гарадок як на сваю прамежкавую базу, каб адпачыць пасля дыверсій на чыгунцы або пасля іншай баявой аперацыі ў гэтай зоне. Многія

работнікі дзетдома сталі сувязнымі і аказвалі вялікую дапамогу разведкай у гарнізонах Заслаўя, Масюкоўшчыны, Ратамкі і Мінска, распаўсюджвалі лістоўкі і газеты.

Да 1943 года фашысты амаль не былі ў дзетдоме, баяліся партызан. Вясною яны прыехалі сюды на некалькіх легкавых і грузавых аўтамашынах, ачапілі тэрыторыю, і афіцэры-медыкі загадалі сабраць дзяцей у самым вялікім пакоі, каб зрабіць ім прышчэпкі нібы ад тыфу. Але разведчык з Мінска М. М. Владысік паведаміў у штаб брыгады, што фашысты будуць на дзецях выпрабоўваць якісьці новы прэпарат. Дзеці наадрэз адмовіліся рабіць прышчэпкі і, калі іх пачалі хапаць, каб сілком ўвесці прэпарат, узнялі гвалт, пачалі адбівацца. Гітлераўцы адмовіліся ад сваіх намераў.

Але неўзабаве яны прыехалі сюды зноў, ужо з іншай мэтай: браць кроў у маленькіх насельнікаў. Фашысцкія шпіталі патрабавалі ўсё больш крыві для параненых, і дзяцей ператварылі ў бясплатных донараў. Бралі кроў без ўсялякіх нормаў у знясіленых вязняў, нягледзячы на іх адчайнае супраціўленне. Большага дзікунства і жорсткасці цяжка сабе нават уявіць.

У студзені 1944 года фашысты канчаткова разрабавалі маёмасць дзіцячага дома, абслуговы персанал забралі ў нямецкае рабства, часткова ён сам разбегся. Шпіталь і санаторый адсюль перавялі ў іншыя населеныя пункты, і маленькія донары былі ўжо непатрэбныя. Дзеці зноў пачалі галадаць, ім пагражала немінучая смерць. Каб замесці сляды свайго злачынства над нявіннымі ахвярамі, іх вырашылі спаліць у Трасцянцы, дзе працавалі газавыя камеры. На парадак дня брыгады

стала пытанне пра выратаванне вязняў Сёмкава-Гарадоцкага дзіцячага канцлагера.

У штабе па ініцыятыве камісара Фёдарава абмяркоўвалі гэта пытанне. Яно здавалася простым толькі на погляд дылетанта. Простыя на вырашэнне задачы тояць у сабе многа невядомых, якія, у сваю чаргу, патрабуюць няпростых падыходаў і могуць прынесці нечаканыя наступствы. Так і тут. Калі дзяцей вывезці ў сваю зону і размеркаваць па атрадах, як прапаноўвалі некаторыя, на кожны атрад прыпадзе па 50 чалавек. Гэта ляжа значным цяжарам на атрады і адаб'ецца на іх баяздольнасці. Была прапанова размясціць дзяцей у вёсках сярод насельніцтва, але трэба было папярэдне правесці растлумачальную работу, і гэта раскрыла б сакрэтную выратавальную аперацыю.

Больш за тое, камбрыг Лунін катэгарычна выступіў супраць аперацыі і заявіў, што не дазволіць дзеля дзяцей рызыкаваць жыццямі партызан брыгады, бо блізка вакол Сёмкава Гарадка размешчаны буйныя і моцныя гарнізоны ворага – у Мінску, Заслаўі, Змееўцы. Стаялі лютыя марозы, і паўраздзетых і босых дзяцей трэба было абуць і апрануць, мець цёплыя пакрывалы і кажухі. Каб вывезці ўсіх 276 дзяцей, патрэбна было 60 падвод, а працягнуць такі вялікі абоз праз сістэму варожых гарнізонаў – нялёгкая задача.

– Лёс і сумленне не даруюць нам, калі мы не выратуем дзяцей, – цвёрда заявіў на паўторнай нарадзе камандавання атрадаў Фёдараў. – Каб правесці гэту самую важную аперацыю, трэба максімальна забяспечыць яе ўсімі нашымі атрадамі, выкарыстаць усё ўзбраенне. Неабходна папоўніць

нашы арсеналы. У гэтым я буду прасіць дапамогі Рамана Навумавіча Мачульскага.

Фёдараў паехаў да камандуючага Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны, прывёз многа боепрыпасаў і новай зброі, а таксама палотнішчы парашутаў, каб замаскіраваць падводы і коней. Пасля вайны Ілля Мартынавіч прыпамінаў падрабязнасці той самай важнай партызанскай аперацыі. Вось як гэта адбывалася.

...Лютаўскай марознай ноччу да памяшкання Сёмкава-Гарадоцкага дзетдома пад'ехаў санны абоз. Дзяцей захуталі ў цёплую адзежу і пасадзілі на падводы. Якраз, на шчасце, той ноччу ўсчалася вялікая мяцеліца, і фашысты ціха сядзелі ў сваіх гарнізонах. Баявыя партызанскія атрады, расстаўленыя ўздоўж дарогі, па якой павінен быў рухацца абоз з дзецьмі, засталіся без работы. Без перашкод гадаванцаў дзетдома даставілі ў партызанскі шпіталь, дзе медыцынскі персанал пад кіраўніцтвам начальніка медслужбы Д. С. Рыдлеўскага агледзеў маленькіх пацыентаў, правёў санапрацоўку і накарміў.

Цяпер камандаванню атрадаў даручылі размеркаваць дзяцей у вёсках сваёй зоны. Ваенныя каменданты вёсак павінны былі сістэматычна назіраць за ўмовамі жыцця дзяцей у сялянскіх хатах і пры неабходнасці ставіць перад партызанскім камандаваннем пытанне пра матэрыяльную дапамогу сем'ям, у якіх жылі малыя. Сотні сялян і сялянак з Вялікіх і Малых Бясяд, Дашак, Вялікіх і Малых Гаян, Шаршун, Маныл, Лоўцавічаў, Лысай і Сухой Гары, Забор'я, Буцек, Сычавічаў і іншых вёсак прынялі адно-два дзіця і клапаціліся пра іх, як пра сваіх родных.

Сярод партызанскіх камендантаў і ў атрадах аказалася нямала педагогаў. Міхаіл Ціханавіч Кандрацьеў, Аляксей Максімавіч Клюй, Мікалай Трафімавіч Міхайлаў і іншыя многае зрабілі, каб дзеці, выбаўленыя з фашысцкага пекла, знайшлі нарэшце мацярынскую ласку, бацькоўскі клопат, цеплыню чалавечых сэрцаў.

У маі 1944 года акупанты пачалі самую буйную карную аперацыю супраць партызан і насельніцтва, якая працягвалася каля месяца. (Пра гэту апошнюю карную экспедыцыю фашыстаў раскажам ніжэй.) Разам з партызанамі ўглыб лясоў адыходзілі і мірныя жыхары, многія тады загінулі, але ніводная сям'я не выраклася прынятых дзяцей, не пакінула іх у мінуту смяротнай небяспекі...

Як толькі наша армія вызваліла Беларусь ад фашысцкай погані, Сёмкава-Гарадоцкі дзіцячы дом быў адноўлены. Большасць дзяцей вярнуліся сюды ці ў іншыя дзіцячыя дамы вобласці, некаторым пашчасціла знайсці сваіх бацькоў. А некаторыя засталіся ў прыёмных сем'ях. Так, Аню Саўрыцкую ўдачарыла жыхарка вёскі Пецькавічы Хрысціна Стасевіч. У прыёмных бацькоў у вёсцы Манылы прыжыліся сёстры Аня і Марыя Сержановічы.

У сакавіку 1964 года па справах аўстрыйскай фірмы «Ангер-пластык-машыненбау» прыехаў у Маскву яе прадстаўнік Уладлен Бадзіян – былы вязень Сёмкава-Гарадоцкага лагера. Карэспандэнты Агенцтва друку «Навіны» ўзялі ў яго інтэрв'ю для «Учительской газеты». Вось што ён тады сказаў:

«Я схіляюся перад мужнасцю і веліччу людзей, якія рызыкавалі жыццём, каб ратаваць дзяцей ад фашысцкай расправы. Па-мойму, гэта адзін з найвялікшых подзвігаў, які ведае партызанскі рух.

Бо аперацыя прайшла за 12 кіламетраў ад Мінска, які на той час знаходзіўся ў глыбокім тыле ворага. Пра бязмежную сціпласць гэтых людзей гаворыць той факт, што да гэтага часу ў друку не было ўспамінаў пра гэты геройскі ўчынак. Натуральна, што я цікаўлюся гісторыяй партызанскага руху і сачу за літаратурай. Нядаўна я прачытаў кнігу "Гісторыя партызанскага руху ў Беларусі". І мяне вельмі здзівіла, што там ні слова не сказана пра гэту аперацыю. Я хачу праз вашу газету перадаць, што нізка схіляюся перад чалавечай велічнасцю гэтых людзей! Пасля вызвалення партызанамі я жыў у сям'і Паныш у партызанскай вёсцы Дашкі. Я прашу перадаць сардэчнае прывітанне Праскоўі Канстанцінаўне Паныш і яе сынам, удзельнікам партызанскага руху» (*«Учительская газета» за 28 сакавіка 1964 года*).

Прайшлі пасляваенныя дзесяцігоддзі, былыя вязні Сёмкава-Гарадоцкага лагера знайшлі сваю дарогу ў жыцці, працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі, выйшлі на пенсію, але і да гэтага часу памятаюць сваё выратаванне, часта збіраюцца на сустрэчы ў Сёмкаў Гарадок, дзе на месцы былога дзетдома выраслі новыя карпусы школы-інтэрната. Тут створаны музей на матэрыялах дзіцячага дома. Чырвоныя следапыты школы-інтэрната адшукалі тых, хто пакутаваў у няволі, і яны штогод сустракаюцца тут са сваімі выратавальнікамі. Нядаўна тут аднавілі мемарыяльную дошку, прысвечаную самай важнай партызанскай аперацыі.

Пра яе напісана цяпер нямала артыкулаў і нарысаў, знята кінастужка, расказ пра выратаванне дзяцей змешчаны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Заслаўе», якая прысвечана гісторыі былога Заслаўскага раёна.

## КРАЁВАЯ АБАРОНА НЕ АБАРАНІЛА

Фашысцкае камандаванне адчувала, што Чырвоная Армія неўзабаве пяройдзе ў наступленне на Цэнтральным фронце. І як толькі нашы войскі рушаць наперад, партызаны зноў нанясуць удары па камунікацыях і запруць ворага ў Беларусі, як у пастцы. Каб пазбегнуць гэтага і аблегчыць сваё становішча, пераемнік Кубэ фон Готберг запатрабаваў ад беларускіх нацыяналістаў больш актыўна дапамагаць нямецкай арміі і акупацыйным уладам. Па ўказцы Готберга на пачатку сакавіка 1944 года прэзідэнт Беларускай цэнтральнай рады (БЦР) Р. Астроўскі выдаў загад аб фарміраванні так званай Беларускай краёвай абароны (БКА).

Абʼяўлялася мабілізацыя ў БКА мужчын ажно 15 узростаў: 1908—1924 гадоў нараджэння, – усіх афіцэраў і унтэр-афіцэраў былых царскай і польскай армій. Прызыўнікі павінны былі зʼявіцца на зборныя пункты праз тры гадзіны пасля ўручэння павесткі. У выпадку няяўкі або дызерцірства з БКА – расстрэл усёй сямʼі і канфіскацыя маёмасці. І многія мужчыны, напалоханыя пагрозамі, пайшлі на прызыўныя пункты, асабліва з населеных пунктаў, дзе былі моцныя варожыя гарнізоны.

Партызаны неадкладна адрэагавалі на гэту акцыю. Штаб брыгады і Заслаўскі падпольны РК КП(б)Б правялі нараду камандна-палітычнага саставу і партыйна-камсамольскага актыву, на якой прынялі рашэнне разгарнуць масава-растлумачальную работу сярод насельніцтва сваёй зоны, выпусціць вялікім тыражом зварот да насельніцтва Лагойскага, Заслаўскага, Мінскага і Радашковіцкага раёнаў, у якім раскрывалася здрадніцкая сутнасць БЦР

і БКА. У кожным населеным пункце правялі мітынгі і сходы, распаўсюдзілі гэты зварот, давалі парады, дзе можна схавацца ад рэпрэсій ворага.

Па брыгадзе «Штурмавая» выдалі загад, у якім камандаванню і асобым аддзелам кожнага атрада было прадпісана падабраць па 2 чалавекі і накіраваць іх на мабілізацыйныя пункты для ўступлення ў рады «краевікоў». Так, у састаў Заслаўскай прызыўной камісіі асобы аддзел атрада «Штурм» заслаў сваіх агентаў, якія пад рознымі прычынамі вызвалілі некаторую частку прызыўнікоў ад службы. Сёмага сакавіка група партызан спаліла прызыўны пункт у вёсцы Раткавічы Вілейскага раёна разам з усімі дакументамі.

Перад партызанскімі разведчыкамі паставілі задачы сачыць і інфармаваць камандаванне брыгады пра ход і вынікі камплектацыі атрадаў БКА, устанавіць парадак арганізацыі, узбраення і нумарацыю часцей і падраздзяленняў, вызначыць палітыка-маральны стан і настрой асабовага саставу, бліжэйшыя задачы і планы новых ахоўных фарміраванняў. Начальнік брыгаднай разведкі І. М. Клюй трымаў з агентамі цесную сувязь праз пасыльных. У якасці сувязных выкарыстоўвалі жанчын і мужчын непрызыўнога ўзросту.

Вялікая работа па зрыву мабілізацыі ў БКА не прапала марна. Насельніцтва партызанскай зоны паўсюдна ўхілілася ад прызыву, за выключэннем гарадоў і буйных вёсак, дзе стаялі гарнізоны. Але і адсюль неўзабаве пачалося масавае дэзерцірства «краевікоў». У іх рады заслалі партызанскіх агентаў для падрыўной работы і прапаганды. Вынікі іх дзейнасці праявіліся адразу ж. З гарнізона ў Заслаўі, дзе былі сабраны 264 чалавекі, у пер-

шую ж ноч збеглі 33, а 46 перайшлі да партызан, як толькі атрымалі зброю. Так адбывалася і ў астатніх гарнізонах.

У выпадку пераезду часцей БКА з Мінска, Заслаўя і Радашковіч у раёны, адкуль трымаць сувязь з разведкай і штабам брыгады было цяжка ці немагчыма, агенту дазвалялася дэзерціраваць і вярнуцца ў атрад, прыхапіўшы з сабою добраахвотнікаў з ліку «краевікоў». І неўзабаве ў партызанскія атрады пачало прыбываць многа мужчын, якія пад уплывам і ў выніку прапагандысцкай работы агентаў уцяклі з радоў самаабароны або ўхіліліся ад мабілізацыі ў гэтыя фарміраванні. Па 30–35 чалавек накіравалі байцамі ў партызанскія атрады, а астатніх, у каго не было зброі, выкарыстоўвалі для ўмацавання і ўзвядзення абарончых рубяжоў.

*З архіўных дакументаў.*

*Службовая запіска на афіцыйным бланку «Камісар партызанскай брыгады "Штурмавая"»:*

*«Іван Мартынавіч! Заўтра да 12.00 прышліце звесткі пра работу, праведзеную Вашым атрадам па зрыву нямецкай мабілізацыі ў Краёвую абарону. Канкрэтна: колькі заслана сваіх агентаў у К. А., колькі праведзена гутарак і дакладаў па разаблачэнні Беларускай Цэнтральнай Рады і БКА, колькі закінута літаратуры, колькі людзей, якія падпадаюць пад мабілізацыю, прынялі ў атрад, колькі сем'яў схавана ў сваім раёне і да т.п. Наогул асвяціце ўсю работу. Трэба часцей заглядваць у штаб брыгады. 06.04.44 г. ФЁДАРАЎ».*

З гэтай запіскі, адрасаванай камандзіру атрада імя Фрунзэ Петрашкевічу, відаць, што камісар

быў сапраўднай арганізуючай і кіруючай асобай. Ён унікаў у кожную баявую аперацыю, трымаў пад кантролем усе справы і клопаты брыгады, часта выступаў ініцыятарам буйных баявых аперацый. І пры гэтым ён надзвычай чула ставіўся да падначаленых, клапаціўся пра іх аўтарытэт. І прыведзеная вышэй службовая запіска яскрава сведчыць пра тое.

Цікава разгледзець і прыгадаць, як планавалася і праводзілася адна са шматлікіх баявых аперацый брагады па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле Фёдарава.

Лютаўскім марозным днём 1944 года ў штаб ад сувязнога «Юзіка» паступілі звесткі пра актывізацыю фашыстаў і ўмацаванне варожага гарнізона ў Лускаве. Тут налічвалася больш за 200 салдат, узброеных 10 батальённымі і ротнымі мінамётамі, станкавымі і ручнымі кулямётамі. Гарнізон строга ахоўваўся, нават на подступах да Лускава ўздоўж дарогі хадзілі ўзмоцненыя патрулі. Ілля Мартынавіч прапанаваў штабу дакладна распрацаваць баявую аперацыю па разгроме гэтага асінага гнязда, адкуль вораг рэгулярна выязджаў на карныя аперацыі ў навакольныя вёскі. Фёдараў асабіста ўдзельнічаў у распрацоўцы плана баявых дзеянняў і ўнёс некалькі сур'ёзных прапаноў у расстаноўку падраздзяленняў і па тактыцы бою. Вось яго прапановы ў план аперацыі ў канчатковым варыянце.

*З архіўных дакументаў:*

*«Загад па брыгадзе "Штурмавая" ад 17.02.44 г.*

*З мэтай разгрому фашысцкага гарнізона ў Лускаве загадваю: ноччу 18.02.44 г. у 0.30 гадзін*

*атрадам "Штурм", імя Фрунзэ, імя Жукава, "За Айчыну" штурмам заняць паўднёва-ўсходнюю ваколіцу Лускава, знішчыць праціўніка і вывезці са складоў боепрыпасы і ўзбраенне. Адначасова з выхадам у раён вёскі выслаць правы заслон да маста, каб скаваць праціўніка ў паўночнай частцы вёскі. Група заслону мае батальённы і ротны мінамёты і 2 супрацьтанкавыя ружжы. Камандзір групы камроты атрада імя Жукава Бацян.*

*Групе ў саставе стралковага ўзвода атрада "Штурм" і кулямётнага ўзвода атрада "За Айчыну" з батальённым мінамётам і супрацьтанкавым ружжом заняць рубеж на паўднёвай паляне на паўночны ўсход ад Лускава з задачай скаваць праціўніка ў паўночнай частцы вёскі і забяспечыць дзеянні ўдарнай групы.*

*Праваму заслону ў саставе ўзвода атрада "Штурм" і ўзвода атрада імя Фрунзэ з адным супрацьтанкавым ружжом і ротным мінамётам заняць рубеж на паўднёвай паляне лесу на поўнач ад вёскі Маславічы, прыкрыцца сілай аднаго аддзялення ад дарогі Маславічы–Дуды, каб не дапусціць контратакі праціўніка з Лускава–Маславічы. Камандзір групы – малодшы лейтэнант Руткоўскі.*

*Леваму заслону ў саставе 70 чалавек з супрацьтанкавым ружжом і станкавым кулямётам заняць рубеж у раёне вышыні на паўночны ўсход ад развілкі дарог на поўдзень ад Лускава. Задача – не дапусціць праціўніка з Астрашыцкага Гарадка, Паперні ў напрамку Лускава. Замініраваць дарогу і парваць сувязь Лускава – Астрашыцкі Гарадок. Камандзір заслону – камісар атрада "За Айчыну" малодшы палітрук Мартынаў.*

*Камандзіру атрада "За Айчыну" выдзеліць санітарную групу з 15 чалавек для забеспячэння бою ўдарнай групы. Камандзіру санітарнай групы ў 20.00 17.02 з'явіцца ў рапараджэнне Бацяна.*

*Абозу з 40 падвод (па 10 з кожнага атрада), рухаючыся па маршруце Жукаўка–Маркавічы–Алексічы, да пачатку аперацыі згуртавацца ў лагчыне за 1,5 км на паўднёвы захад ад Вячы з задачай вывезці боепрыпасы і ўзбраенне з Лускава. Начальнік абозу – памочнік камандзіра атрада "За Айчыну" малодшы лейтэнант Малькоў.*

*Рэзерву камандзіра брыгады – рэшткі атрадаў "Штурм" і імя Жукава – да 24.00 размясціцца ў лесе на поўнач ад Лускава і быць гатовым падтрымаць дзеянні ўдарнай групы. Камандзір рэзерву – камроты атрада "Штурм" Казіцын.*

*Камандны пункт камбрыга і штаба брыгады – паўднёвая паляна лесу на поўнач ад Лускава. Сувязь – праз конных сувязных. Сігнал да пачатку аперацыі – серыя фіялетавых ракет з КП.*

*Збор пасля аперацыі – Жукаўка».*

Як вынікае з загада, Ілля Мартынавіч валодаў немалым тактычным майстэрствам і ваеннымі ведамі, камандзірскімі навыкамі і прывіваў гэтыя якасці камандаванню брыгады і атрадаў. Менавіта таму «Штурмавая» стала сапраўдный воінскай баявой адзінкай, спаянай моцнай дысцыплінай, глыбокай палітычнай работай. Было вырашана пераўтварыць яе шматлюдныя атрады ў палкі і батальёны. Неўзабаве выйшаў загад ад 10 сакавіка 1944 года аб рэарганізацыі і прызначэнні каманднага саставу новых падраздзяленняў. Але штаб партызанскага руху не падтрымаў гэтай ініцыятывы, і давялося вярнуцца да ранейшай структуры і назваў падраздзяленняў.

...Наступіў красавік. Брыгада вяла амаль бесперапынныя баі з карнікамі, якія не пакідалі думкі знішчыць «Штурмавую» і выкарыстоўвалі для гэтага розныя метады і тактыку. Яны спрабавалі спаліць вёскі партызанскай зоны, каб пазбавіць лясных салдат надзейнай апоры і матэрыяльных рэзерваў. 8 красавіка брыгадная разведка далажыла камандаванню, што вораг з гарнізонаў Дафарэнцыя, Астрашыцкі Гарадок, Аколіца і Лагойск мяркуе выйсці ў Меркавічы, Прыседкі, Сёмкава, Закрынічча з мэтай рабаўніцтва вёсак і ўгону насельніцтва ў Германію.

По загадзе камандавання ў названыя вёскі накіравалі атрады імя Фрунзэ, імя Панамарэнкі і імя Жукава, дзе ім загадана было заняць абарону, узмацніць разведку і даць адпор акупантам. Даведаўшыся пра гэту партызанскую аперацыю, фашысты ўстрымаліся ад карнай экспедыцыі. Так быў сарваны чарговы карны паход ворага і выратаваны жыхары вёсак і іх маёмасць...

*З архіўных дакументаў.*

*Загад ад 06.04.44 г.:*

*«Вілейскае СД падрыхтавала з ліку ваеннапалонных шпіёнаў, якіх думае закінуць у партызанскія брыгады пад выглядам савецкіх дэсантнікаў. Яны маюць дакументы і форму ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. Пры затрыманні такіх неадкладна дастаўляць іх у штаб брыгады».*

На адной са штабных нарад Ілля Мартынавіч прапанаваў узмацніць разведку ў варожых гарнізонах, каб дакладна выконваць заданні армейскага камандавання.

– Небходна стварыць асобыя групы разведчыкаў, – цвёрда сказаў камісар. – Для гэтага з кожнага атрада трэба выдзеліць па 10 самых умелых і знаходлівых байцоў, паставіць ім задачу захопу палонных у раёнах Заслаўя, Астрашыцкага Гарадка, Лагойска і, безумоўна, Мінска. Яны павінны найбольш дакладна ўстанавіць колькасць і нумарацыю воінскіх часцей, што знаходзяцца там, іх узбраенне і бліжэйшыя планы.

Такія групы сакрэтным загадам былі створаны, узброены самай лепшай тагачаснай зброяй і разасланы ў месцы дыслакацыі варожых гарнізонаў. Неўзабаве ад іх пачалі паступаць каштоўныя звесткі. Так, сярод іншых паступіла і данясенне пра гестапаўскіх агентаў, якіх рыхтавалі ў Мінску на вуліцы Вароўскага ў памяшканні пад вывескай школы прапагандыстаў прагітлераўскага Саюза беларускай моладзі. У асобным аддзеле школы навучаліся будучыя шпіёны. Іх планавалі закідваць у тыл нашай арміі.

У школу адправілі партызанскага контрразведчыка, і ён неўзабаве паведаміў пра выкладчыцкі састаў, пра пункты, праз якія шпіёнаў закідвалі ў савецкі тыл, апісаў прыкметы агентаў. І гэта не адзінкавы поспех партызанскай контрразведкі. Напярэдадні наступлення Чырвонай Арміі максімальна актывізавалася разведвальна-дыверсійная дзейнасць партызан. У ёй удзельнічалі нават партызанскія агенты-контрразведчыкі. Вось толькі некалькі характэрных запісаў з дакладных у асобы аддзел брыгады:

*«27.01.44 г. Агент "Юзік" у в. Лускава мінай узарваў грузавую машыну са зброяй і боепрыпасамі.*

*22.02.44 г. Сувязны "Нёман" у в. Буцавічы знішчыў аўтамашыну. Забіта 6, смяротна паранена 2, паранена 15 гітлераўцаў.*

*27.02.44 г. Сувязны "Надзейны" пасланы ў г. Мінск да агента "Северава" для сумеснага мініравання на чыгунцы цыстэрнаў з палівам».*

## АПОШНЯЯ БЛАКАДА

Фашысцкае камандаванне ў чарговы раз вырашыла разграміць народных мсціўцаў. 22 мая пачалася самая маштабная блакада партызанскай зоны і карная экспедыцыя «Кармуран». ЦК КП(б)Б і Беларускі штаб партызанскага руху на падставе аналізу такой аперацыі, праведзенай раней фашыстамі ў Віцебскай вобласці, разгадалі план далейшых дзеянняў праціўніка і папярэдзілі партызан пра неабходнасць трымаць зброю напагатове.

Сакратар абкама КП(б)Б Р. Н. Мачульскі склікаў нараду камандзіраў і камісараў брыгад і асобных атрадаў для абмеркавання абставін і тактыкі партызан у барацьбе з карнікамі. Ён загадаў весці баі так, каб як мага даўжэй пратрымацца на першым рубяжы абароны. Калі ж вораг прарве гэту лінію, адыходзіць на больш выгадныя пазіцыі, аказваць упартае супраціўленне і адначасова выявіць слабыя месцы ў баявых парадках карнікаў, прабіцца праз іх і нанесці ўдары з тылу.

Да гэтага часу «Штурмавая» з данясенняў сваіх разведчыкаў ведала пра намеры ворага і падрыхтавала моцную абарону, у найбольш бяспечных месцах па загаду Фёдарава былі

абсталяваны і старанна замаскіраваны зямлянкі на 6–7 чалавек, каб схаваць хворых і параненых. Гэту аперацыю правёў атрад імя Панамарэнкі пад кіраўніцтвам ваенурача Рыдлеўскага – камандзіра і па сумяшчальніцтву начальніка партызанскага брыгаднага шпіталя.

Вярнуўшыся ад Мачульскага, склікалі нараду камандна-палітычнага саставу атрадаў брыгады, на якой абвясцілі загад камандуючага зоны і намецілі меры да яго выканання. Штаб брыгады загадаў камандаванню атрадаў удасканаліць і ўмацаваць лініі абароны на сваіх участках і трымаць атрады ў поўнай баявой гатоўнасці, узмацніць агентурную разведку і па-ранейшаму пасылаць падрыўнікоў на камунікацыі праціўніка.

Ілля Мартынавіч пабываў у кожным атрадзе, правёў адкрытыя партыйныя сходы і гутаркі з камандным і асабовым саставам, паставіў баявыя задачы. Цяпер ён адчуваў яшчэ большую адказнасць за лёс кожнага байца і камандзіра, бо на пачатку мая камбрыг вылецеў за лінію фронту. Часова выконваючым яго абавязкі быў прызначаны Іосіф Фогель, а на пасаду начальніка штаба – маёр Кандыбкін. Перад пачаткам варожай блакады з вёсак партызанскай зоны адклікалі сувязных.

20 мая разведчыкі пачалі даносіць, што па шашы Мінск–Маладзечна з самай раніцы пачалося бесперапыннае перасоўванне войскаў ворага, а ва ўсіх гарнізонах ад Мінска да Маладзечнаназіраецца велізарная канцэнтрацыя гітлераўцаў. Партызаны занялі рубяжы абароны ўсім асабовым саставам брыгады. Два наступныя дні праціўнік працягваў перакідваць войскі.

Наступіла свежая росная раніца 23 мая. Байцы ўслухоўваліся ў цішыню і спакойна размаўлялі. Раптам нешта зафыркала і зашапацела над іх галовамі, і ўслед за гэтым ззаду партызанскіх пазіцый раздаўся ўзрыў вялізнай сілы, за ім другі, трэці. Пачалася артылерыйская падрыхтоўка гітлераўцаў. Праціўна вылі міны, снарады рвалі зямлю, уздыбліваліся слупы з пяску і парахавога дыму, падалі дрэвы. Білі цяжкія дальнабойныя гарматы, шасціствольныя мінамёты, пушкі бліжняга бою. Больш за гадзіну бушаваў шквал агню – такога не было за ўсе гады партызанскай барацьбы. А як толькі абстрэл спыніўся, у паветры з'явіліся варожыя самалёты. Яны, нібы груганы, закружылі на брыючым над партызанскімі пазіцыямі, і ўніз паляцелі бомбы, пасыпаліся чэргі буйнакаліберных кулямётаў. У бой уступілі нашы бранябойшчыкі і кулямётчыкі. Гэта прымусіла фашысцкіх сцярвятнікаў набраць вышыню.

Адразу ж перад пазіцыямі партызан з'явіліся цесныя ланцугі гітлераўцаў. Карнікі ішлі ў касках, з поўнай выкладкай, як у наступленні на фронце. Партызаны маўчалі. Праціўнік выдатна ведаў рубеж партызанскай абароны з папярэдніх экспедыцый, і таму чым бліжэй падыходзіў да пазіцый, тым карацейшым станавіўся крок салдат. Было відаць, як афіцэры размахвалі пісталетамі, крычалі, падганяючы салдат. Але салдаты раптам спыніліся, залеглі і пачалі страляць. Партызаны маўчалі. Тады ланцугі гітлераўцаў падняліся і рушылі наперад.

Да акопаў заставалася не больш як 150–200 метраў. Партызаны маўчалі. Вось ужо засталося якіх-небудзь 100 метраў, гітлераўцы выразна бачаць брустверы і шматлікія варонкі ад снарадаў

і авіябомбаў. «Пасля такой артпадрыхтоўкі і бамбёжкі тут не засталося ніводнай жывой душы», – вырашылі фашысты, перасталі страляць, узняліся на ўвесь рост і смела пайшлі наперад. І раптам – чырвоная ракета, і ў тое ж імгненне – шквальны ружэйна-кулямётны і аўтаматны агонь. Разам з забітымі на зямлю падалі і жывыя. Адпаўзаючы, яны адкрылі беспарадкавую страляніну.

Як толькі гітлераўцы аддаліліся, на партызан зноў абрынуліся міны і снарады, з яшчэ большай злосцю пачалі бамбёжку самалёты. Ад пылу і парахавога дыму нічога не было відаць. Зямля ўздрыгвала ад магутных узрываў. І як толькі закончыліся артабстрэл і бамбёжка, карнікі зноў кінуліся ў атаку. І зноў былі адкінуты на свой зыходны рубеж. Шэсць атак праціўніка адбілі байцы «Штурмавой» у гэты дзень. Назаўтра, 24 мая фашысты не вялі актыўных дзеянняў, а праводзілі авіяразведку.

Ад сакратара абкама КП(б)Б прыскакаў пасыльны і паведаміў абстаноўку: фашысты пачалі баявыя дзеянні не толькі супраць «Штурмавой», але адразу супраць усіх партызанскіх злучэнняў Барысаўска-Бягомльскай зоны, дзе пасля карнай аперацыі ў Полацка-Лепельскай сабраліся многія брыгады народных мсціўцаў. Таму гітлераўскае камандаванне вырашыла знішчыць партызан абедзвюх зон. З гэтай мэтай фашысты ўмацавалі абарону ўздоўж паўночна-ўсходняй граніцы Барысаўска-Бягомльскай зоны па дарогах Докшыцы–Лепель, Лепель–Барысаў–Смалявічы–Слабада.

На гэтым рубяжы акупанты пакінулі ўзмоцненыя заслоны і перакінулі асноўныя сілы на паўднёва-заходнюю граніцу Барысаўска-Бягомльскай зоны

і размясцілі іх часова ў шматлікіх гарнізонах уздоўж дарог Слабада – Астрашыцкі Гарадок – Радашковічы, Радашковічы – Ілля – Даўгінава – Докшыцы. Такім чынам яны замкнулі кальцо акружэння. Фашысты разлічвалі, адрэзаўшы партызанам шлях адступлення на ўсход, па лініі Докшыцы – Лепель – Барысаў – Смалявічы – Слабада, павесці наступленне з поўдня, захаду і поўначы, заціснуць іх на невялікай плошчы ў раёне возера Палік і масіраваным артылерыйскім і мінамётным агнём, бамбардзіроўкай з паветра разграміць.

Для гэтай аперацыі пад назвай «Кармуран» акупанты знялі з фронту 6 дывізій пяхоты, адну – бамбардзіровачнай авіяцыі, танкавыя, артылерыйска-мінамётныя часці і прыдалі ім войскі аховы тылу СС і СД, нацыяналістычныя фарміраванні, так званыя РОА («Русская освободиткльная армия» – «Руская вызваленчая армія»), «украінцаў», БКА – усяго да 120 тысяч салдат і афіцэраў. Партызан жа ў Барысаўска-Бягомльскай зоне налічвалася толькі крыху больш за 10 тысяч чалавек.

Першы дзень «Кармурана» для брыгады Фёдарава прайшоў удала. Вораг абрынуў на партызан не адну тысячу бомбаў, мін і снарадаў, ад якіх было паранена ўсяго некалькі чалавек. Фашысты ж за гэты дзень панеслі значны ўрон.

У дзевяць гадзін раніцы 25 мая ў штабе брыгады было шумна. Прыскакалі разведчыкі штаба брыгады Праслаў і Рашэўскі і далажылі, што з гарнізонаў Казекава, Буцавічы і Рогава рухаецца калона гітлераўцаў колькасцю да трох тысяч салдат і афіцэраў з гарматамі, мінамётамі і кулямётамі. Праз некалькі мінут разведчыкі атрадаў імя Жукава і «Грозны» паведамілі, што з Радашковіч таксама

рушыла варожая калона прыкладна такой жа колькасцю, а з Краснага на партызан ідуць танкі і велізарная аўтакалона з жывой сілай. На прычэпе – гарматы, мінамёты, у тым ліку і шасціствольныя.

Прыбыў пасыльны атрада «За Айчыну» з данясеннем пра бой, які з васьмі гадзін раніцы вядзе атрад у раёне вёсак Карпілаўка і Харужанцы. Атрады імя Фрунзэ і імя Панамарэнкі адбіваюць атакі фашыстаў на подступах да вёсак Скнаравічы, Лекаўка і Жукаўка. Супраць брыгады «Штурмавая», якая налічвала 1870 партызан, вораг кінуў больш як 10 тысяч карнікаў, узброеных найноўшай зброяй і тэхнікай. І ў 10 гадзін раніцы па ўсёй партызанскай больш як 20-кіламетровай лініі абароны бушаваў гарачы бой. З'явіліся параненыя і, самае страшнае, заканчваліся боепрыпасы.

Брыгада вымушана была адступіць на другі рубеж абароны, а параненых адправілі на Бягомльскі аэрадром, каб вывезці на Вялікую зямлю. Але вораг пацясніў брыгаду «Жалязняк», і партызанскі аэрадром аказаўся на занятай фашыстамі тэрыторыі. Патронаў, узрыўчаткі і медыкаментаў ад Мачульскага не паступала. Партызаны апынуліся ў цяжкім становішчы. І гэта быў толькі пачатак тых выпрабаванняў, што давялося перажыць партызанам і насельніцтву падчас блакады і карнай аперацыі «Кармуран».

Ісці на прарыў сіламі адной брыгады было неразумна, і камандуючы Мачульскі згадзіўся з гэтым. Ён загадаў аб'яднаць брыгады «Штурмавая», імя Фрунзэ і «Бальшавік» і прызначыў камандзірам гэтага злучэння маёра Казанцава, які ўзначальваў спецгрупу БШПР. Прарыў намецілі зрабіць ноччу з 2 на 3 чэрвеня паміж 56 і 60 кіламетрамі шашы

Мінск–Бягомль. Брыгады сканцэнтраваліся ў лесе каля вёсак Селішча і Сярэдняе. План нечакана напасці на праціўніка не ўдаўся: варожая авіяцыя ўсе гэтыя дні не выпускала партызан з поля зроку, метадычна бамбіла і абстрэльвала з кулямётаў.

Набліжалася ноч, спусціўся змрок. Брыгады падрыхтаваліся да маршу, і ў гэты час баявыя групы, якія ахоўвалі пярэдні край абароны, сутыкнуліся з буйным атрадам карнікаў. Партызаны падпусцілі ворага на самую блізкую адлегласць і сустрэлі прыцэльным кулямётна-аўтаматным агнём. Толькі нямногія з карнікаў выратаваліся бегствам і папярэдзілі сваё камандаванне пра напрамак наступлення партызанскіх брыгад. Таму, каб не ўпусціць час і не даць праціўніку падцягнуць рэзервы, лясныя салдаты фарсіраваным маршам рушылі да месца прарыву, спадзеючыся з ходу ўварвацца на пазіцыі ворага, узламаць абарону і выйсці яму ў тыл.

У авангардзе ішоў самы буйны атрад «Штурмавой» – «За Айчыну», за ім – «Грозны», справа ішлі атрады «Штурм» і імя Фрунзэ. Атрад імя Панамарэнкі суправаджаў абоз з раненымі, камсамольскі атрад імя Жукава прыкрываў абозы і мірнае насельніцтва. Справа ад брыгады «Штурмавая» адна за адной рухаліся брыгады імя Фрунзэ і зусім маладая, нешматлікая – «Бальшавік». Самая адказная задачы ў прарыве лягла на атрады «За Айчыну» і «Штурм», і таму Фёдараў пайшоў на чале першага атрада, а выконваючы абавязкі камбрыга Фогель узначаліў другі.

Калі да шашы заставалася не больш за 200 метраў, варожыя пасты падалі сігналы-стрэлы, у той жа момант у паветра ўзвілася чырвоная ракета,

і з крыкам «Ура!» партызаны кінуліся ў атаку. Завязаўся бой.

«Такой зацятай схваткі яшчэ не ведала брыгада "Штурмавая", – успамінаў Ілля Мартынавіч. – Трохкіламетровая лінія абароны гітлераўцаў уздоўж шашы Лагойск–Плешчаніцы была ўсеяна трупамі людзей і коней, разбітай і спаленай ваеннай тэхнікай. Праціўнік падцягнуў падмацаванні з іншых участкаў абароны. Густы кулямётны агонь пачаў касіць партызан. І ў гэты момант я нібы на пень наскочыў, ударыўся аб яго каленам і ўпаў. Спрабаваў ускочыць на ногі, але тут жа зноў зваліўся на зямлю ад рэзкага болю ў бядры. Зразумеў – трапіў пад кулямётную чаргу...»

Хтосьці закрычаў:

– Камісар брыгады паранены!

З цемры падпаўзла медсястра, дастала з санітарнай сумкі індывідуальны пакет і перавязала Фёдараву нагу. Бой прыкметна аслабеў: у партызан заканчваліся боепрыпасы. Падышоў камандзір атрада «За Айчыну» Захараў, за ім – камандзір атрада «Штурм» Шубін і паведамілі, што ніводнае партызанскае падраздзяленне, ніводная брыгада не прарваліся. Уладзімір Захараў спытаўся:

– Якія будуць указанні, таварыш камісар?

– Калі засталося хаця б нямнога боепрыпасаў, зноў ідзіце на прарыў, – адказаў Ілля Мартынавіч. – Толькі не тут, вазьміце кіламетры тры лявей ці правей, бо там, я ўпэўнены, засталіся толькі невялікія варожыя заслоны. Усе сілы праціўнік сканцэнтраваў тут.

Але пакуль камандзіры збіралі людзей, стала світаць, а ісці на прарыў днём – справа беспаспяховая. Партызаны валіліся з ног ад

стомленасці і бяссонніцы, у большасці аўтаматчыкаў і кулямётчыкаў не засталося ніводнага патрона. Давялося адступаць. Уся брыгада сканцэнтравалася ў вёсцы Чмелевічы. Падлічылі страты. Яны аказаліся трывожнымі: не далічыліся больш за 200 партызан. Адсутнічалі выконваючы абавязкі камбрыга Фогель, намеснік яго па дыверсіях Цімохін, камандзір атрада імя Фрунзэ Руткоўскі, камісары атрадаў «Грозны» і імя Панамарэнкі Федасееў і Чарненка, камандзіры рот атрада імя Жукава Ціцкі, Бацян і многія іншыя. Многія былі параненыя.

Але і вораг панёс вялізныя страты, таму толькі на трэція суткі ён падцягнуў рэзервы і пачаў наступленне. Брыгаду ўзначаліў Гламаздзін. Без боепрыпасаў яна вымушана была адступаць. 5 чэрвеня былі ў зоне дзеяння брыгады «Смерць фашызму», якая з пачатку месяца вяла бесперапынныя баі. Да Фёдарава падышоў камандзір аднаго з атрадаў гэтай брыгады.

– Таварыш камісар, вы здзекуецеся з сябе і падначаленых. Едзьце ў распараджэнне Рамана Навумавіча, і ён адправіць вас на Вялікую зямлю. Тут вы загінеце!

– Але ж цяпер у нас няма аэрадрома!

– Ужо ёсць. У раёне вёскі Пастрэжжа. Мы сёння адправілі туды параненых.

Цяжка было пакідаць брыгаду ў такія цяжкія дні, горка было расставацца з сябрамі і таварышамі, з якімі столькі перажыта. Развітаўшыся з партызанамі, ў суправаджэнні ардынарца Фёдара Ушакова і байцоў камендацкага ўзвода штаба брыгады Мішы Раманоўскага і Колі Лася камісар адправіўся на аэрадром. Пляцоўку бамбіла варожая авіяцыя, і толькі 10 чэрвеня Фёдарава ўдалося эвакуіраваць самалётам на Вялікую зямлю. Спачатку

ён лячыўся ў армейскім палявым шпіталі, пасля трапіў у горад Іванава.

На бальнічным ложку Іллі Мартынавічу не давалі спакою змрочныя думкі пра лёс баявых таварышаў, пра жонку Марыю Міхайлаўну, якіх давялося пакінуць у самы цяжкі час. Падрабязнасці апошніх дзён перад вызваленнем Мінска сталі яму вядомыя з пісем, што ён атрымаў ажно ў ліпені. Першае было ад Марыі Міхайлаўны, другое – ад Іосіфа Фогеля.

Сэрца Фёдарава было гатова вырвацца з грудзей ад радасці: жонка жывая! Яна пісала: *«Усё ў парадку, жывая, але змучыліся мы ўсе і нагаладаліся мы ўсе так, што ледзь прыцягнулі ногі. Родныя таксама ўцалелі. Пра справы ў брыгадзе табе піша Іосіф Лазаравіч».*

Пісьмо Фогеля было вялікае, падрабязнае:

*«...У тую ноч з 2 на 3 чэрвеня як толькі я скеміў, што праціўнік сцягнуў да месца нашага прарыву сілы з іншых участкаў, загадаў партызанам узяць управа. Сам пайшоў на чале калоны. За кіламетры два ад Плешчаніц фарсіравалі шашу. Убачыў, што са мною прайшло не больш як 200 партызан. Асноўная маса людзей – мірныя жыхары. Сярод партызан былі нам. камандзіра брыгады па дыверсіях Цімохін, камісары атрадаў Федасееў і Чарненка, нач. штаба атрада імя Панамарэнкі Ганееў, камандзіры рот атрада імя Жукава Бацян і Ціцкі, палітрук роты атрада імя Панамарэнкі Саркісаў і партызаны гэтага атрада Лавец, Зазар'янц, Трыч, Піляй, Цынхобль, Крыжаноўскі, твая жонка з братам Сяргеем і іншыя.*

*Мы вырашылі ісці на сваю базу, спадзяваліся, што туды прыйдзе і ўся брыгада. Не прайшлі мы і двух кіламетраў, як паказаліся ланцугі гітлераўцаў, якія адкрылі агонь. Нашчупалі ў парадках гітлераўцаў*

*слабае месца і прарваліся, але пры гэтым згубілі забітымі сваіх партызан: Івана Бацяна і Рымальда дэ Юнга. Пасля мы яшчэ раз сутыкнуліся з гітлераўцамі каля вёсак Ідаліна і Пруткі Лагойскага раёна, забілі 10 гітлераўцаў і яшчэ больш паранілі, самі схаваліся ў лесе. Фашысты, значыць, ішлі не адным фронтам, а трымя хвалямі. Нічога не скажаш, рабілі надзейна.*

*На сваю базу прыйшлі мы 6 чэрвеня. Акрамя нас і дыверсійных груп, што мы пасылалі перад блакадай у тыл ворага, ніхто яшчэ не вярнуўся. Падрыўнікі (...) за час нашага адыходу спусцілі пад адхон шэсць варожых эшалонаў: тры на перагоне Беларусь–Петрышкі, адзін на перагоне Маладзечна–Вілейка і два на перагоне Смаргонь–Солы. Акрамя гэтага перабілі 46 рэек, узарвалі і спалілі 11 мастоў на шасэйных дарогах.*

*Брыгада адыходзіла да вёскі Пастрэжжа Бягомльскага раёна і вырвалася з акружэння пасля трох спроб ноччу з 14 на 15 чэрвеня каля вёсак Макаўе і Мрай, страціла забітымі і згінуўшымі без вестак да трохсот чалавек. Загінулі: сакратар партарганізацыі атрада "За Айчыну", член бюро падпольнага райкама партыі Патомскі, нач. асобага аддзела гэтага атрада Севасцьянаў, камандзір атрада імя Фрунзэ Руткоўскі, камандзір роты атрада "За Айчыну" Уласаў і палітрук гэтай роты Тарасевіч.*

*Яны загінулі, як героі. Ішлі наперадзе і вялі за сабой усіх. У гэтым баі праціўнік страціў толькі забітымі больш як 300 салдат і афіцэраў.*

*Калі вярнуліся на базу, адразу ж усе свае сілы кінулі на падрыўныя работы. Дыверсійныя групы хадзілі на чыгунку Мінск–Маладзечна і Маладзечна–Парафʼянава, спускалі пад адхон эшалоны праціўніка,*

*абстрэльвалі іх з ПТР і кулямётаў. На шашы Мінск–Маладзечна і Мінск–Бягомль рабілі засады і нападалі на аўтакалоны гітлераўцаў. Словам, жыццё ўвайшло ў звычнае рэчышча.*

*2 ліпеня мы сустрэліся з танкістамі генерал-маёра Асланава. Радасць партызан і ўсяго насельніцтва нельга апісаць. Ад генерала атрымалі падзяку за хуткае аднаўленне мастоў і дарог, за каштоўныя звесткі. 4 і 5 ліпеня ў нас гасцявалі салдаты і афіцэры 1-й Маскоўскай гвардзейскай дывізіі, якой мы здалі звыш 400 гітлераўцаў, якіх мы захапілі ў палон. Многія нашы партызаны прынялі ўдзел у баях гэтай дывізіі і добраахвотна ўвайшлі ў яе састаў. Пайшло б і больш, калі б пятага ліпеня не атрымалі радыёграму-загад БШПР з патрабаваннем усёй брыгадзе з'явіцца ў Мінск. Такія ж загады атрымалі і іншыя брыгады Мінскай вобласці.*

*10 ліпеня мы прыбылі ў размяшчэнне БШПР, які дыслацыраваўся каля Мінска, у саўгасе "Лошыца". Атрымалі прызначэнне – несці пастаянную ахову горада ад раптоўнага наскоку недабітых варожых часцей і падраздзяленняў, разгромленых нашай Арміяй на ўсход ад Мінска.*

*Калі ішлі ў Мінск, мы некалькі разоў сутыкаліся з разрозненымі групамі праціўніка. Яны ўжо не аказвалі сур'ёзнага супраціўлення, здаваліся ў палон. Але ў саўгасе "Бальшавік", дзе мы спыніліся на начлег, на світанні 10 ліпеня на нас напала цэлая воінская часць. Партызаны былі захоплены знянацку, бо ніхто і не дапускаў, што за 15 кіламетраў ад Мінска, вызваленага тыдзень таму, могуць быць немцы. Успыхнуў гарачы бой. Нам давялося б туга, калі б на дапамогу не падаспела наша воінская часць. З ворагам было хутка скончана. Многія гітлераўцы*

*былі забіты і захоплены ў палон. Мы страцілі двух патызан.*

*У Мінску наша брыгада з брыгадамі імя Калініна, "Праўда", 1-я і 2-я Мінскія трымалі абарону паўднёвай часткі горада. З 10 па 28 ліпеня наша брыгада захапіла ў палон 12 разрозненых груп праціўніка. Было забіта 68 нямецкіх салдат і афіцэраў, якія аказалі супраціўленне.*

*Сёння, 28 ліпеня, мы закончылі пісаць справаздачу БШПР пра баявую і палітычную дзейнасць брыгады за ўвесь перыяд барацьбы. Не ведаю, як ты ацэніш, а, на мой погляд, вынік атрымаўся нядрэнны. Я прывяду табе толькі асноўныя лічбы: спушчана пад адхон 197 эшалонаў праціўніка, у тым ліку браняпоезд. Пры гэтым разбіта 176 паравозаў, 513 вагонаў з жывой сілай, 567 вагонаў з боепрыпасамі і іншымі ваеннымі грузамі, 347 платформаў з баявой тэхнікай, 67 цыстэрнаў з палівам; знішчана 1848 тон паліва ў бензасховішчах, 571 аўтамашына, 50 танкаў і бронемашын, 11 трактараў і цягачоў, 109 матацыклаў, 2 самалёты, 168 мастоў; разгромлена 20 гарнізонаў, 49 прадпрыемстваў і дзяржаўных гаспадарак, 2 чыгуначныя станцыі; забіта 16 547 салдат і 537 афіцэраў, паранена 9225 і захоплена ў палон 1488 салдат і афіцэраў.*

*Акрамя таго, было пашкоджана 46 паравозаў, больш за 1000 вагонаў і платформаў, 1993 метры падземнага кабелю сувязі.*

*Нашы страты за ўвесь час дзеяння ўсіх атрадаў брыгады склалі нямногім больш як 500 партызан і партызанак.*

*Наш дэвіз: "Мы адпомсцім!" выканалі: ворагу мы адпомсцілі...*

*Цябе, канешне, цікавіць лёс Р. Н. Мачульскага. Ён да канца заставаўся з брыгадамі, якія не прабіліся з акружэння. 18 ліпеня быў цяжка паранены ў грудзі. У цяжкім стане пасля прыходу Чырвонай Арміі адпраўлены ў Маскву на лячэнне. На шчасце, у БШПР нам сказалі, што небяспека мінула, і ён хутка выздаравее.*

*Пішы, як твае раны, хутчэй папраўляйся.*

*Абдымаем цябе ўсёй брыгадай. Твой Іосіф».*

...Вярнуўшыся ў верасні 1944-га ў Мінск, Ілля Мартынавіч быў прызначаны прарэктарам БДУ імя Леніна, разбураныя вайной вучэбныя карпусы якога тады ўзнаўляліся: улічылі яго адукацыю – перад вайной ён закончыў фізіка-матэматычны факультэт Растоўскага ўніверсітэта. Але на гэтай пасадзе працаваў ён нядоўга. Раман Навумавіч Мачульскі, які на гэты час стаў старшынёй Мінскага аблвыканкама, запрасіў яго на пасаду свайго намесніка. Праз тры гады Фёдараў перайшоў на работу ў аблана. У сістэме народнай асветы Ілля Мартынавіч працаваў усё сваё жыццё.

Рэха партызанскай барацьбы гучала на Беларусі яшчэ доўгія пасляваенныя гады. Час расставіў усё па вышэйшай справядлівасці. Многія партызанскія камандзіры і камісары займалі высокія дзяржаўныя і партыйныя пасады, некаторыя і цяпер выхоўваюць маладое пакаленне на прыкладах гераічнага змагання, прывіваюць моладзі імунітэт да расісцкай тэорыі фашызму, заклікаюць ніколі не забывацца на зверствы і злачынствы, што чынілі нацысты і іх памагатыя на нашай зямлі.

Па сваіх чорных справах атрымаў у пасляваенны час камбрыг Лунін. Пра яго ганебны ўчынак

расказаў мне сам Ілля Мартынавіч падчас адной з нашых частых сустрэч. Ён вельмі дакараў сябе, што не змог тады да канца раскрыць яго подлую душу і папярэдзіць страшнае злачынства кар'ерыста і яго прыспешнікаў-падхалімаў, якімі ён акружыў сябе. Чорнай плямай лягло гэта страшнае злачынства на брыгаду «Штурмавая», і многія гады выдатныя баявыя справы гераічнага партызанскага злучэння замоўчваліся.

Як аказалася пасля вайны, Барыс Лунін незаслужана займаў высокую камандзірскую пасаду. Лунін утаіў сваё турэмнае мінулае і назваўся палітруком аўтамабільнага батальёна, хаця служыў радавым шафёрам. А здарылася наступнае.

## ЗЛАЧЫНСТВА Ў МАНЫЛЬСКІМ ЛЕСЕ

*«Цэнтр. 02.12.42. Мяняю дыслакацыю паводле плана № 4. Наступны сеанс сувязі – па графіку».*

Радыёграма такога зместу была адпраўлена ў пачатку снежня 1942 года рэзідэнтам савецкай разведкі з акупіраванага Мінска. Толькі некалькі чалавек з разведупраўлення Генеральнага штаба Чырвонай Арміі ведалі, што хаваецца за гэтымі скупымі радкамі. А гэта быў сігнал трывогі. Справа ў тым, што ў канцы 1942 года ў Мінску высілкамі фашысцкай контрразведкі быў раскрыты і арыштаваны падпольны партыйны камітэт. Пагроза навісла і над явачнымі кватэрамі савецкіх разведчыкаў: яны таксама апынуліся на грані правалу.

Шыфраваную тэлеграму ў цэнтр адправіў савецкі разведчык Вішнеўскі (псеўданім –

«Уладзіміраў»). На той час амаль усе яго яўкі ў Мінску аказаліся праваленымі, шчупальцы гестапа і абвера працягнуліся і да апошняй, гаспадаром якой быў падпольшчык Павел Раманавіч Ляхоўскі. Пара было прымаць тэрміновыя меры. А план № 4 і азначаў, што разведгрупа Вішнеўскага з чатырох чалавек перабіраецца на запасную явачную кватэру пад Мінскам, у вёсцы Латыгаўка.

Яе гаспадар, былы начальнік памежнай заставы на старой заходняй мяжы, добра ведаў Вішнеўскага па сумеснай службе. Разведгрупе з дапамогай праваднікоў удалося ў пачатку снежня лёгка выйсці з Мінска і дабрацца ў Латыгаўку. Праз тыдзень тут асталявалася і другая група разведупраўлення Генштаба, якую ўзначальваў афіцэр-разведчык Барсукоўскі. І неўзабаве ў Латыгаўцы запрацавалі дзве рацыі.

З'яўленне разведгруп, у якіх была пастаянная радыёсувязь з Масквой, стала вялікай падмогай для партызанскага атрада «Штурм», які размяшчаўся непадалёку ў вёсцы Манылы. Да гэтага сувязь з Вялікай зямлёй штаб атрада падтрымліваў праз Д. І. Креймаха («Дзіму»), камандзіра партызанскага атрада, і праз яго штаб, які размяшчаўся ў Руднянскім лесе Лагойскага раёна. Але толькі свае радысты маглі забяспечыць пастаянныя ўстойлівыя зносіны з Вялікай зямлёй, а значыць і сістэматычнае матэрыяльнае забеспячэнне атрада.

Восем чалавек з разведгруп загадам Луніна былі залічаны ў атрад пры штабе. Здавалася, інтарэсы абодвух бакоў будуць задаволены. Але адбылося трагічнае і непапраўнае...

Новы, 1943 год камандаванне толькі што створанай і арганізаванай партызанскай брыгады

«Штурмавая» сустракала разам з байцамі-разведчыкамі. За знаёмства, за паразуменне, баявыя поспехі, за хуткую перамогу над ворагам – чарка за чаркай, і Лунін, як заўсёды, перабраў, крычаў гучней за ўсіх, выхваляўся. Вішнеўскаму гэта не спадабалася. Але... што вінен, аддаць павінен. Ён і запрасіў камандаванне брыгады ў госці да сябе, на сялібу Юшкі, непадалёку ад Радашковічаў. Назаўтра туды і адправіліся на двух падводах. На пярэдняй ехалі камбрыг Лунін і Вішнеўскі са сваёй групай, на другой – камісар Ілля Фёдараў і разведчыкі Барсукоўскага. У дарозе паміж Луніным і Вішнеўскім успыхнула сварка.

За сталом Лунін, насуперак свайму звычаю, піў мала, беспадстаўна хмурыўся. А на зваротнай дарозе бразнуў камісару Фёдараву, што, маўляў, Вішнеўскі жадае заняць яго месца камбрыга. Трэба сказаць, што Лунін у кожным новым чалавеку, які з'яўляўся ў атрадзе, падазраваў суперніка. А тут – афіцэр разведупраўлення Генштаба, адважны і бескампрамісны...

Вярнуўшыся ў штаб, Лунін доўга не мог заснуць, часта выходзіў на вуліцу, нарэшце, загадаў засядлаць каня. На пытанне камісара адказаў, што адпраўляецца да суседзяў у Руднянскі лес. З тым і з'ехаў. Толькі пад вечар на моцным падпітку з'явіўся ён у штабной хаце. І прама з парога заявіў Фёдараву:

– Ну і гадзюку мы прыгрэлі! Зараз жа загадаю пусціць у расход!

– У які расход? Пра каго ты кажаш? – спытаў камісар.

– Ды пра *Вішнеўскага і Барсукоўскага*! Уся гэта кодла – фашысцкія агенты, іх пераверабавалі

і закінулі да нас з мэтай знішчыць партызанскае камандаванне.

– Адкуль ты гэта ўзяў? – спытаў устрывожаны Фёдараў.

– Штаб «Дзімы» атрымаў радыёграму Панамарэнкі пра тое, што ў партызанскія злучэнні закінуты шэсць груп перавербаваных былых нашых разведчыкаў. Вось дзве з іх і трапілі да нас.

– Не трэба спяшацца, – цвёрда сказаў камісар. – Трэба даручыць нашай контрразведцы ўсё старанна праверыць, расследаваць і дасканала разабрацца. Самаўпраўства і самасуд – сур'ёзнае злачынства.

Лунін грукнуў дзвярыма і выйшаў. А праз некаторы час у штабе з'явіўся начальнік асобага аддзела брыгады сяржант дзяржбяспекі Белік. Ён прыцягнуў мяшок з нейкай адзежай і, крыва ўсміхаючыся, абвясціў:

– Вось гад! Яшчэ і абураўся! Цэлую прамову закаціў. Вінаваціў у самаўпраўстве і беззаконні.

У Фёдарава пахаладзела сэрца. Прадчуваючы непапраўнае, ён спытаў:

– Хто закаціў прамову?

– Як – хто? Уладзіміраў! Але гэта не дапамагло: расстралялі ўсю гэту кодлу – восем чалавек!

Аказалася, што раніцай Лунін выдаў загад па брыгадзе, у якім гаварылася пра фашысцкіх агентаў і іх знішчэнні. Камісар Фёдараў гэты загад не падпісаў. У адказ на патрабаванне камбрыга паставіць неадкладна свой подпіс пад загадам Ілля Мартынавіч цвёрда заявіў:

– Я катэгарычна не згодзен з такім самаўпраўствам і як сакратар партыйнай арганізацыі выказваю сваё асобае меркаванне наконт гэтай падзеі. Папярэджваю, што табе прыйдзецца па

закону строга адказаць за самасуд над невінаватымі людзьмі.

– Ты вельмі ўпарты! – злосна прамовіў Лунін. – Глядзі, каб гэта ўпартасць не вылезла табе бокам! – і ў вачах яго палыхнула злосць і абурэнне.

Гэты дыялог праходзіў у прысутнасці начштаба Іосіфа Фогеля, і ён зразумеў, што над Фёдаравым навісла сур'ёзная пагроза. Таму ў сакрэце ад Іллі Мартынавіча ён падрабіў яго подпіс, а Луніну сказаў, што Фёдараў нарэшце падпісаў злашчасны загад. Але пра гэта Ілля Мартынавіч даведаўся значна пазней, пасля вайны.

*З архіўных дакументаў.*

*Загад № 5 па №-скай партызанскай брыгадзе ад 7.1.43 г.:*

*«Прыбыўшая ў атрад Маскоўская група дэсантнікаў аказалася завербаванай нямецкім гестапа і спрабавала зрабіць замах на камандзіра брыгады. Зыходзячы з гэтага, ЗАГАДВАЮ:*

*За вышэй указаныя факты расстраляць Маскоўскую групу ў саставе:*

*1. Камандзіра групы Уладзімірава Сяргея Казіміравіча*

*2. Радыста групы Мельнікава Макара Піліпавіча*

*3. Членаў групы Загорскага Аляксандра Дзяменцьевіча*

*4. Загорскую Марыю Цярэнцьеўну.*

*Загад давесці да ведама ўсяго асабовага саставу».*

*(Далей ідуць подпісы камбрыга, начальніка штаба і падроблены ім подпіс камісара.)*

*(Фонд 1405, справа 959, ліст 8).*

Прачытаўшы гэты загад у Нацыянальным рэспубліканскім архіве, я доўга думаў, чаму ў ім

указаны прозвішчы членаў толькі адной групы разведупраўлення Генштаба. І мне падалося, што Лунін усё ж адчуваў сваю віну за самаўпраўства і такім чынам, напэўна, хацеў хоць крыху зменшыць адказнасць за такое вялікае злачынства.

А пасля вызвалення Беларусі падзеі па справе дэсантнікаў разгортваліся наступным чынам...

## «НА ТОЕ ЯНЫ І ПАРТЫЗАНЫ...»

Павел Раманавіч Ляхоўскі ва ўмоўлены дзень не атрымаў чарговай весткі ад Вішнеўскага. Сувязь чамусьці абарвалася і, як паказаў час, назаўжды. А затым папаўзлі чуткі...

Пасля вызвалення Мінска ў 1944 годзе П. Р. Ляхоўскі напісаў у Камітэт дзяржбяспекі БССР пра свае падазрэнні, выклаў вядомыя яму факты. Вынікам гэтага пісьмовага звароту сталі кругі перапіскі і данясенняў. Луніна выклікалі на допыт у КДБ. Невядома, чым гэта ўсё у той час скончылася б, калі б не адна гутарка паміж Сталінам і Панамарэнкам. Гаворка паміж імі зайшла пра злоўжыванні партызан на акупіраванай тэрыторыі, пра выпадкі неабгрунтаваных рэпрэсій, дапушчаных у гады вайны. Памяць у Сталіна была ўчэпістая. Ён і ўзгадаў, што пра беларускіх партызан у яго з Панамарэнкам была тэлефонная размова пад канец 1943 года. Тады Вярхоўны патэлефанаваў начальніку Цэнтральнага штаба партызанскага руху і сказаў:

– Мы напярэдадні Новага года прадстаўляем да звання Героя вялікую групу камандуючых франтамі,

арміямі. Давай кандыдатуры сваіх партызанскіх камандзіраў, каб усё было па справядлівасці.

Панамарэнка задумаўся. Ён папрасіў у Сталіна дазволу назваць кандыдатуры пазней, а сам звязаўся з начальнікам Беларускага штаба партызанскага руху і запатрабаваў патрэбныя звесткі. Калінін, у сваю чаргу, звярнуўся да І. П. Гапоненкі – другога сакратара ЦК КПБ, які нядаўна вярнуўся з партызанскай Вілейска-Віцебскай зоны. Іван Пятровіч упэўнена і адразу ж назваў прозвішчы некаторых камандзіраў партызанскіх злучэнняў, якія, па яго меркаванні, былі дастойныя высокага звання. Назваў ён, павагаўшыся, і прозвішча камандзіра брыгады «Штурмавая» Луніна.

А прычына гэтага яго сумневу і ваганняў была такая. Падчас куставой, занальнай нарады камандзіраў і камісараў партызанскіх брыгад, атрадаў, кіраўнікоў падполля, якія дзейнічалі на тэрыторыі Вілейска-Віцебскай зоны, Лунін у добрым падпітку ўчыніў дэбош, папракаючы высокае партызанскае кіраўніцтва ў тым, што яго, Луніна, недаацэньваюць. Маўляў, яго брыгада гераічна ваюе каля самага Мінска, «у чорта на рагах», а яго, камандзіра, увесь час абыходзяць. Абураны камандзір злучэння Р. Н. Мачульскі прыстрашыў Луніна і заявіў, што адхіліць яго ад камандавання брыгадай.

Раніцай усе камандзіры сталі прасіць Рамана Навумавіча прабачыць Луніна і не прымяняць да яго строгіх санкцый. Той саступіў. Гэты інцыдэнт запомніўся І. П. Гапоненку, як і аповеды пра шматлікія гераічныя баявыя справы брыгады «Штурмавая». І прозвішча Луніна з'явілася ў загадзе

Галоўнакамандуючага, а на грудзях камбрыга «Штурмавой» заблішчэла Залатая Зорка Героя...

Цяпер жа, у 1944-м, Сталін нядбайна вымавіў:

– Падумаеш, кагосьці партызаны там расстралялі. На тое яны і партызаны, каб страляць!

І справу прыкрылі. Прыкрылі, але не закапалі. Тое, што калісьці хоць раз трапіла ў поле зроку КДБ, захоўваецца надоўга, калі не навечна. У 1953 годзе па настойлівым чарговым пісьме П. Ляхоўскага справа на кароткі час усплыла зноў. Да гэтага часу Барыс Лунін з Мінска, дзе ён пасля вайны працаваў памочнікам міністра аўтатранспарту рэспублікі, пераехаў у станіцу Белазёрская Краснадарскага краю, атрымаў у спадчыну два дамы і ўладкаваўся на пасаду намесніка дырэктара буйной аўтакалоны.

Але і тут ён доўга не затрымаўся: даўняя прыхільнасць да спіртнога саслужыла яму дрэнную службу. Не дапамагла і Зорка Героя – Луніна з трэскам звольнілі. Прыйшлося прадаць абедзве хаты і асталявацца ў Майкопе. Тут яго і знайшоў следчы ваеннай пракуратуры Беларускай ваеннай акругі Васютовіч...

– Мяне арыштаваць?! Ды ці ведаеш ты, хто я такі? Я – Герой Савецкага Саюза, былы камбрыг вядомай на ўсю Беларусь «Штурмавой»!

І ўсё ж Барыс Мікалаевіч Лунін у наручніках быў дастаўлены ў Мінск...

Ваенны трыбунал, разгледзеўшы ў 1956 годзе справу па абвінавачванні былога камандзіра партызанскай брыгады «Штурмавая» Луніна Барыса Мікалаевіча, прызнаў яго вінаватым і прыгаварыў да сямі гадоў пазбаўлення волі. Пазбавілі Луніна і высокага звання Героя Савецкага Саюза. Такі ж тэрмін «адмералі» і яго падручнаму Беліку.

Падчас следства на допыты ў якасці сведкі выклікалі і былога камісара Фёдарава. Правялі экспертызу подпісу, што зрабіў дзеля яго выратавання Іосіф Фогель, і прызналі: Ілля Мартынавіч не падпісваў таго загаду пра расстрэл савецкіх разведчыкаў. Але ў яго, тым не менш на ўсё жыццё засталося пачуццё віны і адчаю, што ў той ракавы дзень не змог прадухіліць страшнае злачынства чалавека, якому пасля ўцёкаў з палону паверыў і згадзіўся з яго кандыдатурай на пасаду камандзіра.

У значнай меры гэтаму паспрыяла тое, што Лунін утаіў сваю даваенную судзімасць і адрэкамендаваўся не простым шафёрам, а палітруком аўтамабільнага батальёна і прысвоіў сабе менавіта такое званне. Яно неаднойчы сустракаецца ў загадах па атрадзе «Штурм», а пасля і па брыгадзе «Штурмавая»...

...Пасля вайны на чарговы партызанскі злёт у Манылы, адбыўшы пакаранне, прыехаў і Барыс Лунін. Ён не асмеліўся выйсці з аўтамашыны і сустрэцца з былымі падначаленымі. Так і прасядзеў за шклом аўтамабіля. Толькі коратка сказаў сваім былым прыбліжаным, што зайшлі да яго:

– Варта мне выйсці і скамандаваць пастраенне, упэўнены, што партызаны выканаюць маю каманду!

Чалавек, на жаль, мала што зразумеў...

А Ілля Мартынавіч, як бачым, звязаў свой далейшы лёс з Беларуссю, доўга працаваў на ніве народнай асветы. Пасля вайны ён даведаўся, што на фронце загінулі пяць яго братоў з дзесяці і двое пляменнікаў, якія змагаліся з ненавісным ворагам, ратавалі чалавецтва ад фашызму.

Фёдараў заставаўся душой былых партызан, амаль да канца сваіх дзён наладжваў штогадовыя сустрэчы на былым месцы дыслакацыі штаба брыгады, у вёсцы Манылы. На жаль, ніхто цяпер не з'явіцца на такую сустрэчу, а вось памяць пра тыя падзеі, памяць пра тых простых гераічных людзей павінна заставацца назаўсёды.

*Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць супрацоўнікам Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ўдаве Іллі Мартынавіча Фёдарава Марыі Міхайлаўне Фёдаравай-Пуцейка за дапамогу ў зборы неабходных дакументаў і звестак.*

# «Волга» выходзіць на сувязь

На завяршальным этапе вайны ў састаў 1-га Беларускага фронта пад камандаваннем маршала Ракасоўскага ўвайшлі падраздзяленні адроджанай польскай арміі, якая змагалася супраць агульнага ворага – фашызма – поплеч з савецкімі воінскімі часцямі. Перад шырокім наступленнем на тэрыторыю Паўночна-заходняй Польшчы для глыбокай разведкі ў тыле ворага былі сфарміраваны разведвальна-дыверсійныя групы – некалькі з іх склалі воіны польскага асобнага штурмавога батальёна.

У састаў адной з такіх груп былі ўключаны і два савецкія афіцэры ў якасці намесніка камандзіра і радыста. Пра баявую разведвальна- дыверсійную групу, якая атрымала назву **«Волга»** і дзейнічала пад кіраўніцтвам разведупраўлення штаба 1-га Беларускага фронту, расказваецца ў гэтай аповесці.



## «ВОЛГА» ПЛЫВЕ НА ЗАХАД

– Пане падпалкоўнік! Дазвольце далажыць: падпаручнік Менткі па вашым загадзе з'явіўся! – адрапартаваў малады стройны афіцэр, зачыніўшы дзверы кабінета і прыклаўшы руку да канфедэраткі.

Камандзір асобнага паветрана-дэсантнага штурмавога батальёна Войска Польскага падпалкоўнік Генрык Таруньчык прыязна махнуў рукою, запрашаючы падпаручніка бліжэй да стала. У кабінеце камбата знаходзіліся два старшыя афіцэры Чырвонай Арміі. Падпалкоўнік звярнуўся да сваіх гасцей:

– Дазвольце вам адрэкамендаваць камандзіра разведвальна-дэсантнай групы «Волга» – падпаручнік Ян Менткі!

Савецкія палкоўнікі ветліва павіталіся з падпаручнікам. Адзін з афіцэраў – вядомы беларускі палітычны дзеяч Сяргей Осіпавіч Прытыцкі быў начальнікам штаба польскіх партызан, другі аказаўся супрацоўнікам разведупраўлення штаба 1-га Беларускага фронту. Ён і запытаў Яна пра гатоўнасць да выканання адказнага баявога задання ў тыле ворага.

– Не толькі я, але і ўсе мае сябры-землякі з нашага Памор'я ў любую хвіліну гатовы вылецець

у тыл ворага, каб наблізіць час вызвалення Айчыны, – адказаў, не вагаючыся, малады афіцэр.

– З гэтага дня вы паступаеце ў распараджэнне нашых гасцей, – сказаў падпалкоўнік Таруньчык. Ён загадаў Ментками з'явіцца да начальніка штаба батальёна капітана Краузе і пазнаёміцца з саставам сваёй будучай разведвальна-дэсантнай групы...

...Сілай мабілізаваны ў рады Вермахта, як і тысячы іншых палякаў з Памор'я, Ян Ментакі аказаўся пад Ленінградам. У кастрычніку 1942 года, прыхапіўшы з сабою аўтамат, ён перайшоў на бок Чырвонай Арміі і пачаў працаваць пры штабе фронту ў палітаддзеле. Пісаў лістоўкі да палякаў з заклікам пераходзіць на савецкі бок, звяртаўся да сваіх землякоў праз мегафон. Гэтыя заклікі былі пачуты: лінію фронту перайшлі Браніслаў Варчак, Грэнь, Нядоля і многа, многа іншых памаран.

У лістападзе 1943 года ў Сельцах паблізу ракі Ака пачаў фарміравацца паветрана-дэсантны батальён Польскай Арміі, які стаў баявым падраздзяленнем штаба польскіх партызан. Сюды прымалі толькі добраахвотнікаў, і тым не менш іх адбіралі вельмі строга. Галоўнай мэтай кіраўніцтва батальёна была падрыхтоўка камандных кадраў і інструктараў для партызанскіх атрадаў, а таксама дэсантнікаў для выканання спецыяльных заданняў у тыле ворага як на тэрыторыях даваеннай Польшчы, так і на землях Германіі. У камандны састаў батальёна ўваходзілі савецкія афіцэры – выдатныя спецыялісты, якія перадавалі свой багаты ваенны і баявы вопыт.

Якую вялікую ўвагу надавалі падрыхтоўцы дэсантнікаў-разведчыкаў, сведчыць той факт, што з імі займаліся самыя лепшыя савецкія спецыялісты. Напрыклад, парашутнай справе іх навучаў

калектыў вядомых савецкіх парашутыстаў на чале з абсалютным майстарам спорту міжнароднага класа палкоўнікам Набі Амінтаевым. Асаблівасцям будучай дыверсійнай дзейнасці і разведкі ў тыле ворага дэсантнікаў абучалі іншыя выдатныя савецкія майстры сваёй справы.

У падраздзяленні сувязі рыхтавалі радыётэлеграфістаў, у падраздзяленні дыверсантаў вучылі мінёрскай справе, стралкі навучаліся тактыцы і спецыфіцы партызанскага бою – арганізацыі засад на дарогах, спосабам нападаў на ваенныя аб'екты і паліцэйскія ўчасткі. Дэсантнікі авалодвалі спосабамі маскіроўкі, абясшкоджвання вартавых, назірання, арыентацыі – вызначэння бакоў гарызонту пры дапамозе бусолі, сонца, Палярнай зоркі месяца, гадзінніка. Трэба было вывучыць віды савецкай і нямецкай зброі, авалодаць майстэрствам гранатнага бою, азнаёміцца з тапаграфічнымі знакамі, навучыцца чытаць ваенныя карты.

Тут Ян Менткі пасля заканчэння спецыяльных вучэбных курсаў атрымаў афіцэрскае званне і быў прызначаны камандзірам групы дэсантнікаў, што павінна была дзейнічаць на Памор'і...

Батальён у жніўні 1944 года дыслацыраваўся каля Любліна, на польскай тэрыторыі. Група размяшчалася асобна ад астатніх байцоў батальёна. Праходзіла знаёмства членаў групы між сабой, «прыціранне» характараў. Праз нейкі час падпаручнік заўважыў, што сярод саставу яго групы мала ўзаемаразумення, наступіў нейкі падзел па інтарэсах. Пра гэта ён неадкладна далажыў падпалкоўніку Таруньчыку.

– Ну што ж, ваша права выбраць надзейных людзей: вам з імі ляцець у тыл ворага, і вы

павінны быць упэўнены ў кожным больш, як у сабе. Прадстаўце новыя кандыдатуры капітану Краузе, мы разам разгледзім іх і прымем канчатковае рашэнне. Толькі не марудзьце: час «Ч» можа наступіць у любы дзень.

У адзін з дзён да падпаручніка Менткага звярнуўся шчуплы, падобны на падлетка капрал з савецкімі баявымі ўзнагародамі на мундзіры і папрасіў залічыць яго ў састаў групы. Падпаручнік са здзіўленнем агледзеў дробную фігуру капрала і запытаў:

– Як тваё прозвішча, імя і імя па бацьку?

– Эдмунд Эрнст, сын Леона! – адным дыхам выгукнуў капрал.

– Дзе ваяваў і за што атрымаў узнагароды?

– Быў байцом партызанскай брыгады «Штурмавая» на тэрыторыі Беларусі, ордэн Чырвонай Зоркі ўручылі мне за дыверсійную дзейнасць, медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» атрымаў там жа.

Так у саставе групы з'явіўся вопытны баец, які дасканала ведаў метады партызанскай барацьбы. Астатнія парашутысты былі таксама добра абучанымі воінамі, прайшлі надзейную падрыхтоўку ў батальёне. Некаторыя з іх паспелі панюхаць пораху на фронце. З дапамогай капітана Краузе быў сфарміраваны новы састаў групы, у якую ўвайшлі падпаручнік Ян Менткі, старшыя сяржанты Браніслаў Варчак, Францішак Надольны, Леон Песік, Алаіз Малахоўскі, старшына снайпер Станіслаў Мрочак і капрал Эдмунд Эрнст. Усе члены падраздзялення, як і сам камандзір, былі родам з Памор'я, дзе групе выпадала дзейнічаць у тыле ворага.

Адразу ж, як толькі вызначылі новую групу, яе камандзіра зноў выклікалі да падпалкоўніка Таруньчыка, дзе ў прысутнасці ўжо знаёмага яму савецкага афіцэра паведамілі, што разам з групай ён прыкамандзіраваны да штаба «Н» – так абазначаўся штаб 1-га Беларускага фронта. Падпаручнік атрымаў загад падабраць і праверыць абмундзіраванне і ўзбраенне на дзевяць чалавек, бо ў саставе групы з'явяцца яшчэ два парашутысты.

Неўзабаве да дома, дзе размяшчаўся камандзір групы, пад'ехаў «віліс», з яго выйшаў знаёмы палкоўнік з двума маладымі савецкімі афіцэрамі. Палкоўнік пазнаёміў Менткага з новымі дэсантнікамі. Адзін з іх, сярэдняга ўзросту чарнявы, падобны на цыгана жвавы мужчына, насіў псеўданім «Віктар» і прызначаўся намеснікам камандзіра групы, другі, моцны фізічна, жыццярадасны, з шырокім тварам і заўсёднай папяросай у зубах, павінен быў выконваць ролю радыста. Прозвішча яго – Уколаў. Абодва да гэтага часу некалькі разоў пабывалі за лініяй фронту ў саставе парашутных дэсантна-разведвальных груп і мелі вопыт дзейнасці ў тыле ворага.

Раніцай 7 верасня палкоўнік загадаў аб'явіць членам групы стан гатоўнасці да адлёту. Камандзір праверыў узбраенне, рыштунак і абмундзіраванне кожнага парашутыста і загадаў падрыхтавацца да вячэрняга пастраення: перад адлётам кожнай групы праходзіла невялікая ўрачыстасць.

...На прасторнай плошчы выстраіўся батальён. Перад ім стаяла гатовая да адлёту група падпаручніка Менткага. Слова ўзяў куратар батальёна генерал брыгады Аляксандр Завадскі.

– Жаўнеры! – урачыста вымавіў ён. – Настаў ваш час святога змагання за свабоду нашай дарагой Айчыны. Няхай спадарожнічае вам ваеннае шчасце ў гэтай барацьбе. Упэўнены, што кожны з вас застанецца дастойным высокага звання салдата новай Польшчы і зробіць усё, каб яна хутчэй паўстала з фашысцкай няволі.

Удачы дэсантнікам пажадаў і камандзір батальёна падпалкоўнік Таруньчык. Пасля перад камандаваннем і групай урачыстым маршам прайшлі падраздзяленні батальёна. Пастраенне закончылася.

Вечарам дэсантнікі селі ў самалёт і пераляцелі на адзін з палявых аэрадромаў. Тут затрымаліся на два дні, атрымалі сухі паёк – сухары і кансервы, – а таксама запасныя камплекты цывільнай адзежы і нямецкага абмундзіравання. 9 верасня камандзіра групы і яго намесніка зноў выклікалі да палкоўніка. Ён паведаміў, што вылет групы прызначаны на вечар, удакладніў асаблівасці задання, спосабы сувязі і дакладна вызначыў на карце месца прызямлення. Ён, між іншым, пацікавіўся настроем членаў групы і запытаў:

– Магчыма, хтосьці з парашутыстаў жадае застацца ў батальёне?

– Што вы, таварыш палкоўнік! – здзівіўся Менткі. – Кожны салдат ірвецца як найлепш выканаць заданне і наракае толькі на тое, што так доўга даводзіцца чакаць адлёту.

На заканчэнне размовы палкоўнік уручыў камплект ваенных геаграфічных карт Польскага Памор'я, у тым ліку рэгіёна будучай дзейнасці разведчыкаў. Ён уключаў тэрыторыю ў граніцах Быдгашч – Інаўроцлаў – Торунь – Грудзёндз – Эль-

бланг–Гданьск–Пуцк–Слупск–Шчэцінак; карты паветаў Хойніце, Тухоля, Старогард, а таксама паўночнай часткі павета Свеце. Выдаў вялікую суму грошай у нямецкіх марках і пяцісотзлотавых банкнотах, якія хадзілі ў акупіраванай Польшчы. Менткі таксама атрымаў чыстыя бланкі розных дакументаў.

У 9 гадзін вечара група села ў аўтамабіль і адправілася на палявы аэрадром пад Бялай Падляскай, дзе цэлую гадзіну давялося чакаць адлёту. Настрой быў вясёлы, хлопцы расказвалі анекдоты, жартавалі і смяяліся. Неўзабаве з'явіўся экіпаж самалёта і пачаў рыхтаваць «Дуглас» да палёту. Запусцілі рухавікі, палкоўнік дастаў бутэльку гарэлкі, некалькі шклянак і наліў кожнаму парашутысту. На развітанне ён сардэчна паціснуў ім рукі, і ўсе занялі месцы ў самалёце.

Як толькі зачыніліся дзверы самалёта, не стала паручніка Менткага – з'явіўся «Вірскі», псеўданімы атрымалі і астатнія дэсантнікі: уступіла ў свае правы строгая канспірацыя. Узлёт. Запанавала агульная радасць, што ім давядзецца першымі сярод польскіх воінаў ступіць на родную зямлю Памор'я і змагацца за яе вызваленне. Траса палёту вяла над спавітай агнём і хмарамі дыму Варшавай і далей у кірунку Торунь – Грудзёдз – Тухоля.

– Наша «Волга», насуперак геаграфіі, плыве на захад, – пажартаваў лейтэнант «Віктар».

Ляцелі на вышыні каля 1000 метраў. Ноч выдалася бясхмарная, ясна свяціў месяц. Праз ілюмінатары былі відаць аўтамабілі, якія з прытушанымі фарамі рухаліся па шашы. Некалькі разоў самалёт абстралялі рознакаляровымі трасамі з кулямётаў.

У цэлым жа палёт праходзіў спакойна, толькі над Грудзёндзам трапілі ў святло пражэктараў, і фашысцкія зеніткі адкрылі агонь. Дэсантнікі падумалі, што прыйшоў канец палёту. Пачалі ліхаманкава прыкідваць план дзеянняў у выпадку вымушанага прызямлення. У гэты час з кабіны выйшаў адзін з членаў экіпажа, падскочыў да кабінкі стралка і выпусціў каляровую ракету. Зеніткі адразу ж замоўклі, пражэктары згаслі, апроч аднаго.

Самалёт у святле пражэктара пачаў зніжацца, нібы маючы намер ісці на пасадку. Пасажыры не разумелі, што гэта значыць, і пачалі хвалявацца, што ім здрадзілі, але праз імгненне рухавікі ўзраўлі, «Дуглас» зрабіў нейкі дзіўны хітры манеўр і вырваўся з промня пражэктара. Самалёт літаральна дрыжэў ад непамерна высокіх абаротаў рухавікоў. У адкрытых дзвярах кабіны стаяў, усміхаючыся, камандзір экіпажа. Ён паглядзеў на парашутыстаў і сказаў:

– Спакойна, хлопцы. Усё ў парадку. Не хвалюйцеся. Нервы трэба трымаць. Яны вам яшчэ спатрэбяцца...

Пасля ўжо іншым тонам дадаў:

– Камандзіра групы прашу ў пілоцкую кабіну.

Разгарнуўшы палётную карту, пілот паведаміў, што праз некалькі мінут – месца высадкі, сігналам да яе падрыхтоўкі будзе святло чырвонага ліхтара над пілоцкай кабінай, а пры зялёным сігнале трэба пакінуць самалёт. Падпаручнік перадаў гэты загад парашутыстам. І калі над кабінай запалілася чырвонае святло, дэсантнікі ўсталі і па чарзе пачалі, дапамагаючы адзін аднаму, прымацоўваць да спецыяльнага каната карабіны парашутаў, каб яны пасля скоку адкрыліся аўтаматычна. Пасталі

ў шарэнгу па росту ад невысокага Станіслава Мрочака даволі цесна адзін за адным: у гэтым выпадку можна было прызямліцца непадалёку адзін ад аднаго.

Заззяў зялёны ліхтар, члены экіпажа выпхнулі мяшок з амуніцыяй, і парашутысты пакінулі самалёт. Першым скокнуў снайпер Станіслаў Мрочак, за ім – Эдмунд Эрнст, дарэчы, гэта быў яго першы скачок, за ім астатнія. Прызямліліся, у прынцыпе, удала, калі не лічыць, што камандзір Ян Менткі завіс на сасне і не мог сам сцягнуць з дрэва парашут, а радыст Юрка зваліўся на страху недалёкага дома і таксама не даў рады парашуту, які сваім купалам поўнасцю накрыў чарапіцу і зачапіўся за комін. Не пашанцавала і Мрочаку, які трапіў у ваду возера каля самага берага. Астатнія скокнулі і прызямліліся без прыгод.

Камандзір падаў умоўны сігнал да збору, і дэсантнікі падбеглі да яго. Агульнымі намаганнямі сцягнулі з сасны парашут і адправіліся на голас Юркі, які моцна кляў няшчасную страху. Пачалі шукаць драбіну, каб зняць парашут, але ў двары яе не знайшлі. Давялося стукаць у дзверы і будзіць гаспадароў. Пачуўшы польскую мову, гаспадар адчыніў дзверы і, убачыўшы салдат у жаўнерскім абмундзіраванні, усклікнуў:

– O, Jezus!.. Polsko wojsko!

Прыйшлося яго расчараваць і паведаміць, што яны толькі разведчыкі, а армія прыйдзе пазней. «Вірскі» паведаміў гаспадару, што за перажытае ім хваляванне пакідаюць яму парашуты, з шаўковых купалоў якіх можна пашыць шмат моднага адзення для яго жанчын і дзяцей.

У ваколіцы не змаўкалі сірэны, і гэта непакоіла дэсантнікаў: фашысты пачалі пошук парашутыстаў.

Трэба было як найхутчэй аддаліцца ад месца прызямлення. А між іншым кудысьці знік мяшок з харчамі, боепрыпасамі, запаснымі батарэямі да рацыі. Доўга шукаць прапажу не маглі: чуўся рокат матораў аўтамашын, – і дэсантнікі паспешным маршам рушылі ў напрамку да мястэчка Шляхты. Ішлі кружным шляхам, заціраючы сляды і апрацоўваючы іх парашком супраць нюху сабак.

Напрамак выбралі з такім разлікам, каб адзін з парашутыстаў – Леон Песік – змог сустрэцца са сваёй раднёй у Шляхце і атрымаць звесткі пра варожыя гарнізоны. «Вірскі» таксама меў родных і знаёмых у вёсках каля Шляхты. Наперадзе крочыў Эдмунд Эрнст – вопытны беларускі партызан. Ён выдатна арыентаваўся ў цемры, яму дапамагаў Леон Песік, родам з тутэйшых мясцін. Ішлі фарсіраваным маршам.

На світанні група дайшла да краю лесу ў раёне безыменнага возера і аказалася на адлегласці 6 кіламетраў ад месца прызямлення. Крыху больш за паўкіламетра адсюль знаходзілася лесніčоўка Звярынец. Заляглі на ўскрайку лесу і пачалі праз біноклі аглядаць мясцовасць. На скрыжаванні дарог за азярцом заўважылі нейкія агеньчыкі. Уважліва прыгледзеўшыся (у лесе яшчэ панаваў паўзмрок), зразумелі, што там размяшчаецца кулямётнае гняздо, а паблізу лесніčоўкі стаяць патрулі. Было зразумела, што немцы перакрылі ўсе дарогі. Да таго ж, як высветлілася пазней, непадалёку ад месца часовага размяшчэння дэсантнікаў быў і варожы назіральны пункт.

Паволі ўставаў світанак, пелі птушкі, лёгкі ветрык ласкава прыгладжваў кусты і дрэвы; панавала насцярожаная цішыня. Нягледзячы на зморанасць

і дзве бяссоныя ночы, разведчыкі былі спакойныя і чакалі, якое рашэнне прыме камандзір.

«Вірскі» пачаў ліхаманкава шукаць выйсце з гэтай небяспечнай сітуацыі. Ён звярнуў увагу на малады, густы, у форме трохкутніка хвойнік, які прылягаў да лясной ускраіны. Шэптам камандзір аддаў загад залегчы ў хвойніку і затаіцца. Рашэнне было правільным, бо нікому нават не прыйшло б у галаву, што тут хтосьці хаваецца. Фашысты шукалі іх у вялікіх лясных масівах. Нягледзячы на моцную зморанасць, ніхто не змог заснуць. Уважліва па чарзе вялі назіранне за нямецкімі пастамі, пільна ўслухоўваліся. Але наўкола была спакойная цішыня.

Сонца падымалася ўсё вышэй і моцна прыгравала зямлю. Гэта яшчэ больш узмацняла смагу дэсантнікаў, хацелася піць. Метраў за дзвесце ззяла нябесна-серабрыстае люстэрка возера, але ісці туды было небяспечна, і смагу спрабавалі наталіць мокрым ад ранішняй расы мохам. Пасля палудня пачуліся каманды на нямецкай мове: фашысты здымалі свае пасты і сядалі на падводы. Але парашутысты праляжалі ў хвойніку да самага вечара. З надыходам ночы наважыліся перайсці каля лесніčоўкі праз дарогу, дзе нядаўна стаялі нямецкія патрулі. У ручайку, што ўпадаў у возера, наталілі смагу і рушылі. Ішлі асцярожна, зноў вызначылі дазорнымі Эдмунда Эрнста і Леона Песіка. Эдмунд нейкім шостым пачуццём выбіраў найбольш бяспечны шлях, а Леону ў гэтым дапамагала выдатнае веданне родных мясцін. Цэлую ноч правялі ў дарозе і выйшлі да шашы Чэрск – Слівіца, на ўсход ад мясцовасці Мосна. Спыніліся ў густым змешаным лесе і ўдакладнілі далейшы маршрут.

Адзін за адным пераскочылі шасэйную дарогу і накіраваліся да азёр Малое і Вялікае Лонтка, дзе наважыліся зрабіць працяглы прыпынак.

## НЕЧАКАНАЯ СУСТРЭЧА

Пасля дзвюх недаспаных начэй дэсантнікі былі змучаныя і сонныя. Выбралі месца прывалу, з задавальненнем залеглі ў густым бярозавым гаі, які прымыкаў да высокага лесу. Наступіў ясны сонечны дзень. Блізіўся час першай сувязі з цэнтрам. «Вірскі» загадаў радысту падрыхтаваць рацыю і паслаў Станіслава Мрочака расцягнуць антэну на адным з недалёкіх высокіх дрэў. Той накіраваўся ў лес і нечакана сярод кустоў заўважыў мужчын, што адпачывалі. Побач з імі ляжалі дубальтоўкі, у некаторых за паясамі былі пісталеты. Убачыўшы ўзброенага жаўнера, ускочылі на ногі.

– Вы хто? – запытаў Мрочак, накіраваўшы на іх аўтамат.

– А ты хто такі? – спыталі незнаёмцы.

Пачуўшы гэту размову, пабач з Мрочакам з'явіліся Песік, Варчак, Надольны і акружылі незнаёмых мужчын. У кароткай размове высветлілася, што гэта мясцовыя жыхары, якія ўцяклі ў лес перад прызывам на ваенную службу ў гітлераўскую армію. Доўга не хацелі верыць, што перад імі польскія жаўнеры, нягледзячы на польскае абмундзіраванне. Навісла трывожнае напружанне. Раптам адзін з партызан – Ян Шмаглінскі – выгукнуў:

– Леон! Гэта ты? У вёсцы ж гаварылі, што ты загінуў на фронце і твае родныя нават атрымалі пенсію за цябе. А ты жывы?

– Напэўна ж, не загінуў, раз знаходжуся тут, – з усмешкай адказаў Песік.

Ян Шмаглінскі перад вайной сябраваў з сястрой Песіка і таму пазнаў яго. Напружанне спала. Партызаны агледзелі самую сучасную зброю дэсантнікаў і пачалі прасіць, каб тыя прынялі іх да сябе. Падпаручнік перадаў у Цэнтр шыфроўку:

*"Волга" – Цэнтру: прызямліліся без прыгод. Знаходзімся ў абумоўленым месцы. Згубілі мяшок з прадуктамі і рэчамі. Сустрэў землякоў і мяркую прыняць іх у сваю групу. Высылайце пасылку з дадатковымі прадуктамі і рыштункам. Чакаю паведамлення пра дату візіту, месца сустрэчы будзе ўзгоднена дадаткова. Паведамляйце пра яго час і ўмовы. Вірскі».*

Між тым, пакуль радыст трымаў сувязь з Цэнтрам, партызаны распалілі агонь і пачалі гатаваць сняданак. Двое з іх па загадзе падпаручніка разам з адным парашутыстам адправіліся ў дазор, астатнія пачалі сілкавацца. Партызаны расказалі, што за 6–7 кіламетраў адгэтуль у іх абсталяваны бункер і камандуе імі нейкі «Ман», які з'явіцца пад вечар. Асабліва іх захапленне выклікала зброя дэсантнікаў – лёгкая, прыдатная, простая ў карыстанні.

Партызаны прапанавалі парашутыстам заняць іх бункер і выказалі поўную гатоўнасць выконваць усе загады камандзіра групы – іх вельмі ўразілі афіцэрскія мундзіры «Вірскага», яго намесніка «Віктара», а таксама радыста Юркі. «Вірскі» запытаў, да якой арганізацыі яны належаць, і, атрымаўшы адказ, што да Арміі Краёвай, задумаўся і прапанаваў канчаткова вырашыць пытанне пра аб'яднанне пасля размовы з іх камандзірам. Асцярожнасць

такая была не марнай: здаралася нямала выпадкаў, калі даходзіла да ўзброеных сутычак паміж прадстаўнікамі пралонданскай АК і Гвардыяй Людовай, якая прытрымлівалася левых поглядаў.

Ужо вечарам пасля працяглых размоў з партызанамі высветлілася, што на самай справе яны не падпарадкаваны ніякай ваеннай арганізацыі, а назвалі сваю прыналежнасць да АК проста так, бо лічылі ўсе ваенныя групы, якія змагаліся з фашыстамі ў Польшчы, падлеглымі Арміі Краёвай. Камандзір разведчыкаў параіўся са сваім намеснікам «Віктарам» і вырашыў прыняць прапанову партызан размясціцца ў іх бункеры. Да базы, якая ляжала каля 6 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Чэрска ў лесе над возерам Сляпым, рушылі позна ноччу пад камандаваннем «Віктара».

Сам камандзір разведчыкаў у суправаджэнні аднаго дэсантніка і аднаго партызана адправіўся ў недалёкую адсюль вёску Класкава, дзе жыла яго цётка Ганна, якая магла дапамагчы яму сустрэцца з бацькамі і наладзіць кантакты з будучымі інфарматарамі. Бацька «Вірскага» працаваў на чыгунцы і мог перадаваць разведчыкам многа каштоўнай інфармацыі.

З такой жа мэтай Леон Песік з адным партызанам пайшоў да сваіх родных у Шляхту. Каля поўначы ўсе вярнуліся на базу партызан. Тут і адбылася сустрэча з іх камандзірам Янам Мегерам («Манам»). Гэта аказаўся дужы лысы мужчына з энергічным выразам твару і хуткім поглядам. У нядаўнім паядынку з жандармам ён быў паранены ў руку. Стараўся быць гасцінным і многа расказваў пра сябе.



Падлетак Антон Гасціловіч



Генерал-палкоўнік, доктар ваенных навук, прафесар Акадэміі Генеральнага штаба А. І. Гасціловіч



Чайбалсан і А. І. Гасціловіч на сумесных вучэннях мангольскіх і савецкіх войск у Манголіі



Ваенны савет 18-й арміі. У цэнтры ля стала – камандарм А. І. Гасціловіч, злева – начальнік палітаддзела арміі генерал-маёр Л. І. Брэжнеў



Камандарм А. І. Гасціловіч з чэхаславацкімі афіцэрамі



Маці камісара М. А. Фёдарава



Ілля Мартынавіч Фёдараў
(пасляваенны здымак)



Марыя Міхайлаўна і Ілля Мартынавіч Фёдаравы



Начальнік разведкі брыгады «Штурмавая» А. М. Клюй



Камандзір роты падрыўнікоў П. В. Лісаў



Камандзір атрада брыгады «Штурмавая» І. І. Цімохін



Камісар аднаго з атрадаў брыгады «Штурмавая» А. В. Чарненка




Мемарыяльная дошка ў гонар выратавання дзяцей з Сёмкаўскага дзетдома



Камандзір разведвальнай групы ГРУ Генштаба Чырвонай Арміі Л. А. Барсукоўскі



Камандзір разведвальнай групы ГРУ Генштаба Чырвонай Арміі С. Вішнеўскі



Трое з неба: доктар Павел Сегал, лейтэнанты Чырвонай Арміі – радыст Юрка Уколаў і «Віктар», намеснік камандзіра групы «Волга»



Камандзір разведвальна-дыверсійнай групы
1-га Беларускага фронту паручнік адроджанага Войска Польскага
Ян Менткі



Памочнік камандзіра групы «Волга» польскі партызан
Ян Мегер («Ман»)



Партызан беларускай брыгады «Штурмавая», баец групы «Волга» Эдмунд Эрнст



Радыстка Юзэфа Катыньска («Зоя»)



Дырэктар 65-й мінскай школы (цяпер гімназія № 30) Р. Ц. Сівакоў



Мемарыял гераічным экіпажам авіятараў, якія загінулі ў небе Беларусі



МіГ-17, на якім лятаў выпускнік 65-й школы Дзмітрый Тэндзітнікаў (фрагмент мемарыяла)



**Герой Савецкага Саюза**
**Барыс Акрэсцін**



**Барыс Акрэсцін з баявымі сябрамі**



Барыс Акрэсцін падчас адпачынку са сваёй нявестай



Стралок-радыст экіпажа
Б. С. Акрэсціна В. Л. Саладухін



Паветраны стралок Ф. А. Сылка



Штурман старшы лейтэнант
І. П. Багатыроў



Камандзір авіяэскадрыллі
капітан М. М. Нікалаеў



Барэльеф Героя Савецкага Саюза Б. С. Акрэсціна (фрагмент мемарыяла)



Савет музея мінскай гімназіі № 30 імя Б. С. Акрэсціна на мітынгу.
Злева – кіраўнік музея настаўніца Т. Г. Лоскутава



У музеі мінскай гімназіі № 30: акцябронак ля бюста Героя Савецкага Саюза Б. С. Акрэсціна



Апошні шлях Героя Савецкага Саюза Б. С. Акрэсціна праз 66 гадоў пасля гібелі. Пахаванне яго астанкаў на Ваенных могілках у Мінску па вул. Казлова. На ўрачыстым мітынгу выступае ваенны камісар Савецкага раёна горада палкоўнік Алег Загорскі. 2010



Сустрэча пасля вайны: лётчыкі з пякельнага бамбардзіроўшчыка У. М. Сашыхін, Д. М. Янаў і камісар брыгады «Штурмавая» І. М. Фёдараў



Герой Савецкага Саюза Яўген Іванавіч Міркоўскі, куратар А. М. Бацяна




Савецкія танкі на вуліцах Прагі. 1968



Палкоўнік Аляксей Мікалаевіч Бацян



Юрый Іванавіч Драздоў, начальнік савецкай нелегальнай разведкі ў 1979–1991 гг.



Прэзідэнт Расіі У. У. Пуцін віншуе А. М. Бацяна з 90-годдзем і прысваеннем яму звання Героя Расіі. 2007



Герой Расіі разведчык А. М. Бацян і мастак А. М. Шылаў. 2011

Нарадзіўся ён у Чэрску. Бацькі ў пошуку работы эмігрыравалі ў Германію, у Берліне адкрылі свой рэстаран. У маі 1939 года Яна мабілізавалі ў нямецкую армію, але ён дэзерціраваў і збег у Польшчу. У верасні фашысты напалі на Польшчу, і за Янам пачалося паляванне. Уцёк у лес. Астатніх партызан, хто далучыўся да Мегера, таксама праследавалі фашысты за іх антыгітлераўскую дзейнасць, а некаторых – за дэзерцірства з вермахта.

Усе партызаны дасканала ведалі навакольную тэрыторыю і мясцовых людзей, усе лясныя сцежкі, мелі цесныя кантакты з блізкімі, сваякамі і знаёмымі і маглі аказаць неацэнную дапамогу разведчыкам у выкананні адказнага задання. «Вірскі» нарэшце згадзіўся прыняць іх у сваю групу і дамовіўся з Мегерам пра размеркаванне абавязкаў. Агульнае камандаванне ён пакінуў за сабой, а Мегер прызначаўся камендантам базы.

Так ужо на трэці дзень група павялічылася на восем чалавек, якія выдатна ведалі мясцовасць і тутэйшых людзей. Усе яны таксама насілі псеўданімы: Ян Мегер – «Ман», Леон Шмаглінскі – «Чорны», Вітольд Шмаглінскі – «Віт», Ян Глінецкі – «Ясь», Ян Асоўскі – «Штыфт», Ян Камінскі – «Стайн». «Мадзьярам» у партызанскіх радах быў савецкі афіцэр-танкіст, які ўцёк з лагера ваеннапалонных.

Наступнай раніцай «Вірскі» з «Віктарам» і Мегерам пачалі аглядаць тэрыторыю, што прымыкала да базы. Бункер размяшчаўся сярод маладога густога сасонніка на паўночным схіле пясчанага адкосу, які з трох бакоў – паўночнага, усходняга і паўднёва-ўсходняга – падковай акружала топкае балота. База знаходзілася на стыку трох паветаў (раёнаў): Старогардскага, Хойніцкага і Тухольскага. Ва ўсходнім кірунку метраў за 500 расцягнулася возера Сляпое, аддзеленае вузкай

паласой сушы на паўночным усходзе ад возера Доўгага. На поўнач ад бункера, адразу за балотам, на адлегласці метраў 700 за нешырокай паласой рэдкага сасонніку ўздоўж возера Астравітае раскінуліся абшары лясных масіваў.

На поўдзень ад базы беглі лясныя дарогі, ад якіх бункер аддзяляў невялікі густы лясок. Адразу ж за дарогай пачыналіся вялікія і шырокія тухольскія бары. Удалае размяшчэнне базы дазваляла незаўважанымі выйсці ўглыб лясных масіваў, а з другога боку, давала магчымасцьляснымі дарогамі дабрацца да важных камунікацыйных шляхоў – чыгункі і шасэйкі Берлін – Крулевец і Шлёнск – Гдыня. Уся гэта мясцовасць выклікала прафесійную цікавасць дэсантнікаў з пункту гледжання будучай іх разведвальнай дзейнасці.

– Наша база – надзвычай удалае і бяспечнае месца, – расказваў Ян Мегер. – Мясцовыя акупацыйныя ўлады трох паветаў ніколі не праводзяць сумесных карных экспедыцый. Яны дзейнічаюць па прынцыпу: «кожны – на сваёй тэрыторыі», – а мы маем магчымасць «гасцяваць» то на адной, то на другой.

## У ПОШУК НЯЛЁГКІ ВЫХОДЗІЦЬ РАЗВЕДКА...

«Вірскі» выклікаў Браніслава Варчака і Леона Шмаглінскага і загадаў рыхтавацца ў дарогу. Шлях ляжаў зноў у вёску Класкова, да роднай цёткі падпаручніка Ганны Кламан, дзе ён збіраўся сустрэцца з бацькамі. Хацелася пасля двух з палавінай гадоў расстання не толькі пабачыцца з роднымі, якія лічылі яго без вестак загінуўшым,

але і папрасіць у бацькі-чыгуначніка дапамогі ў здабычы неабходных разведданых. Бацька Міхал Менткі працаваў на чыгуначным вузле Касцяжына памочнікам машыніста, меў многа знаёмых чыгуначнікаў і мог здабаваць каштоўныя звесткі.

– А мой ты сынок! – усклікнула са слязамі на вачах маці, як толькі Ян Менткі пераступіў парог цётчынага дому. – Мы ўжо не спадзяваліся ўбачыць цябе, думалі, што загінуў ты на фронце!

Яна кінулася да сына і моцна абняла яго, у душы яшчэ не верачы, што гэты ладны прыгожы афіцэр – яе прапаўшы сын, па кім яна выплакала нямала начных слёз. Бацька таксама быў узрушаны сустрэчай і цішком выціраў слёзы. Пасля першых радасных воклічаў і прывітанняў пачалася размова.

– Пасля таго як ты згінуў недзе пад Ленінградам, да нас некалькі разоў прыходзілі гестапаўцы і ўсё патрабавалі выдаць твой адрас, – расказваў Міхал. – За намі і нашай сядзібай устанавілі назіранне, часта пад вокнамі нашы размовы праслухоўвалі. Нас абавязалі адзначацца ў мясцовым аддзяленні жандармерыі. Усю карэспандэнцыю праглядала цэнзура. Але з работы не звольнілі.

– Як бачыце, я жывы і здаровы, – зазначыў Ян. – І мундзір, які на мне, гаворыць, што маю воінскі абавязак: рабіць усё, каб хутчэй была вызвалена наша мілая Айчына. Дарэчы, татусь, раскажы, што вядома пра мясцовых партызан.

– Тут, на Паморʼі ёсць дзве падпольныя палітычна-ваенныя арганізацыі: Армія Краёва і тайная вайсковая арганізацыя «Грыф Паморскі». Абедзве арыентуюцца на лонданскі ўрад і не праводзяць

якіх-небудзь асабліва актыўных баявых дзеянняў. Ну а ты, сыне, якое маеш заданне? Не сакрэт?

– Ад цябе, татусь, сакрэтаў хаваць не буду, але і падрабязна пра сваю місію расказаць не магу. Скажу толькі, што і твая дапамога мне вельмі спатрэбіцца.

Далей аказалася, што маршруты цягніка, на якім працаваў бацька, праходзяць якраз па той мясцовасці, што ўяўляла цікавасць для разведчыка. Бацька згадзіўся збіраць і перадаваць патрэбныя звесткі. Так знайшлася дакладная і надзейная крыніца інфармацыі пра дыслакацыю нямецкіх вайсковых падраздзяленняў на тэрыторыі Хойніца–Касцяжына–Тчэў–Гданьск–Грудзёндз–Быдгашч–Картузы–Лембарк–Інаўроцлаў–Бутаў. Такі шырокі маштаб быў магчымы: бацька меў вельмі многа надзейных сяброў на кожным чыгуначным вузле, на кожнай станцыі і збіраўся падключыць іх да збору даных, у тым ліку і пра рух вайсковага транспарту. Дапамагчы ў справе павінна было і тое, што ён выдатна ведаў нямецкую мову.

– Трэба толькі быць асцярожным, – сказаў Ян. – Справа небяспечная, і я не магу рызыкаваць вашым здароўем і жыццём. Усе звесткі перадавайце сюды Гертрудзе Фірэк: яна чалавек надзейны.

На ролю сувязных прызначылі астатніх блізкіх родзічаў: маці, сястру Марыю Матушыньскую і брата Бенедыкта, – бо частыя паходы адной і той жа асобы ў адным кірунку, па адной дарозе маглі выклікаць падазрэнні. З гэтай жа прычыны ўстанавілі і розныя месцы сустрэчы з сувязнымі. Ян перадаў родным некалькі польскіх газет і два экземпляры ліпеньскага Маніфеста Польскага Камітэта Народнага Вызвалення. Развітаўшыся з родзічамі, ён пасля

поўначы разам з таварышамі, якія яго ахоўвалі, вярнуўся на базу. Тут было ўсё ў поўным парадку, пад камандаваннем «Віктара» і Мегера партызаны расчышчалі бункер, уладкоўваліся ў ім.

## РАЗВЕДДАНЫЯ – ШЫРОКІМ ПАТОКАМ

З гэтага дня прыступілі да разгортвання разведсеткі. Агентамі-інфарматарамі станавіліся родзічы партызан, свае добрыя знаёмыя і блізкія сябры, якія былі патрыётамі і ненавідзелі акупантаў. Крыніцай цікавых звестак былі таксама паведамленні сваякоў інфарматараў, вывезеных углыб Германіі на прымусовыя работы. Яны паведамлялі пра ваенныя аб'екты ворага, пра настрой нямецкага насельніцтва.

Адзін з мясцовых партызан паведаміў пра нямецкага афіцэра, які ў размовах з мясцовымі людзьмі абразліва адзываўся пра Гітлера і яго акружэнне. Афіцэр займаў высокае службовае становішча, аднак прадаў інфарматару пісталет з запасам патронаў. Ён набываў у Чэрску прадукты і высылаў сваім родным у Германію. Вырашылі выкарыстаць гэту акалічнасць і купляць у яго патрэбныя звесткі. Так разведчыкі атрымалі даныя пра паспешлівае ўмацаванне абарончых збудаванняў ворага ўздоўж Віслы восенню 1944 года.

Праз некалькі дзён «Вірскі» зноў сустрэўся з бацькам, які паведаміў пра рух ваеннага транспарту па чыгунцы і шасейных дарогах Хойніца – Тэзаў, Хойніца – Касцяжына, Гдыня – Гданьск. Ён расказаў, што ў лесе пад Вершхуцам і каля Лебы немцы абсталявалі палігон для запуску ракет «Фау-1».

– На супрацоўніцтва з намі згадзіўся наш сусед Антоні Шлесэр – паштовы служачы ў Касцяжыне, – паведаміў між іншым бацька, – а таксама чыгуначнікі на іншых чыгуначных вузлах.

Паштовы служачы аказаўся зручным інфарматарам: перахопленыя дэпешы і падслуханыя телефонныя размовы палітычных функцыянераў, прадстаўнікоў паліцэйскіх і адміністрацыйных улад дазвалялі разведчыкам ведаць пра ўсе падзеі ў той мясцовасці.

У гэты ж час Леон Песік наладжваў праз сваіх родных разведсетку ў Будгашчы, а Францішак Надольны – у Гдыні і Эльблэнгу. Такім чынам, «Вірскі» забяспечыў пастаянны паток інфармацыі з шырокай тэрыторыі. Прымяняліся і іншыя формы здабычы каштоўных даных. Адна з іх – паходы за «языком». Патруль з двух-трох парашутыстаў і мясцовых партызан рабіў засаду ў лесе пры даро гах, значна аддаленых ад базы. Часцей за ўсё здабычай станавіліся адзінокія вайскоўцы вермахта, якія былі на адпачынку пасля ранення ці праводзілі тут свой адпачынак.

Спалоханага і ўражанага «языка» адводзілі ў лес і распытвалі пра яго часць. Звычайна яны без асаблівага прымусу расказвалі ўсё ім вядомае і прасілі толькі аб адным – каб іх адпусцілі жывымі, і кляліся, што нікому не раскажуць пра такую сваю незвычайную прыгоду. Гэтаму можна было цалкам паверыць, бо служба бяспекі і жандармерыя строга карала такіх ваеннаслужачых. Разведчыкам таксама было выгадна не забіваць палонных, бо, знайшоўшы труп салдата, гестапа магло ўчыніць рэпрэсіі сярод мясцовага насельніцтва.

Вельмі важныя разведдныя здабыў у Гдыні Францішак Надольны. Перад вайной ён доўга жыў у гэтым партовым горадзе і меў тут многа знаёмых. Пры першым візіце ў Гдыню Надольны сустрэўся са сваім даўнім сябрам Эдвардам Міланоўскім, які згадзіўся супрацоўнічаць. Вельмі важныя звесткі даставіў разведчыку другі яго сябра – Уладыслаў Паўтарак.

Немцы паспешліва рыхтаваліся да абароны горада і адначасова арганізоўвалі сродкі эвакуацыі. У порце знаходзілася многа пасажырскіх караблёў, сярод іх – «Ганза» і «Штутгаф». Разведчыкі выявілі таксама базу ваенных караблёў і падводных лодак. Дыслакацыя вайсковых часцей, размяшчэнне сродкаў проціпаветранай абароны, радыёстанцый і апаратаў сачэння за самалётамі, артылерыі, танкаў, абарончых збудаванняў былі дакладна ўстаноўлены і перададзены на Вялікую зямлю.

## «ШЫШКІ» ВАЯВАЦЬ НЕ ЗБІРАЮЦЦА...

Падчас апошняй сустрэчы Міхал Менткі сказаў сыну, што з ім звязаліся партызаны з атрада «Шышкі» і папрасілі сустрэчы з «Вірскім». Яны размяшчаліся ў бункерах паблізу вялікага палігону СС, расцягнутага ў трохкутніку Ліпы – Брусы – Кутаў, што давала ім адносную бяспеку: ніхто нават не падумаў бы шукаць партызан пад носам у каманды эсэсаўцаў. Сярод партызан «Шышак» было многа людзей, добра знаёмых Вірскаму яшчэ з перадваенага часу. І Ян згадзіўся на сустрэчу. Вызначылі яе час і месца: на кантактным пункце ў Класкаве, у доме Ганны Кламан.

На спатканне з «Вірскім» з'явіліся два партызаны з «Шышак». Адзін з іх аказаўся добра знаёмы яму – Войцех Варсіньскі («Алень»). «Вірскі» з'явіўся ў доме цёткі ў суправаджэнні Эдмунда Эрнста, Бронека Варчака і Леона Шмаглінскага. Пасля прывітанняў прадстаўнікі «Шышак» расказалі пра небяспечны выпадак у дарозе. У Чэрску партызаны заўважылі жандармаў, якія стаялі пры выхадзе са станцыі. Сітуацыя была небяспечнай, бо Варсіньскага шукала служба бяспекі, і жандармы мелі яго фатаграфію. Іх выручыў бацька Менткага. Ён хутка замяніў марынарку Варсіньскага на адзенне чыгуначніка і на паравозе даставіў на месца сустрэчы.

Пачалася дзелавая размова. Аказалася, што атрад «Шышкі» спачатку належаў да тайнай вайсковай арганізацыі «Грыф Паморскі», а з кастрычніка камандзір атрада Ян Шалеўскі (псеўданім «Собаль») парваў з «Грыфам Паморскім» і падпарадкаваўся камандзіру акругі Арміі Краёвай. Пасланцы «Шышак» хацелі даведацца, кім сапраўды з'яўляецца група «Вірскага» і каму падпарадоўваецца. «Вірскі» расказаў ім пра стварэнне Польскіх Узброеных Сіл на тэрыторыі СССР. Коратка спыніўся на змесце ліпеньскага Маніфесту Польскага Камітэта Народнага Вызвалення і праблемах, звязаных з будучыняй Польшчы.

Прадстаўнікі «Шышак» карысталіся даволі слабымі і мала пераканаўчымі палітычнымі аргументамі, якія абапіраліся на перадачы лонданскага Бі-бі-сі. Размова міжволі ператварылася ў дыскусію, у ходзе якой прыпомнілі пра вывад арміі Андэрса з тэрыторыі Савецкага Саюза ў самы цяжкі для яго час, пра справу Катыні і прычыну затрымкі

Чырвонай Арміі пры Вісле падчас Варшаўскага паўстання.

Урэшце прадстаўнікі «Шышак» згадзіліся з вывадамі «Вірскага», бо іх аргументы не вытрымлівалі ніякай крытыкі. Яны паведамілі, што іх атрад дзейнічае самастойна, і дзейнасць гэта заключаецца толькі ў кантактах з блізкімі і роднымі, якія жывуць на тэрыторыі паветаў Хойніца, Касцяжына і Старогард. Іх сувязь з кіраўніцтвам Арміі Краёвай была на самай справе вельмі слабай. На пытанне, у чым заключаецца іх баявая дзейнасць, не здолелі даць пэўнага адказу.

«Вірскі» прапанаваў наладзіць баявое супрацоўніцтва з мэтай барацьбы з акупантамі і падпарадкаваць усе групы цэнтральнаму камандаванню, якое выконвае загады Штаба Польскіх Партызан. Калі яго прапановы будуць прыняты, ён адразу ж адправіць шыфроўку ў Цэнтр, і ім будуць высланы зброя, амуніцыя і абмундзіраванне, а таксама людзі, дасканала падрыхтаваныя для арганізацыі і каардынацыі дыверсій. «Вірскі» раскрыў перад «Аленем» магчымасці разгортвання такога партызанскага руху на тэрыторыі Паморʼя, каб фашысты адчулі, што зямля гарыць у іх пад нагамі.

«Алень» цалкам згадзіўся з аргументамі «Вірскага» і сказаў, што на такое рашэнне ён не мае паўнамоцтваў, і абяцаў пра ўсё далажыць свайму камандаванню. Партызаны звярнулі ўвагу на ўзбраенне, амуніцыю і абмундзіраванне дэсантнікаў. Асабліва іх уразілі новенькія зграбныя аўтаматы, гранаты Ф-1, дакладнасць і падрабязнасць ваенных карт.

– А ці маглі б вы адпусціць нам трохі такой зброі? – спытаў «Алень».

– Безумоўна, – адказаў яму «Вірскі», – але толькі ўтым выпадку, калі мае прапановы будуць прынятыя. У першую чаргу я павінен добра ўзброіць партызан, якія нядаўна ўвайшлі ў маю групу, бо трымаць іх у бяздзейнасці не буду. Цяпер жа я падарую табе дзве гранаты.

«Алень» узрадаваўся, бо быў ён узброены слаба: меў толькі пісталет з невялікім запасам патронаў. На гэтым і развіталіся. А праз некалькі дзён ад «Аленя» прыйшоў адказ, што яго камандаванне не прымае прапаноў «Вірскага», а «Аленю», тым не менш, дазволілі перадаваць разведчыкам патрэбную ім інфармацыю. Трэба прызнаць, што ў далейшым шэраг звестак, атрыманых ад «Шышак», былі каштоўнымі разведданымі. З-за адмоўнага адказу камандавання «Шышак» «Вірскі» прыняў меры бяспекі і забараніў байцам сваёй групы раскрываць знаходжанне базы...

## БУДАЎНІЦТВА – СПРАВА НЕБЯСПЕЧНАЯ

...На кароткай нарадзе вырашылі у ліку самых неадкладных спраў расшырыць бункер, бо для сямнаццаці чалавек ён быў цесным. Трэба было таксама паклапаціцца пра ўзбраенне партызан, якія далучыліся да разведчыкаў, і камандзір загадаў радысту ў час аднаго з сеансаў сувязі нагадаць яго просьбу аб высылцы зброі і боепрыпасаў. Вялікая зямля паведаміла, што просьба будзе задаволена, і прапанавала ўзгадніць месца і ўмоўныя сігналы, на якія на парашутах скінуць усё запатрабаванае.

Такое месца было вызначана на адлегласці 15 кіламетраў ад базы, на паляне сярод густога лесу ўдалечыні нават ад лясных дарог. Урэшце пасля гэтых радыёграм прыйшоў адказ:

*«Цэнтр – "Волзе": пасылкі будуць дастаўлены ва ўказанае месца ноччу 17 верасня. Сігналам да ўручэння пасылак павінна быць святло электрычных кішэнных ліхтарыкаў, якія ўтвараюць квадрат, а таксама полымя вогнішча ў цэнтры квадрата. Цэнтр».*

Да ўмоўнага дня ўсё трымалі ў строгім сакрэце. Перад гэтым нават не выходзілі на разведку, за прадуктамі, за «языкамі», толькі правяралі паштовыя скрынкі з прызначанай для іх карэспандэнцыяй. Нарэшце наступіў дзень прыёму грузу. І тут узнікла смешная неспадзяванка: ніхто не захацеў заставацца на базе, усе жадалі назіраць цікавае відовішча начнога выкіду на парашутах мяшкоў са зброяй. Давялося загадам вызначыць ахову бункера, у якім заставаўся радыст з рацыяй. З астатнімі вызначылі маршрут да месца прыёму грузу і калонай па адным рушылі.

Ноч выдалася бясхмарная і месячная. На цёмным шатры неба – міліярды зорак. Дарога да паляны аказалася лёгкай. На месца дабраліся без прыгод у вызначаны час. Да з'яўлення самалёта заставалася мінут 40. Гэты час выкарысталі для разведкі краю лесу, які акружаў прасторную паляну, нанасілі сухога галля і зламылі на месцы распальвання вогнішча ў якасці дадатковага сігналу для пілотаў. Асноўным жа сігналам павінна было стаць святло электрычных ліхтарыкаў, што трымалі дэсантнікі, стоячы ў вызначаных месцах.

Нарэшце пачуўся характэрны і знаёмы гук матораў самалёта. Ён набліжаўся. Па сігналу камандзіра запалілі кішэнныя ліхтарыкі, успыхнула полымя вогнішча. Самалёт зрабіў круг над палянай, і на зямлю сталі апускацца тры парашуты з мяшкамі. Лётчыкі заклалі яшчэ яшчэ адзін круг, міргнулі бартавымі агнямі, і самалёт паляцеў на паўночны ўсход. Мяшкі сабралі, згарнулі парашуты. Кожны з мяшкоў важыў 80–100 кілаграмаў, іх трэба было несці на плячах. Камандзір вызначыў парадак калоны, прызначыў 12 насільшчыкаў і двух дазорных з абодвух бакоў калоны.

Зваротны шлях аказаўся цяжкім. На кожным кіламетры рабілі кароткі адпачынак. Усе змарыліся, спацелі, але ніхто не наракаў. Нарэшце перад самым світаннем дабраліся да базы. Нягледзячы на зморанасць, спаць не хацелі: усе цікавіліся змесцівам мяшкоў. У адным з іх знайшлі картку з віншаваннямі ад экіпажа самалёта. У мяшках знаходзілася зброя, гранаты, патроны, прадукты харчавання, батарэі да рацыі, абмундзіраванне і іншае адзенне, некалькі бутэлек «Маскоўскай», а таксама многа літаратуры.

Сярод зброі было некалькі новенькіх аўтаматаў, якія камандзір урачыста ўручыў партызанам. Тут жа аказалася скрынка гранат Ф-1 і скрынка патронаў для аўтаматаў. Трэба было навучыць партызан карыстацца новай зброяй. Знаёмства з ёю прайшло хутка, бо ППШ-43 аказаліся простымі ў абслугоўванні. Практычную стральбу вырашылі з мэтай канспірацыі праводзіць пад зямлёй, для чаго трэба было неадкладна расшырыць бункер. Да гэтай справы прыступілі назаўтра.

Мегер атрымаў загад здабыць патрэбныя прылады. Пілы, сякеры і лапаты знайшліся

ў мясцовага насельніцтва, прычым іх тайна «пазычылі», без ведама гаспадароў, якія пачалі вінаваціць суседзяў у крадзяжах. Неабходны будаўнічы матэрыял ноччу, калі шумеў вялікі вецер, высякалі на значнай адлегласці ад базы, старанна маскіравалі пні мохам, знішчалі голле і насілі бярвенне на плячах.

Нарыхтавалі неабходны запас дрэва і прыступілі да будаўніцтва. Сцены і страху склалі з бярвенняў, не ачышчаных ад кары. Павялічаны бункер меў даўжыню 10 м, шырыню – каля трох, а вышыню столі – 2,2 м. У ім знаходзіліся тры аддзелы: агульны, пакой камандавання і радыста, кухня. Яны злучаліся агульным калідорам. У кожнае памяшканне вёў асобны ўваход, і калі лазы закрываліся, нават на блізкай адлегласці бункер заўважыць было нялёгка.

У памяшканні камандзіра знаходзіліся ложак і стол, на якім размяшчалася радыёстанцыя, у агульным – двухпавярховыя ложкі і паліцы для асабістых рэчаў разведчыкаў. На адной з паліц стаялі два лямпавыя радыёпрыёмнікі на батарэях. На кухні зрабілі паліцы для захоўвання прадуктаў і кухоннага інвентару, склалі печ, комін вывелі на страху і старанна замаскіравалі ядлоўцам. У кухні выкапалі студню. Вокнамі служылі лазы, а ноччу памяшканні асвятляліся карбідавымі лямпамі.

Базу на невялікай адлегласці ад бункера ахоўвалі тры вартавыя пасты, за зменай якіх сачыў дзяжурны. Ноччу выстаўлялі толькі адзін пост каля самага бункера, бо звычайна ніхто, і асабліва немцы, у гэты час носу ў лес не сунулі. Затое ноч была для насельнікаў лесу – партызан – самай актыўнай

парой. Разведчыкі выходзілі за інфармацыяй да скрынак, на сустрэчу з сувязнымі ці на іншыя заданні. Вярталіся звычайна пад раніцу або наступнай ноччу.

## ...І ПРЫГОЖАЯ ПАЛАВІНА ЧАЛАВЕЦТВА

На канцы верасня ў атрадзе з'явіўся былы ваеннапалонны Аляксей, які яшчэ раней уцёк з канцлагера і далучыўся да групы Мегера. Ён паведаміў камандзіру, што мае сувязь з савецкімі дзяўчатамі, якіх фашысты вывезлі з Украіны для будаўніцтва дарог і кансервацыі чыгуначных пуцей. Яны размяшчаліся ў лагеры каля вёскі Ліповай. Вырашылі звязацца з паланянкамі і праз іх атрымліваць звесткі пра рух вайсковага транспарту. Дзяўчаты ахвотна згадзіліся дапамагаць разведчыкам і забяспечвалі іх не толькі важнай інфармацыяй, але і камплектамі бялізны – прасцінамі і ручнікамі, што здабывалі ў лагеры. Сувязь з імі падтрымлівалі разведчык Станіслаў Мрочак і партызан «Мадзьяр» – савецкі афіцэр, якому таксама пашчасціла збегчы з лагера.

Падчас чарговага візіту да «мілых інфарматарак» у кастрычніку здарылася непрадбачанае: ахоўнік лагера – уласавец – прагульваўся па ўскрайку лесу з адной з лагерных нявольніц і заўважыў кантакт разведчыкаў з сувязнымі. Давялося адвесці ўласаўца ў лес, раззброіць і абшукаць. Забралі яго зброю, дакументы і загадалі ісці на базу. Дзяўчыну, што была з няўдалым кавалерам, адпусцілі, строга наказалі трымаць язык за зубамі. Уласавец лёг на зямлю і наадрэз адмовіўся ісці з разведчыкамі. У нейкі момант ён ускочыў на ногі і спрабаваў

збегчы. Раздаўся стрэл: Мрочак выпадкова націснуў курок рэвальвера, які трымаў каля віска палоннага. Той быў забіты. «Мадзьяр» пабег да дзяўчат, папрасіў у іх лапату, і труп закапалі тут жа ў лесе. Пра гэта непрыемнае здарэнне далажылі камандзіру. Сітуацыя аказалася няпростай, бо не было ўпэўненасці, што дзяўчына, якая шпацыравала з уласаўцам, не раскажа каму-небудзь пра сустрэчу з разведчыкамі і не выдасць сувязных. Падпаручнік загадаў Мрочаку і «Мадзьяру» вярнуцца да дзяўчат і, калі ім пагражае небяспека, забраць з іх згоды на базу. І раніцай у бункеры загучалі жаночыя галасы.

Здавалася, што сітуацыю ўдалося лёгка развязаць, але камандзір разумеў, што ўсё можа скласціся не так проста. З'яўленне ў атрадзе жанчын магло прывесці да розных клопатаў, звязаных з падтрыманнем дысцыпліны і маральнага стану. Давялося размаўляць на гэту тэму як з дзяўчатамі, так і з партызанамі. Як высветлілася пазней, дзяўчаты і хлопцы аказаліся на вышыні маралі і не дазволілі сабе нічога лёгкадумнага. Дзяўчаты – звалі іх Надзя, Шура, Клава і Вера – былі дысцыплінаваныя, высокамаральныя і дадалі ў жыццё разведчыкаў многа аптымізму. Надзя была настаўніцай, астатнія ніякай прафесійнай падрыхтоўкі не мелі. Яны старанна выконвалі свае абавязкі: гатавалі ежу, мылі бялізну, падтрымлівалі чысціню і парадак у бункеры, а ў вольны час ціха спявалі рускія і ўкраінскія песні. Як пазней успамінаў Эдмунд Эрнст, са з'яўленнем у бункеры «прыгожай палавіны чалавецтва» «наша "мужчынская гаспадарка" выразна змянілася да лепшага. З той пары мы харчаваліся рэгулярна, толькі гарачы абед елі раніцай, бо гарачыя стравы

гатавалі ноччу, а сняданак і вячэру, або, як гаварылі польскія разведчыкі, каляцыю, – днём і вечарам».

Дзяўчаты былі ў атрадзе да самага вызвалення тэрыторыі Памор'я, і перайшлі лінію фронта разам з разведчыкамі.

## БАРАЦЬБЫ РОЗНЫЯ ФОРМЫ

Тым часам колькасць інфарматараў і сувязных павялічвалася. Кожны з дэсантнікаў і партызан меў сваіх людзей, сваю сетку супрацоўнікаў. Радыст Юрка ўжо не спраўляўся з наплывам інфармацыі і з цяжкасцю перадаваў яе на Вялікую зямлю. Рацыя працавала кожныя суткі па некалькі гадзін, што было вельмі небяспечна: паблізу базы з'явіліся пеленгатарныя ўстаноўкі, і даводзілася выбіраць такі час сеансаў, каб фашысты не запеленгавалі рацыю. Давялося неяк нават на два дні перапыніць сеансы сувязі з Вялікай зямлёй. У канцы лістапада «Вірскі» папрасіў штаб прыслаць яшчэ аднаго радыста з рацыяй. Кіраўніцтва згадзілася разгледзець гэту просьбу і пазней паведаміць пра час і месца высадкі радыста.

З'явілася інфармацыя пра актывізацыю дзейнасці нямецкай службы бяспекі з мэтай устанавіць дыслакацыю групы «Вірскага». У той жа час немцы пачалі распускаць чуткі, што з групай пакончана, каб прымусіць палякаў не аказваць партызанам ніякай дапамогі. Камандзір дэсантнікаў вырашыў нанесці нечаканы ўдар па ворагу, каб паказаць сілу партызан і дэсантнікаў. Якраз у гэтыя дні польскае насельніцтва паскардзілася на забойцу цывільных людзей, жорсткага і ганарлівага

каменданта нямецкай жандармерыі ў Чэрску, нейкага Касанку.

Паводзіны гэтага крыважэрцы былі разведчыкам ужо добра вядомы. Звычайна ў адказ на акцыю мясцовых слаба ўзброеных партызан ён асабіста ўзначальваў карную экспедыцыю на месца іх нападу. Для ўдзелу ў аперацыі стварылі дзве групы. Адна пад камандаваннем Мегера («Мана») павінна была раніцай напасці на прадуктовы магазін у Гутоўцы, а другая ў той жа час – арганізаваць у зручным для дэсантнікаў месцы ў лесе паміж Гутоўцам і Чэрскам засаду на аўтастрадзе, якая вяла з Берліна да Крулеўца.

Група Мегера атрымала загад пры нападзе не карыстацца аўтаматычнай зброяй, каб зрабіць уражанне, што напад здзейсніў якісьці мясцовы слаба ўзброены атрад. Таму толькі партызаны, якія павінны былі ахоўваць групу Мегера ад любых нечаканасцей, мелі аўтаматы, а астатнія, хто павінен быў дзейнічаць у магазіне, узялі з сабой дубальтоўкі і штуцары. Група выканала заданне дакладна і хутка. Партызаны забралі цукар, шакалад, папяросы і касу, астатні тавар знішчылі. Работнікам магазіна строга наказалі не паведамляць да вечара мясцовым уладам пра напад.

Паблізу, кіламетры за два ад месца партызанскай акцыі, знаходзілася фашысцкая артылерыйская батарэя, якую ахоўвала падраздзяленне вермахта. Напад на магазін непадалёку ад батарэі, ды яшчэ сярод белага дня, павінен быў з пэўнасцю выклікаць неадкладную рэакцыю Касанкі. Партызаны з магазіна, заціраючы сляды, кружным шляхам вярнуліся на базу.

Праз нейкую гадзіну пасля аперацыі ў магазіне замаскіраваная ў лесе каля дарогі другая група заўважыла на аўтастрадзе атрад жандармерыі на веласіпедах. Афіцэр, што ўзначальваў калону, быў вельмі падобны на Касанку, хаця жандармы і з'явіліся не з боку Чэрска, як меркавалі разведчыкі, а з боку Хойніце. Камандзір засады падаў сігнал адкрыць агонь. Смяротныя чэргі з аўтаматаў па калоне палажылі яе на зямлю. У ход пайшлі гранаты. Было многа забітых і параненых, тым не менш уцалелыя фашысты прынялі бой. Храбра і ўмела дзейнічалі ўсе хлопцы, але асабліва праявіў сябе Эдмунд Эрнст – вопыт партызанскіх засад у Беларусі саслужыў тут яму добрую службу. Але цягнуўся бой мінут 10–15. Адстрэльваючыся, дэсантнікі адступілі, заціраючы за сабою сляды.

Задаволеныя сваёй перамогай, пасля шматгадзіннага маршу вярнуліся яны на базу. Доўгі бой партызаны весці не маглі, бо на аўтастрадзе звычайна быў інтэсіўны рух, і працяг бою з мэтай поўнага знішчэння жандармаў мог скончыцца трагічна: у любы момант да фашыстаў прыйшла б дапамога. Тым не менш баявая аперацыя ў белы дзень паблізу моцных нямецкіх гарнізонаў настрашыла акупантаў, а польскаму насельніцтву прыдала аптымізму і надзеі, што час вызвалення недалёка. На лясных дарогах з'явіліся паказальнікі з надпісамі: «Увага! Партызаны!»

Фашысты прымалі і іншыя захады ў сувязі з актыўнасцю групы «Вірскага». Яны ўзялі некалькі дзясяткаў заложнікаў – мужчын з мясцовага насельніцтва – і размясцілі пад вартай у закінутай цагельні ў Шляхце. Заложнікаў сабралі ў асноўным з Чэрска і навакольных вёсак, падазраючы, што мясцовыя людзі супрацоўнічаюць з партызанамі,

хаця доказаў гэтага не мелі. За дапамогай мясцовыя палякі праз сувязных звярнуліся да «Вірскага». Ён вырашыў «паразмаўляць» з камендантам гарнізона ў Шляхце – былым афіцэрам перадваеннага Войска Польскага – паручнікам Бразоўскім. Яшчэ перад вайной Бразоўскі быў завербаваны фашысцкай разведкай і пасля акупацыі Польшчы, прыняўшы нямецкае грамадзянства, стаў Бюркнерам, ажаніўся з немкай з Гданьска і атрымаў чын оберлейтэнанта вермахта. Пастаянна жыў ён у Шляхце.

Спецыяльная група партызан і дэсантнікаў на чале з Францішкам Надольным ноччу падышла да добра асветленай вілы каменданта, размешчанай у некалькіх дзясятках метраў ад уваходу ў казармы ягдкаманды, дзе заўсёды знаходзіўся вартавы. Тым не менш, удалося незаўважанымі ўвайсці ў дом Бюркнера і нейтралізаваць яго дамачадцаў. Камендант быў настолькі ўражаны дзёрзкасцю дэсантнікаў, што не змог нават вымавіць ніводнага слова. Хлопцы прыступілі да «выхавання» рэнегата. Некалькі ўдараў дубінкай зрабілі яго вельмі памяркоўным.

– Ты чалавек надзвычай уплывовы ў Шляхце, – сказаў камандзір групы дэсантнікаў. – Дык вось, ты павінен ужыць увесь свой уплыў і вызваліць нявінных заложнікаў-палякаў, інакш мы зноў сустрэнемся з табой і нават наведаем некаторых тваіх родзічаў, адрасы якіх не толькі ў Гданьску, але і ў Рэйху нам добра вядомы. Толькі наша наступная сустрэча не будзе такой бяскроўнай. І павер, што няма такога месца на зямлі, дзе мы цябе не адшукалі б.

– Усё зраблю, што належыць, – заікаючыся, прамовіў Бюркнер. – Толькі пакіньце ў спакоі маю сям'ю і родзічаў!

– Не раім таксама паведамляць немцам пра нашу прысутнасць, калі мы выйдзем з памяшкання, – заўважыў Надольны, – гарнізон акружаны моцнымі сіламі партызан.

Перад гэтай аперацыяй разведчыкі папрасілі сваіх мясцовых інфарматараў, каб яны распусцілі чуткі, што бачылі дзве вялікія групы партызан, узброеных аўтаматамі. Бюркнер быў настолькі напалоханы, што наступным днём прыклаў усе намаганні і ўвесь свой немалы ўплыў, каб вызваліць усіх заложнікаў. Аўтарытэт партызан у вачах мясцовых людзей вырас нязмерна, і колькасць інфарматараў зноў павялічылася: радыст паранейшаму не спраўляўся. Давялося зноў адправіць на Вялікую зямлю просьбу аб дэсантаванні яшчэ аднаго радыста. А весткі ад групы «Вірскага» былі вельмі патрэбныя, і па іх Цэнтр адразу ж прымаў належныя захады.

*«“Волга” – Цэнтру: у порт Гдыня прыбыў адзін з самых буйных ваенных караблёў фашысцкага флоту – крэйсер “Шанхорст”. Паспешліва загружаецца прадуктамі, палівам і амуніцыяй. Прысылайце “піяніста”. Вірскі».*

На Гдыню наляцелі савецкія бамбардзіроўшчыкі і разбамбілі порт. Нямецкі карабель, на загрузіўшыся, быў вымушаны выйсці ў адкрытае мора.

У лістападзе са штаба прыйшла тэрміновая тэлеграма з загадам удакладніць раней атрыманыя звесткі пра рух ваенных цягнікоў на станцыі Быдгашч. Тут працавала група інфарматараў Леона Песіка. Адзін з іх, Максіміліян Плішка, чыгуначнік, мабілізаваў для збору звестак многіх сваіх знаёмых. Сталі паступаць паведамленні пра дыслакацыю вайсковых часцей, абарончых збудаванняў, пра

ваенныя заводы і іх прадукцыю, пра інтэнсіўны рух ваенных эшалонаў. Менавіта іх расклад камандаванне і загадала ўдакладніць. На гэта надзвычай важнае заданне трэба было паслаць кагосьці проста ў Быдгашч. Дарога была нялёгкай: 100 кіламетраў па занятай ворагам тэрыторыі. Прааналізаваўшы ўсе магчымасці, вырашылі паслаць Леона Песіка і Вітольда Шмаглінскага. Ехаць яны павінны былі на таварняку па чыгунцы. Апранулі іх у такое адзенне, каб на першы погляд яны здаваліся людзьмі, якія едуць на работу. Тым не менш, яны былі ўзброены пісталетамі і фінскімі нажамі.

Прыехаўшы ў Быдгашч, Леон праз сувязнога звярнуўся да Максіміліяна з просьбай пісьмова пацвердзіць звесткі, якія запатрабаваў штаб. Але інфарматар чамусьці перастаў давяраць разведчыку і адным вечарам з'явіўся да яго бацькоў у Шляхце, не ведаючы, што Леон знаходзіцца дома. А якраз у гэты момант Леон Песік з Вітольдам Шмаглінскім, апранутыя ў вайсковыя мундзіры і ўзброеныя пісталетамі, сядзелі за сталом. Убачыўшы бравых салдат Войска Польскага ў поўным узбраенні, Плішка быў уражаны і перастаў сумнявацца. Ён пацвердзіў патрэбныя звесткі і працаваў далей бездакорна. Чарговае заданне Вялікай зямлі было выканана.

Вярнуўшыся з Быдгашча, Леон Песік пры дакладзе камандзіру групы пра выкананне разведзадання паведаміў таксама, што фашысты часта праводзяць у горадзе нечаканыя праверкі дакументаў. Прычынай такой пільнасці сталі незвычайныя паводзіны аднаго нямецкага афіцэра, які на гарадскіх вуліцах спыняў салдат вермахта,

ушчуваў і бэсціў іх, прымушаў паўторна вітаць яго. Гісторыя гэта ўсім здавалася сенсацыйнай, бо пруская ваеншчына ніколі не дапускала падобных паводзін афіцэраў у адносінах да салдат. На афіцэра звярнула ўвагу служба бяспекі і арыштавала яго. Як аказалася, у афіцэрскім мундзіры дзейнічаў савецкі разведчык. Здавалася б, нават такая дробязь прывяла да правалу чалавека, якога доўга рыхтавалі ў разведшколе. Гэты факт прымусіў камандзіра дэсантнікаў і яго намесніка «Віктара» яшчэ раз задумацца пра канспірацыю і абмеркаваць усе падрабязнасці ў гэтай важнай справе.

Набліжалася зіма – не вельмі спрыяльны час для паходаў за правіянтам, на дыверсіі, за разведданымі: сляды не снезе маглі дэмаскіраваць дыслакацыю групы. «Вірскі» з «Віктарам» пачалі думаць, як выйсці з гэтага становішча. Амаль тры месяцы дзякуючы строгай асцярожнасці разведчыкам удалося добра канспіраваць сваю базу і сваю дзейнасць. Стараліся дзейнічаць у розных паветах і ніколі не праводзілі акцый паблізу. Метады прымяняліся розныя, пачынаючы ад дэзінфармацыі да спецыяльных прыёмаў. Так, пры нападзе на магазіны і прадуктовыя склады разведчыкі і партызаны апраналі нямецкую форму і размаўлялі толькі па-нямецку. Мовай яны валодалі дасканала, бо многія служылі ў радах вермахта, а, напрыклад, Мегер доўга жыў у Берліне. Гэта прыносіла нечаканыя вынікі: мясцовыя акупацыйныя ўлады пачалі падазраваць у марадзёрстве сваіх салдат і афіцэраў, якія знаходзіліся тут на адпачанку пасля лячэння ў шпіталях. Інфарматары паведамлялі разведчыкам, што пасля чарговай іх «прадук-

товай» акцыі органы бяспекі строга правяралі не толькі дакументы адпускнікоў, але і іх чамаданы.

І вось набліжалася пара, якая магла звесці ў пусты канец усю канспірацыю разведчыкаў. «Вірскі» сабраў сваіх паплечнікаў і пацікавіўся, што яны мяркуюць рабіць, каб і далей заставацца «невідзімкамі».

– Добра было б замяніць свае ногі на капыты аленяў ці кабаноў, – жартам заўважыў хтосьці з прысутных.

– А думка выдатная! – усклікнуў лейтэнант «Віктар». – У дзяцінстве мы хадзілі на хадулях, і калі зрабіць іх невысокімі, прымацаваць падэшвы з выявай звярыных капытоў, ніхто і не адрозніць сляды ад сапраўдных.

Прапанову прынялі на «ўра» і заселі за выраб хадуль, пачалі са смехам і жартамі трэніравацца ў хадзьбе. Паступова ўсе налаўчыліся карыстацца новымі прыладамі, і пытанне канспірацыі на зімовы час было паспяхова вырашана. А пакуль жыхары бункера папаўнялі прадуктовыя запасы і выконвалі заданні Цэнтра па разведцы...

*«..."Цэнтр" – "Волзе": радыстка і доктар будуць высаджаны ў 24 гадзіны 22 снежня ў квадраце 27. Забяспечце ахову і суправаджэнне. Высылаем з імі "гасцінцы"...»*

## НЯЎДАЛАЕ ПРЫЗЯМЛЕННЕ

...Над лініяй фронту самалёт, у якім знаходзіліся радыстка і доктар, абстралялі зеніткі. Лётчыкі набралі вышыню і крыху змянілі курс. Гэта аказалася фатальным для парашутыстаў: яны пакінулі

самалёт зусім у іншым квадраце, за многа кіламетраў ад вызначанага. Тым больш што ўмоўных сігналаў не было. Першай скокнула радыстка Юзэфа Катыньская («Зоя»), за ёй – Павел Сегал – «доктар Сускі». Перад гэтым лётчыкі выкінулі тры мяшкі, у якіх знаходзілася зброя і боепрыпасы, прадукты харчавання і медыкаменты.

Па легендзе «доктар Сускі» і яго асістэнтка медсястра Яніна Чарноцкая ўцяклі ад паўстанцаў з Варшавы і цяпер шукалі месца жыхарства і работу. Дакументы на гэты конт былі ў поўным парадку. «Зоя» прызямлілася не вельмі ўдала: парашут завіс на дрэве, і дзяўчына паранілася аб востры сук. Але яна хуценька сцягнула парашут і схавала яго ў густых кустах, пасля пачала падаваць умоўныя сігналы доктару, але сігналаў у адказ не было. Пачула раптам, што хтосьці бяжыць напралом праз хмызняк. Не было ўпэўненасці, што гэта – Павел, таму яна перастала стукаць па дрэве, хуценька залезла наверх і ўважліва агледзелася.

Ноч была светлая, вакол ляжаў снег, і кожны прадмет можна было дакладна разгледзець. Непадалёку на паляне стаяў Сегал і ўважліва аглядаў наваколле. «Зоя» злезла з дрэва і зноў падала ўмоўны сігнал. Пасля сустрэчы пачалі шукаць мяшкі, але знайшлі толькі адзін – з медыкаментамі і прадуктамі. Два іншыя, са зброяй, прапалі, і адшукаць іх не ўдалося, хаця рабілі гэта да самай раніцы. Трэба было падумаць над сітуацыяй, вызначыць месца, дзе яны знаходзіліся, і ісці на спатканне з групай «Волга».

Але ўсё аказалася не так проста. Вызначыць месца знаходжання па карце не ўдалося, бо прызямліліся яны зусім не ў тым раёне, і на іх карце

ён ужо не значыўся. Вырашылі дайсці да якога-небудзь населенага пункта ці хутара і распытаць пра мясцовасць у людзей. Зайшлі у бедную хаціну, якая стаяла на ўскраіне вёскі, на водшыбе, лічачы, што ў ёй жывуць палякі. Але гэтыя эканамічныя разлікі моцна іх падвялі. На сцяне халупы вісеў партрэт фюрэра, а на століку пад ім ляжала кніга "Майн камф": жылі тут гітлераўцы. «Зоя» папрасіла ў гаспадыні малака, але тая жорстка адмовіла. Трэба было хутчэй выходзіць са змяінага гнязда.

Зноў вярнуліся ў лес і вырашылі зайсці з другога канца вёскі. Тут пашанцавала – трапілі да палякаў. На просьбу дапамагчы тыя сказалі, што нічога самі не дадуць, але калі ім вельмі патрэбна, то можна ўзяць усё. Такія дзіўныя паводзіны гаспадароў былі абумоўлены тым, што акупацыйныя ўлады часта высылалі спецыяльных агентаў, якія пад выглядам партызан прасілі дапамогі, каб праверыць, як насельніцтва выконвае строгі загад не аказваць ніякай падтрымкі незнаёмым. Каб супакоіць гаспадароў, паведамілі ім, што ідуць на вяселле да сваякоў, але заблудзіліся. Запыталі дарогу да возера Белага, дзе і была абумоўлена сустрэча з прадстаўнікамі групы «Волга». Аказалася, што да возера даволі далёка – кіламетраў 30. І ўсё ж «Зоя» і Павел дайшлі да возера і пачалі падаваць умоўныя сігналы. Ніхто не адказваў.

Трэба было вяртацца да месца прызямлення. Тут вельмі спатрэбіліся парашуты: з іх зрабілі сабе «домік». У невялікай лажбінцы насцялілі лапніку, накрылі адным парашутам, палажылі на яго палатку. Другім парашутам прыкрываліся. Пры сабе трымалі напагатове рацыю. Неаднаразова ў наступныя дні наведваліся да возера Белага, але ніхто іх там не

сустракаў. А дарога ж была няблізкай: у адзін бок – каля 30 кіламетраў.

Ішлі дні за днямі, прадукты харчавання змяншаліся – яны былі разлічаны на кароткі тэрмін. Засталося па банцы мясных і рыбных кансерваў і буханка хлеба, сухары. У мяшку з медыкаментамі знайшлося крыху цукру і некалькі пачкаў кашы. Трэба было гэтым запасам распараджацца вельмі ашчадна. Паволі наплываў адчай. Агонь разводзіць не асмельваліся. «Зоя» прымарозіла ногі і вельмі пакутавала і ад незагойнай раны і ад марозу...

## СХВАТКА НАД ВОЗЕРАМ

...Каля 5-й гадзіны раніцай 22 снежня дазорны Ян Глінецкі ўляцеў у бункер і далажыў камандзіру, што чуваць гул аўтамабільных матораў, якія набліжаецца да базы па дарозе з Курча да Любацені. Падпаручнік выйшаў наверх і таксама пачуў гул аўтамабіляў і, хаця было яшчэ цёмна, прыкмеціў нязвыклы рух на дарозе, што вяла з вёскі Астравітай да вёскі Краг. Ветру не было, мароз трашчаў: наступаў каляднік. Неба іскрылася міліярдамі зорак. Камандзір пераканаўся, што па дарогах рухаюцца дзве калоны аўтамашын і акружаюць базу. Такім чынам, усе шляхі адступлення аказаліся адрэзанымі. Сумненняў не засталося: мэтай фашысцкай карнай экпедыцыі была ліквідацыя базы разведчыкаў і партызан.

Камандзір абвявіў баявую трывогу, загадаў выставіць наперад узмоцненыя дазоры, аднак забараніў адкрываць агонь без яго каманды. Дазорныя павінны былі толькі назіраць за рухам і дзеяннямі ворага, а калі пераканаюцца, што

немцы наступаюць на базу, адразу ж ціха адысці ў бункер, не выдаючы сваёй прысутнасці. Астатнія атрымалі загад скласці мяшкі і рукзакі, праверыць зброю і быць гатовымі па камандзе заняць баявыя пазіцыі. Дзяўчатам паступіла заданне скласці ў мяшкі запас прадуктаў.

– Таварыш лейтэнант, – звярнуўся падпаручнік да радыста, – запакуйце рацыю, батарэі і трымайце яе ў поўнай гатоўнасці, але пакуль не ўключайце: магчыма, нас слухаюць і пеленгуюць.

Камандзір усё яшчэ спадзяваўся, што найгоршае абыдзе бокам, як не раз гэта было раней. Затым ён запрасіў да сябе «Віктара», і яны разам з радыстам пачалі ацэньваць сітуацыю. Абодва афіцэры ўхвалілі даручэнні камандзіра і яго загады. «Вірскі» сказаў пра свае планы ў выпадку, калі прыйдзецца прыняць бой: падпусціць ворага як мага бліжэй да агнявых кропак, адкрыць агонь з аўтаматаў, а пасля закідаць атакуючых гранатамі. Нечаканы агонь з блізкай дыстанцыі мог павялічыць страты ворага і выклікаць паніку ў яго радах. Меркавалася пасля ашаламляльнага адпору вызначыць найбольш зручны напрамак, разарваць варожае кальцо і вырвацца з акружэння.

– Давайце цяпер вызначым парадак і шляхі адыходу, – прапанаваў Віктар. – Трэба таксама ўдакладніць месца будучага збору і новай базы.

– Калі ўсё будзе па плану, то пасля прарыву для падману фашыстаў спачатку пойдзем углыб Тухольскіх лясоў, – сказаў падпаручнік, – а пасля акружной дарогай будзем ісці фарсіраваным маршам на наш пункт у Смольніку ў Старогардскім павеце пад Чорнай Вадой. Там і вырашым, дзе абсталюем новую базу. Прарывацца будзем

асобнымі групамі. Падраздзяленне Надольнага спачатку пойдзе лесам у напрамку вёскі Белае, пасля паверне направа ў Тухольскія лясы, каб завесці фашыстаў у зман і заблытаць сляды. Няхай думаюць, што мы падаліся лясамі.

Вызначылі таксама маршруты і для астатніх груп. Першым месцам збору выбралі дом Яжджэўскіх, другім, калі не ўдасца трапіць на першы пункт, – лясны масіў каля возера Малая Лонтка на тэрыторыі лясніцтва Ліпова.

Абмеркавалі і іншую праблему, якая выклікала нямала занепакоенасці і трывогі. Справа была звязана з радыёграмай з Вялікай зямлі, у якой паведамлялася пра дэсантаванне доктара і радысткі. Іх павінны былі выкінуць сёння ноччу, 22 снежня роўна ў поўнач на ўмоўныя сігналы электрычных ліхтарыкаў сярод ляснога масіву ў 7 кіламетрах на ўсход ад возера Белага. Змест гэтай шыфроўкі быў вядомы толькі траім, хто так зацікаўлена абмяркоўваў цяпер складаную сітуацыю. Вырашылі падрыхтаваць і перадаць у Цэнтр шыфроўку з паведамленнем, што трапілі ў акружэнне, вядуць няроўны бой і прыняць дэсантнікаў не могуць. Прасілі адтэрмінаваць вылет доктара і радысткі. Гэту шыфроўку радыст павінен быў перадаць падчас бою.

Радыст прыступіў да падрыхтоўкі шыфроўкі, а Менткі і Віктар выйшлі на разведку. Пераваліла ўжо на 7-ю гадзіну. Дазорныя шэптам далажылі, што як з боку Астравітай, так і з боку вёскі Краг гул матораў заціх, адтуль даносіліся толькі каманды на нямецкай мове, а пасля і гэта сціхла. Чуліся толькі адзінкавыя запускі рухавікоў і ашалелы брэх сабак у вёсках. Было зразумела, што калоны далей не

паехалі, а спыніліся паблізу бункера. Надзея на лёгкі зыход знікла. Значыць, аблава мела на мэце ліквідацыю групы «Вірскага», і месца яе базы немцам было ўжо добра вядома.

Вярнуліся ў бункер, пачалі падрыхтоўку да бою і між іншым сталі аналізаваць прычыну выкрыцця базы. Прыпомнілі, што на мінулым тыдні, 18 снежня, перад абедам прыбег адзін з аддаленых дазорных і паведаміў, што ў хвойнік увайшла група дзяцей і накіроўваецца проста да бункера. Дзеці ішлі, напэўна, за ялінкай: набліжаліся Каляды. Сярод іх паставы пазнаў сына нямецкага жандарма, які ваяваў супраць югаслаўскіх партызан і цяпер знаходзіўся на адпачынку. Дом яго стаяў непадалёку ад базы разведчыкаў, але гэта сям'я нават і не падазравала пра яе існаванне. І вось цяпер дзеці маглі наткнуцца на бункер і штосьці заўважыць. Трэба было хутка прымаць нейкае рашэнне.

Камандзір не змог тады аддаць загад знішчыць дзяцей. Таму ён выслаў насустрач ім Мегера, апранутага ў форму лесніка, каб той спыніў іх і завярнуў да дому. Мегер перапыніў няпрошаных гасцей метраў за 50 ад базы. Наўрад ці яны змаглі што-небудзь заўважыць падазронае, і таму ў той дзень партызаны не пакінулі бункер, бо, па-першае, свежы снег, які толькі што перад гэтым выпаў, дэмаскіраваў бы сляды вялікай групы людзей, а па-другое, у бункеры знаходзіліся прадуктовыя запасы на ўсю зіму.

Як паказаў час, гэта было фатальнай памылкай. Пазней высветлілася, што сын жандарма ўсё-такі заўважыў расцягнутую над бункерам антэну і паведаміў пра гэта бацьку, а той далажыў мясцовай службе бяспекі. Праз некалькі дзён пасля дзіцячай

экскурсіі ў ваколіцы паміж вёскамі Астравіта і Краг паляўнічыя арганізавалі аблаву на зайцоў. Некалькі чалавек прайшлі праз густы хвойнік непадалёку ад бункера. Складалася ўражанне, што яны нічога не ведаюць аб прысутнасці базы. Гэта ўпэўніла партызан, што дзеці нічога не паспелі заўважыць. А паляванне на зайца было толькі на руку разведчыкам: да новага снегу яны маглі бесперашкодна выходзіць на заданні.

Цяпер жа прыйшлі да высновы, што пад выглядам палявання фашысты правялі разведку. Але было ўжо позна пакідаць бункер, і падрыхтоўка да агнявога адпору, да бою ішла хуткімі тэмпамі. У агульным памяшканні сабраўся ўвесь асабовы састаў партызан і дэсантнікаў, запрасілі сюды і дзяўчат. Менткі кожнаму вызначыў яго агнявую пазіцыю, дзяўчатам загадаў ладкаваць магазіны аўтаматаў і падаваць іх байцам, а таксама падрыхтаваць медыцынскія сродкі. Прынеслі скрынкі з патронамі і гранатамі, паставілі іх у адным месцы. Падлічылі свае баявыя прыпасы і сілы.

У 22 парашутыстаў і партызан было 18 аўтаматаў, 20 пісталетаў, 10 адзінак іншай зброі, у тым ліку карабіны з аптычнымі прыцэламі, 150 гранат, кожны меў ад 140 да 180 аўтаматных патронаў у магазінах. Колькасна атрад быў невялікім, але складаўся з вопытных, загартаваных байцоў і валодаў вялікай агнявой сілай. Людзі трымаліся спакойна. Падпаручнік распарадзіўся заняць баявыя месцы толькі з моманту, калі фашысты выявяць іх дыслакацыю. Ён хацеў як надалей не адкрываць агнявых пазіцый, падпусціць ворага вельмі блізка і знянацку пачаць агонь, закідаць варожы ланцуг гранатамі. Сігнал да агню павінен быў даць сам

камандзір аўтаматнай чаргой. Ён яшчэ раз звярнуў увагу на захаванне безумоўнай дысцыпліны і дакладнае выкананне загадаў падчас бою. Глядзеў на крыху пабялелыя твары сваіх хлопцаў, заўважыў, як напружана сочаць за яго паводзінамі, і таму быў спакойны аж да фізічнага болю. Час ішоў марудна, пакуль нічога не адбывалася. Нервы былі напружаны да апошняга, але ўсе вытрымлівалі.

Пасля 8-й гадзіны ў бункер вярнуліся паставыя аддаленых сакрэтаў і далажылі, што на дарозе паміж вёскамі немцы ўстанавілі заслоны. Такія ж заслоны былі таксама на лініі дарог, якія вялі з сядзібы Конаўка да лясніцтва Звяжынец і з вёскі Жэпічнай да скрыжавання з дарогай на вёску Астравіта. На падставе пачутых урыўкаў нямецкіх каманд стала зразумела, што аблава неўзабаве рушыць у кірунку базы ад сядзібы Конаўка і вёскі Жэпічнай аж да возера Сляпога. Камандзір даў загад заняць агнявыя пазіцыі каля бункера ў густым маладым хвойніку. Сам ён стаў каля аднаго з уваходаў у бункер.

Нарэшце аблава рушыла. Фашысты ішлі павольна расцягнутай лініяй, страляючы кароткімі чэргамі і адзіночнымі стрэламі, стараючыся вытрымліваць дыстанцыю і не парушаць лінію атакі. Партызаны маўчалі. Як толькі лінія атакі наблізілася метраў на 30 – 40, пачуліся воклічы: «Halt! Achtung! Sie sind hier! Vorsichtig sein! Gut aufpassen!» *(«Стой! Увага! Яны тут! Будзьце асцярожныя! Беражы сябе!»)* Лінія салдат на кароткі момант спынілася, былі выразна чуваць ажыўленыя галасы. Нарэшце раздалася новая каманда: «Achtung! Vorsichtig und langsam vor, marsch!» *(«Увага! Асцярожна і павольна наперад, марш!»)*

Лінія наступаючых з вялікай асцярожнасцю пасунулася наперад. У густым хвойніку парашутыстаў яны яшчэ не бачылі, тыя іх – таксама. Праз некалькі хвілін паміж пнямі і маладымі густымі сасонкамі Менткі на адлегласці 15–20 крокаў ад бункера заўважыў лінію ног нямецкіх салдат і адкрыў агонь са свайго аўтамата. Доўгай рассеянай чаргой ён ударыў па лініі аблавы і кінуў у яе дзве гранаты. Пачаўся бой. Дэсантнікі і партызаны стралялі з аўтаматаў і кідалі гранаты. Наступаючая лінія зламалася, парадак у ёй парушыўся, пачуліся крыкі раненых. Фашысты адступілі. Партызаны спынілі агонь.

Каля 10-й гадзіны пачалася новая атака, якую партызаны і дэсантнікі таксама адбілі. Атакі ішлі ажно да 12-й гадзіны адна за адной з розных кірункаў без перапынку, але выніку не прынеслі, акрамя параненых і забітых фашыстаў.

Дзяўчаты паспешліва начынялі магазіны і падавалі гранаты. Раптам проста на бункер пасыпаліся доўгія чэргі з кулямётаў. Адна з іх трапіла ў «Віктара», які высунуўся з улазу, яго параніла ў правую далонь і, як аказалася пазней, у прадплечча. Дзяўчаты адразу ж перабінтавалі яму далонь. Падпаручнік аддаў загад усім вярнуцца ў бункер, каб у спрыяльны момант контратакаваць і разарваць кальцо акружэння.

## ПРАРЫЎ

Падраздзяленне Францішка Надольнага займала баявыя пазіцыі злева ад выхаду з бункера, з якога вёў агонь падпаручнік. Снайпер Станіслаў

Мрочак цярпліва выбіраў цэлі і дакладна паражаў іх. У адзін момант ён заўважыў гітлераўца, які цэліўся ў яго, і не паспеў стрэліць першым. Ад болю ў назе Мрочак голасна застагнаў і гучна папрасіў:

– Франак, дапамажы мне!

У адказ на голас фашысты пачалі весці інтэнсіўны аўтаматны агонь. Загаварыў варожы кулямёт, ад куль ламаліся галінкі і маладыя дрэўцы. Склалася пагражальнае становішча. На дапамогу параненаму падпоўз Браніслаў Варчак, які ў групе выконваў ролю санітара. Ён налажыў павязку на нагу Мрочака і перадаў яго Эдмунду Эрнсту і Франку Надольнаму.

Падпаручнік узмахам рукі загадаў Надольнаму прарывацца. Той зразумеў і аддаў загад шасці сваім байцам падабрацца пад варожае акружэнне. Падпоўзшы пад самы варожы ланцуг, адкрылі агонь з аўтаматаў, закідалі фашыстаў гранатамі, знішчылі іх кулямётнае гняздо. Раненага Мрочака вялі Эдмунд Эрнст і Бронек Варчак. Прарвалі ланцуг акружэння і выйшлі ў Тухольскі бор. Адышоўшы з кіламетр ад месца бою, Мрочака зноў перавязалі і падаліся вызначаным папярэдне шляхам, каб адцягнуць на сябе ўвагу ворага...

Каля палавіны першай гадзіны камандзіру далажылі, што заканчваюцца боепрыпасы. Ён загадаў раздзяліць патроны і гранаты, а Мегеру сказаў аддаваць такія каманды па-нямецку, каб у фашыстаў склалася ўражанне, што тут дзейнічае буйны партызанскі атрад. «Erster Zug links! Zweiter rechts! Dritter in die Mitte!» *(«Першае падраздзяленне налева! Другое направа! Трэцяе пасярэдзіне»),* – голасна пачаў выгукваць Мегер. Ворага гэтыя каманды збянтэжылі, і агонь на кароткі час спыніўся.

Парашутысты непрыкметна пакінулі бункер, у баявым парадку «клінам наперад» падышлі да лініі акружэння і з крыкам «ура!» кінуліся на штурм, страляючы на бягу. У сярэдзіне атакуючых беглі паранены «Віктар», партызан, які яго ахоўваў, радыст і дзяўчаты. Атакуючых прыкрывалі партызаны Шмаглінскі і Глінецкі, страляючы з бункера. Яны вялі вельмі інтэнсіўны агонь, што дапамагло адцягнуць увагу ворага і прарваць кальцо. У апошні момант, карыстаючыся разгубленасцю фашыстаў, два партызаны таксама пабеглі ўслед за таварышамі. Наўздагон не раздалося ніводнага стрэлу: фашысты былі дэзарыентаваныя і нават не наладзілі пагоні. Як пазней высветлілася, яны вырашылі, што з акружэння вырвалася невялікая група партызан, а асноўныя іх сілы застаюцца ў бункеры: каманды Мегера ўвялі іх у зман. Тады фашысты прымянілі сваю звычайную тактыку: яны сагналі мясцовых палякаў і пусцілі наперад да партызанскай базы. Прыкрываючыся жывым ланцугом, уварваліся ў бункер, але знайшлі там толькі... коціка, які «не захацеў» пайсці з разведчыкамі.

Вырваўшыся з варожага кальца, партызаны і дэсантнікі пасля трохкіламетровага фарсіраванага марша крыху передыхнулі на невялікай палянцы і нацянькі праз высокі лес накіраваліся згодна з планам у напрамку Любацені. Каля лясной вышыні Малая Галоўка спыніліся на адпачынак. Калі пачало вечарэць, адправіліся далей, у вёску Зімняя Здроя. Перасеклі тры чыгункі: Шлёнск – Гдыня, Чэрск – Шляхта – Слівіца і Шляхта – Оцыпаль. Апошнюю з іх перайшлі з вялікай асцярожнасцю і спыніліся на кароткі адпачынак.

Пасля 25-кіламетровага маршу па глыбокім снезе ўсе адчувалі страшную змoранасць. Асабліва цяжка даводзілася параненаму «Віктару», але ён ніводнага слова пра гэта не прамовіў. Усе былі галодныя, бо з самай раніцы зярнятка макавага ў роце не мелі. Выдатна трымаліся і дзяўчаты. Менткі паклікаў да сябе Мегера, і разам вызначылі далейшы шлях: дайсці заходнім ускрайкам лесу да сядзібы, што стаяла асобна каля вёскі Кэнша, дзе збіраліся зноў адпачыць, падсілкавацца і перавязаць раны «Віктара». Па словах Мегера, тут жыла польская сям'я.

Да сядзібы дабраліся без перашкод, акружылі і праверылі ўсе будынкі, частка людзей засталася на двары, астатнія ўвайшлі ў дом. Тут знаходзіліся гаспадар – мужчына сталага ўзросту, яго жонка і дзве дачкі. Папрасілі накарміць байцоў, але ўражаныя жыхары заявілі, што калі партызаны галодныя, то няхай возьмуць усё самі насуперак гаспадарскай волі. Камандзір загадаў дзяўчатам выкарыстаць запасы гаспадароў, згатаваць вячэру і закіпяціць малако для параненага лейтэнанта, якому прамылі і зноў перавязалі рану.

Дзяўчаты пачалі завіхацца на кухні, а гаспадар папрасіў у Менткага дазволу схадзіць за тытунём у суседні з кухняй будынак. Прайшло некалькі мінут, а гаспадар усё не вяртаўся. Мегер і Менткі забеглі ў будынак, куды пайшоў гаспадар, і ўбачылі адкрытае акно. Падышлі бліжэй і... убачылі, як метраў за 600 ад хаты гаспадар бег па полі. Не доўга думаючы, падпаручнік выпусціў услед уцекачу аўтаматную чаргу, але не трапіў: мужчына знік за пагоркам. Сітуацыя вымагала неадкладных дзеянняў.

Забраўшы крыху прадуктаў і прыгатаваную ежу, пакінулі негасцінны прытулак.

Фарсіраваным маршам прыйшлі пад раніцу да вёскі Зімняя Здроя, праз якую цякла рэчка Чорная Вада. Перабраўшыся праз раку па кладцы ў сярэдзіне вёскі, спыніліся на адпачынак у знаёмага гаспадара, сядзіба якога стаяла наводшыбе. Спалі мёртвым сном на сене ў стадоле. Каля палудня іх раптоўна разбудзілі. Аказалася, што гаспадар атрымаў паведамленне пра жандармаў, якія наехалі на той бок вёскі за ракой і распытваюць людзей пра партызан. Камандзір аб'явіў трывогу і тэрміновы марш. Кружным шляхам увайшлі ў густы лес, што прымыкаў да стадолы, і паспешліва рушылі да сядзібы Малыя Любікі, дзе ў маладым густым сасонніку прычакалі вячэрняга змроку.

Пераначавалі ў доме ў Любіках. Гаспадар Гурновіч накарміў партызан смачным хлебам з мясам і напаіў малаком. Ноччу Мегер сказаў Менткаму, што чуў, быццам у блізкім лесе ў бункеры хаваюцца мясцовыя партызаны, якіх ён добра ведае, і прапанаваў звязацца з імі. Той жа ноччу адбылася сустрэча, і раніцай парашутысты перайшлі ў невялікі бункер.

Камандзіра вельмі непакоіў стан «Віктара». Яму часта мянялі павязкі, а тэмпература працягвала расці. Пры адной з перавязак Надзя ўзялася за прадплечча «Віктара», і ён самлеў. Разрэзалі рукаў і ўбачылі тут скразную рану, якая ўжо загнаілася. Пра гэту рану ніхто не ведаў. Ачышчаючы яе, Надзя страціла прытомнасць. Надзю замяніў Мегер, хутка прамыў і забінтаваў руку, і «Віктар» неўзабаве хутка пайшоў на папраўку.

Мясцовыя партызаны прынялі нечаканых гасцей прыязна, пачаставалі мясам аленя і хлебам. З цікавасцю глядзелі на дэсантнікаў і іх узбраенне. Падпаручнік сказаў ім, што месца для свайго сховішча яны выбралі не вельмі ўдала. У выпадку акружэння тут нельга было бараніцца і выйсці незаўважанымі. Ён прапанаваў партызанам далучыцца да яго атрада і накіравацца за аўтастраду ў лясніцтва Бартэл Вялікі. Яны з радасцю згадзіліся. Перад дарогай вырашылі назапасіць прадуктаў і вярнуліся ў Любікі, дзе ў сваякоў і знаёмых набылі ўсё патрэбнае.

Захоўваючы вялікую асцярожнасць, дайшлі да лясніцтва Лясная Гута і павярнулі лесам да возера Смольнік. Тут жыла добра вядомая партызанам сям'я Міхала Яжджэўскага. Затрымаліся паблізу іх сядзібы ў лесе. Яжджэўскіх добра ведаў Мегер яшчэ з часу сваёй самастойнай партызанскай дзейнасці, таму падпаручнік загадаў яму і двум партызанам пайсці да Яжджэўскіх на разведку. Праз некалькі мінут адзін з партызан вярнуўся і далажыў, што ўсё спакойна і можна зайсці да гаспадароў.

Ціха ўвайшлі ў дом. Тут іх чакала прыемная неспадзяванка: аказалася, што ў гумне на сене хаваюцца паранены Мрочак і дэсантнікі, якія разам з ім вырваліся з варожага кальца. Была агульная радасць ад сустрэчы. Ноч прайшла на сене ў Яжджэўскіх.

Гэта была святая калядная ноч 24 снежня, вігілія, або куцця, ноч Божага нараджэння, свята, якое вельмі шануюць усе католікі. Ян Менткі, яго пабрацімы-землякі ўспаміналі святочныя вечары дома, вячэру на сене, засланым абрусам, дамашнюю ўрачыстасць, утульнасць і святло. У кожнага

ў душы падчас гэтых успамінаў, напэўна, загучала ўрачыстая, бадзёрая, напоўненая светлай надзеяй мелодыя каляднай песні «Srud nocnej ciszy glos sien roschodzi...», а таксама пяшчотная, кранальная да глыбіні пачуццяў «Luliaj ze Jezuniu, luliaj ze, luliaj...»

Раніцай з мэтай канспірацыі выйшлі ў лес і цэлы дзень правялі на снезе і марозе. Агонь па той жа прычыне не распальвалі, таму што ведалі пра інтэнсіўную пошукавую дзейнасць фашыстаў, якая не спынялася ўжо каторы дзень. Былі падняты на ногі ўсе сілы навакольных гарнізонаў, у тым ліку ў Быдгашчы, Грудзёндзы і блізкага палігона Waffen SS. Немцы прачосвалі лясы пры дапамозе моцных аддзелаў ягдкаманд і эсэсаўцаў і чакалі толькі выпадку для агнявога кантакту з дэсантнікамі і партызанамі, які, без сумнення, быў бы канцом іх дзейнасці.

27 снежня Менткі загадаў радысту звязацца з Цэнтрам і далажыць кароткай шыфроўкай пра нялёгкае становішча групы і панесеных стратах. Пасля перадачы шыфроўкі радыст паведаміў, што ёсць шыфроўка і для «Вірскага», але з прычыны моцна замерзлых рук прыняць і расшыфраваць яе ён не можа. Падпаручнік загадаў радысту ўстанавіць час наступнага сеанса. Сам камандзір таксама вельмі пакутваў ад прымарожаных ног: выходзячы з бункера, ён нацягнуў на тоненькія шкарпэткі цесныя элегантныя хромавыя боты і цяпер зацята кляў сваю неабачлівасць. Боль дакучаў яму нясцерпна, але ён віду не паказваў. Цяпер жа яго акрамя болю і марозу турбавала пытанне: што паведаміць яму Вялікая зямля?

Нарэшце наступіў час абумоўленага сеанса, і Юрка пачаў прымаць дэпешу, тэкст якой трэба

было дзясяткі раз паўтараць. Непадатлівымі ад марозу рукамі радыст не мог пісаць. Падагравалі яму далоні запалкамі. Нарэшце радыст з цяжкасцю запісаў радыёграму і пачаў яе расшыфроўваць. Цэнтр павіншаваў разведчыкаў з атрыманай перамогай і паведаміў, што ў той трагічны дзень былі выкінуты на парашутах двое людзей – радыстка і доктар – і даручаў прыняць усе захады, каб адшукаць іх. Падпаручнік сабраў камандны састаў групы, і сумеснымі сіламі склалі план далейшай неадкладнай дзейнасці ў гэтай няпростай сітуацыі.

– Па-першае, трэба падрыхтаваць бяспечныя сховішчы для раненых і забяспечыць іх медыцынскай дапамогай, – сказаў на нарадзе падпаручнік. – Па-другое, выратаваць парашутыстаў, якія ўжо амаль тыдзень мерзнуць у лесе.

– У сувязі з павелічэннем саставу нашай групы паўстае задача будаўніцтва новай базы, – дадаў Ян Мегер.

– Не будзем забывацца пра нашу асноўную дзейнасць – разведку, – заўважыў лейтэнант «Віктар». – Таму прапаную наладзіць перапыненыя кантакты з інфарматарамі і зноў пачаць збор разведданых.

Параіўшыся, вырашылі адправіць параненага Віктара пад аховай двух партызан і Леона Песіка ў Новую Вёску, дзе ў мясцовым маёнтку працаваў яго сваяк Францішак Клаўчынскі. Паранены Мрочак пакуль заставаўся ў Яжджэўскіх. Сюды ж вечарам вярнуліся з лесу радыст і астатнія партызаны, і Юрка разгарнуў рацыю.

*«"Волга" – "Цэнтру": прыступаю да выратавання парашутыстаў. Прашу паведаміць дакладнае месца*

*іх знаходжання, а таксама ўмоўныя сігналы, пры дапамозе якіх можам іх пазнаць».*

Праз два дні атрымалі з Цэнтра адказ, з якога вынікала, што парашутысты – гэта жанчына, якая мае дакументы на імя Яніны Чарнецкай (псеўданім «Зоя»), а таксама лейтэнант Павел Сегал – «доктар Суські». Яны чакаюць спаткання ў лесе над возерам Белым. Умоўныя сігналы для сустрэчы – трохразовы стук па дрэве праз кароткія адрэзкі часу.

Вечарам разам з Яжджэўскім, Мегерам і радыстам пачалі абмяркоўваць пытанне, дзе пабудаваць новую базу. Спыніліся на ваколіцы лясніцтва Лясная Гута. Тут у 2 кіламетрах ад возера Смольнік рос густы лес. Паблізу былі каналы, якія даглядаў Яжджэўскі. Гэта мясцовасць лічылася закінутай, глухой, і нават тутэйшая лясная адміністрацыя не наведвала яе. Сюды рэгулярна па грэблі хадзіў па справах службы Яжджэўскі, і гэта было на руку партызанам, бо можна было не хвалявацца пра пакінутыя на вытаптанай сцежцы сляды. Мегер атрымаў заданне прыступіць да будаўніцтва новага бункера.

## ПА СТАРЫХ АДРАСАХ

Трэба было таксама неадкладна аднавіць кантакты з інфарматарамі, каб зноў выконваць сваё асноўнае заданне – разведку. «Вірскі» вырашыў паслаць надзейнага чалавека з пісьмом да свайго бацькі і запрасіць яго на сустрэчу. У пісьме паведамлялася, што маці Міхала Менткага цяжка захварэла і чакае яго неадкладнага прыезду да сябе ў вёску Бэнк. Падпаручнік быў упэўнены, што бацька здагадаецца, хто запрашае яго на сустрэчу,

і неадкладна прыедзе. Таму разам з радыстам Юркам, Францішкам Надольным, Леонам Шмаглінскім і Браніславам Варчакам познім вечарам адправіўся за 18 кіламетраў уздоўж канала Чорная Вада ў вёску Бэнк.

На месца дайшлі 1 студзеня каля першай гадзіны ночы. Асцярожна абышлі будынкі. Ноч выдалася марознай і яснай. У адной з хат жыла другая цётка «Вірскага» разам са сваёй старэнькай маці. Падпаручнік шэптам загадаў сваім таварышам схавацца ў цені складзеных дроў, а сам падкраўся да акна і пастукаў у шыбу. Праз некалькі хвілін яго вітала цётка, якую ён апошні раз бачыў пяць гадоў таму. Аказалася, што бацька яшчэ не прыехаў. Вырашылі схавацца ў невялікім драўляным хлеўчуку, дзе стаяла карова. Пачуўшы чужых, яна пачала рыкаць, і прыйшлося кінуць ёй ахапак сена. У хлеўчуку было цёпла, утульна, пахла сенам і сырадоем.

Цётка раніцай прынесла збанок малака, вялікую гару батэрбродаў з вяндлінай і яечню. Успомнілі, што наступіў Новы год, і пачалі сардэчна віншаваць адзін аднаго, жадаючы хутчэйшай перамогі і шчасця. Дзень прайшоў у размовах і сне. Вечарам прыехаў бацька. Прывітаўшыся, ён усклікнуў:

– Дзякуй Богу, што ты, сынок, жывы і здаровы! Мы вельмі хваляваліся за цябе і тваіх таварышаў.

– Не трэба хвалявацца, татусь. Мы здолелі вырвацца з фашысцкіх абцугоў, і гэта ім дорга каштавала. Нам удалося разарваць варожае акружэнне без асаблівых страт, толькі двое лёгка параненыя.

– Мы даведаліся пра гэта з тэлеграмы, якую перахапіў наш сусед і добры прыяцель, які служыць на пошце. Ён сказаў, што немцы падчас бою страцілі

каля 30 чалавек забітымі і больш за 40 параненымі. Ну а ты цэлы і здаровы?

– Як бачыш, цэлы, толькі абмарозіў ногі, бо з дурасці нацягнуў на мароз цесныя афіцэрскія боты.

– Нічога, сынку, сястра прывязе табе барсучынага тлушчу і цёплыя валёнкі.

Бацька паведаміў шэраг свежых звестак пра рух ваеннага чыгуначнага транспарту, абгаварылі спосабы кантактаў на будучае, а таксама дату прыезду сястры з наступнымі звесткамі, і бацька адправіўся дадому. На другі дзень радыст уключыў радыёстанцыю. З апошніх паведамленняў разведчыкі даведаліся пра забойства савецкіх парламентарыяў у Будапешце, і гэта злачынства фашыстаў выклікала ў іх абурэнне і нянавісць.

А ў гэты момант на двары пачуўся моцны лямант і крык: ад суседняй студні бегла цётка.

– O Swenta Maryja, Matka Boska! Ktos nam zdradzil! – лямантавала яна без памяці ад страху. – To kolumne san z esesowcami zbliza!

Адступаць было позна: радыст толькі што закончыў перадачу шыфроўкі і не паспеў згарнуць рацыю. Падпаручнік загадаў цётцы заставацца ў хаце, а калі распачнецца страляніна, уцякаць за раку. Партызаны стоўпіліся каля дзвярэй хлеўчука, якія выходзілі прама на дарогу, што вяла з вёскі Бэнк да вёскі Войтал. Зброю трымалі напагатове.

– Слухайце загад! – шэптам выгукнуў падпаручнік. – Калі немцы захочуць абшукаць гэты хляўчук, адкрываем раптоўны агонь з аўтаматаў, кідаем у іх гранаты і адступаем да рэчкі, а там – да бліжэйшага лесу.

Марудна пацягнуліся хвіліны чакання. Нервы былі напяты да апошняга. Нарэшце паказалася

калона. Партызаны пераглянуліся, і падпаручнік шэптам яшчэ раз нагадаў свой план. Ад калоны фашыстаў іх аддзяляла тонкая драўляная сцяна хлеўчука. Чуваць былі размовы немцаў, якія нават не падазравалі, што так блізка напружана сочаць за імі пяць пар вачэй. Налічылі каля 30 падвод, якія павольна ехалі перад гэтымі напружанымі вачыма.

Нарэшце калона схавалася за бліжэйшым паваротам дарогі. Мароз крыху зменшыў, неба пакрылася хмарамі, наступіў змрок. Цётка прынесла вячэру і паведаміла, што эсэсаўцы размяшчаюцца ў недалёкай вёсцы Карсіне, куды і вярнуліся цяпер. Пасля вячэры шчыра падзякавалі за начлег і ежу і рушылі ў дарогу да новай базы. Дайшлі без асаблівых прыгод, бо пачалася мяцеліца і замяла ўсе сляды на снезе.

У Яжджэйскіх сустрэлі двух сваіх партызан, якія аднеслі гаспадару пазычаныя для будаўніцтва бункера інструменты. Разам пайшлі ў новы схрон. Ён аказаўся меншым за папярэдні, але месца ў ім хапала ўсім. Унутры збудавалі двухпавярховыя нары, дзе на галінках сосен і елак, на саломе можна было добра адпачываць. Пры сцяне стаяла жалезная пячурка. Мегер раздабыў таксама патрэбны посуд, запасы прадуктаў. Але іх хапіла б ненадоўга, таму запланавалі на бліжэйшую ноч некалькі рэйдаў па тытунь і жыўнасць...

## ВЫРАТАВАННЕ ДОКТАРА І РАДЫСТКІ

...Надышоў Новы год. Ужо цэлы тыдзень «Зоя» і Павел не маглі ўстанавіць кантактаў з групай «Вірскага». Не ведалі яны, што парашутысты і пар-

тызаны вялі цяжкі бой з фашыстамі і выходзілі з варожага кальца, унікаючы настойлівай пагоні. Думалі, што адбылося якое-небудзь непаразуменне ці здарылася няшчасце. Паволі агарнула іх апатыя. Не хапала ежы, вады. Хаця паблізу струменіў крынічны ручаёк, Павел забараніў хадзіць да крынічкі, каб не нарабіць слядоў і не выкрыць сваю дыслакацыю. Падобна на тое, і гэта высветлілася пазней, што Павел у гэтых адносінах меў рацыю: пасля бою партызан і дэсантнікаў з фашыстамі, эсэсаўцы і ягдкаманды прачосвалі лясы. «Зоя» прапанавала падкласці звязку гранат пад які-небудзь ваенны састаў, якія час ад часу праходзілі непадалёку, каб нарабіць немцам шкоды. Павел забараніў і гэту акцыю.

У адну з начэй, калі ўжо закончыліся ўсе прыпасы і парашутысты пухлі ад голаду і пакутавалі ад марозу, вырашылі звязацца з Цэнтрам і адкрытым тэкстам, што было зусім недапушчальна, перадалі на рускай мове наступнае: «*Замярзаем у лесе, давайце хутчэй адказ*». Але адказу не дачакаліся. Думалі, што надыходзіць непазбежная смерць. У апошнія хвіліны жыцця вырашылі настроіць рацыю на маскоўскую хвалю. Не шкадавалі батарэі: «Зоя» была перакананая, што рацыя больш не спатрэбіцца і хацела пачуць з Масквы што-небудзь вясёлае.

Загучаў прыемны голас жанчыны, якая чытала дзецям казку, відаць, пры навагодняй ёлачцы. Зрабілася вельмі прыкра. Праз некалькі хвілін пачулі навіны з фронту: нашы войскі імкліва наступаюць. І гэта паведамленне надало ім энтузіязму. Яны вырашылі любымі спосабамі дайсці да групы «Вірскага». Нарэшце наступным днём атрымалі са

штаба шыфроўку, што іх будуць чакаць ад 2 да 5 студзеня ў ваколіцы возера Белае...

...У той жа дзень перад раніцай падпаручнік загадаў Алаізу Малахоўскаму і групе партызан выйсці на ўмоўленае праз штаб месца сустрэчы з парашутыстамі. У дарогу адправіліся Ян Каміньскі, Павел Чарвіньскі, Ян Глінецкі і новенькі партызан Леон Прыхла. Трэба было прайсці ў адзін бок каля 50 кіламетраў па лясах, насычаных аддзеламі СС, жандармерыі і ягдкамандамі. Вакол сноўдалі фашысты з надзеяй, што партызаны нарэшце трапяць у расстаўленыя на іх сеткі. Небяспека чакала за кожным кустом, кожным паваротам лясных дарог. Таму ўдзельнікі групы выратавання былі апрануты ў нямецкае абмундзіраванне. Ішлі ў напрамку Любацені асцярожна, уважліва аглядаючы наваколле. Пасля кароткага адпачынку выйшлі на ўмоўленае месца.

А там ледзь не адбылася трагедыя. Павел і «Зоя» прыйшлі туды раней і пачалі даваць умоўныя сігналы. У вяршалінах дрэў свістаў моцны вецер, чуўся трэск галін, што ламаліся пад яго напорам. Пасля адной з серыі сігналаў пачуўся адказ – стук па дрэве. Але... гэта дзяцел стукаў па старой сасне. І так працягвалася доўга – то дзяцел, то вецер. «Зою» ахінулі адчай, злосць і роспач. Яна ўзвяла курок пісталета і паднесла ствол да віска.

– Ты што гэта робіш? – закрычаў Павел, нечакана з'явіўшыся ў яе за спінай. Ён вырваў у «Зоі» пісталет і схаваў яго ў кішэню. – Сорамна табе быць такой маладушнай у момант, калі вось-вось прыйдзе паратунак. Лепш яшчэ раз пастукай тройчы па дрэве: можа нарэшце нас пачуюць.

«Зоя» паўтарыла сігналы. І тут пачулі адказ. Не было сумнення, што на гэты раз яго падаюць людзі. Гэта прыбавіла сілы, пачалі шукаць крыніцу сігналаў і неўзабаве ўбачылі групу людзей у нямецкім абмундзіраванні.

– Асцярожна, Паша, – папрасіла «Зоя». – Я нікога з іх не ведаю. А раптам гэта фашысты?

– Не, гэта свае! – радасна закрычаў Павел. У адным з дэсантнікаў ён пазнаў Алаіза Малахоўскага, і падаўся ім насустрач.

Некалькі ўзброеных фігур на чале з Малахоўскім паволі падыходзілі да абяссіленых парашутыстаў. У главе «Зоі» зашумела, яна пачала скакаць ад радасці, не зважаючы на абмарожаныя ногі, усіх падрад цалавала і нарэшце звалілася без сіл.

Хлопцы распалілі агонь, напаілі чаем, накармілі парашутыстаў. Партызаны добра ведалі мясцовасць і былі перакананы, што тут ім нічога не пагражае і можна абагрэць замёрзлых бедакоў каля вогнішча. Падсілкаваўшыся і трохі адпачыўшы накіраваліся ў вёску Звярынец да сям'і Лутkоўскіх, якая супрацоўнічала з групай «Волга». Гэта сям'я па загаду «Вірскага» падтрымлівала добрыя адносіны з немцамі, тайна трымала многа свіней і дамашняй птушкі, дзялілася мясам з немцамі і партызанамі, і таму была ў дорым воку мясцовых улад, што ствара бяспеку для разведчыкаў. Тут гасцям наладзілі цёплы, радасны прыём з музыкай і танцамі. «Зоя» скінула з сябе старую вопратку, у якой бадзялася па лесе, памылася, надзела ўсё чыстае, наелася гарачага булёну з індычкі і адчувала сябе як у раі. Разам з рацыяй яе размясцілі на сене пад страхой у чыстым і светлым памяшканні. Пад сенам быў тайны выхад. Схрон аказаўся бяспечным, відаць, тут

часта хаваліся партызаны. Некалькі разоў на дзень сюды заглядала дачка Лутkоўскіх, прыносіла ежу, перавязкі на абмарожаныя ногі, сардэчна і прыязна размаўляла з «Зояй».

..Утой дзень, калі група партызан на чале з Алаізам Малахоўскім ратавала згубленых парашутыстаў, а раненага «Віктара» разам з аховай размясцілі ў бяспечным месцы, партызаны арганізавалі рэйды ў розных кірунках за «языкамі» і за прадуктамі. Як заўсёды, рабілі гэта з такім разлікам, каб увесці ў зман акупацыйныя ўлады наконт сапраўднай дыслакацыі атрада. Выбіралі найбольш аддаленыя месцы, ніколі не вярталіся адной і той жа дарогай, блыталі сляды. Пераапрануўшыся ў форму салдат Вермахта, размаўлялі толькі па-нямецку.

Назаўтра пасля выратавання «Зоі» і Паўла пачалі абмяркоўваць спосабы выканання даручанага Цэнтрам задання. Па папярэдніх разліках Цэнтра, Павел разам з радысткай павінен быў пры дапамозе «Вірскага» легалізавацца ў Быдгошчы ці яго ваколіцах. Гэта магчыма было толькі да 22 снежня, г. зн. да бою з карнай экспедыцыяй фашыстаў. Цяпер жа гэта стала небяспечным і рызыкоўным, бо акупацыйныя ўлады ўзмацнілі прапускны рэжым, увялі новыя прапускныя дакументы і павялічылі кантроль руху на чыгуначных станцыях. У такой сітуацыі разведчыкі прыйшлі да высновы, што самым правільным будзе тое, калі «доктар Сускі» часова застанецца на базе і вылечыць раненых, а для выканання асноўнага яго задання «Вірскі» перадасць яму сваю агентуру ў Быдгошчы. Цэнтр згадзіўся з такім рашэннем, і хутка запрацавала яшчэ адна рацыя, перадаючы на Вялікую зямлю каштоўныя разведданыя. «Зою» да гэтага часу

перавезлі ад сям'і Лутkoўскіх і размясцілі ў верхнім пакоі бацькоўскага дома Леона Песіка. Разам з «Зояй» тут знаходзіліся намеснік «Вірскага» – «Віктар», які далечваў раны, і для іх аховы – партызан Віт Шмаглінскі, а таксама Леон Песік.

Хаваліся яны ў даволі светлым пакойчыку на паддашку. Позна вечарам, калі дзеці клаліся спаць і дзверы замыкаліся на замкі, сыходзілі долу вячэраць, прымалі шыфроўкі і перадавалі ў Цэнтр разведданыя. Пасля хлопцы вярталіся на паддашак, а «Зоя» заставалася і клалася спаць з бабуляй. На золку, пакуль дзеці яшчэ спалі, радыстка таксама вярталася ў верхні пакой, куды бабуля прыносіла сняданак, а потым і абед. Гаспадыня неўзабаве даведалася, што нямецкія ўлады праводзяць праверку супрацьпажарнага стану на паддашках дамоў. Пастаяльцы верхняга пакою вымушаны былі цэлы дзень прасядзець у падсобным памяшканні, дзе была складзена бульба. Надышоў вечар, немцы праверылі паддашак і пакінулі сядзібу, а «Зоя» і трое партызан вярнуліся ў свой пакой. Жыццё пацякло па ўстаноўленым раней распарадку...

## ЗДРАДА І РАСПЛАТА

...На новай базе, у бункеры быт таксама наладзіўся, партызаны аднавілі сувязі са сваімі інфарматарамі, неабходныя звесткі сталі пастаянна паступаць у Цэнтр. Разведчыкі мелі сваіх людзей у Гданьскім і Быдгашчкім гестапа, у мясцовай фашысцкай службе бяспекі, якой даручалася ліквідацыя групы «Вірскага». Агентурная сетка была арганізавана так узорна, што ёй мог бы

пазайздросціць кожны ас разведкі. Але здаралася і непрадбачанае

...Адным днём партызанскія вартавыя паведамілі камандзіру, што па грэблі праходзяць трое незнаёмых, знешні выгляд якіх сведчыць пра іх як пра былых ваеннапалонных. Падпаручнік загадаў затрымаць і ўстанавіць іх асобы. Аказалася, што гэта сапраўды былыя вязні, якім тры дні таму ўдалося збегчы з транспарту. Хаваліся яны ў лесе і ішлі ў кірунку Быдгошчы. Прынялі іх у атрад, бо ўсё, пра што яны расказалі, выглядала праўдзіва. Тым не менш, праявілі асцярожнасць, якая павінна была ахаваць разведчыкаў ад магчымай правакацыі. Сачылі за кожным іх крокам, па адным бралі іх на разведаперацыі, у рэйды за прадуктамі, за «языкамі». Але Андрэй, Алёша і Ваня – так звалі новых байцоў – аказаліся мужнымі, храбрымі і вернымі таварышамі і ваявалі ў атрадзе да самага вызвалення.

А вось другі Алёша, былы ваеннапалонны, што трапіў у групу Мегера яшчэ да з'яўлення атрада «Волга» на Памор'і, пра якога мы расказвалі раней, прынёс разведчыкам многа непакою і трывогі. Падчас аднаго з баявых заданняў ён, убачыўшы некалькі нямецкіх жандармаў, струсіў, пакінуў пост вартавога і, не папярэдзіўшы таварышаў, уцёк. Алекс, як называлі яго ў атрадзе, перад гэтым не раз паводзіў сябе труслівa, за што атрымліваў дысцыплінарныя спагнанні – пазачарговыя дзяжурствы на кухні. Заўсёды абяцаў выправіцца, але так і не змог стаць сапраўдным адважным байцом. Падпаручнік не рабіў намераў, каб адшукаць дэзерціра, бо спадзяваўся, што ён яшчэ вернецца, як гэта адбывалася раней, калі Алекс затрымліваўся падчас выканання заданняў. Але

праз некалькі дзён паступілі звесткі, што да адной нямецкай удавы прыбіўся новы парабак, які вельмі дрэнна размаўляе па-польску і гаворыць, што «партызанства» яму надакучыла і ён мае намер добраахвотна з'явіцца ў камендатуру. Трэба было прымаць тэрміновыя меры. Каб удакладніць гэтыя звесткі, вырашылі правесці разведку. Яе ўзначаліў і правёў «Мадзьяр» – былы палонны савецкі афіцэр. Чуткі пацвердзіліся.

Камандзір загадаў стварыць ваенны трыбунал і разгледзець справу здрадніка. У састаў трыбунала ўвайшлі: старшыня – лейтэнант «Віктар», радыст лейтэнант Юрка, «Мадзьяр», а таксама два парашутысты, адным з якіх быў Эдмунд Эрнст. Такім чынам, судзіць дэзерціра даручылі ў асноўным яго землякам. Уважліва разгледзеўшы справу, суд вызначыў віну падсуднага і, прымаючы пад увагу, што паводзіны здрадніка могуць прывесці да ліквідацыі групы і людзей, якія супрацоўнічаюць з разведчыкамі, прыгаварыў яго да смяротнага пакарання праз расстрэл.

Перад зацвярджэннем прыгавору падпаручнік задумаўся: усё-такі ў яго руках быў лёс чалавека. Ён з жалем падумаў, што дарэмна не пагаварыў адкрыта і шчыра з Алексам за ўвесь час яго знаходжання ў бункеры. Камандзір добра разумеў, што нервы былога фашысцкага вязня былі растрэсены, і яго паводзіны можна было ў нейкай меры апраўдаць. Калі б той звярнуўся да падпаручніка з просьбай аб дэмабілізацыі, то ён вызначыў бы яму работу ў бункеры і не даручаў баявых заданняў. А цяпер падстаў для паблажлівасці не знаходзілася. Прыгавор быў суровы, але ў тых абставінах цалкам апраўданы. «Вірскі» зацвердзіў яго і паведаміў

пра гэта ў Цэнтр, які згадзіўся з рашэннем суда. Прыгавор даручылі выканаць Эдмунду Эрнсту і «Мадзьяру». Праз некалькі дзён дызерціра яны знайшлі і расстралялі пры канале Чорнай Вады...

...У ваколіцах партызанскай базы здалёк над лясным масівам пачуўся знаёмы характэрны гул рухавікоў самалёта, які ляцеў на вышыні з паўкіламетра. Усе ажывіліся. Былі перакананы, што на борце «Дугласа» – парашутысты або рыштунак для якой-небудзь раней дэсантаванай групы. Але наступнай раніцай разведчыкаў устрывожылі водгукі страляніны і разрывы гранат, якія чуліся даволі выразна з боку лясніцтва Лясная Гута. Яна працягвалася каля гадзіны, а пасля наступіла цішыня. «Вірскі» аб'явіў баявую гатоўнасць і загадаў выслаць патрулі ў тых напрамках, адкуль можна было чакаць з'яўлення ворага.

Раптам раздалося знаёмае пасвістванне – умоўны знак супрацоўніка і інфарматара разведчыкаў старога Яжджэўскага. «Вірскі» выйшаў на ўскраіну лесу і сустрэў яго на грэблі. Яжджэўскі запытаў, ці чулі партызаны адгалоскі нядаўняга бою. Ён быў вельмі ўстрывожаны. «Вірскі» загадаў яму схадзіць у Лясную Гуту і даведацца аб прычыне страляніны. Вярнуўшыся апоўдні, Яжджэўскі расказаў, што разведчыкі не памыліліся: самалёт выкінуў дэсантную групу ў лесе, расцягнутым паміж лясніцтвам Лясная Гута і вёскай Вецк. Прызямленне парашутыстаў было ўдалым, але яны зрабілі некалькі фатальных памылак. Па-першае, пакінулі на дрэвах паблізу лясной дарогі парашуты, а па-другое, схаваліся ў хвойніку непадалёку ад месца прызямлення. Парашуты заўважыў, спяшаючыся рана на работу, мясцовы лясны работнік і паведаміў

ляснічаму. Той патэлефанаваў у Чэрск, адкуль адразу ж выехалі аддзелы эсэсаўцаў і ягдкаманда. Прачосваючы блізкія каля парашутаў лясы, хутка выявілі дэсантнікаў. Пачаўся няроўны бой, і дэсантнікі ўсе загінулі.

З расказаў эсэсаўцаў, якія пры лясных работніках каменціравалі здарэнне, вынікала, што парашутысты бараніліся ўпарта і ўмела. Апошнім загінуў камандзір. Ён знішчыў рацыю і шыфры, дабіў параненага радыста і застрэліўся сам. Трупы дэсантнікаў і іх рыштунак прывезлі ў Чэрск. Эсэсаўцы падазравалі, што гэта была савецка-польская група, і распусцілі чуткі пра ліквідацыю атрада «Вірскага». Трэба было прымаць контрмеры.

Якраз у гэты час непадалёку ад партызанскай базы ў лесе на поўдзень ад Студзеніц раскінула лагер група «Шышак» пад камандаваннем «Собаля» (Яна Шалеўскага) і «Ярэмы» (Альфонса Квічоры). Цяпер у гэтым атрадзе знаходзіліся два савецкія разведчыкі 3-га Прыбалтыйскага фронту. Атрад складаўся з 15 чалавек. «Вірскі» падтрымліваў пастаянныя кантакты з камандаваннем «Шышак» і дамовіўся пра ўзаемную дапамогу ў выпадку нападу фашыстаў. Цяпер ён прапанаваў сумесна ўдарыць на Чэрск у адказ на знішчэнне групы дэсантнікаў.

І гэта было цалкам магчыма, але кіраўніцтва «Шышак» адмовілася ўдзельнічаць у аперацыі, спаслаўшыся не нейкае заданне, якое яны цяпер выконваюць. Галоўнай жа прычынай адмовы сумесна праводзіць баявыя аперацыі была пралонданская палітыка, якой прытрымлівалася камандаванне гэтага атрада. Да таго ж «пралонданцы» баяліся ўплыву байцоў «Волгі» на сваіх радавых партызан і на канспіратыўнае падполле, бо сімпатыя такая

ўзрастала, і многія падпольшчыкі, што належалі да АК ці «Грыфу Паморскага», ахвотна выконвалі даручэнні «Вірскага».

У сувязі з адмовай сумеснымі сіламі ўдарыць па гарнізоне ў Чэрску «Вірскі» прыняў рашэнне ў якасці помсты за смерць дэсантнікаў раззброіць падраздзяленне вермахта, што размяшчалася ў лясніцтве Лясная Гута. Выкананне такой акцыі ён даручыў спецыяльнай групе пад камандаваннем Мегера («Мана»).

Група падышла да будынкаў лясніцтва і акружыла іх. Перад гэтым была пашкоджана тэлефонная сувязь з Чэрскам. «Ман» вырашыў прымяніць ваенную хітрасць: ён даручыў дзяўчыне, якая жыла ў лясніцтве, далажыць фашыстам, што ўся Лясная Гута акружана значнымі сіламі партызан, і калі акупанты жадаюць застацца жывымі, павінны здацца без бою. У адваротным выпадку Лясная Гута запалае пажарам, а яны будуць знішчаны ўсе да аднаго. У пацвярджэнне сваіх слоў пра вялікую колькасць партызан «Ман» загадаў дзяўчыне паглядзець навокал. Дзяўчына пабялела: у лесе маячылі постаці ўзброеных людзей. Яны бесперапынна мянялі месца, і стваралася ўражанне, што лес перапоўнены партызанамі.

Немцы запанікавалі і вырашылі здацца без бою. Група з некалькіх партызан на чале з Мегерам увайшла у казарму. Салдаты стаялі ля сцяны з паднятымі ўгору рукамі. Іх абшукалі, мяркуючы, што хто-небудзь з салдат пакінуў пры сабе пісталеты ці гранаты. Але нічога не знайшлі. Палонныя дрыжалі ад страху і малілі толькі аб адным: пакінуць іх жывымі. Тут былі ў пераважнай большасці пажылыя рэзервісты. Перад аперацыяй «Вірскі»

загадаў «Ману» ў выпадку добраахвотнай здачы ў палон пакінуць усіх салдат жывымі.

Рашэнне было прадыктавана ў першую чаргу той акалічнасцю, што ў адносінах да гэтых салдат не было ніякіх прэтэнзій: мясцовага насельніцтва яны не мардавалі, не крыўдзілі і не вельмі старанна выконвалі сваё асноўнае заданне – барацьбу з партызанамі. Салдаты не толькі не праяўлялі ў гэтай справе ініцыятывы, але стваралася ўражанне, што многіх рэчаў яны проста не жадалі заўважаць. Патрулюючы лясы, голасна размаўлялі, каб іх чулі здалёку. Так яны, напэўна, падавалі сігнал, што выйшлі ў дазор, і папярэджвалі, каб не трапляліся ім на дарозе.

Партызаны забралі аўтаматычную зброю, а астатнюю вывелі са строю, зрабілі яе непрыгоднай. Мегер загадаў салдатам чым хутчэй падавацца ў Чэрск, а адтуль вяртацца да сваіх родных, бо пры наступнай сустрэчы яны могуць застацца тут назаўсёды. На жаль, яны і засталіся назаўсёды ў Памор'і: служба бяспекі расстраляла іх у лесе пад Чэрскам.

Атрад «Вірскага» налічваў ужо 35 байцоў. Захопленую ў Лясной Гуце аўтаматычную зброю з вялікім запасам патронаў раздалі навічкам, якія мелі толькі карабіны. Такім чынам, узбраенне атрада цяпер складалі ў асноўным савецкія і нямецкія аўтаматы.

Кантакты з мясцовым насельніцтвам значна пашырыліся. З нецярплівасцю чакалі вясны, каб разгарнуць дыверсійную дзейнасць. «Вірскі» лічыў, што да вясны атрад яшчэ больш вырасце. Але здарылася так, што планы на будучую вясну кардынальна змяніліся. З вялікай радасцю парты-

заны пачулі па радыё пра зімова-вясновае наступленне Чырвонай Арміі і Войска Польскага, якое ўваходзіла ў састаў 1-га Беларускага фронту. Кожны дзень радыё даносіла весткі пра вызваленне ўсё новых польскіх населеных пунктаў і тэрыторый. На шасэйных дарогах і чыгунцы ўзрос рух ваеннага транспарту: фашысты перакідвалі свае апошнія рэзервы на фронт.

Давялося часта ўдакладняць абстаноўку на дарогах і маршруты транспарту. Павел Сегал з групай дэсантнікаў адправіўся за «языком». Ён павінен быў правесці разведку на дарогах з Тухоля да Свеце над Віслай. Падчас рэйда Павел арганізаваў засаду пры перакрыжаванні шасэйных дарог пад Малым Гацнам. Паказалася калона гітлераўцаў. Падпусціўшы яе бліжэй, партызаны адкрылі агонь з аўтаматычнай зброі. Сярод фашыстаў пачалася паніка, вельмі многа было забітых і параненых. Астатнія, не адстрэльваючыся, паспешліва ўцякалі.

Партызаны выбеглі з укрыцця, каб забраць у забітых дакументы і зброю. Калі над адным з іх нахіліўся Сегал, уяўны нябожчык выстраліў у яго з пісталета. Куля прабіла далонь Паўла. Хуткім рухам ён здаровай рукой схапіў гітлераўца за пісталет, з якога той спрабаваў стрэліць яшчэ раз. Немец аказаўся дужым і спрытным – пачалася валтузня, падчас якой фашыст здолеў стрэліць у камандзіра групы з яго асабістага аўтамата, але прамахнуўся. Тут падбег Мегер і аўтаматнай чаргой паклаў канец паядынку. Пасля вяртання на базу Паўла адправілі на лячэнне да Лу тко ўскіх, дзе ён быў акружаны цеплынёй і ўвагай. Яму давялося ампутаваць два пальцы, і гэту аперацыю ён правёў сам.

Імклівае наступленне Чырвонай Арміі і Войска Польскага набліжала вызваленне тэрыторый у раёне дзейнасці групы «Волга». Кожны дзень савецкія самалёты штурмавалі ўсё новыя цэлі, пра якія разведчыкі па рацыі паведамлялі ў Цэнтр. 26 студзеня пасля трохдзённых баёў быў вызвалены Быдгашч. Перад гэтым «Вірскі» вырашыў сабраць усіх разведчыкаў на базе і выслаў групу на чале з Францішкам Надольным з заданнем прывезці радыстку «Зою» і разведчыкаў, якія яе ахоўвалі. Другая група павінна была прывесці параненага Паўла Сегала, які лячыўся ў Лутkoўскіх.

Надольны і яго група прыехалі за радысткай на санях, запрэжаных нямецкім біцюгом: фурманка незадоўга перад гэтым была рэквізавана ў фашыстаў. На сані пагрузілі рацыю, пасадзілі «Зою», якую, як сваю родную, з плачам адпраўлялі ў дарогу родзічы Леона Песіка. Па дарозе Надольны ўручыў «Зоі» маленькі Вальтэр-7 з патронамі як падарунак ад камандзіра. «Зоя» выстраліла з яго некалькі разоў, каб праверць сваю зброю, і засталася задаволенай. Да бункера дабраліся без асаблівых прыгод: немцы былі ў паніцы і не так пільна ўжо неслі службу, тым больш што была ноч.

Цяпер усе разведчыкі сабраліся разам. «Зоя» ўключылася ў работу і з Юркам пачала перадаваць на Вялікую зямлю звесткі пра дыслакацыю і перамяшчэнне фашысцкіх войск. Дарогі былі запруджаны ваенным транспартам. Група разведчыкаў далажыла, што ў раёне чыгуначных станцый Чорная Вада – Чэрск – Шаламая сабралася многа цягнікоў з варожай жывой сілай і тэхнікай. Пуці былі «закарканы» да апошніх граніц. Адразу ж па рацыі перадалі гэтыя даныя ў Цэнтр. Вялікая

радасць агарнула разведчыкаў, калі наляцелі эскадры савецкіх штурмавікоў і пачалі бамбіць гэты транспарт...

...Ціхім лютаўскім ранкам партызан рабудзілі некалькі стрэлаў. Неўзабаве прыбег Леон Шмаглінскі, які перад гэтым адправіўся да Яжджэўскіх за прадуктамі. Ён убачыў гітлераўцаў і, прыкрываючыся будынкамі і густымі кустамі, вярнуўся на базу. Яго ніхто не праследаваў, і незаўважаным ён без перашкод прыйшоў у бункер. Пачуліся адчайныя крыкі з боку будынкаў Яжджэўскіх. «Вірскі» занепакоіўся і абвявіў баявую трывогу, загадаў падрыхтавацца да маршу, выставіць дазоры з мэтай назірання за мясцовасцю ў напрамку возера Смольнік.

Каля 11 гадзін дазоры заўважылі калону санных падвод, якія рухаліся па лясной дарозе. Дзень, поўны нервовага напружання, цягнуўся доўга. Вечарам «Вірскі» выслаў дазор з мэтай устанавіць прычыну крыкаў з сядзібы Яжджэўскіх, загадаўшы захоўваць асцярожнсць. Вярнуўшыся на базу, дазорныя паведамілі, што на світанні на сядзібу Яжджэўскіх прыехаў вялікі атрад эсэсаўцаў, выцягнулі ўсіх з ложкаў і патрабавалі ўказаць базу партызан. Гераічная сям'я Яжджэўскіх аднагалосна сцвярджала, што нічога пра партызан не ведае.

Раз'юшаныя гітлераўцы пачалі па чарзе біць усіх. Аднак ніхто нічога не сказаў. Дамачадцаў у адной бялізне выгналі на снег і старанна абшукалі ўсе будынкі і памяшканні. Нямецкія вырадкі бязлітасна збівалі жонку і дачок гаспадара. Урэшце акрываўленых жанчын эсэсаўцы пакінулі ў спакоі, а гаспадара пачалі біць прыкладамі карабінаў і палкамі, дамагаючыся пачуць ад яго,

дзе месца партызанскай базы. Калі Яжджэўскі траціў прытомнасць, аблівалі яго халоднай вадой і працягвалі допыт і катаванне. Яжджэўскі гераічна цярпеў і не выдаў партызанскай дыслакацыі, хаця выдатна пра яе ведаў. Не адкрылі гэтага сакрэту таксама яго жонка Марыя, дочкі, хаця не раз яны прыносілі ў бункер хлеб і добра ведалі, дзе ён знаходзіцца.

Акрываўленага, непрытомнага ад болю дзеда з паламанымі рукамі і нагамі палажылі ў сані і павезлі ў Чэрск. Па дарозе ён памёр і быў закапаны ў лесе пры дарозе Лясная Гута – Чэрск. Самая крыўднае, што загінуў гераічны патрыёт за некалькі дзён да вызвалення.

## НАПЕРАД, ДА ЛІНІІ ФРОНТУ

15 лютага былі вызвалены Тухоля і Хойніце, да базы партызан ужо даносіліся раскаты артылерыйскай кананады, радыё паведамляла пра вызваленне ўсё новых населеных пунктаў, і гэтыя назвы аказваліся ўсё бліжэй. «Вірскі» сабраў на кароткую нараду афіцэраў і сказаў:

– Фронт няўхільна набліжаецца да нашай базы. Да гэтага часу месца яе добра адпавядала і нашай бяспецы, і выкананню разведзадач. Але ў сувязі з наступленнем савецкіх і нашых войск фашысты могуць сканцэнтраваць у гэтым раёне, дзе праходзяць важныя камунікацыйныя шляхі, вялікія сілы і выкарыстаць дарогі як лініі абароны. Трэба неадкладна прыняць рашэнне пра далейшыя дзеянні. Якія будуць прапановы?

– Нам трэба падавацца на поўдзень, насустрач наступаючым часцям, усяляк пазбягаючы важнейшых дарог, – заўважыў «Віктар». – На поўнач ад нашай базы ў раёне лясніцтваў Лясная Гута і Бартэль Вялікі сканцэнтравана вялікая колькасць нямецкай пяхоты і артылерыі, і фашысты, каб забяспечыць свае тылы, могуць прачосаваць лясы і знайсці нашу базу.

– Пойдзем насустрач фронту вялікімі ляснымі масівамі, – прапанаваў Павел Сегал. – Але, можа, хтосьці з мясцовых партызан захоча застацца ў родных мясцінах і дачакацца вызвалення. І мы павінны даць ім такую магчымасць.

– Думка слушная, – згадзіўся «Вірскі». – Звесткі пра канцэнтрацыю варожых войск у лясніцтвах трэба неадкладна перадаць у Цэнтр. А з мясцовымі хлопцамі я пагавару сам.

Але гэтага не спатрэбілася: неўзабаве да «Вірскага» звярнуліся некалькі мясцовых партызан з просьбай вызваліць іх з атрада, бо яны вырашылі пайсці дадому і дачакацца ў сваякоў і родных вызвалення. Ім выдалі даведкі на рускай і польскай мовах, якія пацвярджалі іх знаходжанне ў партызанскім атрадзе пры дэсантнай групе разведчыкаў. «Вірскі» адпусціў іх да родных з той умовай, каб пасля вызвалення тэрыторый, дзе яны будуць знаходзіцца, яны з'явіліся да мясцовых улад і дапамагалі ім арганізоўваць адміністрацыйны апарат.

Радысты перадалі звесткі пра канцэнтрацыю фашысцкіх воінскіх часцей у Цэнтр і адначасова паведамілі пра рашэнне ісці да лініі фронту. «Вірскі» лічыў, што лепш было б перайсці лінію фронту большымі сіламі, і адправіўся да сваіх суседзяў-партызан з атрада «Шышкі». Хацеў прапанаваць

ім разам прабівацца на ўсход, а таксама расказаў пра канцэнтрацыю ворага непадалёку ад іх базы. Камандаванне атрада негатыўна паставілася да прапановы «Вірскага», спасылаючыся на тое, што атрымалі іншае заданне. Затое прапанову падпаручніка з радасцю прынялі разведчыкі 3-га Прыбалтыйскага фронта, якія доўгі час знаходзілася пры атрадзе «Шышкі».

Вечарам 22 лютага партызаны склалі свой няхітры скарб і сабраліся разам у бункеры, каб выслухаць загады камандзіра. Перад гэтым фурманку з санямі падарылі Кавалеўскаму са Студзеніц за дапамогу разведчыкам. «Вірскі» паглядзеў на таварышаў па зброі, крыху памаўчаў. Маланкава пранесліся малюнкі баявой дзейнасці, эпізоды нялёгкага змагання ў тыле бязлітаснага ворага, страты, што панеслі ў гэтай барацьбе. Ён з радасцю падумаў, што страт гэтых аказалася нямнога і што салдацкае шчасце часта спадарожнічала ім.

– Слухайце баявы загад! – урачыстым голасам вымавіў падпаручнік. – Выступаем неадкладна. Рухацца будзем калонай па адным. Наперадзе калоны на адлегласці 80–100 метраў ідзе трохасабовы дазор, у сярэдзіне асноўных сіл выступаюць дзяўчаты, радысты і параненыя – Мрочак, «Віктар» і Сегал. З тылу нас абараняе дазор з двух байцоў.

Такой паходнай калонай рушылі дарогай, што вяла лесам паблізу азярца Плашчкі да насыпу чыгуначнай лініі Хойніце – Тэзаў. Уздоўж чыгункі ішлі хуткім маршам да лагера атрада «Шышкі», каб забраць з сабою савецкіх парашутыстаў. На змярканні дасягнулі партызанскага лагера, адкуль, узмоцненыя групай савецкіх дэсантнікаў, рушылі

ўздоўж дарогі Студзеніц–Любік да аўтастрады, дзе затрымаліся на кароткі адпачынак у лесе, а патруль пайшоў на разведку па той бок аўтастрады.

Хутка разведка данесла, што дарога свабодная. Аўтастраду некалькімі групамі пераскочылі, выкарыстоўваючы хвілінныя перапынкі ў руху ваеннага транспарту. Захоўваючы ўсе меры асцярожнасці, памаршыравалі ў напрамку мясцовасці Зімняя Здроя, каб пераправіцца праз раку Чорная Вада па ўцалелым ужо добра знаёмым ім мосціку. Рэчку перайшлі без перашкод і накіраваліся да Шляхты. У гэтым раёне меркавалася перайсці праз лінію фронту. Таксама, як і цераз аўтастраду, асцярожна праскочылі чыгуначныя пуці Чэрск–Шляхта, Шлёнск – Гдыня і заляглі ў маладым густым лесе.

З боку вёсак Ліпова, Асечна, Асувак, Бэндзіміравіце выразна даносіўся водгалас баёў. На разведку адправілі Леона Песіка разам з двума партызанамі. Яго родзічы і сям'я жылі ў гэтай мясцовасці, у Шляхце. Пад раніцу разведчыкі вярнуліся з хлебам і кавай у бутэльках і далажылі, што напярэдадні вечарам нямецкія ўлады і аддзел ягдкаманды паспешліва пакінулі Шляхту. У раёне Класкавы заўважана канцэнтрацыя варожай артылерыі, а на шашы Чэрск–Слівіца – рух танкаў. «Вірскі» прыняў рашэнне застацца на месцы і пачакаць прыходу нашых войск.

Усе атрымалі загад захоўваць цішыню і асцярожнасць і толькі ў самым крайнім выпадку прымяняць зброю. Раніцай паблізу размяшчэння партызан праходзілі групы нямецкіх салдат, якія пра нябяспеку і не падазравалі. «Вірскі» загадаў агню не адкрываць. Цэлы дзень байцы пільна ўслухоўваліся ў адгалоскі страляніны. Пад вечар

над партызанамі пачалі пралятаць снарады. Ноччу артылерыйскі паядынак узмацнеў, снарады пачалі рвацца зусім блізка, чуваць былі загады на нямецкай мове адступаць.

Раптам хтосьці з партызан, аглядаючы на світанні прасеку, заўважыў некалькі постацей на адлегласці 600 метраў. З таго месца неўзабаве пачала страляць гармата. Нельга было, на жаль, нават з дапамогай бінокляў разгледзець яе абслугу, бо густыя кусты перашкаджалі. Але здавалася, што там былі савецкія салдаты. «Вірскі» загадаў выслаць дазорных, каб устанавіць ісціну. На чале з Надольным у разведку адправіліся «Мадзьяр» і адзін з савецкіх разведчыкаў з атрада «Шышкі». На ўсякі выпадак яны падрыхтавалі белую хустачку і незаўважна пайшлі ў бок гарматы. Нарэшце, махаючы хустачкай, адкрыта наблізіліся да гарматнага разліку. Гармата аказалася савецкай...

Так 24 лютага група «Волга» – партызаны і разведчыкі – перайшла лінію фронту. Сустрэча з савецкімі салдатамі была радаснай і сардэчнай. Доўга не затрымліваючыся, адкрытым маршам пайшлі ў напрамку чыгуначнай станцыі Ліпова Тухольская, дзе размяшчаўся камандны пункт савецкага генерала. «Вірскі» аддаў яму ўрачысты рапарт перад строем разведчыкаў і партызан, якія са зброяй стаялі ў дзвюх шарэнгах. Генерал павітаўся з байцамі. У адказ пачуліся нястройныя галасы: «Здравия желаем, товарищ генерал!», «Czolem, obywatelu!», «Czolem, panie generale!». Генерал у кароткай прамове падзякаваў разведчыкам за іх гераічную выніковую дзейнасць і сказаў, што кожны з іх у тыле ворага быў варты цэлага стралковага палка на фронце. Салдаты забяспечылі

партызан тытунём, накармілі з паходнай кухні, а «Вірскага» генерал запрасіў да сябе на кватэру, дзе пачаставалі сціплым салдацкім пачастункам. Тут падпаручнік паведаміў генералу шэраг разведданых, якія тычыліся паласы наступлення яго часцей, прапанаваў выкарыстаць у якасці праваднікоў і разведчыкаў сваіх байцоў. Па просьбе начальніка штаба «Вірскі» аддаў ім адну сваю рацыю.

У суправаджэнні афіцэра-сувязнога памаршыравалі да Сліваў, дзе ў асобым аддзеле пачалі ўстанаўліваць асобу кожнага з разведчыкаў і партызан. Тут запатрабавалі здаць зброю, але падпаручнік з гэтым не пагадзіўся. Ён пераканаў начальніка асобага аддзела ў слушнасці сваёй пазіцыі, і той згадзіўся пакінуць ім узбраенне пад поўную адказнасць камандзіра за парадак і дысцыпліну. «Вірскі» гэтага не баяўся, бо добра ведаў сваіх хлопцаў. Ім выдзелілі кватэры, паставілі на харчовае забеспячэнне і сказалі чакаць дакументаў.

Прайшлі два дні, а патрэбных дакументаў не было, як не было і адраса дыслакацыі паветранадэсантнага штурмавога батальёна – роднага падраздзялення разведчыкаў. «Вірскі» загадаў радысту выслаць у Цэнтр шыфроўку з негатыўнай ацэнкай далейшага чакання і бяздзейнасці. Назаўтра атрымалі шыфроўку, у якой паведамляўся адрас батальёна. Ледзьве Юрка расшыфраваў і далажыў падпаручніку змест тэлеграмы, яго выклікалі ў асобы аддзел, дзе прад'явілі прэтэнзіі, што ён без дазволу выкарыстаў рацыю. Хутка ўсё высветлілі, асабіст уручыў падпаручніку патрэбныя дакументы, і на гэтым сардэчна развіталіся. Адправіліся

ў дарогу з дэсантнікамі і Мегерам. Астатнія партызаны засталіся чакаць дакументаў.

У батальёне разведчыкаў радасна вітаў палкоўнік Таруньчык, ён уручыў Менткаму дакументы на званне паручніка і ўзнагароджанне Крыжам Грунвальда і савецкім ордэнам Чырвонай Зоркі. Адпаведныя ўзнагароды, у тым ліку «Крыж Валечных» («Крыж храбрых») і ордэны Чырвонай Зоркі, атрымалі ўсе разведчыкі...

...Неўзабаве пасля вяртання ў батальён гэта воінскае падраздзяленне разам з дывізіяй генерала Кіневіча пераўтварылі у новую часць пад назвай Корпус унутранай бяспекі. У ім служылі і многія парашутысты з групы «Волга», змагаючыся з украінскім бандамі і атрадамі нацыянал-сацыялістаў на вызваленай тэрыторыі сваёй ваеннай партызанскай дзейнасці.

Перад тым як паставіць апошнюю кропку ў гэтай аповесці, нельга не ўзгадаць гераічную сям'ю Яжджэўскага, якога за дапамогу партызанам закатавалі фашысцкія вырадкі. Пасля вайны яго магілу знайшлі ў лесе і перазахавалі яго на цвінтары. Народная ўлада і Войска Польскае пабудавалі для яго сям'і новы дом і ўручылі дыплом на вечнае карыстанне ім. Ва ўрачыстай цырымоніі прыняў удзел і палкоўнік Ян Менткі...

# Мы адкрыем імёны герояў...



...Пошукі працягваліся з вялікай інтэнсіўнасцю. Гэта работа захапляла ўсё большую колькасць старшакласнікаў, і тады камітэт камсамола стварыў агульнашкольны штаб чырвоных следапытаў. Краязнаўцы прынялі рашэнне не толькі шукаць падрабязныя звесткі пра Героя Савецкага Саюза **Б. С. Акрэсціна,** чыё імя носіць школа, але і ўстанавіць імёны і месцы подзвігу лётчыкаў, якія загінулі ў беларускім небе падчас Вялікай Айчыннай вайны і лічыліся прапаўшымі без вестак, адшукаць іх родных і аднапалчан...



– Рыгор Ціханавіч! Ну што рабіць з гэтымі прагульшчыкамі? Зноў збеглі з урокаў, – у голасе настаўніцы чуліся ноткі адчаю.

Дырэктар 65-й мінскай школы Сівакоў уважліва паглядзеў на кіраўніка 5-га класа і перавёў строгі погляд на трох вучняў, што з апушчанымі галовамі застылі дя дзвярэй дырэктарскага кабінета. Ён пазнаў самых актыўных удзельнікаў школьнага турыстычна-пошукавага клуба, якія неаднойчы хадзілі з ім у паходы, адкрывалі і вывучалі старонкі гераічнага мінулага, імкнуліся вярнуць гісторыі імёны невядомых герояў.

Турыстычна-пошукавы клуб у школе арганізаваў сам Рыгор Ціханавіч, былы франтавік, адстаўны афіцэр-артылерыст. Напэўна, вялікую прагу да адкрыццяў заклаў ён у юных душах вучняў, што яны з-за дапытлівасці збягаюць з урокаў. Усвядоміўшы гэта,дырэктар не стаў сурова ўшчуваць пяцікласнікаў, а, звярнуўшыся да настаўніцы, заўважыў:

– Вось сапраўды, нашы недахопы – працяг нашых добрых якасцей, – усміхнуўся дырэктар і прапанаваў прысутным прысесці да стала. – Ну, дзе вы прападалі цяпер?

Вучні моўчкі паглядалі на Рыгора Ціханавіча, і адзін з іх нясмела вымавіў:

– Мы зноў былі на Ваенных могілках ля помніка Барысу Акрэсціну.

– Што цікавага ўбачылі вы на тым помніку? Граніт як граніт, – сваім абыякавым тонам ён хацеў схіліць вучняў да шчырасці. І задума ўдалася.

– Нас зацікавіў не граніт, а подпіс на ім, – прамовіў адзін з хлопчыкаў. – Атрымліваецца, што лётчыку на момант гібелі споўніўся толькі 21 год, а ён быў ужо Героем Савецкага Саюза. Вось бы падрабязна даведацца пра яго подзвігі!

– Ну што ж, гэта і будзе новай задачай нашага пошукава-турыстычнага клуба, – прамовіў Рыгор Ціханавіч. – А цяпер – на ўрок і больш не прагульвайце. Пасля заняткаў разам складзём план пошукаў.

## ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

Пачаліся пошукі. Па многіх адрасах адправілі пісьмы з запытамі пра Барыса Сямёнавіча Акрэсціна. Неўзабаве прыйшлі адказы з музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і архіва Савецкай Арміі ў Падольску. Потым пачаўся пошук аднапалчан і родных Акрэсціна. Следапыты сабралі пісьмы, асабістыя рэчы, успаміны родных і баявых сяброў-аднапалчан пра адважнага лётчыка. Камсамольцы наведалі родных Героя ў Маскве, пагутарылі з яго маці – Пелагеяй Іванаўнай, пабывалі ў воінскай часці, дзе ён служыў...

...Школу абляцела радасная вестка: на сустрэчу з вучнямі прыбываюць баявыя сябры Барыса Акрэсціна – Героі Савецкага Саюза палкоўнікі

ў адстаўцы П. Р. Калеснікаў і І. П. Фанароў. Поўная зала гудзела дзіцячымі галасамі. Спакойным заставаўся толькі ганаровы каравул, выстраены для сустрэчы дарагіх гасцей. Паказалася прадстаўнічая дэлегацыя на чале з Рыгорам Ціханавічам. За ім ішлі ветэраны вайны – адважныя сокалы з Залатым Зоркамі на грудзях, прадстаўнікі раённага аддзела асветы, райкамаў партыі і камсамола, ваеннай часці – 1-й Сталінградскай гвардзейскай авіядывізіі, у якой ваяваў Барыс Сямёнавіч.

– Вы, дарагія дзеці, робіце пачэсную і высакародную справу, адкрываючы невядомыя для маладога пакалення старонкі жыцця і подзвігу герояў мінулай вайны, – пачаў свой аповед адзін з гасцей чырвоных следапытаў. – Гэта вельмі патрэбна, бо многія родныя загінуўшых на фронце не ведаюць падрабязнасцей подзвігу сваіх блізкіх, а часта ім невядомы і месцы іх пахавання.

– Мы ваявалі ў 74-м гвардзейскім авіяпалку, які носіць ганаровае званне Сталінградскі, – працягваў ветэран. – Сюды, пад асаджаны гераічны горад, у верасні 1942 года і прыбыў былы інструктар аэраклуба. Яго залічылі ў лёгкабамбардзіровачны полк начной авіяцыі. «Начнікі» лawalі на фанерных ціхаходных безабаронных аэрапланах, «хадзілі» літаральна па галовах фашыстаў і кідалі на іх бомбы і запальваючыя ампулы. Немцы абстрэльвалі нашых пілотаў усім, што было пад рукой. Дзевятнаццацігадовы малодшы сяржант Акрэсцін праз два месяцы атрымаў першую ўзнагароду – ордэн Чырвонай Зоркі. Трэба зазначыць, што сам Барыс не навучаўся ў лётнай школе ці вучылішчы. Ён закончыў толькі аэраклуб, выдатна асвоіў тут

спецыяльнасць авіятэхніка, а потым і пілота і пры тым паказаў такое майстэрства, што яго прызначылі інструктарам.

– Відаць, праявіліся ў хлопца прыродныя здольнасці, бо сапраўды быў ён непераўзыдзеным лётчыкам, як кажуць, ад Бога. Не было яму роўных у нашым гвардзейскім палку, куды перавялі яго пасля таго, як ён асвоіў штурмавік «Іл-2», які ён асабіста атрымаў і вывучыў на заводзе. І гэта аказалася для Акрэсціна лёгкай справай: хлопец меў здольнасці да тэхнікі, выдатна ведаў кожную дэталь, кожны вузел складанай машыны. Дададзім сюды яго прыродную абаяльнасць, высокі рост, светла-русую прычоску, здольнасці мастака і шахматыста, чэмпіёнства па плаванні і па гарадках – і партрэт Барыса Акрэсціна будзе амаль завершаны. Удача і баявое шчасце таксама спадарожнічалі гэтаму маскоўскаму хлопцу. Не дзіўна, што неўзабаве атрымаў ён афіцэрскае званне і стаў самым маладым камандзірам эскадрыллі.

– Служыць пад камандаваннем Акрэсціна лічылася вялікім гонарам і ўдачай, – з захапленнем расказваў І. П. Фанароў. – А таму, што ў яго эскадрыллі страты былі мінімальныя і нават пасля самых складаных штурмовак самалёты як загавораныя вярталіся на аэрадром без сур'ёзных пашкоджанняў. Не дзіўна, што пра выдатнага штурмавіка складалі легенды. У Сталінградскай бітве Барыс Акрэсцін зрабіў 300 баявых вылетаў, пасля ўдзельнічаў у вызваленні многіх гарадоў Украіны і Беларусі. На жаль, ён і загінуў тут, пад Мінскам 6 ліпеня 1944 года, штурмуючы скапленне варожых войск, якія спрабавалі вырвацца з мінскага катла. Наш аднапалчанін здзейсніў тут бессмяротны подзвіг...

Пасля гэтай памятнай сустрэчы пошукі працягваліся з вялікай інтэнсіўнасцю. Гэта работа захапляла ўсё большую колькасць старшакласнікаў, і тады камітэт камсамола стварыў агульнашкольны штаб чырвоных следапытаў. Краязнаўцы прынялі рашэнне не толькі шукаць падрабязныя звесткі пра Барыса Сямёнавіча, але і ўстанавіць імёны і месцы подзвігу лётчыкаў, якія загінулі ў беларускім небе падчас Вялікай Айчыннай вайны і лічыліся прапаўшымі без вестак, адшукаць іх родных і аднапалчан...

...На перапынку паміж урокамі група хлопчыкаў зноў, у каторы ўжо раз прыйшла да помніка маладому Герою. Задумліва гледзячы на твар лётчыка, адзін са старшакласнікаў заўважыў:

– А ён жа гераічна загінуў амаль у нашым узросце...

– Так, Акрэсцін зусім не намнога старэйшы за нас. І я часта думаю, ці змаглі б мы паступіць у той сітуацыі падобным чынам, як ён.

– Ну, цяпер няма такой сітуацыі, а вось стаць пілотам, служыць у праслаўленым гвардзейскім палку, у якім ваяваў Акрэсцін, цалкам магчыма.

– Ці не збіраешся ты ў лётнае ваеннае вучылішча? – запытаў аднакласнік. – Ведаеш, Дзімка, як цяжка паступіць туды, якія веды і, галоўнае, здароўе трэба мець!

– Ну што ж, я паспрабую. Буду займацца спортам, засяду за падручнікі. Калі вельмі хочаш і імкнешся да мэты – удача прыйдзе. Яна заўсёды прыходзіць да настойлівых, – заключыў размову Дзіма Тэндзітнікаў...

Прайшлі тры гады настойлівых пошукаў. Следапыты 65-й школы заняліся пошукамі іншых

гераічных экіпажаў лётчыкаў, якія загінулі ў беларускім небе і заставаліся пакуль невядомымі. За патрыятычную справу па хадайніцтве камандуючага Беларускай ваеннай акругі Савет Міністраў БССР у кастрычніку 1966 года прысвоіў 65-й сярэдняй школе імя Героя Савецкага Саюза Барыса Сямёнавіча Акрэсціна. І адна са сталічных вуліц атрымала яго імя. Значна папоўніліся стэнды школьнага музея рэвалюцыйнай і баявой славы, які па ініцыятыве Рыгора Ціханавіча Сівакова арганізавалі ў школе.

З выпадку гэтай падзеі віншавальную тэлеграму следапыты атрымалі ад камандавання воінскай часці, у якой служыў Герой Савецкага Саюза Барыс Акрэсцін:

*«Дарагія акрэсцінцы – вучні сярэдняй школы № 65! Віншуем вас з адкрыццём музея рэвалюцыйнай і баявой славы! Няхай рэвалюцыйныя і ратныя традыцыі бацькоў, іх гераічныя подзвігі будуць для вас заўжды натхняючым прыкладам, сімвалам беззапаветнай любові да Радзімы!*

*Камандзір вайсковай часці, начальнік палітупраўлення».*

На савеце штаба чырвоных следапытаў па ініцыятыве юных краязнаўцаў вырашылі ўстанавіць у школьным двары помнік Барысу Акрэсціну. І вучні, увесь педкалектыў занялiся зборам металалому, макулатуры, сталі працаваць у Батанічным садзе Акадэміі навук і ўсе сродкі пералічвалі на асобны рахунак. Школе дапамагалі бацькі вучняў, скарбонка з кожным днём папаўнялася. Школьнікі сабралі 150 тон металалому, і трактаразаводцы выраблі з іх 30 машын.

І вось настаў урачысты дзень адкрыцця помніка. У школу прыехалі маці Героя – Пелагея Іванаўна, аднапалчане і баявыя сябры Барыса Сямёнавіча – Героі Савецкага Саюза Калеснікаў, Фанароў, Глебаў, прадстаўнікі авіяпалка, дзе служыў Акрэсцін, ветэраны Вялікай Айчыннай, шэфы – маракі Балтыкі. З вялікай увагай слухалі прысутныя расказы аднапалчан – баявых сяброў Героя. На ўрачыстым мітынгу прагучала клятва чырвоных следапытаў перад маці Героя Пелагеяй Іванаўнай жыць і змагацца, любіць Радзіму так, як Барыс Акрэсцін...

## «З БАЯВОГА ЗАДАННЯ НЕ ВЯРНУЎСЯ...»

Пошукавая работа між тым не спынялася нават на месяц. У ёй сталі ўдзельнічаць амаль усе старшакласнікі і некаторыя вучні малодшых класаў. Следапыты імкнуліся адшукаць побач з новымі звесткамі пра свайго Героя і звесткі пра іншых, пакуль што безымянных лётчыкаў, якія загінулі ў беларускім ваенным вогненным небе, пра іншых невядомых удзельнікаў баёў на тэрыторыі Беларусі. Цікавая навіна прыйшла з Магілёўшчыны. Адтуль паведамлялі пра трагедыю, якая адбылася падчас вайны ля возера Сіняе. Тут, у возеры, загінуў экіпаж савецкага танка, і следапыты адправіліся ў чарговы пошук. Запрасілі прыняць удзел у ім вадалазаў, спецыялістаў глабакаводнага пагружэння з дапамогай амфібіі.

З вялікай нецярплівасцю следапыты чакалі вынікаў падводных пошукаў. А яны аказаліся нечаканымі: танк знайсці не ўдалося, яго, напэўна,

глыбока занесла ілам, а вадалазы дасталі са дна... крылы самалёта-бамбардзіроўшчыка! І адразу ж узніклі пытанні: хто былі лётчыкі, як яны загінулі, ці ведаюць родзічы пра іх подзвіг? Магчыма, і амаль праз 30 гадоў яны – усё яшчэ без вестак прапаўшыя. Пачалі распытваць мясцовых жыхароў-старажылаў, настойліва стараліся адшукаць іншыя фрагменты самалёта. І пошукі аказаліся паспяховымі: непадалёку ад пасёлка Гіжня ў балоце знайшлі рэшткі скараснога бамбардзіроўшчыка. І зноў – новыя пытанні: хто яны, героі неба?

Дапамаглі відавочцы. Па іх расказах была адноўлена падрабязная карціна трагічнага бою, які адбыўся тут у адзін з ліпеньскіх вечароў 1941 года. На савецкі бамбардзіроўшчык напалі ажно пяць «месераў». Але экіпаж чырваназорага самалёта прыняў няроўны бой і першым пайшоў у атаку. Ад яго кулямётнага і гарматнага агню ўспыхнуў адзін варожы сцярвятнік, на кавалкі разваліўся другі. І хаця пад варожымі прыцэльнымі стрэламі загарэўся і наш бамбардзіроўшчык, яго стралок да апошняга працягваў страляць з кулямёта.

На месцы падзення бамбардзіроўшчыка пры раскопках следапыты знайшлі астанкі двух лётчыкаў. Без сумнення, гэта і былі пакуль безыменныя героі, якія вялі той няроўны паветраны паядынак.

Прыступілі да аналізу знойдзеных рэчаў і дакументаў. На шчасце, нядрэнна захавалася кандыдацкая картка на імя Фёдара Андрэевіча Сылкі, яго камсамольскі білет, пасведчанне на медаль «За адвагу» ўдзельніка баёў на Хасане ў 1938 годзе, а таксама кавалак палётнай карты з паметкай: «Рослаў – р. Днепр» (відаць, баявы маршрут).

Астанкі лётчыкаў урачыста пахавалі на цэнтральнай сядзібе мясцовага саўгаса «Наватар», а ўсе дакументы вучні прывезлі ў школьны музей і неадкладна заняліся пошукам родных і аднапалчан Ф. А. Сылкі. І цяпер штаб чырвоных следапытаў і камітэт камсамола вялі яго па розных азімутах. На дапамогу вучням прыйшлі карэспандэнты газет. Была рэстаўрыравана, адноўлена і надрукавана ў «Советской Белоруссии» фатаграфія лётчыка, якая захавалася на камсамольскім білеце. Неўзабаве адгукнуліся многія баявыя сябры Фёдара Андрэевіча, прыслалі пісьмы яго родныя.

З архіва Узброеных Сіл СССР і ўспамінаў яго аднапалчан стала вядома, што ў тым апошнім палёце разам са старшыной Фёдарам Сылкам былі камандзір авіяэскадрыллі капітан Міхаіл Нікалаеў і штурман эскадрыллі старшы лейтэнант Іван Багатыроў. Дакументы, пісьмы аднапалчан і родных гераічнага экіпажа склалі асобны стэнд школьнага музея баявой славы. А што значыць кожны экспанат для родных загінуўшых герояў, напісала ў ленінградскай газеце «Ленінскія іскры» дачка І. П. Багатырова – Ліна Багатырова.

*«З дзяцінства,* – піша Ліна Іванаўна, – *над маім пісьмовым сталом вісіць фотаздымак маладога лётчыка. Светлыя валасы, адкрыты погляд, ледзь прыкметная ўсмешка. Гэта мой бацька – старшы лейтэнант Іван Паўлавіч Багатыроў. На жаль, жывым я яго не памятаю. Была зусім маленькай, калі летам 1941 года маме прынеслі пахавальную: "...загінуў смерцю храбрых..." Дзе? Пры якіх абставінах? Маўчыць простая паперка. Не можа нам з мамай адказаць. І на працягу доўгіх 29 гадоў ніхто не мог нам расказаць, дзе і як загінуў бацька.*

*Але аднойчы, зусім нядаўна, у нашу кватэру пазванілі. Адчыніла дзверы. На парозе – крыху збянтэжаныя дзеці.*

*– Нам хацелася б убачыць каго-небудзь са сваякоў лётчыка Багатырова.*

*Гэта былі чырвоныя следапыты мінскай школы № 65. Яны дасталі невялікі пакецік. Беражліва разгарнулі... І мы ўбачылі ўвесь нечым перакручаны партсігар. Мама прыціснула яго да шчакі і пабялела. Ледзь чутна яна запытала:*

*– Адкуль у вас гэта рэч, дзеткі? Гэта ж партсігар майго мужа.*

*Той вечар мне запомніўся на ўсё жыццё. Насупраць нас сядзелі вучні. Мы з імі пазнаёміліся ўсяго гадзіну таму, але гэта ўжо былі мне як браты і сёстры. Яны столькі ведалі пра бацьку. Пра ўвесь экіпаж бамбардзіроўшчыка. Бо яны разам з дарослымі паднялі з чатырохмятровай глыбіні рэшткі самалёта, знайшлі асабістыя рэчы лётчыкаў. І самае галоўнае: па ўспамінах мясцовых жыхароў аднавілі карціну бою, што праходзіў над вёскай Гіжня 29 гадоў таму...»*

Гэта сустрэча ў горадзе-героі на Няве глыбока ўразіла і чырвоных следапытаў. Вось як напісалі яны пра сваю паездку ў Ленінград у справаздачы савету музея:

*«З якім хваляваннем мы ўваходзілі ў дом, дзе жыў герой. Мы першыя паведамілі жонцы і дачцэ героя пра подзвіг і лёс дарагога ім чалавека. Якая гэта была хвалюючая сустрэча, пра яе нельга забыць! Марыя Апанасаўна – жонка героя і яе дачка Ліна Іванаўна зноў і зноў прасілі нас паўтарыць расказ, а затым многае паведамілі пра свайго мужа і бацьку, падарылі для школьнага музея яго даваенныя фотаздымкі і асабістыя рэчы».*

...І зноў паходы па родным краі, па месцах цяжкіх баёў, па месцах партызанскіх засад, тайных стаянак і ўмацаваных лагераў, аналіз пісьмаў і паведамленняў з розных куткоў краіны. У чарговым паходзе па Віцебшчыне следапыты з аповеда старажылаў пачулі хвалюючую гісторыю пра бой шасцёркі штурмавікоў з фашысцкімі зенітчыкамі над умацаваным немцамі гарадскім пасёлкам Багушэўскам. Вяртаючыся з баявога задання, грозныя «Ілы» трапілі пад шквальны агонь замаскіраванай варожай зенітнай батарэі. Адзін штурмавік адразу ўзарваўся ў паветры, другі развярнуўся і ўступіў у схватку. У глыбокім піке ён адкрыў агонь з усіх відаў зброі. Ад разрыву варожага снарада «Іл» упаў літаральна ў некалькіх метрах ад зеніткі і патануў у балоце.

На месцы падзення штурмавіка вырас лес, і дакладнае месца трагедыі не маглі назваць нават мясцовыя жыхары. Следапыты пачалі пошук у навакольнай мясцовасці з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў. Нарэшце на васьміметровай глыбіні ў балоцістым лесе знайшлі самалёт. Раскапаўшы глебу, яны ўбачылі «стальнога птаха», але рабіць далейшыя раскопкі не рызыкнулі: меркавалі, што ў машыне могуць застацца боепрыпасы. Таму вучні напісалі пісьмо камандуючаму ваеннай акругі генерал-палкоўніку Траццяку з просьбай аказаць дапамогу ў далейшым пошуку.

«Выказваю ўдзячнасць чырвоным следапытам вашай школы за работу па ўвекавечванні памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны», – напісаў у заключэнні пісьма камандуючы, паведаміўшы, што начальніку Віцебскага гарнізона даручана аказаць

дапамогу пры раскопках і ў пошуку дакументаў загінуўшых лётчыкаў. Хутка ў Багушэўску з'явіліся вопытныя сапёры. Дырэктар мясцовай гаспадаркі выдзеліў экскаватар, а дзясяткі мясцовых жыхароў прыйшлі прапанаваць сваю дапамогу. З вялікай асцярогай самалёт паднялі на паверхню і знайшлі ў ім астанкі лётчыка і яго дакументы.

Адкрылі партыйны білет і прачыталі прозвішча героя: Гарбуноў Уладзімір Міхайлавіч. У партбілеце ляжаў складзены лісток паперы. На ім простым алоўкам быў пазначаны спіс асабовага саставу звяна, падпісаны лейтэнантам Гарбуновым. Добра захаваліся ў спісе прозвішчы лётчыкаў, і іх можна было лёгка прачытаць. Знайшлі і запісную кніжку лётчыка-інструктара, якая засталася ў Гарбунова яшчэ з вучылішча. У ёй таксама прачыталі паметкі, зробленыя алоўкам. Уважліва вывучылі следапыты адрасы з запісной кніжкі. Звярнулі ўвагу на запіс: «П\п 40341 Гарбуновай З. М.» Вырашылі, што гэта, магчыма, адрас жонкі, але аказалася, што ў гэтай часці ваявала родная сястра Уладзіміра Міхайлавіча.

Зацікавіў вучняў і яшчэ адзін адрас з запісной кніжкі: «Саратаў, вул. Горкага, 116, Гарбунова Антаніна Андрэеўна». Напісалі пісьмо на гэты адрас, але адказу не дачакаліся. Тады па тэлефоне звязаліся з Саратаўскім аблваенкаматам і папрасілі ўстанавіць і знайсці родных героя. І адказ неўзабаве прыйшоў, але не з Саратава, а з Астрахані: райваенкам паведаміў, што члены сям'і Уладзіміра Міхайлавіча выязджаюць у Багушэўск, на месца гібелі лётчыкаў.

А да гэтага часу следапыты ўстанавілі імя і другога лётчыка, якога пры падзенні бамбар-

дзіроўшчыка адкінула ўбок. Яго астанкі знайшліся на самым дне катлавана. Гэта аказаўся стралок экіпажа, пры ім сярод іншых рэчаў было і пісьмо на імя Чарвова Івана Ягоравіча. А менавіта такое прозвішча было пазначана ў спісе асабовага саставу звяна з паметкай «стралок камандзірскай машыны». Так з небыцця адкрыліся імёны членаў экіпажа, якія 25 гадоў лічыліся прапаўшымі без вестак.

...З самай раніцы ў Багушэўск збіраліся людзі з навакольных вёсак, амаль з усяго Сенненскага раёна, каб ушанаваць памяць герояў-лётчыкаў, аддаць ім апошнюю даніну павагі, пакланіцца маці У. М. Гарбунова – 85-гадовай Пелагеі Яфімаўне, яго дачцэ і дзвюм сёстрам, якія таксама прыехалі на ўрачыстасць. Уздоўж галоўнай вуліцы пасёлка выстраіліся дарослыя і дзеці, перад траурнай працэсіяй піянеры пасыпалі апошні шлях герояў жывымі кветкамі.

У парку на траурным мітынгу сакратар райкама партыі зачытаў рашэнне райкама і райвыканкама аб занясенні навечна ў Кнігу народнай славы раёна лётчыкаў-герояў У. М. Гарбунова і І. Я. Чарвова. Старшыня выканкама пасялковага Савета абвясціў пастанову аб прысваенні адной з вуліц пасёлка імя Гарбунова. Маці героя ўдастоена звання ганаровай грамадзянкі Багушэўска, ёй перадалі шкатулку з зямлёй з месца гібелі сына.

Пад гукі дзяржаўнага гімна і залпы салюту урны апускаюць у магілу, урачыстым маршам праходзяць воіны ганаровага каравула і чырвоныя следапыты. Да іх са слязьмі ўдзячнасці і вялікага душэўнага ўзрушэння звярнулася Пелагея Яфімаўна:

– Дарагія мае! Праз столькі гадкоў знайшлі вы майго сыночка, па якім я выплакала не адну ноч! Вялікі вам і вашым настаўнікам дзякуй! – гаварыла яна, абдымаючы следапытаў.

– Я ні разу не бачыла бацьку, не чула яго роднага голасу, – гаварыла вучням дачка героя Людміла Уладзіміраўна. – Дзякуючы вам я магу цяпер наведваць яго магілу і ведаць, што загінуў ён па-геройску.

Родныя Гарбунова расказалі многа цікавых падрабязнасцей пра яго даваеннае жыццё, пра высокія маральныя якасці Уладзіміра Міхайлавіча. Гэтыя аповеды дапоўнілі і радкі пісьмаў, што былі атрыманы ў адказ на запыты школьнікаў, якія яны адправілі на адрасы з запісной кніжкі камандзіра звяна штурмавікоў. Вось што напісаў з Арэнбурга А. І. Шышоў:

*«Дарагія чырвоныя следапыты! Дзякуючы вашай рабоце стала вядома месца гібелі майго баявога камандзіра лейтэнанта У. М. Гарбунова і яго паветранага стралка І. Я. Чарвова.*

*З Уладзімірам Міхайлавічам мы пазнаёміліся ў Чкалаўскім вучылішчы лётчыкаў, дзе працавалі інструктарамі. Ён быў вопытным лётчыкам, лятаў на многіх тыпах машын, выдатна валодаў баявым самалётам Іл-2. За час работы ў вучылішчы навучыў лётнаму майстэрству некалькі дзясяткаў курсантаў, якія пасля грамілі фашысцкіх захопнікаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У жыцці Уладзімір быў сціплым, чулым чалавекам, верным сябрам. На службе – патрабавальным, справядлівым камандзірам.*

*Бліжэй з ім мы пазнаёміліся ў студзені 1944 года, калі ў саставе групы лётчыкаў вучылішча адправіліся*

*на фронт на баявую стажыроўку. Мы з Уладзімірам трапілі ў 624-ы штурмавы авіяцыйны полк. Баявое хрышчэнне атрымалі над возерам г. Ідрыца. Пасля заканчэння тэрміну стажыроўкі па хадайніцтве лётчыкаў уся група была пакінута ў дзеючай арміі.*

*З пачаткам Беларускай аперацыі, у чэрвені 1944 года, наш полк знаходзіўся ў бесперапынных баях. Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, лётчыкі рабілі па 2–3 і больш баявых вылетаў у дзень. Больш як 10 баявых вылетаў зрабіў у гэтыя дні і камандзір звяна У. М. Гарбуноў і паказаў сябе храбрым, мужным і ўмелым паветраным байцом. Пад вечар 24 чэрвеня полк атрымаў загад на знішчэнне групоўкі войск захопнікаў у раёне Багушэўска.*

*Група ў саставе 16 самалётаў Іл-2 (у тым ліку і звяно лейтэнанта Гарбунова, а я ляцеў з ім у пары) вышла на заданне. Пры падыходзе да цэлі група была сустрэта моцным зянітным агнём праціўніка. Пераадолеўшы паласу разрываў, мы спікіравалі. Бомбы, агонь пушак, кулямётаў абрынуліся на ворага. Перастроіўшыся ў баявы парадак "левы круг", група пачала парамі штурмаваць адступаючую калону, расстрэльваючы фашыстаў, якія разбягаліся.*

*На другім заходзе ў момант пераходу ў атаку (у гушчыні разрываў зенітных снарадаў) самалёт камандзіра раптам рэзка нахіліўся, развярнуўся ў мой бок (я знаходзіўся справа метраў за 20–30) і знік пад маім самалётам. Вядучы ззаду спікіраваў за камандзірам. Мы некалькі дзён чакалі вяртання таварышаў. Але яны не вярнуліся...*

*У ходзе баёў за Беларусь лётчыкі палка адпомсцілі за смерць сваіх баявых сяброў. За паспяховыя баявыя аперацыі пры вызваленні Оршы, Віцебска,*

*Мінска і Маладзечна нашаму палку прысвоілі назву "Маладзечанскі"».*

Пры абмеркаванні пісьма на пасяджэнні савета школьнага музея хтосьці са следапытаў звярнуў увагу на тую частку пісьма, дзе гаварылася, што за камандзірскім штурмавіком спікіраваў яшчэ адзін самалёт, і ён таксама не вярнуўся на аэрадром.

– Значыць, праўду казалі жыхары Багушэўска, калі сцвярджалі, што ў той дзень загінулі два экіпажы, два штурмавікі. Трэба працягваць пошукі, тым больш што яны ведаюць і магілу другога экіпажа, – вырашыў старшыня савета.

Некаторыя адрасаты з запісной кніжкі камандзіра звяна У. М. Гарбунова не толькі адгукнуліся на пісьмы следапытаў, але і прыехалі ў школу. У гасцях у настаўнікаў і вучняў пабывалі яго аднапалчане В. А. Анцух і А. І. Літаў. Баявыя сябры расказалі пошукаўцам пра абодва экіпажы, якія ў той дзень не вярнуліся з баявога задання. Другім быў самалёт, які пілатаваў лейтэнант Хаміні́ч. Каб удакладніць прозвішча другога члена экіпажа, госці параілі звярнуцца да былога камандзіра эскадрыллі Героя Савецкага Саюза А. Пуціна.

Неўзабаве адшукалі адрас Героя, які жыў у Разані. Ён і паведаміў школьнікам, што 24 чэрвеня 1944 года сам не вылятаў на баявое заданне, а эскадрыллю вёў яго намеснік лейтэнант Гарбуноў. З налёту на Багушэўск экіпажы лейтэнантаў У. М. Гарбунова і Л. М. Хамініча не вярнуліся, а штурмавікі, якія прыляцелі, далажылі, што самалёт Хамініча загарэўся ў паветры і ўзарваўся, напэўна, у яго трапіў варожы снарад. А прозвішча другога

члена экіпажа Пуцін не назваў, магчыма, за даўніной гадоў не змог прыпомніць. Прыйшлося звярнуцца ў ваенны архіў у Падольску. Адтуль прыйшоў кароткі адказ:

*«24 чэрвеня 1944 года з баявога задання ў напрамку г. п. Багушэўска не вярнуліся самалёты лётчыка Уладзіміра Міхайлавіча Гарбунова і стралка сяржанта Івана Ягоравіча Чарвова, лётчыка Лукі Макаравіча Хамініча і паветранага стралка Васіля Дзмітрыевіча Каракоўцава».*

Так і гэта тайна была раскрыта, і яшчэ адна магіла перастала быць безыменнай, а школьны музей папоўніўся новымі экспанатамі...

...У 1974 годзе школа пераехала на новае месца, у новы будынак. Да гэтага часу першыя следапыты закончылі вучобу і разляцеліся нібы птушкі па вялікай краіне. Дзмітрый Тэндзітнікаў дабіўся сваёй мэты: стаў пілотам у 74-м авіяпалку, лятаў на «МіГ-17», а неўзабаве, як і Барыс Акрэсцін, камандаваў там эскадрылляй. І калі вырашылі не проста перанесці помнік Акрэсціну да новага памяшкання школы, а адкрыць у прасторным школьным двары мемарыял, прысвечаны экіпажам лётчыкаў, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі, сталі хадайнічаць парад камандаваннем Беларускай ваеннай акругі аб перадачы ад шэфаў самалёта, на якім лятаў выпускнік школы акрэсцінец Дзмітрый Тэндзітнікаў. Хадайніцтва падтрымаў камандуючы авіяцыі БВА двойчы Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік Леанід Бяда.

Мемарыял стваралі амаль чатыры гады, і 6 лістапада 1977 года ён быў урачыста адкрыты. Яго аўтарамі сталі архітэктар Есьман, скульптар Памяйчук, бюст Барыса Акрэсціна выканаў скульп-

тар Палякоў. Мемарыял складаецца з двух частак: уімклівым узлёце набірае вышыню самалёт «МіГ-17», крыху воддаль у неба ўзнімаецца вастраканечная стэла, ля падножжа якой выліта металічная пяцікандовая зорка з імёнамі загінуўшых лётчыкаў, выбітымі на яе гранях. Іх у настойлівым пошуку адкрылі і вывелі з небыцця чырвоныя следапыты 65-й мінскай школы.

Праз два гады за вялікую краязнаўчую работу і ўзорнае патрыятычнае выхаванне вучняў школа стала ўдзельніцай Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве. Але на той час, на жаль, пайшоў з жыцця Рыгор Ціханавіч Сівакоў, пакінуўшы нашчадкам сваю кнігу-даследаванне «Героіка- патрыятычнае выхаванне школьнікаў», якая лягла ў аснову яго кандыдацкай дысертацыі. Новы кіраўнік педкалектыву Юльян Юльянавіч Сіліч і ўзначаліў дэлегацыю школы на ВДНГ. Адтуль настаўнікі і вучні прывезлі сярэбраныя медалі. Высокая ацэнка і прызнанне вынікаў патрыятычнай дзейнасці педагагічнага і вучнёўскага калектыву школы натхнялі на новыя пошукі.

## ПРАЗ 66 ГАДОЎ: АПОШНЯЯ КРОПКА

Пошукі новых звестак пра Барыса Акрэсціна, пасля таго як школа стала насіць яго імя, працягваліся з яшчэ большай настойлівасцю. Збіраючы па крупінках матэрыялы, краязнаўцы адкрывалі новыя рысы яго характару, новыя старонкі яго біяграфіі, новыя грані баявога майстэрства свайго Героя.

Так, было ўстаноўлена, што Барыс Сямёнавіч пасля Крымскай аперацыі атрымаў амаль імянны самалёт, які ён выбраў сам на Куйбышаўскім авіязаводзе № 18, адкуль 74-ы полк пераганяў новыя штурмавікі для ўсёй дывізіі. Тут Акрэсціну прыглянуўся самалёт пад № 9299 з магутным фарсіраваным рухавіком АМ-38Ф. Якасці гэтага рухавіка і ўсяго самалёта прыйшліся даспадобы былому авіятэхніку, а цяпер пілоту-асу. Менавіта на гэтым штурмавіку і ўступіў Барыс Акрэсцін у аперацыю «Баграціён». І тут ён паказаў высокае снайперскае майстэрства.

26 чэрвеня Акрэсцін атрымаў надзвычай важнае заданне. Камандуючы 3-га Беларускага фронта генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі паставіў авіятарам задачу: разбамбіць эшалоны, якія рухаліся на ўчастку Орша–Барысаў. Прычым трэба было знішчыць толькі паравозы, пакінуўшы цэлымі вагоны і платформы з дабром, якое фашысты імкнуліся вывезці ў Германію. Трапіць у паравоз, які на поўным ходу імчаўся па рэйках, было архіскладанай задачай. Тут нават мінімальная пагрэшнасць у прыцэльванні з сярэдняй вышыні палёту ў адзін градус крэну прыводзіла да стометровага адхілення бомбы ад цэлі.

Але ж Барыс Акрэсцін ва ўсёй 1-й гвардзейскай авіядывізіі нездарма лічыўся майстрам снайперскіх удараў. За ім даўно хадзіла слава знішчальніка танкаў – ён не раз умудраўся палажыць бомбу амаль у танкавы люк. Камандаванне дывізіі было ўпэўнена, што і з нялёгкай задачай знішчэння паравозаў Акрэсцін паспяхова справіцца, і паслала

на перахват нямецкіх эшалонаў менавіта яго. Вылецеўшы са сваёй групай пад Оршу, камандзір эскадрыллі выявіў, што па абодвух чыгуначных пуцях у бок Барысава суцэльным патокам ідуць каля 20 цягнікоў.

Галаўныя Акрэсцін перахапіў каля Талочына і з першай атакі прамым ударам бомбы знішчыў паравоз. Развярнуўшыся, трапным агнём з гармат расстраляў і другі, які ішоў паралельным курсам. Рух па чыгунцы поўнасцю перапыніўся. Усе астатнія эшалоны аказаліся ў пастцы, і паравозы трапілі пад прыцэльныя снайперскія ўдары аднапалчан Акрэсціна – гвардзейцаў Дзмітрыя Капрына, Андрэя Каламойца, Уладзіміра Гамзіна, Рыгора Віктарава, Івана Фанарова. У выніку гэтага беспрыкладнага бою 25 эшалонаў дасталіся нашым вайскам у якасці багатых трафеяў.

Найвышэйшае баявое майстэрства Барыса Акрэсціна атрымала глыбокае прызнанне камандавання: трэцяга ліпеня яму ўручылі палкаводчы ордэн Аляксандра Неўскага. Акрамя таго (і гэта рэдкі выпадак у гісторыі вайны), усе, хто прымаў удзел у аперацыі пад Барысавам, былі ўзнагароджаны нагруднымі знакамі «Ганаровы чыгуначнік» і форменнымі фуражкамі чыгуначнікаў. Дададзім, што за 6 дзён Віцебска-Аршанскай аперацыі 74-ы гвардзейскі полк зрабіў 337 баявых вылетаў, нанёс ворагу значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. Гэта давалася вялікай цаной: загінулі 6 экіпажаў. У эскадрыллі Барыса Акрэсціна страт пакуль не было...

Пра гэты адметны факт з баявой біяграфіі Героя следапытам 65-й школы расказаў палкоў-

нік у адстаўцы М. Кучук – у 2008 годзе ён наведаў школьны музей і пазнаёміўся са стэндам, прысвечаным подзвігу Героя. У свой час Мікалай Мікалаевіч служыў у тым праслаўленым 74-м авіяпалку і заняўся пошукам невядомых фактаў біяграфіі і баявой дзейнасці славутага аднапалчаніна. Але самай важнай сваёй задачай М. Кучук лічыў знайсці дакладнае месца падзення самалёта гераічнага экіпажа і паспрабаваць выявіць там рэшткі штумавіка і астанкі лётчыкаў.

Дарэчы, следапыты 65-й школы неаднаразова спрабавалі знайсці гэта месца, выязджалі на тэрыторыю мяркуемага падзення самалёта, вялі там раскопкі. Але жаданых вынікаў не было: ніяк не ўдавалася трапіць на дакладнае месца падзення штурмавіка.

Мікалай Кучук ведаў усю гісторыю няўдалых пошукаў і тое, што на Ваенных могілках памылкова пахаваны астанкі не Барыса Акрэсціна і яго паветраннага стралка. Памылка гэта пачала выяўляцца ў 1972 годзе, калі чырвоныя следапыты Лугаваслабадской школы раскапалі месца падзення самалёта Акрэсціна. Прычым здарылася гэта выпадкова. Падчас асенніх канікул вучні Павел Васілец і Сягей Ходан гулялі ў лесе і знайшлі вялікую варонку ад узрыву. Амаль на паверхі заўважылі спражку ад афіцэрскага паса. Пачалі капацца ў пяску – металічныя прадметы сталі трапляцца ўсё часцей. Сярод іх на восеньскім сонцы заблішчэў і фрагмент баявога ордэна.

Наступным днём хлопчыкі паказалі сваю знаходку настаўніку – кіраўніку школьнага музея Сяргею Мікалаевічу Кушнеру. Узнагарода ў выглядзе

пяцiканцовай зоркi з надпiсам «Айчынная вайна» на эмалi рубiнавага колеру была фрагментам баявога ордэна. На тым месцы пачалi iнтэнсiўныя раскопкi i знайшлi некаторыя часткi астанкаў лётчыка, шматлiкiя асколкi бомбаў i снарадаў, абломкi штурмавiка. Тады i паявiлася меркаванне, што пад помнiкам Акрэсцiну на Ваенных могiлках у Мiнску пахаваны астанкi iншага, невядомага воiна.

Праўда, раскопкi на нейкi час спынiлi, бо на месцы падзення самалёта было выяўлена многа боепрыпасаў, i кiраўнiк школьных следапытаў настаўнiк С. М. Кушнер небеспадстаўна палiчыў iх небяспечнымi. Аднавiлi пошукi толькi ў 1990 годзе. Тады пачаў раскопкi пошукавы атрад «Каскад», якi быў створаны пры Мiнскiм аўтазаводзе пад кiраўнiцтвам Вiталя Лунёва. Прычым вялi iх на законнай i навуковай аснове – па рашэннi Заводскага райвыканкама г. Мiнска з удзелам ваенных спецыялiстаў i экспертаў.

Знайшлiся даволi важныя артэфакты: абломак авiяматора з бiркай, на якой быў пазначаны яго заводскi нумар, калодка з часткай ленты шэра-жоўтага колеру з чырвонай палоскай. Такая лента належала медалю «За абарону Сталiнграда». Знайшлi i астанкi лётчыка. Iх беражлiва склалi ў цэлафанавы мяшок, закупорылi ў бляшанку i схавалi побач пад дрэвам, зрабiўшы на iм памятную засечку. Лунёў спадзяваўся ў далейшым устанавiць iмя лётчыка i пахаваць яго з усiмi атрыбутамi воiнскага ганаровага рытуалу.

## ПОСПЕХ ПРЫХОДЗІЦЬ ДА НАСТОЙЛІВЫХ

Пра гэта Мікалаю Кучуку расказаў сам Віталь Лунёў падчас сустрэчы ў 1996 годзе. Яго аповед вельмі зацікавіў палкоўніка: ён зразумеў, што нітачка вядзе ў правільным кірунку. Бо Мікалай Мікалаевіч у выніку нястомных пошукаў высветліў, якія баявыя ўзнагароды насіў Барыс Акрэсцін. У Кнізе ўліку ўзнагароджаных ваеннаслужачых 74-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка, якія загінулі ў 1944–45 гадах, адзначана, што ў апошнім палёце Барыс Сямёнавіч меў на гімнасцёрцы наступныя ўзнагароды: медаль «За абарону Сталінграда», ордэны: Чырвонага Сцяга – 2, Чырвонай Зоркі – 1, Айчыннай вайны 2-й ступені – 1, Аляксандра Неўскага – 1.

Ордэна Леніна і Залатой Зоркі Героя пры ім не было. Як і адзінай баявой узнагароды – ордэна Чырвонай Зоркі – не было падчас таго трагічныга палёту ў паветранага стралка гвардыі старшыны Віктара Лявонцьевіча Саладухіна.

І палкоўнік Кучук вырашыў давесці пошукі да лагічнага завяршэння. Ён сустрэўся з Віталем Лунёвым, і яны разам у ліпені 2009 года пабывалі на месцы падзення самалёта, каб знайсці тое дрэва, пад якім была закапана каробка з цэлафанавым мяшком. Але адшукаць дрэва не ўдалося, і пазней высветлілася, чаму.

Мікалай Кучук звярнуўся ў Міністэрства абароны Беларусі, і ў верасні 2009 года рота пошукавага батальёна выехала на месца трагедыі ваенных часоў, на тую яму-варонку, дзе вялі пошукі

следапыты Лугаваслабадской сярэдняй школы Мінскага раёна і атрад «Каскад» Віталя Лунёва.

«...23 верасня першыя гадзіны работы пошукавікоў далі ашаламляльны вынік, – піша ў газеце "СБ. Беларусь сегодня" за 20 кастрычніка 2009 года Мікалай Кучук. – Беражліва і старанна прасейваючы зямлю, якую выкінулі з "ямы" людзі, што капалі тут раней, малодшы сяржант Яўген Сяляўскі і яфрэйтар Юрый Сяргееў выявілі фрагменты чалавечых астанкаў, гузікі з зоркамі ад гімнасцёркі і пагона, кручок-засцёжку ад армейскіх галіфе».

А праз некалькі хвілін прысутныя ахнулі: Юра Сяргееў выкапаў маленькі металічны пяцікутнік! Калодка ад медаля? Не падобна. Мікалай Мікалаевіч выказаў сваё меркаванне:

– Думаю, што гэта калодка ад ордэна Чырвонага Сцяга, – сказаў ён. – Іх у Барыса Акрэсціна было два.

Археолаг Вадзім Тамілін у той жа дзень правёў аналіз калодкі і зрабіў выснову, што да яе мацаваўся менавіта гэты ордэн.

Наступны дзень прывёў пошукаўцаў да самай важнай знаходкі. Прапаршчык Мікалай Падасінавік на адным схіле ямы пад слоем моху і зямлі ўбачыў цэлафанавы мяшок з астанкамі лётчыка, якія ў 1990 годзе знайшлі члены атрада «Каскад». Тады Лунёў схаваў гэту знаходку пад дрэвам са спецыяльнай паметкай. Тут жа пад елачкай знайшліся іржавыя абломкі металічнай скрынкі, у якой і быў схаваны мяшок. Адшукалі і тое памечанае дрэва, пад якім была захавана каробка. Яно аказалася ў яме на глыбіні каля двух метраў.

Стварылася ўражанне, што хтосьці не толькі ссек яго, але і закапаў глыбока, каб знішчыць прыкметы месца, дзе былі астанкі лётчыка.

Мікалай Кучук, убачыўшы гэту знаходку, зніякавеў і задумаўся: няйначай нейкая містыка! Ён прыпомніў, што незадоўга да гэтых раскопак, у гадавіну гібелі экіпажа штурмавіка, 6 ліпеня, па даручэнні ветэранаў 1-й гвардзейскай авіядывізіі разам з супрацоўнікамі Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў тут, каля ямы. Сабралі для музея часткі бранякорпуса штурмавіка, і Мікалай Мікалаевіч па франтавой традыцыі напоўніў гранёную шклянку гарэлкай, накрыў яе лустай хлеба і агледзеўся, дзе паставіць. Погляд затрымаўся міжволі на невялікім прыгорачку, парослым зялёным мохам. Нейкая сіла пацягнула яго менавіта сюды...

Пад гэтым узгорачкам і былі астанкі Героя, якія 24 верасня знайшоў прапаршчык Мікалай Падасінавік.

Пошукі працягваліся і на наступны дзень. Салдаты знаходзілі не толькі шматлікія абломкі самалёта, але і разрозненыя астанкі лётчыка. Цалкам знайсці іх не ўдасца ніколі: вельмі многія капалі тут да гэтага дня – вучні Лугаваслабадской школы, члены атрада Лунёва, невядомыя шукальнікі, якія перазахавалі цэлафанавы мяшок і закапалі памечанае Лунёвым дрэва. Яны, напэўна, здабывалі тут порах, гаечным ключом выкруцілі свечкі запальвання з рухавіка самалёта. Знайшліся тут і тыя свечкі, і паржавелы гаечны ключ.

Вялікая колькасць металічных стужак ад пушак і кулямётаў з нерастрачанымі боепрыпасамі сведчыць пра тое, што штурмавік збілі пры першым

заходзе. Знайшлі тут зялёны плафон ад лямпы аэранавігацыйнага агню з заканцоўкі правага крыла штурмавіка, многа фрагментаў ад прыборнай панэлі лётчыка: тумблеры, манометры, экраніраваныя правады, пераключальнікі. Уся варонка была ўсеена асколкамі плексігласу ад зашклення кабіны і кавалкамі браняшкла ад ахоўнага казырка лётчыка. Заўважым, што ўсе гэтыя знаходкі захоўваюцца цяпер у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Сумненняў больш не было: знойдзена кабіна штурмавіка з астанкамі пілота. Каб пераканацца ў правільнасці сваёй высновы і зрабіць канчатковы вывад, што знойдзены менавіта штурмавік Барыса Акрэсціна, звярнуліся да архіўных матэрыялаў і дакументаў. Самы важны з іх – нумар рухавіка самалёта, указаны ў дакуменце, і яго адпаведнасць нумару рухавіка на бірцы, знойдзенай на месцы раскопак. Эксперты прачыталі яго як 25780, а нумар штурмавіка Акрэсціна – 257804. Аказалася, што іржа «з'ела» апошнюю лічбу. Гэты матор стаяў на самалёце № 9299 – машыне Барыса Акрэсціна.

Вось дакумент, які сведчыць менавіта пра тое, што гэты нумар належыць штурмавіку Б. Акрэсціна, – аператыўная зводка № 169 штаба 1-й гвардзейскай авіядывізіі на 21.00 06.07.1944, у якой запісана: «74-ы гв. шап (штурмавы авіяполк. – *Ю. В.*) чатырма групамі і пяццю парамі, пад прыкрыццём 86-га зап (знішчальнага авіяпалка. – *Ю. В.)* бамбардзіровачна-штурмавымі дзеяннямі знішчаў войскі і баявую тэхніку праціўніка ў раёне Загор'е, Засценак, Апчак, Каралішчавічы... Баявая страта: 74 шап – камандзір

АЭ (авіяэскадрыллі. – *Ю. В.*) гв. ст. лейтэнант Акрэсцін Барыс Сямёнавіч і паветраны стралок – Саладухін В. Л., самалёт № 9299 у раёне вышыні 247 быў збіты агнём з танкаў».

Прывядзём тут пераказ яшчэ аднаго надзвычай важнага дакумента, які дапаможа дакладна раскрыць карціну гібелі экіпажа Акрэсціна У акце расследавання прычыны страты самалёта «Іл-2» старшага лейтэнанта Акрэсціна запісана, што пяцёрка штурмавікоў Акрэсціна, знаходзячыся ў правым пеленгу, заходзіла на цэль з левага круга з пікіравання. На першым заходзе самалёт вядучага загарэўся і ўпаў у лес у раёне вышыні 247, якая знаходзіцца за 3 км на паўночны захад ад населенага пункта Апчак.

Гэта пацвердзіў і камандзір 1-й гвардзейскай авіядывізіі гвардыі палкоўнік Сяргей Пруткоў. «Дзейнічаючы па акружанай групоўцы, якая маскіравала сваю баявую тэхніку, і асабліва танк, у лясах на паўднёвы ўсход ад Мінска, штурмавікі не маглі выявіць зенітныя сродкі і танкі, якія стралялі па самалётах. Лётчыкі захапіліся знішчэннем жывой сілы, пікіравалі да брыючага палёту. На выхадзе з пікіравання прыцэльным агнём з танка быў збіты самалёт вядучага Героя Савецкага Саюза гвардыі старшага лейтэнанта Акрэсціна», – адзначае камандзір дывізіі.

Па крупінках гэтых звестак, па прыведзеных вышэй дакументах і ўспамінах аднапалчан, якія ў той дзень разам з Акрэсцінам штумавалі скапленні варожых войск, можна нарэшце амаль гадзіна за гадзінай аднавіць падзеі таго гарачага ліпеньскага дня і ўстанавіць дакладную карціну гібелі экіпажа

штурмавіка № 9299. Давайце цяпер паспрабуем прасачыць гераічны шлях экіпажа Барыса Акрэціна 6 ліпеня 1944 года да бессмяроцця...

...Гарачыня над аэрадромам ля Талачына яшчэ не адчуваецца, ранішнія гадзіны дыхаюць чаканай прахалодай. Чуецца гул матораў, іх правяраюць і праграваюць тэхнікі. У неба ў 8.45 узмывае штурмавік Барыса Акрэсціна. Экіпаж вылятае на рэкагнасцыроўку ў раён Мінскага катла. Ваенная разведка данесла, што ўчора нямецкая авіяцыя скінула акружанай групоўцы сваіх войскаў боепрыпасы, паліва, харчаванне, і сёння яна нанясе ўдар па беларускай сталіцы са спробай разарваць акружэнне. Належала ўстанавіць, дзе свае войскі, вызначыць дакладную дыслакацыю ўдарнай фашыскай групы і метадам інтэнсіўнай штурмоўкі дапамагчы яе разграміць. Да гэтага дня ў выніку смяротных схватак тут усё перамяшалася, і справа часта даходзіла да рукапашнай.

Наша пяхота, убачыўшы савецкі штурмавік, пачала абазначаць сябе сігнальнымі ракетамі ў раёне Волмы, Якімава, Вялікага Сціклева, Апчака, Загор'я. Пра гэта і далажыў камандаванню Барыс Акрэсцін. І на фашыстаў пасыпаліся ўдары штурмавікоў. Чацвёрка «Іл-2» лейтэнанта Байцова адбамбілася па калоне з 200 аўтамашын у раёне Якімава–Засценкі і з 6 танкаў за 2 кіламетры на ўсход ад вёскі Вялікае Сціклева. Група лейтэнанта Каламойца атакавала матарызаваную армаду з 10 танкаў і 400 аўтамашын, якая рухалася па трох дарогах ад Загор'я.

У 14.30 пад прыкрыццём 2 знішчальнікаў Барысаўскага гвардзейскага авіяпалка ў неба

ўзнялася пяцёрка штурмавікоў Барыса Акрэсціна, следам –шасцёрка гв. ст. лейтэнанта Івана Лысенкі, у саставе якой вылецеў і гамельчанін Герой Савецкага Саюза Уладзімір Гамзін. У час падлёту групы да цэлі У. Гамзін пачуў у эфіры: «Акрэсцін не выйшаў з піке! З левым крэнам ён урэзаўся ў самую гушчыню фашыстаў і іх тэхнікі». А хутка ў небе паказалася асірацелая чацвёрка штурмавікоў, якую вёў дамоў баявы сябра Акрэсціна гв. ст. лейтэнант Віктараў. Ён расказаў, што месца гібелі Барыса Акрэсціна ўяўляе сапраўднае пекла, у неба ўздымаліся восем велізарных слупоў дыму, гарэў лес, каля 20 аўтамашын, усюды ляжалі трупы гітлераўцаў. Віктараў з таварышамі ў шасці заходах на цэль адпомсцілі за смерць камандзіра, яшчэ пяць удараў нанесла шасцёрка Івана Лысенкі. Ад вышыні 247 і да самага Апчака палалі дзясяткі нямецкіх танкаў і сотні аўтамашын. Бязлітасна помсціў за смерць баявога сябра У. Гамзін: на брыючым ён расстрэльваў фашыстаў.

Калі б не гэтыя ўдары штурмавікоў, невядома, што сталася б з Мінскам. Бо на наступны дзень, 7 ліпеня, гітлераўцам удалося захапіць аэрадром і прарвацца ў горад у раёне тэатра оперы і балета. А што, калі б сюды падышлі тыя дзясяткі тысяч фашыстаў, якіх з дапамогай штурмавікоў удалося знішчыць 6 ліпеня?..

Адразу пасля гібелі экіпажа Акрэсціна яго аднапалчане пачалі настойлівыя пошукі дакладнага месца падзення штурмавіка № 9299. «У нашым гвардзейскім палку была заведзена непахісная традыцыя: з вызваленнем часова акупіраваных гітлераўцамі тэрыторый знаходзіць астанкі загінуўшых таварышаў і хаваць іх з усімі воінскімі

ўшанаваннямі», – успамінае камандзір палка Ф. Балдырыхін.

Пошук у 1944 годзе ўзначаліў асабіста намеснік кампалка па палітычнай частцы гвардыі маёр Каваленка. Іларыён Япіфанавіч быў сапраўдным палітычным кіраўніком, сам неаднаразова вылятаў на баявыя заданні ў якасці паветранага стралка, шчыра сябраваў з Барысам Акрэсціным. Пад кіраўніцтвам нампаліта шукалі і з паветра, і на зямлі. Але пошукам вельмі перашкаджала гарачыня, у лесе стаяў невыносны смурод ад тысяч трупаў, не дапамагалі і процівагазы. Сярод абломкаў тэхнікі знайсці канкрэтны самалёт было вельмі цяжка. Пры яго падзенні адбыўся магутны ўзрыў ад незрасходаваных боепрыпасаў, і гэта яшчэ больш ускладніла пошукі...

...У прыёмную першага сакратара ЦК КП(б)Б зайшлі два маёры-авіятары: намеснік камандзіра 74-га гвардзейскага палка Герой Савецкага Саюза Смольскі і нампаліт Каваленка. Яны папрасіліся на прыём у высокага партыйнага начальства. П. К. Панамарэнка адразу ж прыняў лётчыкаў. Госці расказалі Панцеляймону Кандратавічу пра подзіг свайго аднапалчаніна і прасілі знайсці яго астанкі, пахаваць і ўстанавіць помнік Герою.

– Мы ўстановім такі помнік, што перад ім кожны будзе здымаць шапку, – паабяцаў Панамарэнка.

Усхваляваны расказам авіятараў, Панцеляймон Кандратавіч асабіста выехаў на месца баёў. У выніку з'явілася яго данясенне на імя прадстаўніка Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання маршала А. М. Васілеўскага: «На днях мы агледзелі ў лясах на паўднёвы ўсход ад Мінска велі-

зарны ўмацаваны лагер немцаў, поўнасцю знішчаны нашай штурмавой авіяцыяй. Выявіла гэту групу 1-я авіядывізія. У лагеры (...) ляжала 5 тысяч трупаў нямецкіх салдат і афіцэраў і больш як 5 тысяч спаленых машын. Месца пабоішча знаходзіцца за 13 км на паўднёвы ўсход ад Мінска па Магілёўскай шашы. Тут мы мяркуем паставіць помнік-абеліск доблесным лётчыкам».

З гэтага месца неўзабаве прывезлі астанкі, як меркавалі, Барыса Акрэсціна і ўрачыста пахавалі іх у скверы на плошчы Саветаў ля Дома ўрада. Пазней іх перанеслі на Ваенныя могілкі па вуліцы Казлова, паставілі тут помнік Акрэсціну і яго паветранаму стралку гвардыі старшыне Віктару Лявонцьевічу Саладухіну. Прычым пераблыталі яго воінскае званне і імя па бацьку. На пліце было пазначана: «гвардыі старшы лейтэнант Віктар Лявонавіч Саладухін»...

## БЮРАКРАТЫ СУПРАЦЬ ПАТРЫЁТАЎ

Каб яшчэ раз пераканацца, што нарэшце знойдзены менавіта самалёт і астанкі Барыса Акрэсціна, 28 верасня на месца раскопак прыехаў з Брэста Віталь Лунёў. Ён апазнаў астанкі лётчыка, знойдзеныя ў чэрвені 1990 года яго групай «Каскад». І ў той жа вераснёўскі дзень астанкі былі перададзены старшаму следчаму Мінскай райпракуратуры Андрэю Валасяну. Пошукаўцы спадзяваліся, што нарэшце справядлівасць будзе аднаўлена, і да 65-й гадавіны Вялікай Перамогі астанкі Героя заспакояцца пад яго помнікам на

Ваенных могілках на сталічнай вуліцы Казлова. Але... зноў умяшалася містыка, а хутчэй, нават махровы бюракратызм, злачынная халатнасць і абыякавасць да памяці нашых вызваліцеляў.

...Прайшло многа часу, і ў рэдакцыі газеты «СБ. Беларусь сегодня», дзе друкаваліся артыкулы Мікалая Кучука пра подзвіг Акрэсціна і пошукі дакладнага месца яго гібелі, пачалі раздавацца тэлефонныя званкі: чытачы цікавіліся, што стала з астанкамі Акрэсціна, пра якога так многа пісала газета. А ў рэдакцыі нічога адказаць не маглі: звестак пра далейшы лёс астанкаў Героя не было. Карэспандэнт газеты Мікалай Казловіч па заданні рэдакцыі заняўся новымі пошукамі. Пачаў іх з Мінскай райпракуратуры. Там паведамілі, што следчыя, якія займаліся гэтай справай, перайшлі на іншае месца службы, і такім чынам пракурорская нітачка абарвалася.

Звярнуліся да мясцовых органаў улады. З Мінскага райвыканкама карэспандэнта пераадрасавалі ў Мінгарвыканкам, куды райвыканкам адправіў афіцыйнае пісьмо з прапановай вырашыць далейшы лёс астанкаў Героя. Адтуль пацікавіліся сутнасцю справы, і работнікі райвыканкама адаслалі іх да ліпеньскіх публікацый у «СБ. Беларусь сегодня». А на рэдакцыйны запыт у Мінгарвыканкам адказалі, што разбяруцца і адкажуць рэдакцыі па сутнасці. Але сутнасць аказалася несуцяшальнай: чыноўнікі параілі звярнуцца да камунальнікаў, а можа, ва ўпраўленне культуры ці...

Нарэшце ўдалося высветліць, што ўвесь гэты час астанкі Барыса Акрэсціна праляжалі... у халадзільніку Галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай

службы медыцынскіх судовых экспертыз па Мінску і Мінскай вобласці. Іх маглі нават падзахаваць у любым месцы, як гэта дазваляецца законам. Пасля пастановы райпракуратуры аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы эксперты правялі даследаванні і адправілі астанкі Героя на захоўванне.

Пра вынікі сваіх пошукаў і пра тупік, у якім зноў з-за бюракратаў трапіў Барыс Акрэсцін, карэспандэнт газеты Мікалай Казловіч расказаў у публікацыі «Патрыёты супраць бюракратаў» («СБ. Беларусь сегодня» ад 28 жніўня 2010 года). Гэты артыкул прачытала траюрадная ўнучка Героя – Юлія Акрэсціна, паслушніца Полацкага Свята-Ефрасіннеўскага манастыра. Адтуль і прыйшла афіцыйная просьба выдаць астанкі Акрэсціна, каб пахаваць на манастырскай тэрыторыі. І тут усе забегалі. Паведамілі ёй, што астанкі ўжо крэміраваны, і 10 верасня адбудзецца ўрачыстае іх пахаванне на Ваенных могілках...

...У храме на могілках ідзе малебен у памяць гераічнага экіпажа і ўсіх загінуўшых на той праклятай вайне. Пасля пад гукі ваеннага аркестра ўрачастым маршам да помніка Барысу Акрэсціну падыходзіць рота ганаровай варты. Слова бярэ ваенкам Савецкага раёна Мінска палкоўнік Алег Загорскі. Ён расказвае пра гераічнае жыццё Барыса Сямёнавіча, пра яго ваенныя подзвігі, пра палёт у бяссмерце пад беларускай сталіцай. Урну з прахам Героя кладуць да яго помніка, гучыць ваенны салют, льецца чуллівая мелодыя песні Яна Фрэнкеля «Журавы».

І раптам у вераснёўскім небе паказваецца клін адлятаючых жураваў. Ціха і павольна праплываюць

птушкі над помнікам, і прысутным здаецца, што ў гэтым журботным страі ляціць і шматпакутная душа Акрэсціна, якая доўгіх 65 гадоў не магла знайсці заспакаення. Цяпер яна адлятае з грэшнай зямлі, ад грэшных перад ім людзей у вечнасць, застаючыся назаўсёды ў нашай удзячнай памяці!

Так адразу падумала і Тамара Генадзьеўна Лоскутава, якая з членамі савета Музея баявой і працоўнай славы прысутнічала на ўрачыстасці. Пошукавая работа следапытаў 30-й мінскай гімназіі (былой 65-й школы) у той дзень верасня атрымала чаканае завяршэнне.

Прыехала на Ваенныя могікі і Юлія Акрэсціна са сваім бацькам. Яны ўсклалі кветкі да помніка і магілы свайго славутага родзіча...

...Вялікая работа праведзена юнымі патрыётамі, нястомнымі следапытамі некалькіх пакаленняў 65-й мінскай школы. Пяць экіпажаў, 13 раней невядомых герояў-авіятараў знайшлі яны пад кіраўніцтвам афіцэра-франтавіка, кандыдата педагагічных навук Рыгора Ціханавіча Сівакова і яго паслядоўнікаў. Апошні экіпаж бамбардзіроўшчыка «Іл-4» акрэсцінцы знайшлі сумесна з камсамольцамі Раўкуцьеўскай сярэдняй школы Мінскага раёна на чале з яе дырэктарам Бойка. І не толькі знайшлі, але і запрасілі жывых членаў экіпажа палаючага бамбардзіроўшчыка, родных загінуўшых у тым няроўным баі над вёскай Камянец Мінскага раёна ў школьны музей.

На месца апошняга бою каля вёскі Камянец Мінскага раёна прыехалі ўцалелыя члены экіпажа – яго былы камандзір Уладзімір Сашыхін і стралок-радыст Дзмітрый Янаў. На шчасце, Уладзіміра Сашыхіна ў той трагічны дзень 29 чэрвеня

1941 года пераапранулі ў вясковую адзежу і паказалі дарогу за лінію фронту. А цяжка параненага Дзмітрыя Янава спачатку хавалі ў гумне Кандрата Ангілевіча, а пасля адправілі ў Буцавіцкую сельскую бальніцу, дзе Дзмітрый Мітрафанавіч залячыў раны і стаў дапамагаць мясцовым падпольшчыкам, стаў сувязным партызанскага атрда «Штурм».

Імёны астатніх членаў экіпажа – штурмана капітана Апанаса Дворніка і стралка сержаната Сяргея Зуева ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці іх родных занеслі на помнік «Гераічным экіпажам» ля 65-й мінскай сярэдняй школы.

Усе гэтыя экіпажы здзейснілі подзвігі ў франтавым небе Беларусі, і іх імёны павінны стаяць у адной шарэнзе з імёнамі легендарных лётчыкаў Вялікай Айчыннай – Мікалая Гастэла, Аляксея Марэсьева, Віктара Талаліхіна, Барыса Акрэсціна і многіх іншых.

На падставе нястомнай пошукава-даследчай работы, праведзенай многімі пакаленнямі чырвоных следапытаў, члены савета Музея баявой і працоўнай славы 30-й мінскай гімназіі імя Героя Савецкага Саюза Барыса Акрэсціна да 65-гадавіны Перамогі напісалі навуковую работу «Без вестак прапаўшых экіпажаў няма». Яе аўтары старшакласнікі Мацей Гаробчанка, Мікіта Крывавусаў і Ягор Палякоў расказалі пра подзвігі савецкіх лётчыкаў, якія праявілі гераізм і мужнасць у першых баях Вялікай Айчыннай вайны ў чэрвені–ліпені 1941 года на тэрыторыі Беларусі, баявыя экіпажы якіх доўгі час лічыліся без вестак прапаўшымі. Цяпер іх слаўныя імёны вернуты з небыцця…

Набліжаецца чарговая гадавіна Вялікай Перамогі. Разам з шырокай грамадскасцю нашай гераічнай рэспублікі да гэтых урачыстых святочных дзён рыхтуюцца і следапыты 30-й мінскай гімназіі, члены савета яе Музея баявой і працоўнай славы. Кіраўнік музея Т. Г. Лоскутова заўважае, што да гэтай падзеі варта ўстанавіць памятныя стэлы на месцах падзення і гібелі гераічных экіпажаў, і ў першую чаргу – экіпажа Героя Савецкага Саюза гвардыі старшага лейтэнанта Барыса Акрэсціна, чыё імя з гонарам носіць мінская гімназія.

# Хто вы, пан Алаіз Дворжак?

## Працяг дакументальнай аповесці «Без права на славу»



Першая частка аповесці, пад назвай «Без права на славу», змешчанай у кнізе «За край бацькоўскі, за Радзіму» (Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2014), апавядала пра ваенны перыяд жыцця і гераічную барацьбу нашага земляка Героя Расіі **А. М. Бацяна,** яе другая частка ў гэтай кнізе пра не менш насычаныя адметнымі патрыятычнымі падзеямі ўсе пасляваенныя гады жыцця легендарнага чалавека.



Партызанская брыгада Івана Залатара, у якой камандзірам атрада быў Аляксей Бацян, аказалася на польскай тэрыторыі, занятай Чырвонай Арміяй. Неўзабаве радыст прынёс камбрыгу тэлеграму ад начальніка 4-га галоўнага ўпраўлення П. А. Судаплатава. Павел Анатольевіч павіншаваў асабовы састаў брыгады з завяршэннем партызанскай барацьбы і прапанаваў перадаць усіх партызан прызыўнога ўзросту ў адно з падраздзяленняў Чырвонай Арміі, што знаходзілася паблізу, за выключэннем чэкістаў, якія павінны былі вярнуцца ў маскоўскую брыгаду палкоўніка Арлова.

Але да 20 мая 1945 года Аляксей Мікалаевіч заставаўся ў Польшчы, дзе дапамагаў органам «Смерш» раззбройваць падраздзяленні Арміі Краёвай, якія не жадалі прыняць новую ўладу і часта змагаліся супраць Польскай і Чырвонай Арміі. З дапамогай сваіх паплечнікаў – салдат і афіцэраў былой Арміі Людовай і «Батальёнаў Хлопскіх» – партызанскі камандзір лейтэнант дзяржбяспекі Бацян выдатна спраўляўся з нялёгкім заданнем. Вайна для яго была яшчэ не закончана.

Пра гэту аперацыю і яе выключную важнасць узгадвае генерал-маёр Леанід Рыгоравіч Іваноў – непасрэдны ўдзельнік тых падзей: «Нейдзе ў лістападзе 1944 года мы атрымалі каманду:

праводзіць раззбраенне падраздзяленняў Арміі Краёвай. Як гэта рабілася? Калі мы высвятлялі, што ў лесе ёсць нейкая акаўская часць, то нашы работнікі – звычайна нам. начальніка контразведкі дывізіі, прадстаўнік камандавання, ну і ўзвод аўтаматчыкаў з імі – выязджалі на месца, знаходзілі камандзіра і абʼяўлялі, што па загаду Вярхоўнага камандавання Чырвонай Арміі і Польскага камітэта па вызваленні Польшчы вы падлягаеце ліквідацыі. Гэта значыць, вам належыць здаць зброю, а людзей распусціць па дамах. Наколькі я памятаю, якога-небудзь супраціўлення яны пры раззбраенні не аказвалі.

Праўда, былі выпадкі, калі некаторыя акаўцы абураліся: "На якой падставе, мы армія народная, абаронцы польскага народу, вы не маеце права нас расфарміраваць, мы павінны застацца!" Але, нягледзячы на ўсе гэтыя заявы, загад аб раззбраенні яны ўсё-такі выконвалі. Колькасць людзей была рознай: іншы дзень па 200 чалавек складвалі зброю, а калі-нікалі і па 500. У нейкі перыяд у снежні я збіраў звесткі з аддзелаў контрразведкі дывізій, колькі здадзена зброі, колькі падраздзяленняў распушчана, а пасля ўся гэта інфармацыя перадавалася ў фронт, гэта значыць ва ўпраўленне контрразведкі "Смерш" нашага 1-га Беларускага фронту. Фронт, як мне гаварылі, штодзённа дакладваў пра гэта Сталіну. Сталін быў занепакоены наяўнасцю на польскай тэрыторыі Арміі Краёвай і ставіў задачу як мага хутчэй яе раззброіць!»

З гэтага вынікае, што Аляксей Бацян непасрэдна ўдзельнічаў у справе значнай палітычнай і дзяржаўнай важнасці. Здаралася, што пры такіх аперацыях даводзілася мець справу і з узброенымі

групамі немцаў. Апошні такі эпізод адбыўся каля сяла Піўнічнае Новасонскага павета. На чале невялікай групы з пяці чалавек ён сутыкнуўся з нямецкім падраздзяленнем, якое у дзесяць разоў пераўзыходзіла партызан. Трэба ведаць рэакцыю Бацяна: і тут ён імгненна адкрыў агонь, яго падтрымалі іншыя члены групы, 15 гітлераўцаў было забіта, іншыя кінулі зброю і здаліся. Палякі, якія прысутнічалі ў групе Бацяна, прапанавалі немцаў расстраляць.

– А навошта? – запытаў Аляксей. – Яны ж цяпер не ворагі, а ваеннапалонныя!

Такое яно – воінскае высакародства ў нашага героя: палонны вораг ворагам ужо не з'яўляецца. І астатніх 35 чалавек, сярод іх двух афіцэраў, перадалі Чырвонай Арміі.

## ПАН ДВОРЖАК ЕДЗЕ «НА РАДЗІМУ»

Пасля выканання адказнага задання, пра якое ўзгадана вышэй, 20 мая 1945 года Аляксей Бацян вярнуўся ў Маскву. Пытання, што рабіць далей, у яго не ўзнікала, ён раз і назаўсёды зразумеў і вырашыў, што такая служба – для яго, што гэта – яго лёс і варта рухацца далей. Значыць, трэба не спыняцца на дасягнутым. А каб рухацца наперад, трэба атрымаць адпаведную адукацыю. Аляксей не такі чалавек, каб адкладваць справу: напісаў рапарт на імя Судаплатава з просьбай дазволіць паступленне ў адпаведную вучэбную ўстанову, якая давала вышэйшую ваенную адукацыю. У прынцыпе, ён хацеў працягваць тую вучобу, якую пачаў у 1941 годзе. Праз нейкі час яго выклікаў Павел Анатольевіч.

– Вырашыў вучыцца? – пасля прывітанняў спытаў ён. – Справа пахвальная, але дзе ж я вазьму людзей для далейшай работы? Так што вучобу прыйдзецца адкласці. Цябе чакае іншая вучоба, даволі прафесійная.

І Судаплатаў паведаміў Аляксею Бацяну, што яму прыйдзецца ператварыцца ў разведчыка-нелегала, і вучыцца ён цяпер павінен менавіта тонкасцям гэтай адказнай прафесіі...

...У свеце існавала меркаванне, што толькі адна краіна валодала найбольш магутнай сакрэтнай разведвальнай службай. Бясспрэчна, гэта быў Савецкі Саюз, і назва сакрэтнай арганізацыі, беспрэцэндэнтнай у гісторыі чалавецтва, – КДБ. На думку англійскай сакрэтнай службы, «адзін з першых міфаў камуністаў – навязаць меркаванне пра тое, што органы бяспекі новай дзяржавы не былі створаны да снежня 1917 года. Гэта няпраўда была распаўсюджана, каб даказаць, што Савецкая ўлада за першыя сорак адзін дзень яе існавання магла абыходзіцца без масавых рэпрэсій, вельмі знаёмых іншым рэвалюцыям. На самай жа справе органы і масавыя рэпрэсіі з'явіліся з першай гадзіны тых дзён, "якія патрэслі свет"».

Тая першая ноч абвясціла свету нараджэнне найбольш крывавай дыктатуры. Ленін прызначыў яе лідараў, і сярод іх быў таварыш Рыкаў, першы кіраўнік Народнага камісарыята ўнутраных спраў РСФСР. Рыкаў пазней быў расстраляны, але паспеў упісаць у гісторыю органаў крывавыя старонкі, пра якія Савецкі ўрад заўсёды стараўся не ўспамінаць. У далейшым пятнаццаць чалавек адзін за адным прызначаліся на пасаду кіраўнікоў органаў. Трое з іх былі выгнаны з Савецкага ўрада з ганьбай,

адзін памёр на гэтай пасадзе, сем былі расстраляны ці павешаны са страшнымі катаваннямі перад іх афіцыйным пакараннем.

Чаму ж найбольш магутная арганізацыя ў свеце так лёгка і вольна аддавала сваіх лідараў? Чаму Палітбюро не баяліся іх, здаецца, усясільных асоб, і арганізацый, якія яны ўзначальвалі? Як атрымлівалася, што партыя і Палітбюро не мелі фактычна ніякіх цяжкасцей у знішчэнні не толькі кіраўніка дзяржаўнай бяспекі, але і цэлых груп яе найбольш ўплывовых афіцэраў? У чым заключалася тайна гэтай бязмежнай улады Палітбюро?

Адказ тут вельмі просты. Метад стары і выкарыстоўваўся паспяхова на працягу тысячы гадоў. Ён заключаецца ў формуле: «Раздзяляй і ўладар». Па ініцыятыве Леніна было ўзята за аснову, што кожны магутны, значны орган ці арганізацыя, якая можа прымаць незалежныя рашэнні, павінны быць ураўнаважаны іншай не менш магутнай бюракратычнай арганізацыяй. Тады кожны раўніва сочыць за сваім канкурэнтам і своечасова паведамляе пра любыя адхіленні ад устаноўленай нормы. Такім чынам, таварышы з Палітбюро маглі жыць ціха і спакойна.

Існаванне паралельных устаноў у спецслужбах пачалося са стварэннем Надзвычайнай камісіі (так званага ЧК), каб ураўнаважыць паўнамоцтвы Народнага камісарыята ўнутраных спраў, якія пастаянна раслі. На працягу Грамадзянскай вайны гэтыя дзве крывавыя арганізацыі існавалі незалежна і канкурыравалі адна з адной. Іх уплыў рос з кожным днём, і Ленін прапанаваў стварыць іншы незалежны орган для кантролю і расплаты – Рабкрын. Рабоча-сялянская інспекцыя была створана не для рэпрэсій

насельніцтва, а для кантролю бальшавіцкай эліты, і перш за ўсё ЧК і НКУС.

Тым часам шчупальцы ЧК дасягнулі замежжа, і бальшавіцкія лідары вымушаны былі стварыць іншую, паралельную разведвальную службу, якая магла б ураўнаважыць яго знешнія дзеянні. Ні народны камісарыят, ні Рабкрын не маглі выканаць падобную ролю, і па асабістым заказе неўгамоннага Леніна 21 кастрычніка 1918 года паявілася знешняя разведслужба пад бяссэнсавай назвай – Рэгістрацыйнае ўпраўленне Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі. У далейшым яна атрымала назву Галоўнага Разведупраўлення Генеральнага штаба. На яго гісторыі і дзеяннях мы спыняцца не будзем, скажам толькі, што з самага пачатку ваенная разведка стала самым вялікім антаганістам ЧК (у далейшым КДБ), таму спробы «з'есці» яе ў органаў дзяржбяспекі працягваліся пастаянна.

Партыя, КДБ і армія фарміравалі трыумвірат, які кіраваў Савецкім Саюзам. Усе іншыя ўстановы і арганізацыі знаходзіліся ў залежным становішчы. Але і ніхто з упамянутых трох не меў абсалютнай улады. Яны ўсе былі ўзаемазвязаны і павінны былі дзяліць уладу са сваімі канкурэнтамі, паміж імі – пастаянная барацьба з нападамі і адступленнямі, крывавымі перастрэлкамі, перамогамі, паражэннямі, перамір'ямі, сакрэтнымі саюзамі і здрадамі. Такія ж адносіны існавалі і паміж дзвюх разведвальных спецслужбаў – КДБ і ГРУ. Іх пастаянна рэфармавалі, пераўтваралі, але задачы іх заставаліся адны і тыя ж.

Вось і Аляксей Мікалаевіч вярнуўся ў Маскву падчас чарговага рэфармавання органаў дзяржбяспекі. Неўзабаве было ліквідавана Чацвёртае

упраўленне НКДБ СССР, якое выканала свае задачы, а перад гэтым у МДБ стварылі аддзел «ДР» – служба дыверсій і індывідуальнага тэрору, начальнікам якога стаў генерал-лейтэнант Судаплатаў. Аддзел працаваў на перспектыву – рыхтаваўся да актыўных дзеянняў у «асобы перыяд» – так на жаргоне спецслужбаў называецца ваенны час і падрыхтоўка да яго. Адразу ж пасля Перамогі нашы былыя саюзнікі ўжо распрацоўвалі планы новай сусветнай бойні. А «закляты сябра» Сталіна брытанскі прэм'ер Уінстан Чэрчыль яшчэ ў красавіку 1945 года даручыў Аб'яднанаму штабу планавання ваеннага кабінета Вялікабрытаніі падрыхтаваць план экстранай аперацыі, у якім будуць сфарміраваны мэты і напрамкі ўдараў заходніх саюзнікаў супраць Чырвонай Арміі.

Праўда, спецыялісты гэтага штаба зрабілі несуцяшальную выснову: «...Мы лічым, што, калі пачнецца вайна, дасягнуць хуткага абмежаванага поспеху будзе па-за нашымі магчымасцямі, і мы акажамся ўцягнутымі ў працяглую вайну супраць пераўзыходзячых сіл». Іншага меркавання прытрымліваліся заакеанскія саюзнікі. Вось вытрымка з мемарандума намесніка дзяржаўнага сакратара ЗША Дж. Гру ўраду ад 18 мая 1945 года: «Будучая вайна з Расеяй відавочная... Яна можа пачацца ў бліжэйшыя некалькі гадоў. Нам належыць таму падтрымліваць у гатоўнасці нашы ўзброеныя сілы». Вось чаму савецкай разведцы трэба было ўсур'ёз рыхтавацца да «асобага перыяду», і Аляксей Бацян павінен быў стаць разведчыкам-нелегалам. Пачалася падрыхтоўка да ўкаранення яго ў чужыя спецслужбы за граніцай. На пачатковым перыядзе быў выбраны шлях праз Чэхаславакію.

– У 1947 годзе было заключана пагадненне паміж СССР і Чэхаславакіяй аб тым, што чэхі, якія пражываюць на тэрыторыі Кіеўскай, Жытомірскай і Валынскай абласцей, маюць магчымасць выехаць у Чэхію, – расказвае Аляксей Мікалаевіч. – Чаму? Таму што немцаў выселілі з Судэцкай вобласці, і, так сказаць, свабодныя месцы былі. Я пазнаёміўся з маладымі чэхамі пад выглядам чэха і ў якасці рэпатрыянта паехаў разам з імі ў Чэхаславакію. Называлі цяпер мяне Алаіз Дворжак. Якой нагодай я тлумачыў сваё рашэнне «вярнуцца на радзіму», ужо не памятаю, але быў я малады, мог прыдумаць усё, што належыць. Прычым у мяне не было абсалютна ніякіх дакументаў – ні па нараджэнні, ні па адукацыі – нічога, ніякай даведкі! Тлумачыў, што, маўляў, нас бамбілі, і ўсе мае дакументы згінулі пры бамбёжцы, усіх сваіх родных я згубіў у акупацыі, застаўся на белым свеце адзін-адзінюткі. І гэта «легенда» прыдалася, тым больш што ніхто яе не правяраў. Я ведаў польскую мову – гэта мне дапамагло, што не рускую, так было больш прасцей. Адносіны з Чэхаславакіяй тады былі самыя сяброўскія, а людзей без роду і племені пасля вайны было многія тысячы.

Вось раздолле адкрывалася для Штырліцаў рознага напрамку! Так і ў Чэхаславакіі Бацян даволі хутка прыжыўся і пачаў «натуралізавацца», як гэта называецца на мове спецслужбаў. Тым больш, што «па Чэхаславакіі» яму працаваць было не патрэбна: тут ён павінен быў правесці нейкі час, адчуць сябе сапраўдным чэхам, пасля чаго эмігрыраваць у нейкую краіну, адкуль сыходзіла пагроза для Савецкага Саюза. Такіх краін было тады нямала.

– Прыехалі мы ў Чэхію, – распавядае далей Аляксей Мікалаевіч, – там размеракаванне было такое, што нас накіравалі кіламетраў за сто на захад ад Прагі: Судэцкая вобласць, горад Жацец. А далей хто куды. Як аказалася, у чэхаў, якія ехалі адсюль, спецыяльнасць была: хто быў мясніком, хто – сталяром, хто яшчэ чорт ведае кім, але месцы яны сабе знаходзілі. А што мне рабіць пры маім слабым валоданні чэшскай мовай? Настаўнікам у школу не пойдзеш. Пра іншыя мае навыкі, як вы разумееце, на гэты час трэба было забыцца... Вось і вырашыў я ісці на завод у горад Хамутоў, што непадалёку ад Жацеца. Там было прадпрыемства па вытворчасці бясшоўных труб для нафтавай і газавай прамысловсці. Мне прапанавалі працаваць слесарам. Ну, ладна, пайшоў, хаця я ніколі не працаваў слесарам і нават ніякага ўяўлення аб гэтым не меў! Але я ніколі не маркоціўся – чаго не ведаў, пра тое пытаўся. Мне расказваюць – я калі не разумею, то прашу паўтарыць або паказаць... Людзі там да мяне вельмі добра ставіліся – разумелі, што я рээмігрант, што нікога ў мяне не засталося, таму спачувалі і дапамагалі. Для таварышаў я быў Лозіка, Лео... Не хачу сябе хваліць, але кумекаў я хутка, так што неўзабаве стаў сапраўдным слесарам. Але я сваім майстэрствам не ганарыўся і для далейшага стараўся больш пытацца, каб як мае быць ва ўсё ўнікнуць... Што яшчэ? Жыў як усе. Атрымаў невялікі пакойчык, хадзіў на работу, кармілі нядрэнна; сам сабе шкарпэткі цыраваў. Цяжка, праўда, жылося ў пасляваеннай Чэхаславакіі...

Кожны тыдзень у вызначаны час Алаіз Дворжак з'яўляўся у вызначаным месцы і чакаў сувязніка. Міналі тыдні, месяцы, а сувязі ўсё не было. Ні сувязі,

ніякай дапамогі, як быццам у далёкай Маскве пра яго наогул забыліся. Баявы афіцэр дзяржбяспекі, кавалер двух ордэнаў Чырвонага Сцяга стаў чэшскім слесарам, прычым невядома, ці надоўга. Магло быць, што і назаўсёды, да канца свайго жыцця, як сталася з адным чэкістам, сябрам Бацяна па атрадзе Карасёва. Ён таксама быў накіраваны ў Чэхаславакію адначасова з Бацяном, асеў дзесьці пад горадам Пльзень, уладкаваўся на работу грузчыкам, таму што спецыяльнасці грамадзянскай таксама не меў. Пасля ў яго рэзка пагоршылася здароўе, разведчык цяжка захварэў. Пра гэта паведамілі ў Цэнтр, але вывезці яго не паспелі, ён хутка памёр, і яго пахавалі пад чэшскім прозвішчам. Так магло стацца і з Аляксеем Бацяном. Ды што Цэнтру было да нейкага лейтэнанта дзяржбяспекі, калі лбы трашчалі ў генералаў!

У гэты перыяд органы дзяржаўнай бяспекі трапілі пад чарговую рэарганізацыю, звязаную з заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны. Была яна цалкам лагічнай і неабходнай. У сакавіку 1946 года на сесіі Вярхоўнага Савета СССР быў створаны Савет Міністраў – замест Савета Народных Камісараў, гісторыя якога бярэ пачатак з 1917 года. У ліку іншых міністэрстваў было створана і Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (МДБ) СССР, у састаў якога ўвайшлі ўсе структуры былога НКДБ. Міністрам дзяржбяспекі стаў В. С. Абакумаў, які ў гады вайны кіраваў контрразведкай «Смерш». Яму прысвоілі званне генерал-палкоўніка.

Між тым савецкія спецслужбы зноў пачалі трэсці чарговыя пераўтварэнні. Вось што з гэтай нагоды пісаў генерал-лейтэнант Судаплатаў: «Вайна паказала, што палітычная і ваенная разведка не заўсёды кваліфікавана спраўлялася з ацэнкай

і аналізам усёй інфрамацыі, якую яна арымлівала па сваіх каналах. І тады Молатаў, які перад Ялцінскай канферэнцыяй некалькі разоў старшынстваваў на нарадах кіраўнікоў спецслужбаў, прапанаваў аб'яднаць іх у адну цэнтралізаваную арганізацыю. Сталін згадзіўся з гэтай прапановай – так з'явіўся на свет Камітэт інфармацыі, куды ўвайшлі 1-е ўпраўленне МДБ і Галоўнае разведупраўленне Міністэрства абароны. Што тычыцца Міністэрства дзяржбяспекі, то вырашана было захаваць у яго складзе спецыяльную службу разведкі і дыверсій – на выпадак магчымай вайны ці лакальных канфліктаў на Бліжнім Усходзе, у Еўропе, на Балканах або на Далёкім Усходзе. Аналагічнае падраздзяленне было захавана і ў Міністэрстве абароны». Такім чынам, аддзел «ДР» усё-такі застаўся ў сістэме МДБ.

А вось што сведчаць пра стварэнне Камітэта інфармацыі тыя ж замежныя крыніцы: «...У гэты час партыя і Сталін клапаціліся, каб аслабіць армію і МДБ, якія ўзмацнілі свае пазіцыі на працягу вайны да такой ступені, што яны перасталі пацвярджаць грамадзянскае падпарадкаванне партыі. Вядучыя камандуючыя, якіх узначальваў Жукаў, былі звольнены з арміі, а Берыю пазбавілі лідэрства ў МДБ... Каб аслабіць армію і Міністрства дзяржаўнай бяспекі, Сталін вырашыў выдаліць разведку з арміі і МДБ. Гэты план выканалі ў 1947 годзе. ГРУ і органы палітычнай разведкі Міністэрства дзяржбяспекі былі злучаны ў адну арганізацыю – Камітэт інфармацыі... Уся разведка на далейшае была залежнай ад партыі. Такая сітуацыя не задавальняла армію і МДБ, і яны ўпершыню аб'ядналіся супраць партыі.

З самага пачатку Камітэт інфармацыі аказаўся вельмі неэфектыўнай арганізацыяй. Афіцэры

разведкі МДБ і ГРУ, якія сфарміравалі асноўнае ядро Камітэта, імкнуліся выйсці з-пад кантролю партыі назад да ўласных былых арганізацый. Абодва саставы афіцэраў імкнуліся сарваць дзейнасць Камітэта інфармацыі. МДБ і армія, дзейнічаючы ў змове, інфарміравалі Цэнтральны Камітэт, што яны не могуць больш працаваць эфектыўна, бо атрымліваюць інфармацыю з другіх рук. Яны націснулі на сваіх былых афіцэраў, каб паспрабаваць разваліць Камітэт інфармацыі знутры. Цэнтральны Камітэт партыі прыкладваў усе намаганні, каб палепшыць эфектыўнасць Камітэта інфармацыі. Менш чым праз год чатыры кіраўнікі Камітэта былі прызначаны і звольнены з той прычыны, што яны не маглі супрацьстаяць аб'яднанай сіле Міністэрства дзяржаўнай бяспекі і арміі...»

Так што справа тут не ў тым, што «палітычная і ваенная разведка не заўсёды кваліфікавана спраўляліся з ацэнкай і аналізам усёй інфармацыі», як піша пра гэта Судаплатаў. Камітэт інфармацыі быў створаны для іншай мэты, а менавіта для таго, каб аслабіць уплыў арміі і МДБ, захаваць уладу партыі нават пры той умове, што гэта здорава пашкодзіла б органам разведкі. У выніку рэарганізацыі органаў былое разведупраўленне НКУС–НКДБ, якое з'яўлялася асноўным інструментам забеспячэння інтарэсаў дзяржбяспекі за мяжой, ператварылася ў прыдатак Міністэрства замежных спраў, асноўная дзейнасць якога – дыпламатыя, а не разведка. Як і Камітэт інфармацыі, міністэрства знаходзілася пад кантролем Молатава, а значыць – партыі.

Напэўна, ужо так павялося, што на ўсе часы ў Расіі палітыкі лічылі сябе самымі разумнымі – нават больш разумнымі за розных прафесараў

і прафесіяналаў, пісьменнікаў і мастакоў, усіх шырокіх народных мас. Усіх яны спрабавалі вучыць, усім давалі «каштоўныя ўказанні», усіх настаўлялі, як жыць. І зразумела, што такім «вялікім кіраўнікам» у Цэнтры за ўсімі «перабудовамі» было ўжо зусім не да замежных нелегалаў, нават тых, хто па «заданні Радзімы» рыхтаваўся да важнай місіі ў іншай, далёкай краіне. Нягледзячы на тое, што краіна гэта ўяўляла значны аператыўны інтарэс, вялікую цікавасць для разведкі.

Зразумеўшы, што сувязі і дапамогі ён можа і не дачакацца, Аляксей Бацян вырашыў узяць лёс ва ўласныя рукі. Ён жа прайшоў вялікую школу выжывання ў розных экстрэмальных умовах: у начным заснежаным марозным лесе, пад прыцэльным агнём праціўніка, у варожым акружэнні. А тут – спакойная дружалюбная краіна, цывілізаванае грамадства, людзі, якія паблажліва адносяцца да свайго земляка-сіраты, ёсць работа і жыллё. І наш герой прыняў адзінае правільнае ў тых умовах рашэнне: вучыцца і рухацца далей.

– Вось я і задумаўся, – працягвае свой аповед Аляксей Мікалаевіч, – колькі ж я яшчэ буду слесарам працаваць? Не ўвесь жа свой век! Трэба кудысьці выходзіць. Аказалася, што ў нашым горадзе можна атрымаць сярэднюю тэхнічную адукацыю – тут знаходзілася так званая Вышэйшая прамысловая мотабудаўнічая школа. Канструктарскі факультэт. Аднак, каб трапіць туды, трэба было закончыць ФЗН, а для паступлення ў ФЗН належыла мець мінімальна восем класаў. Да таго ж патрабавалася рэкамендацыя майстра – адтуль, дзе ты працуеш. Але гэта, як разумееце, для мяне было самае простае... Ды ніякіх дакументаў аб адукацыі ў мяне

не было, не гаворачы пра тое, што ніякага ФЗН я не заканчваў. Ну, прыходжу я туды, у гэту самую школу, кажу, што я рээмігрант, прыехаў з Валыні – не з Расіі, не, нас так і называлі – «валынскія чэхі», – і хачу быць карысным сваёй Радзіме, Чэхаславакіі. Але дырэктар, ці хто там, гаворыць: «Трэба вам ехаць у Прагу, у Міністэрства вышэйшай і сярэдняй асветы, каб нам далі каманду!»

Аляксей неадкладна паехаў у Прагу. А там, у міністэрстве, аказаўся непрыёмны дзень!

– Сказаў я дзяжурнаму, што я – няшчасны чалавек, – расказвае далей Аляксей Мікалаевіч. – Маўляў, бацькі мае загінулі, я сам прыехаў на радзіму, цяпер вось хачу адукацыю атрымаць, а ўсе паперы мае згарэлі... Дзяжурны па міністэрстве мне паспачуваў і патэлефанаваў якомусьці рэферэнту. Няхай, адказалі дзяжурнаму, падыходзіць. Я падняўся наверх, на нейкі, не памятаю, высокі паверх, адкуль уся Прага цалкам была відаць. Лета было, вельмі ўсё прыгожа! Наогул, Прага – гэта цудоўны горад! Зайшоў я ў той кабінет, куды мне было сказана, мне там усялякія хітрыя пытанні задаваць сталі, але я ведаў, як адказваць: я прыехаў на радзіму сваіх продкаў, хачу быць карысным роднай Чэхаславакіі!

Якімі былі гэтыя пытанні, можна меркаваць па тым, якое Бацяну задаў субяседнік пад канец аўдыенцыі: ці з’яўляецца ён членам партыі? Аляксей зрэагаваў правільна: ён ведаў, што ў Чэхіі тады, у 1948 годзе, сказаць пра сваё членства ў партыі камуністаў было яшчэ небяспечна, бо, хаця Клімент Готвальд нядаўна і стаў прэзідэнтам, старая апазіцыйная буржуазная інтэлігенцыя захавала

свае антысавецкія пазіцыі, і такія прызнанні былі б рызыкоўнымі.

«І там я ў партыі ніколі не знаходзіўся, і тут таксама я беспартыйны!» – цвёрда і ўпэўнена адказаў Бацян. І па выразу твару свайго субяседніка зразумеў, што адказаў так, як і трэба. Ілгаць ён навучыўся прафесійна —такая служба ў нелегала.

«Ну, вяртайцеся да сябе, а я патэлефаную ў школу, дам каманду, каб вас прынялі з выпрабавальным тэрмінам».

– Я прыйшоў туды, у гэту школу, кажу, хто я такі. Мне адказваюць: так, з Прагі званілі, – і з 1 верасня я стаў туды хадзіць, вучыцца, – успамінае Аляксей Мікалаевіч. – Чэшскай мовы я не ведаў, толькі польскую, так што спачатку на лекцыях я толькі здагадваўся пра нешта... Уяўляеце, як я жыў? Заняткі былі з 8 раніцы да 14 гадзін. Шэсць гадзін! А з дзвюх да шасці на заводзе працаваў, жыць трэба было з нечага! Нашы ж пра мяне забыліся, ніякай матэрыяльнай дапамогі мне ніадкуль не было. Пасля я прыходзіў у свой пакойчык і займаўся... Мы вывучалі чэшскую мову і літаратуру. Але ж я ніякі не чэх, што я там ведаў? Трэба было ўсё вывучаць з нуля – культура, традыцыі, быт, норавы, звычкі. На шчасце, прафесар па чэшскай мове і літаратуры аказаўся амаль маім равеснікам. Я расказаў яму, хто я такі і які я няшчасны... Ён мне кажа: «Леа, я ведаю, што, калі ты пачнеш пісаць, – гэта кол. Але я табе даю падручнікі. Вывучы гэта і гэта. Ты павінен ведаць, што менавіта пісьменнік напісаў і што ён гэтым сказаць хацеў...» Я добра натрэніраваў за гэты час памяць, таму вывучаю неабходнае і прыходжу на заняткі. Ён мне: «Дворжак! Хто напісаў гэты твор?» Адказваю. «Што ён гэтым творам хацеў сказаць?»

Гавару. «Сядай, выдатна!» Так і вучыўся год. Цяжкавата мне было, бо мовы, паўтару, я не ведаў. Але ўсё-такі экзамены за першы курс здаў. А пасля ўсё наладзілася, і я закончыў гэту школу амаль ці не на выдатна, прынамсі, ніводнай тройкі ў мяне не было. Я атрымаў спецыяльнасць канструктара, так што любую канструкцыю магу зрабіць: масты, пад'ёмныя краны, аўтамабілі... Усё сам магу вылічыць – які матэрыял патрэбен, што, як... Вельмі добрую адукацыю даюць чэхі! Пасля заканчэння школы мяне накіравалі ў Іакімавецкія ўранавыя руднікі – я быў там механікам, на гэтых рудніках. Працаваў там выдатна, зарплата вялікая была...

## ЦЭНТР ПРЫСЫЛАЕ СУВЯЗНОГА

...Аляксей Бацян з таварышамі-аднакурснікамі адзначаў паспяховую здачу экзамена за першы курс і званне другакурснікаў у невялічкім утульным кафэ. Тут было светла і весела, студэнты нават запелі народныя песні, якія паспеў ужо вывучыць і Лео. У разгар застолля да іх падышоў незнаёмец і, звярнуўшыся да аднаго са студэнтаў, папрасіў запальнічку. Гэта быў пароль: нарэшце з'явіўся сувязнік. Умоўленай фразай яму адказаў Бацян. Тыя словы азначалі месца і час сустрэчы. Так была наладжана доўгачаканая сувязь з Цэнтрам.

Неўзабаве на канспіратыўную сустрэчу да Бацяна прыехаў начальнік аднаго з аддзелаў іх падраздзялення – службы дыверсій і індывідуальнага тэрору – Герой Савецкага Саюза Я. І. Міркоўскі. Праходзіў кантакт у вядомых Карлавых Варах. Гэта сустрэча была для Аляксея

вельмі важнай: па-першае, ён атрымаў адпаведныя інструкцыі, па-другое, Яўген Іванавіч уручыў Бацяну немалую суму грошай. Пры гэтым Міркоўскі папярэдзіў разведчыка, каб ён не вельмі раскідваўся грашыма на вачах сваіх сяброў: «Глядзі, каб ніхто не заўважыў, што ў цябе грошы ёсць! Можаш спажываць далікатэсы, але так, каб ніхто не бачыў!» Ну і самае галоўнае: Бацян атрымаў ад Міркоўскага вельмі адказнае даручэнне.

– Міркоўскі мне сказаў, што яму неабходна сустрэцца з яшчэ адным нашым супрацоўнікам, чэхам па нацыянальнасці, які раней працаваў у нашым Жытомірскім упраўленні, – гаворыць Аляксей Мікалаевіч. – Я сказаў, што з'езджу і яго выклічу. Я яго ведаў, бо мы ў Чэхаславакію разам ехалі...

І паездка гэта для Леа Дворжака-Бацяна аказалася адметнай. У кватэры яго знаёмага акрамя гаспадара былі яго пляменніца і яе сяброўка – Галіна Фіксель – з нашых савецкіх чэшак, прыехала сюды з Украіны. Сям'я Галіны Уладзіміраўны была з тых «валынскіх чэхаў», што прыехалі ў Чэхаславакію на свабодныя сілезскія землі і пасяліліся на самай мяжы з Заходняй Германіяй. Прыгожая прыемная дзяўчына працавала зубным тэхнікам. Пры знаёмстве яна ласкава ўсміхнулася Дворжаку, падала руку і сарамліва вымавіла: «Галя».

Сэрца Аляксея забілася хутчэй, і на душы стала светла і ў той жа час трывожна: яму прыпомнілася іншая дзяўчына з партызанскім псеўданімам «Галя» – Зіна Літвіненка, смелая радыстка з яго атрада, якая на нядоўгі час стала баявой сяброўкай Бацяна. Але ён узяў пачуцці ў кулак і таксама з прыемнай усмешкай назваў сябе. Так завязалася

гэта знаёмства, якое неўзабаве перарасло ў вялікае пачуццё, і Алаіз Дворжак прапанаваў Галі выйсці за яго замуж.

Жаніцьба для кожнага – справа сур'ёзная і адказная, а для разведчыка – тым больш. Дадатны бок справы тут у тым, што жаніцьба ўмацоўвае тваю «легенду», не трэба заводзіць нейкія сумніўныя сувязі. А з другога боку, ты трапляеш пад пастаяннае назіранне тваёй новай сям'і. Пра сваё рашэнне жаніцца Аляксей далажыў куратару – таму ж Міркоўскаму. Сказаў, што яна савецкая дзяўчына, была ў камсамоле.

– Ну што ж, жаніся! – пасля кароткага роздуму сказаў куратар. – Але май на ўвазе: калі спатрэбіцца, ты яе пакінеш!

І Аляксей Мікалаевіч пасля гэтых слоў канчаткова зразумеў, што Чэхія для яго была толькі трамплінам, каб ён, натуралізаваўшыся, ужо сапраўдным чэхам перабраўся ў іншую краіну. Там і павінна быць сапраўднае асяданне. А раптам жонка адмовіцца ехаць ці яшчэ што-небудзь здарыцца...

– Наогул было ў мяне вяселле, – гаворыць Аляксей Мікалаевіч, – а нявеста, а пасля і жонка не ведала, хто я такі. Думала, што выйшла замуж за чэха. Не ведала яна гэтага, аж пакуль не пераехалі мы ў Расію. У Карлавых Варах нарадзілася ў нас дачка... Бацька Галіны добра прыладкаваўся – ён загадваў гаражом, і гэта яго і згубіла. Як і ў Расіі, усё ішло «праз гэту справу» – тады ж быў велізарны дэфіцыт транспарту, таварышы прыходзілі і «дамаўляліся». Так што цесць выпіваў, і нямала. У доме паміж старэйшым пакаленнем, цесцем і цёшчай, здараліся скандалы... А наогул, «жыццё наладжвалася», і я паспяхова ўваходзіў у сваю ролю мужа і зяця.

А вось у Маскве было неспакойна: рэарганізацыя і барацьба спецслужбаў працягваліся з неаслабнай сілай. Пасля таго як Камітэт інфармацыі ўзначаліў В. С. Абакумаў – вучань і фаварыт Берыі, – уся разведка трапіла пад кантроль КДБ. Сталін адразу зразумеў, што зроблена вялікая памылка. На яго думку, стварэнне адной разведслужбы, нават пад лідарствам партыі, павінна было рана ці позна дазволіць ЧК поўнасцю падпарадкаваць і ўстанавіць абсалютную ўладу над гэтай арганізацыяй, што магло стаць смяротнай небяспекай для партыі. Быў толькі адзін шлях выхаду з падобнай сітуацыі – неадкладна ліквідаваць Камітэт інфармацыі і раздзяліць разведвальную службу на два варожыя лагеры – ваенная разведка ў арміі і палітычная разведка МДБ.

Каб вырашыць праблему, партыя знайшла падтрымку ў арміі, якая не згаджалася з манаполіяй дзяржаўнай бяспекі на разведслужбы. Па інструкцыях Сталіна, намеснік начальніка Генеральнага штаба Штаменка зрабіў даклад у Палітбюро на тэму «сляпога Генштаба», пасля чаго ГРУ было выведзена з-пад падпарадкавання Абакумава і перададзена арміі. Сталін неадкладна прызначыў генерала Штаменку начальнікам Генеральнага штаба і прысвоіў яму № 8776. Прайшло два гады, і Штаменка далажыў Сталіну пра змову сярод падначаленых Абакумава, прадставіў адпаведныя дакументы. Абакумава адразу ж расстралялі, Камітэт інфармацыі адмянілі, і пайшла звычайная чыстка ў радах дзяржаўнай бяспекі. Безумоўна, Міністэрства дзяржбяспекі неабходна было рэарганізаваць: яго штаты выраслі ў параўнанні з даваеннымі

амаль у тры разы. Аднак дакладная праграма рэарганізацыі ў кіраўнікоў краіны адсутнічала.

Пасля смерці Сталіна разгром сістэмы бяспекі толькі ўзмацніўся: новае кіраўніцтва СССР спяшалася ўстанавіць свой кантроль над спецслужбамі. Для гэтага вырашылі выключыць усіх стаўленікаў Берыі, якога арыштавалі 26 чэрвеня 1953 года і расстралялі ў снежні. У ліку арыштаваных «стаўленікаў» аказаўся і генерал-лейтэнант Судаплатаў. Ні Судаплатаву, ні Абакумаву, ні цэламу шэрагу вышэйшых кіраўнікоў дзяржбяспекі ніякія іх велізарныя ваеннныя заслугі не ўлічылі. Павел Анатольевіч Судаплатаў атрымаў пятнаццаць гадоў зняволення і выйшаў на волю ў 1968 годзе.

– Калі б наша кіраўніцтва, Эйцігон і Судаплатаў, заставаліся на сваіх месцах ва ўладзе, то мой лёс склаўся б зусім іншым чынам, – распавядае Аляксей Мікалаевіч. – Гэта я цвёрда ведаю! Але іх арыштавалі, прыйшлі новыя людзі і абвясцілі, што ўсё, што рабілі нашы папярэднікі, – гэта нікуды не варта, ідзе на шкоду савецкай уладзе. Пасля гэтага мяне без усякіх на тое тлумачэнняў адклікалі. Было гэта на пачатку 1955 года. Я вярнуўся ў Маскву. Мая жонка і дачка засталіся ў Чэхаславакіі. ...Прыходжу на Лубянку і даведваюся, што мяне скаацілі. Мне кажуць: «Едзь у Беларусь!» Кажу: «Што я там, калгаснікам буду працаваць, ці што? Я абараняў Маскву – дайце мне жылплошчу ў Маскве, і пайшлі вы ўсе к чортавай мацеры!» Вось так я, чэсна, і сказаў! Я пражыў сярод чужых людзей – не прапаў, я і тут не прападу! Так і здарылася... Я быў звольнены па скарачэнні штатаў.

Аляксей застаўся адзін у вялікім горадзе і з Лубянкі накіраваўся проста ў невядомасць.

Нельга нават падлічыць, колькі таленавітых, адукаваных людзей згубіў гэты горад, якія, не паспеўшы збегчы адсюль, апускаліся на самае «дно», каб згінуць там бясследна. Але «чэкісты ніколі не здаюцца» – гэты дэвіз Бацян памятаў цвёрда, і не толькі памятаў – заўсёды кіраваўся і карыстаўся ім. Быў у яго просты выхад: плюнуць на ўсё і вярнуцца да сваёй сям'і ў Чэхаславакію, краіну больш спакойную, чым пасляваенны Савецкі Саюз. Там чакалі яго дом, прэстыжная работа і матэрыяльны дастатак. Такія думкі калі-нікалі на імгненне ўзнікалі, ды ён не даваў ім ходу: інстынктыўна Аляксей Мікалаевіч верыў, што яшчэ спатрэбіцца і зможа Радзіме паслужыць. Днямі ён хадзіў па горадзе, успамінаў ваенныя гады, трывожныя дні і ночы абароны Масквы, неаднаразова праходзіў каля дома, дзе ён займаў пост ля акна-амбразуры ў 1941-м.

І вось аднойчы проста на Кузнецкім мосце сустрэў свайго баявога таварыша, які таксама быў звольнены па нейкай смешнай падставе з органаў: ці то як «стаўленік», ці то па «справе аб сіяністцкай змове ў МДБ». А ў гэтага таварыша аказаліся вялікія сувязі, і ён паспеў ужо стаць намеснікам дырэктара рэстарана «Прага», аднаго з лепшых у Маскве.

– Яны ў гэты час якраз падбіралі кантынгент з веданнем замежных моў, – дзеліцца ўспамінамі Бацян. – А ў мяне – чэшская, польская і нямецкая. «Слухай, Аляксей, калі хочаш, ідзі да мяне працаваць!» – прапануе ён. Я прыйшоў, і мяне тут жа аформілі... Пасля была падрыхтоўка – месяцы два, напэўна, мяне навучалі таму, як гасцей сустрэць, як правесці, якія стравы прапанаваць. І так я стаў там працаваць...

## І ЗНОЎ – «ПРАГА»: «NEHMEN SIE, PLATZ, BITTE!»

Уявіце сабе: прыходзіць іншаземец у «Прагу», і ля дзвярэй яго сустракае элегентны, падцягнуты метрдатэль у беззаганным смокінгу, белай кашулі з «бабачкай», ветлівы, спакойны, праводзіць у залу, на яго роднай мове прапануе зручнае месца, усаджвае і кліча афіцыянта. Вось цяпер Аляксей быў цалкам падобны на сапраўднага Штырліца! Але чаму быў падобны? Ён і сапраўды заставаўся Штырліцам – агентам спецслужбы, якая ад яго пазбавілася, але, тым не менш, не выпускала з-пад сваёй увагі.

У архіве службы знешняй разведкі (СЗР) знайшліся пацвярджэнні гэтаму: «Працуе ў рэстаране “Прага” з красавіка 1955 года на пасадзе адміністратара-перакладчыка. Праявіў сябе ініцыятыўным, добрасумленным работнікам. У правядзенні адказных абслугоўванняў праявіў сябе з лепшага боку. Спагнанняў не мае. Выконвае партыйныя даручэнні»; «За час работы ў рэстаране праявіў сябе з лепшага боку. З абавязкамі метрдатэля спраўляецца. Палітычна пісьменны, маральна ўстойлівы. Сістэматычна займаецца над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. З мэтай павышэння сваёй кваліфікацыі займаецца на курсах метрдатэляў»; «У рабоце праяўляе ініцыятыву, патрабавальны да сябе і таварышаў. Сярод калектыву карыстаецца заслужаным дзелавым аўтарытэтам. За добрую работу ў IV квартале 1956 года занесены на дошку гонару Масрэстарантрэста».

Такія высокія адзнакі работы Бацяна на гэтай пасадзе змяшчаюць яго характарыстыкі за

1956–1957 гады. А якую ж ініцыятыву праяўляў Аляксей Мікалаевіч у рэстаране?

– Калі трэба было, – успамінае Бацян, – я, як старшы метрдатэль, усаджваў «патрэбных людзей» за «патрэбны» падрыхтаваны столік... Уключаў тэхніку, слухаў размовы... Я ж падтрымліваў сувязь з нашымі – з другім глаўкам.

Другое галоўнае ўпраўленне КДБ – гэта, як вядома, контрразведка. Аляксей працягваў служыць Радзіме, свайму ведамству, не таіў доўга крыўды на яго, а даказаў сваю вернасць спецслужбе. І гэта неўзабаве атрымала высокую і чаканую адзнаку. Бацяна запрасілі на Лубянку.

– Ну як, назад пойдзеце? – спыталі там яго без усякіх рэверансаў.

– З вялікім задавальненнем! – не раздумваючы адказаў Аляксей.

Вось тады, у 1957 годзе ён і атрымаў званне маёра дзяржбяспекі.

Тым часам сям'я таксама аказалася ў Маскве. Амаль год жонка з дачкою жылі ў бацькоў у Чэхаславакіі. Пасля Галіна Уладзіміраўна стала трывожыцца: ад мужа не было ніякіх вестак, і яна звярнулася да ўлад з патрабаваннем знайсці яго. Пра гэта стала вядома нашай разведцы, і да Галі прыехаў таварыш Аляксея Мікалаевіча – Міша Анціпаў.

Вось як пра гэты эпізод распавядае Бацян: «Я прыехаў сюды адзін, а Галіна Уладзіміраўна толькі і ведала, што я паехаў у Расію. Але час ідзе, а мяне ўсё няма і няма! Нейдзе ўжо амаль год прайшоў – і яна падняла шум: муж паехаў, і няма мужа. Дзе ён? Тады да яе прыехаў мой таварыш Міхаіл Анціпаў. Пытаецца: "Паедзеце за мужам?" –

"Паеду!" – адказвае, не пытаючы, куды. "Тады кідайце рэчы – і паехалі!" Яна хутка сабралася, пакінуўшы практычна ўсё, акрамя самага неабходнага, узяла з сабою маці і дачку, і Анціпаў прывёз іх на машыне проста ў Чоп. Гэта была пагранічная станцыя... Прывёз ён іх, правёў куды трэба і сам паехаў. Не трэба было яму там доўга "адсвечваць". Тут я пад'ехаў, сказаў пагранічнікам, хто мне патрэбен... Пагранічнік кажа Галіне: "Вось, прыехаў за вамі такі Бацян..." Яна адказвае: "Не ведаю такога!" Я ж там Дворжак быў, а не Бацян! І яна мяне толькі як Дворжака ведала... Вечар, цемень, яна мяне не бачыць... Але тут Іра, дачка, яна маленькая – чатыры гады ёй было, мяне ўбачыла. Яна вырвалася ад пагранічнікаў, крычыць па-чэшску: "Тацінка! Тацінка!" – "Татачка! Татачка!" Пагранічнік змікіціў, прапусціў... Прыехалі мы ў Маскву – кватэры не было, але добрыя таварышы, з якімі мы працавалі, на некалькі дзён у сябе прытулілі, а пасля мне далі пакой на Каляеўскай вуліцы...»

Так наладзілася і сямейнае жыццё нашага героя. Пра гэты перыяд, пра сямейны ўклад і ўмовы пражывання дачка Бацяна – Ірына Аляксееўна – так расказвала аўтару кнігі «Сапраўдная гісторыя "Маёра Віхра"» А. Ю. Бандарэнку: «У нас быў выдатны пакой у камунальнай кватэры ў цэнтры Масквы. А спачатку, калі мы толькі прыехалі, мы жылі наогул у знаёмых. Нас прытулілі татавы сябры, у невялікай двухпакаёвай кватэры жылі наша сям'я і іх сям'я – нас было чацвёра і іх было чацвёра... Мая бабуля, я так скажу, наогул нічога не памяняла: яна там была хатняй гаспадыняй і тут была хатняй гаспадыняй. Яна ў нас вяла гаспадарку: магазіны, прыгатаванне ежы... Мама працавала, тата працаваў.

Прэтэнзій у нашым доме ніколі не было, дзякуй богу! Яны вельмі добра, дружна жылі! Хаця ў нас усё было падпарадкавана тату, усё наша жыццё хатняе. Да яго прыходу ў бабулі ўсё было гатова, усё на стале, свежанькае. Гэта было безагаворачна!.. Стравы былі розныя, у тым ліку і з чэшскай кухні. І мама рабіла гэтыя кнедлікі, з бігусам і са свінінай, гэта таксама рабілі, я гэтаму, на жаль, не навучылася. Мне ўсялікія прысмакі, печыва, нават у форме розных звяркоў, варанае ў сметанковай паліўцы, – усё гэта рабілася. Гэта тое, што у мяне засталося ў памяці прынамсі. Мама пасля перайшла на спрошчаны варыянт – калі бабулькі не стала. Не было ўжо калі. А бабуля памерла ў 1981 годзе, у жніўні... Дарэчы, мама з бабуляй называлі бацьку Лёнем. Я пасля здзіўлялася: чаму не Алёша, а менавіта Лёня? Толькі пасля я даведалася, што ў Чэхіі ён быў Леа Дворжак, і мама з ім пазнаёмілася, як з Леа, – таму ён для яе так і застаўся Лёнем на ўсё жыццё. Ёй, як вернай сяброўцы, было ўсё роўна – Аляксей гэта ці Алаіз. У яе ніколі не з'яўлялася ніякага шкадавання, што яна прамяняла Чэхію на Савецкі Саюз. Магчыма, яна ў свой час была ў нейкай ступені гэтым здзіўлена – мне так здаецца, але я ведаю, што ўспрымала яна гэта нармальна. Мне здаецца, што тата больш здзіўляецца, калі гаворыць: "Гэта ж трэба, выехала з СССР пасля вайны, здаецца б, там прыжылася, усё добра – і назад вярнулася туды, дзе нарадзілася!"»

Аляксей Мікалаевіч хадзіў на службу і разумеў, што доўга ў Маскве ён не затрымаецца. Міжнародная абстаноўка ўскладнялася: халодная вайна працягвалася, і разведчыкам работы хапала, асабліва супрацоўнікам знешняй разведкі. Неўзабаве Бацяна запрасілі ў высокі кабінет на Лубянцы.

## ЗАМЕЖНЫЯ КАМАНДЗІРОЎКІ

– Ці не пара вам, пан Дворжак, наведаць свайго блізкага сваяка ў Чэхіі? – з усмешкаю спытаў Бацяна гаспадар кабінета. – Цесць даўно ўжо чакае зяця і сваю дачку. Збірайцеся і выязджайце неадкладна. Ваша асноўнае заданне... – і генерал падрабязна растлумачыў Аляксею Мікалаевічу яго задачу.

У Чэхаславакію Бацян-Дворжак выехаў з жонкай: меркавалася пражыць там даволі доўгі час. «У годзе 1958 ці 1959-м яны з мамай кудысьці паехалі ў доўгатэрміновую камандзіроўку, – успамінае Ірына Аляксееўна. – Думаю, што на нелегальную работу – бо калі яны нам з бабуляй званілі, то не з дому, а аднекуль яшчэ. Гэта я добра памятаю! А мы ім не званілі ні разу. Пасля яны вярнуліся, а ў 1965 годзе тата легальна паехаў у Берлін».

Але да Берліна была адказная работа ў Чэхаславакіі. Праўда, у той час ён наведваўся і ў сваю «кантору» ў сталіцы ГДР. Пра тое сведчаць успаміны генерал-маёра Юрыя Драздова: «З Аляксеем Мікалаевічам Бацяном я пазнаёміўся ў 1957 годзе. Да гэтага я яго не ведаў ніяк. Знаёмства наша адбылося на спартыўнай пляцоўцы, на задворках бальніцы Святога Антонія – гэта ў Берліне, дзе мы кожную раніцу збіраліся для гульні ў валейбол. Замест фіззарадкі. Дык ён там быў – рухавы, скачучы жыўчык, які працаваў, дакладней, служыў у адным з аддзелаў Берлінскага апарата... Там мы і пазнаёміліся. Тое, што ён весяльчак, – гэта вядома, і калі прыйдзеш да іх туды, у падраздзяленне, то голас яго заўсёды быў чуцен. Жывы, энергічны і вельмі добры хлопец такі! Больш я якіх-небудзь адносін у гады работы ў Германіі не

меў, таму што падраздзяленні знаходзіліся ў розных месцах, ён займаўся сваёй справай, я – сваёй...»

Не будзем браць пад сумненне словы Юрыя Іванавіча, бо ён не толькі той чалавек, якому можна верыць, але і той, на чыю памяць цалкам можна спадзявацца. Значыць, з вялікай доляй верагоднасці можна дапусціць, што падчас работы ў Чэхіі Дворжак-Бацян выязджаў у камандзіроўкі ў Берлін, у аддзяленне КДБ, дзе атрымліваў інструкцыі, дзяліўся сакрэтнымі звесткамі, здабытымі разведчыкамі-нелагаламі і ім асабіста. Сам Аляксей Мікалаевіч пра той перыяд сваёй дзейнасці ў Чэхаславакіі гаворыць неахвотна і скупа. Задасі яму канкрэтнае пытанне, а ён неўпрыкмет паверне на іншую тэму і ўхіліцца ад прамога адказу – нічога не папішаш: школа разведкі.

Праўда, у прэсе прамільгнула паведамленне пра чэхаславацкія гады жыцця Бацяна – быццам яму ўдалося тады пранікнуць у разведслужбу варожай дзяржавы і паралізаваць яе дзейнасць. Магчыма, гэта таксама легенда. Што ж у легендарнага чалавека павінны быць і легенды. Паўторымся: сам ён пра той перыяд гаворыць скупа і неканкрэтна. Пасля вяртання Бацяна ў Маскву адбыўся эпізод, які характарызуе нашага героя як кваліфікаванага спецыяліста і эксперта ў сваёй галіне дзейнасці.

Успамінае генерал Драздоў: «Недзе ў 1959 годзе мяне выклікалі да кіраўніцтва. Там было некалькі чалавек, і Бацян там сядзеў тады... Пачалі мяне распытваць: давайце пагаворым на ўкраінскай мове, а якія песні украінскія вы ведаеце, ну і так далей... Такая нібы лёгкая размова, якая ні да чаго не абавязвае. Да мяне звярнуліся таму, што я жыў у Харкаве і крыху размаўляў па-ўкраінску. Бацян ні

пра што не пытаў, толькі глядзеў на мяне і ўважліва слухаў. Так мы пасядзелі, пагутарылі, потым мне кажуць: "Ладна, ідзі, не падыходзіш!" І я спакойна вярнуўся да сваіх спраў. Толькі праз нейкі час мне стала ясна, што мяне разглядалі як чалавека, які мог бы прыняць удзел ў аперацыі па ліквідацыі Бандэры. Але не атрымалася! Бацян там прысутнічаў як спецыяліст, як эксперт...»

Да 1965 года Аляксей Мікалаевіч пасля доўгай замежнай камандзіроўкі заставаўся ў Маскве. Тады і адбылася падзея, вынікі якой праявіліся толькі праз паўвека. Набліжалася 20-годдзе Перамогі, і баявыя таварышы Бацяна падпалкоўнікі ў адстаўцы Герой Савецкага Саюза В. А. Карасёў і П. Р. Пярмінаў вырашылі звярнуцца да начальніка 13-га аддзела генерал-маёра Б. С. Іванова з хадайніцтвам аб прысваенні Бацяну звання Героя Савецкага Саюза: «Пра Алёшу Бацяна мы можам сказаць, што ён унаследаваў лепшыя якасці, якія завяшчаў Ф. Э. Дзяржынскі. Цяпер, напярэдадні дваццаціgоддзя з дня Перамогі над гітлерызмам, мы вяртаемся да думкі – ці не пара па-сапраўднаму ацаніць подзвіг Аляксея Бацяна, прысвоіўшы яму заслужанае званне Героя Савецкага Саюза!»

Тады не збылося. Папера была адпраўлена, каб праляжаць у архіве амаль 50 гадоў. Канкрэтных фактаў з разведдзейнасці Бацяна тады ў яго таварышаў не было: саслужыўцы пра разведвальныя подзвігі Аляксея Мікалаевіча не ведалі абсалютна нічога. І Бацян, не думаючы пра ўзнагароды, зноў спакойна паехаў у тым жа 1965-м на работу ў ГДР. Легальная яго пасада – прадстаўнік «Аэрафлоту» ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Да гэтага яму давялося павучыцца на адпаведных

курсах, бо гэту ролю трэба было выконваць з поўнай суз'ёзнасцю і самааддачай. Яго адразу папярэдзілі, што прадстаўнік «Аэрафлоту» павінен быць камерсантам, і адной з асноўных яго задач з'яўляецца прыцягненне турыстычных кампаній...

Ну, Аляксей Мікалаевіч і паказаў, якім камерсантам ён можа стаць, калі гэта патрэбна для справы. «Прыехаў я ў Берлін, стаў прадстаўніком "Аэрафлоту", і справы ў мяне пайшлі вельмі добра, – распавядае ён. – Хаця гэдээраўцы – яны ж хітрымі былі! Паміж маркамі, гэта значыць валютай ГДР і ФРГ розніца вялікая была, а таму яны на свае самалёты садзілі заходніх немцаў, а на нашы, аэрафлоцкія, – сваіх грамадзян. Я гэта хутка разгадаў, паехаў у Заходні Берлін і стаў дамаўляцца з іх турыстычнымі кампаніямі. Стаў заказваць чартарныя самалёты, а там па сто і больш чалавек, і вось адзін самалёт адпраўляю, другі... Усе заходнія кампаніі, якія накіроўвалі сваіх турыстаў на адпачынак, я перахопліваў! А гэдээраўцаў садзіў на іх самалёты – у іх жа быў "Інтэрфлюг".

Аднойчы адбыўся выпадак, калі немцы на свой "Інтэрфлюг" не маглі пасадзіць сваю ўрадавую дэлегацыю! Усё было забраніравана. Яны звяртаюцца да мяне, і я саджу нямецкую ўрадавую дэлегацыю на свой "Аэрафлот". А на свой яны не маглі! Усё вельмі добра атрымлівалася! Я ўвесь час загрузкі ім даваў – даваў "Аэрафлоту" прыбытак. Напэўна, і шанцавала мне, ды я і мікіціў у гэтай справе – вось усё і пайшло... І ў маскоўскага кіраўніцтва да мяне вельмі добрыя адносіны былі. Мне нават прапаноўвалі іншае месца – у іншай дзяржаве. Прыехаў з Масквы генерал з "Аэрафлоту"

і, убачыўшы як добра ў мяне ідуць справы, сказаў: "Я звярнуся ў ЦК, каб вас перавялі на нашу работу"».

Але ў Бацяна была свая, асноўная работа і зусім іншае жыццё. У той час савецкія разведчыкі на тэрыторыі ГДР працавалі не «па Усходняй Германіі», а ў цесным кантакце са сваімі ўсходнегерманскімі калегамі – супраць служб і агрэсіўных памкненняў краін НАТА. Пра гэту работу пісаў і былы кіраўнік знешнепалітычнай разведкі ГДР Маркус Вольф: «На пачатку дзейнасці нашай знешнепалітычнай разведкі саветнікі з СССР адыгрывалі значную, калі не сказаць дамінуючую, ролю. Гэта становішча мянялася па меры "сталення" нашай службы...

У мяне пыталіся не адзін раз: чаму Масква стварыла сабе ў асобе нашай службы нямецкага канкурэнта, які неўзабаве набыў пачуццё ўласнай годнасці і ў многім пераўзыходзіў савецкую разведку ў Германіі? Я думаю, што ў Маскве з поўнай падставай лічылі: нямецкай службе будзе ў пасляваеннай Германіі лягчэй, чым рускім, дабірацца да пэўнай інфармацыі, якую брацкая служба будзе прадастаўляць савецкаму боку. Так яно і было, прынамсі, спачатку...»

Аляксей Мікалаевіч працаваў у Германіі з 1965 па 1972 г. Яго асноўным абавязкам былі сувязі з сем'ямі маладых нямецкіх нелегалаў, якія знаходзіліся за мяжой, у Заходняй Германіі. Ён быў куратарам гэтых агентаў.

«У мяне з імі былі вельмі добрыя адносіны, – успамінае Бацян, – Асабліва з немкамі. Яны мяне "Алэксэй" звалі. Жыццё было вясёлым... Немкі – цікавыя жанчыны! Яны любілі замежныя сігарэты, а я заўсёды меў добрыя адносіны з заходнімі лётчыкамі – прашу, прывязі мне сігарэты вось такія.

Плаціў ім гэдээраўскімі маркамі, гэта ім таксама было выгадна. Ну, а я сігарэтамі падкупляў...»

Добрыя адносіны ў Аляксея Мікалаевіча склаліся не толькі з сем'ямі немцаў-нелегалаў, дзейнасць якіх ён накіроўваў і курыраваў па лініі сваёй службы – знешняй разведкі КДБ. Ён устанавіў добрыя кантакты з гэдээраўскімі пагранічнікамі, і, калі трэба было нелегальна правесці свайго агента так, каб ніхто не ведаў, Бацян вёў яго праз службовы ход без праверкі са словамі: «Са мной...» і гэтага было дастаткова.

Звернемся да ўспамінаў былога начальніка Упраўлення «С» (нелегальная разведка) ПГУ КДБ СССР, назавём яго Міхаілам Пятровічам, які пазнаёміўся з Бацяном у 1968 годзе, калі толькі закончыў «101-ю школу»: «У тым прадстаўніцтве КДБ пры МДБ ГДР, як называлася наша "кантора", куды я быў размеркаваны і дзе працаваў, працаваў і Аляксей Мікалаевіч. Дэтальна я з яго дзейнасцю не знаёмы, але ў агульным ведаю, чым ён займаўся: ён працаваў з сем'ямі немцаў, агентаў-нелегалаў, якія знаходзіліся ў Заходняй Германіі. Яны або "на асяданне" туды выязджалі, або ў паездках розныя заданні выконвалі – ад тыдня да некалькіх месяцаў...»

– Чаму менавіта Аляксей Мікалаевіч займаўся гэтай работай? – працягвае размову Міхаіл Пятровіч. – Работа гэта вельмі далікатная, і патрэбен па-сапраўднаму душэўны чалавек. У Бацяна ёсць такая залатая якасць: на мой погляд, ён, бадай, з любым чалавекам можа знайсці агульную мову. Ён не да ўсіх аднолькава ставіцца, але вось падтрымаць кантакт, быць цікавым суразмоўцам – гэта ён можа ў адносінах да любога чалавека. А такое

не ўсім дадзена! Калі-нікалі пара пытанняў, і ўжо не ведаеш, што сказаць... Але Аляксей Мікалаевіч – не, не такі. Да таго ж ён валодае велізарным баявым вопытам і многае ведае нібы знутры. Напэўна, таму яму і даручылі такі ўчастак. Чаму яшчэ, сказаць мне цяжка. Але мне вядома, што ён вельмі многіх немцаў, нашых агентаў-нелегалаў, ведаў і, адпаведна, ведаў іх сем'і, якія жылі ў Берліне або дзесьці ў ГДР. Не выключаю, што, калі прыязджалі нелегалы і мелася быць чарговая паездка, – ён удзельнічаў у выпрацоўцы задання, вызначэнні лініі паводзін і г. д.

Выпрацоўка задання для нелегала – вельмі адказная справа, гэта амаль палавіна поспеху або няўдачы ў будучай дзейнасці разведчыка за мяжой. Пры планаванні аперацыі трэба ўлічваць характар чалавека, ведаць абстаноўку ў яго дома – не толькі аператыўныя пытанні, але і складаемыя іншага кшталту: пра што ў яго душа баліць. Такімі псіхалагічнымі данымі ў адносінах да сваіх падапечных выдатна валодаў Аляксей Мікалаевіч. Вось чаму ён і ўдзельнічаў у распрацоўцы многіх аперацый, якія пасля, у тым ліку і пад яго куратарствам, выконвалі агенты-нелегалы.

Якія канкрэтна аперацыі планавалі і праводзілі ў тыя гады савецкія і гэдээраўскія спецслужбы, у тым ліку і з удзелам Бацяна, невядома. Аляксей Мікалаевіч пра іх не раскажа – ён умела перавядзе размову на іншую цікавую тэму, а архівы таксама пакуль маўчаць. Можна толькі здагадвацца пра іх змест і мэты: халодная вайна працягвалася, стратэгі НАТА і іх заакіянскія партнёры імкнуліся любымі спосабамі прынесці як мага больш шкоды свайму нядаўняму саюзніку і яго сябрам, стараліся вырваць

з сацыялістычнага лагера тую ці іншую дзяржаву. У 1956 годзе была Венгрыя, цяпер увагу звярнулі на Чэхаславакію. І Бацян як спецыяліст па гэтай краіне не заставаўся ўбаку. Так што накіраванасць плануемых з яго ўдзелам аперацый можна прадказаць з вялікай доляй верагоднасці.

## «ПРАЖСКАЯ ВЯСНА» ЎПАЛА Ў ЛЕТУ

Зазначым, што менавіта ў гэты час пачалася так званая «Пражская вясна» – чэхаславацкія падзеі. Абстаноўку, у якой давялося цяпер дзейнічаць Аляксею Мікалаевічу, нам лепш за ўсё дапамогуць зразумець успаміны іх сведак і ўдзельнікаў.

«На першы погляд, усё, што адбывалася ў Чэхаславакіі, было правільна і нават недзе прыгожа, – успамінае генерал-маёр Я. Г. Чыкулаеў, які ў 1968 годзе быў старшым оперупаўнаважаным асобага аддзела КДБ па 19-й мотастралковай дывізіі, якая дыслацыравалася ў Групе савецкіх войскаў у Германіі. – У студзені 1968 года першым сакратаром ЦК Чэхаславацкай кампартыі стаў Аляксандр Дубчак, які аб'явіў курс на вырашэнне эканамічных праблем. Пасля чэшскае кіраўніцтва перайшло да лібералізацыі ў палітычным плане: у прыватнасці, была дэкларавана свабода слова, якая неўзабаве вылілася ў ашалелую крытыку КПЧ, патрабаванні роспуску органаў бяспекі і іншыя аналагічныя рашэнні.

Зрэшты, свабода была "аднабаковай" і мела вельмі дакладную антыдзяржаўную, антыкамуністычную накіраванасць. Рэальна гэта была ідэалагічная апрацоўка насельніцтва. І вось на гэтай

хвалі да ўлады ў краіне фактычна прыйшлі правыя: у красавіку быў сфарміраваны новы ўрад на чале з Чэрнікам. Неўзабаве "лібералы" пачалі пераходзіць ад слоў да справы, і чым далей – тым больш рашуча. Пад markнымі нагодамі з усіх дзяржаўных органаў, у тым ліку – з дзяржбяспекі, органаў унутраных спраў, контрразведкі – было звольнена каля 300 тысяч чалавек, у асноўным тых, якія глядзелі на ўсход, г. зн. на Маскву. Быў ліквідаваны Чэхаславацкі саюз моладзі. А неўзабаве ўжо дайшло да лозунгаў: "Цягні на шыбеніцу ўсіх, хто супрацоўнічае з рускімі!"»

Чым гэта ўсё магло скончыцца, сведчаць сакрэтныя матэрыялы, якія пазней аказаліся ў руках савецкай дзяржбяспекі. У дакуменце «Запіс для старшыні ўрада Чэрніка» ёсць звесткі аб тым, што міністр унутраных спраў Й. Павел і загадчык аддзела ЦК КПЧ генерал Прхлік падрыхтавалі праект стварэння кіруючага цэнтра, які павінен быў узяць усю дзяржаўную ўладу ў свае рукі падчас палітычнай напружанасці ў краіне. Там жа сказана і аб прэвентыўных мерах бяспекі, накіраваных супраць выступлення кансерватыўных сіл, уключаючы стварэнне працоўных лагераў. Такім чынам, у Чэхаславакіі праводзілася тайная, але зусім рэальная падрыхтоўка да стварэння канцлагераў, куды саслалі б усіх, хто выступіў бы супраць рэжыму з такім «чалавечым тварам».

У Маскве сур'ёзна аднесліся да трывожнага становішча ў адной з краін Варшаўскага дагавора, і Чэхаславакія стала тэмай неаслабнай увагі кіраўнікоў на самым высокім узроўні. Вясной 1968 года Л. І. Брэжнеў выклікаў да сябе генерал-палкоўніка А. М. Маёрава, які камандаваў

38-й арміяй Прыкарпацкай ваеннай акругі, а пасля Цэнтральнай групай войск, дыслацыраванай у Чэхаславакіі, і спытаў яго напрамую, чаго чакаць ад такіх падзей у Празе.

Як піша генерал у сваёй кнізе, набраўшыся смеласці, ён выпаліў тое, пра што думаў: «У адзін цудоўны ранак, Леанід Ільіч, пад Чопам, Мукачава, Ужгарадам могуць быць выкінуты 82-я і 101-я паветрана-дэсантныя дывізіі войск НАТА. А цераз усю Чэхію і Славакію на максімальных хуткасцях пойдуць да іх на злучэнне пяты і сёмы армейскія карпусы ЗША (а гэта 9–11 дывізій), першы і другі армейскія карпусы ФРГ, гэта таксама 9–11 дывізій. Нам вядома: манеўры войск НАТА намечаны на пачатак верасня... А ноччу перад высадкай дэсанта будзе сфарміраваны марыянетачны ўрад Чэхаславакіі. Ён абвесціць нейтралітэт, заявіць пра выхад з Варшаўскага дагавора, звернецца з просьбай да НАТА абараніць краіну ад савецкага ўварвання. Чэхаславакія можа быць страчана. Або вялікая вайна».

Назвы гарадоў, пра якія гаварыў генерал, напомнілі Брэжневу яго ваенныя дарогі ў саставе вядомай 18-й арміі, якой на заключным этапе Вялікай Айчыннай вайны камандаваў наш зямляк-беларус генерал-лейтэнант А. І. Гасціловіч. Леанід Ільіч займаў тады пасаду начальніка армейскага палітаддзела і разам з камандармам і начальнікам штаба ўдзельнічаў у распрацоўцы аперацый па вызваленні гэтых населеных пунктаў. Прычым з узяццем станцыі і горада Чоп атрымалася закавыка. Штабныя работнікі паспяшаліся тады паведаміць пра ўзяцце Чопа па інстанцыі, і ў паведамленні Саўінфармбюро агучылі гэту інфармацыю. У час, калі

яна прагучала на ўсю краіну, фашысты конратакавалі і занялі гэты Чоп. Непрыемны асадак ад тых падзей застаўся ў камандавання 18-й арміі надоўга.

Магчыма, прыпомніўшы тыя дні, Брэжнеў пад уздзеяннем горычы ад былой непрыемнай падзеі і прыняў у далейшым рашэнне пра папераджальныя меры ў адносінах да Чэхаславакіі. Але хутчэй за ўсё кіраваўся ён горкім вопытам Венгрыі 1956 года. Думаю, абодва бакі канфлікту выдатна памяталі, што адбылося тады ў гэтай краіне, і не жадалі паўтарыць мінулае. Прычым савецкі ўрад не хацеў паўтарэння першага этапу таго «сцэнарыя»: народнае абурэнне ў Венгрыі, якое перайшло ў крывавы мяцеж, калі партыйных служачых, супрацоўнікаў службы бяспекі, звычайных мірных грамадзян проста расстрэльвалі на вуліцах. У сваю чаргу, чэхаславацкія стваральнікі «пражскай вясны» не жадалі паўтарэння «другога акта», а менавіта падаўлення паўстання сілай савецкай зброі.

Таму чэхі стараліся не дапусціць і не справакаваць савецкага ўзброенага ўмяшання, не лезлі на ражон, стрымліваліся ад рэзкіх заяў і рухаў, а савецкі бок пачаў прымаць прэвентыўныя меры, каб не дапусціць кровапраліцця. У русле гэтых мер нашаму герою давялося зноў нечакана для сябе наведаць Чэхаславакію.

«Вясной нам стала вядома – і нашы таварышы пра гэта даносілі, і па іншых лініях інфармацыя ішла, – што ў Чэхаславакіі працвітае антысавеччына, – распавядае былы калега Бацяна Валянцін Іванавіч. – Тады яшчэ не быў адпрацаваны механізм "каляровых рэвалюцый", але контрразведвальны апарат у іх стаў антысавецкім, паліцыя – тое ж самае, на адказныя пасады ў дзяржаве ціхенька

вылучалі людзей, якія былі супраць нашага блока... Наогул абстаноўка ўскладнялася. І тады кіраўніцтва наша (...) паставіла нам задачу: "Трэба дапамагчы". У маі наш аддзел быў падняты па трывозе, паступіла каманда: вылецець, знаходзіцца там і чакаць распараджэнняў... Праз дзень мы былі ў Берліне, дзе падхапілі Бацяна, і наступным днём цераз Мюнхен выехалі ў Прагу на дзвюх машынах з дыпламатычнымі нумарамі. Бацян кіраваў адной з іх. Ён патрэбен быў нам як чалавек, які ведаў мову, ведаў рэгіён. Прага была яшчэ не "франтавая", але адносіны да рускіх былі не вельмі добрыя...»

Падчас таго майскага візіту Аляксей Мікалаевіч і яго спадарожнікі наладжвалі цесныя кантакты з асобамі, якія цвёрда стаялі на сацыялістычных пазіцыях і былі за тое звольнены з органаў чэшскай службы бяспекі і іншых ведамстваў. Яны ахвотна ішлі на супрацоўніцтва з нашымі разведчыкамі, і таму ўдалося дакладна высветліць абстаноўку ў Празе. Вядучую ролю тут, безумоўна, сыграў былы «валынскі чэх» Алаіз Дворжак – Бацян. Ён звязваўся са сваімі былымі таварышамі па вучобе, па рабоце на заводзе і па месцы былога жыхарства. Дзякуючы валоданню мовай яго ўсюды прымалі за свайго і ахвотна дзяліліся навінамі. У прыватнасці, удалося высветліць адрасы арсеналаў зброі, якую рыхтавалі да дня «Ч».

У Празе група пабывала два разы – у маі і чэрвені. Пасля нечакана ёй чамусьці загадалі неадкладна і тэрмінова пакінуць Прагу і выехаць у Польшчу. Варшава сустрэла гасцей прыхільна, і тут адбыліся падзеі, якія вельмі здзівілі членаў групы. Бацян папрасіў у кіраўніка дазволу на некалькі тэлефонных званкоў.

– Я там пачаў шукаць і знайшоў людзей, якія ў мяне былі ў партызанах, – расказвае Аляксей Мікалаевіч. – Толькі набіраю тэлефон аднаго з іх і кажу: «Дзень добры, Сташу!» – ён мяне тут жа пазнаў! «Аляксей, дзе ты?!» – «У гандлёвым прадстаўніцтве» – «Неадкладна прыязджай да мяне!» Ён мяне забраў – паездзілі па Польшчы. Ён знайшоў тых таварышаў, з якімі я працаваў у час вайны... Мне там такі прыём наладзілі!»

Аповед гэты пацвярджае і Валянцін Іванавіч: «Калі прыехалі ў Варшаву, дзе нас чакалі, Бацян кажа кіраўніку групы: "Дазвольце я пазваню?" Мінут праз сорак пасля таго, як Бацян пазваніў, прыязджае машына, выходзіць палкоўнік, кажа: "Мы ўжо намецілі мерапрыемствы, калі ёсць час – паехалі спачатку ў горад Радам, гэта цэнтр Радамскага ваяводства, а пасля ў горад Ілжу!" А мы ж нічога гэтага не ведалі! Вось да чаго чалавек сціплы! Пра яго ўжо кніга выдадзена ў Польшчы, якая называлася "Партызан Алёша". Гэту кнігу напісаў палкоўнік Вісліч, які быў паручнікам у час вайны, калі яны пазнаёміліся.

...Калі мы з Аляксеем Мікалаевічам былі ў горадзе Ілжа, я сваімі вачыма бачыў той самы абеліск, дзе пра Бацяна напісана. Ля гэтага помніка быў арганізаваны ўрачысты мітынг, і мне было вельмі прыемна чуць, калі ўсе, нават маленькія піянеры звярталіся да яго: "Дарагі партызан Алёша!" І ветэраны, звяртаючыся да яго, таксама гаварылі не "Аляксей Мікалаевіч" а "партызан Алёша". Прыліпла да яго гэта званне!»

Тым часам паміж савецкім і чэхаславацкім бакамі вяліся напружаныя перамовы, якія, на жаль, не прынеслі чаканага выніку. Тады было

прынята рашэнне пра ўвядзенне ў Прагу і іншыя гарады Чэхіі кааліцыйнай групы войск краін Варшаўскага дагавора. Аляксею Мікалаевічу зноў давялося выехаць у Чэхаславакію, але ўжо не пад дыпламатычным прыкрыццём: машына была звычайная, а сам пасажыр выглядаў даволі камічна, бо адзелі яго ў гімнасцёрку не таго памеру.

«Неўзабаве пасля таго, як нашы войскі ўвайшлі ў Чэхаславакію, мяне без ведама майго аэрафлоцкага начальства забралі, і я туды паехаў, – распавядае Аляксей Мікалаевіч. – Мяне тады пераадзелі ў салдацкую форму, але тым людзям, якія мяне акружалі, было сказана: майце на ўвазе, усё, што ён загадае, выконвайце!»

У той візіт Бацян зноў вызначыўся: ён знайшоў вялікі арсенал зброі, якую планавалі раздаць паўстанцам напярэдадні рашаючых падзей. Ніхто не мог знайсці гэты склад, а ён знайшоў!

– Прыехалі туды, – працягвае аповед Бацян. – Добра, што я ведаў чэшскую мову! Чэхі перакрылі ўсе дарогі, усе ўказальнікі былі зняты, невядома, куды ехаць. Нічога, разабраліся! Хаця стаўленне да нас было варожым, але я знаходзіў людзей, якія разумелі, за кім праўда, ну і супрацоўнічалі з намі. Я вельмі добрых людзей знаходзіў, якія нам дапамагалі! Да таго ж у Марыянскіх Лазнях і Карлавых Варах тады адпачывалі нашы супрацоўнікі, я ездзіў туды, мы ўсіх забралі... Чэсна скажу, колькі я там часу прабыў – не памятаю. І як мяне ціха ўзялі, так жа ціха і адпусцілі. Я вярнуўся ў Германію, але маё месца ў «Аэрафлоце» аказалася занятым. Што ж рабіць, знайшлі іншае!

Намаганнямі А. М. Бацяна і яго таварышаў давялося пазбегнуць вялікага кровапраліцця, па-

шчасціла захаваць спакой і мір у Празе і іншых чэхаславацкіх гарадах і пасёлках. Ноччу на 21 жніўня, калі планавалася выдаць «апалчэнцам» зброю, усе склады і арсеналы былі заблакіраваны. Некалькі дзясяткаў тысяч адзінак зброі былі канфіскаваны. За гэта трэба падзякаваць Аляксею Мікалаевічу, Валянціну Іванавічу і іншым нашым разведчыкам.

## «СПАКОЙ НАМ ТОЛЬКІ СНІЦЦА...»

Служба ў Германіі пасля гэтага працягвалася. Дарэчы, прабыў Аляксей Мікалаевіч там не пяць лімітных гадоў, а цэлых сем: яго дзелавыя якасці высока цанілі і не адпускалі. Толькі ў 1972 годзе ён вярнуўся ў Маскву і збіраўся выйсці на заслужаны адпачынак – яму споўнілася 55 гадоў. На яго заяву пра пенсію кіраўніцтва адрэзала: «Куды табе на пенсію? Пойдзеш працаваць у 13-ы аддзел. Аддзел баявы!»

«Ён вярнуўся і доўгі час працаваў у тым падраздзяленні, якое адпавядала яго франтавому, ваеннаму вопыту, – удакладняе Міхаіл Пятровіч, выпускнік «101-й школы». – У асноўным там быў народ, які ўдзельнічаў у партызанскім руху...»

Але, як сказана ў «Энцыклапедыі сакрэтных службаў Расіі», неўзабаве на месцы 13-га аддзела «быў арганізаваны аддзел "В"..., які меў больш шырокую арганізацыю... Акрамя правядзення тэрарыстычных актаў аддзел быў надзелены і іншымі функцыямі, адной з якіх з'яўляўся збор інфармацыі пра ваенна-стратэгічныя аб'екты НАТА, а таксама падрыхтоўка надзвычайных планаў ды-

версій у розных камунальных службах, на транспарце, на аб'ектах сувязі і кіравання».

Пра гэтыя рэарганізацыі і далейшае развіццё аддзела, у якім давялося служыць Аляксею Мікалаевічу, успамінае генерал-маёр Ю. І. Драздоў. Ён непасрэдна кіраваў усімі пераўтварэннямі і работай аддзела, які ў розны час называўся па-рознаму, але выконваў усё тыя ж галоўныя функцыі. Так, у 1976 годзе ўзнік 8-ы аддзел (прамыя дзеянні, дыверсіі) Упраўлення «С» (нелегальная разведка) ПГУ КДБ... Вось што пра функцыі свайго ўпраўлення «С» расказвае Юрый Іванавіч:

«Наша ўпраўленне не вырашала якіх-небудзь пытанняў, звязаных з тэрарыстычнай дзейнасцю. Усё, што надрукавана апошнім часам за мяжой аб прыналежнасці 8-га аддзела Упраўлення "С" да тэрарызму, – не больш чым вольны палёт фантазіі аўтараў.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны на працягу шэрага гадоў падраздзяленні спецпрызначэння былога IV Упраўлення МДБ СССР, якія дзейнічалі ў тыле праціўніка і супраць бандытаў і пасобнікаў нацыстаў, былі згорнуты. 8-ы аддзел Упраўлення "С" сфарміраваўся да сярэдзіны 1970-х з некаторых былых супрацоўнікаў гэтых падраздзяленняў, быў нічым іншым, як інфармацыйнай і навукова-даследчай разведвальнай структурай, якая аператыўнымі сродкамі адсочвала ўсё, што тычылася сіл спецыяльнага прызначэння краін НАТА. Аддзел, натуральна, праводзіў падрыхтоўку спецрэзервістаў на выпадак магчымых ваенных дзеянняў, як гэта робіцца ў кожнай дзяржаве...

Падзеі ў Афганістане прымусілі нас стварыць у 1978–1980 гадах і паслаць туды ўкамплектаваныя спецрэзервістамі пазаструктурныя падраздзяленні тыпу "Зеніта" і "Каскада". Цяжкасці, якія там сустрэліся, даказалі памылковасць прынятага ў 1950-я рашэння пра заканчэнне дзейнасці часцей спецыяльнага прызначэння...»

І далей Юрый Іванавіч расказвае пра стварэнне зусім сакрэтнага атрада спецыяльнага прызначэння ў саставе 8-га аддзела Упраўлення «С» КДБ СССР для правядзення аперацый за межамі краіны ў «асобы перыяд». Ён быў створаны 19 жніўня 1981 года на закрытым сумесным пасяджэнні Савета Міністраў СССР і Палітбюро ЦК КПСС.

«...Яго першым камандзірам стаў удзельнік штурму палаца Аміна Герой Савецкага Саюза Эвальд Казлоў, баявы капітан 1-га рангу з марскіх пагранчасцей КДБ. А таму назвалі атрад "Вымпел", па асацыяцыі з адміральскім брэйд-вымпелам на мачце. Афіцыйная ж назва была сумная – Асобны вучэбны цэнтр КДБ СССР... Пасля таго як рашэнне пра фарміраванне "Вымпела" было прынята канчаткова, Юрый Іванавіч Андропаў перадаў мне паперы і сказаў: "Ну вось, на! Працуй, стварай! І каб роўных ім не было!"

Роўных ім сапраўды не было. І па ступені гатоўнасці пайсці на рызыку, і па ступені аператыўнай выдумкі, разведвальнай знаходлівасці. Яны даказалі сваё права на існаванне і даказалі права ганарыцца сваёй прафесіяй і сваімі навыкамі. Галоўная асблівасць "Вымпела" заключалася ў тым, што гэта была сіла, якая ўмела самастойна абдумаць любую задачу, прыняць правільнае рашэнне і ажыццявіць яго...

Мы выдатна ведалі, што наша баявая падрыхтоўка ў некаторых выпадках пераўзыходзіць амерыканскую па сваёй напружанасці, вастрыні і, можна сказаць, па выніковасці. Хаця магчымасцей для гэтага ў амерыканцаў было намнога больш. Адразу ж пасля стварэння атрада пачала фарміравацца і вучэбная база па некалькіх напрамках. Неабходна было поўнасцю прааналізаваць і абагульніць багаты вопыт дыверсійнай разведвальнай дзейнасці на тэрыторыі нашай краіны падчас Вялікай Айчыннай і папярэдніх войнаў, вопыт баявой падрыхтоўкі нашых ваенных, армейскіх падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння, вопыт нашых праціўнікаў – амерыканцаў, ізраільцян, заходніх немцаў...»

Да такой падрыхтоўкі «Вымпела» А. М. Быцян меў самае непасрэднае дачыненнне. На курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу (КУОС) ён прыязджаў у ролі пасрэдніка – прадстаўніка галаўной арганізацыі, ад заказчыка, удзельнічаў у вучэннях і занятках. Пра гэта расказаў Сяргей Аляксандравіч, які 10 гадоў быў начальнікам курсаў: «Бацян (...) прафесійна глядзеў, як ідзе працэс падрыхтоўкі. Пры гэтым сам нярэдка мог штосьці падказаць, параіць, навучыць...»

Аднойчы на агнявых занятках адбыўся выпадак, які надоўга стаў прыслоўем для ўсіх удзельнікаў курсаў. У той дзень курсанты адпрацоўвалі стральбу па нерухомых мішэнях з розных сістэм ручной зброі, прычым марку рэвальвераў і пісталетаў выбіраў сам курсант. Вынікі аказаліся несуцяшальнымі. Тады Аляксей Мікалаевіч папрасіў дазволу паўдзельнічаць у практыкаванні і выбраў парабелум, да якога прывык за ваенныя гады. Маладыя

афіцэры скептычна аднесліся і да выбару зброі, і да самога пасрэдніка. Бацян выйшаў на агнявую пазіцыю і, амаль не цэлячыся, зрабіў тры выстралы. Прысутныя затаілі дыханне.

– Дваццаць дзевяць! – далажыў кіраўнік агнявой падрыхтоўкі, на здзіўленне ўсёй аудыторыі.

«Наогул, на працягу ўсіх дзесяці гадоў, якія мы сумесна ў гэтай рабоце праводзілі, я атрымліваў ад яго толькі канкрэтныя заўвагі і прапановы, – працягвае Сяргей Аляксандравіч, – у нас было сапраўднае творчае супрацоўніцтва. Звычайна прыязджалі маладыя – правяраючым таксама даводзілася пераносіць немалыя фізічныя нагрузкі, але і Аляксей Мікалаевіч быў у нас частым госцем... Ён, выконваючы абавязкі пасрэдніка, павінен быў не толькі сустракаць групу пры вяртанні... Ён аглядаў месцы, вывучаў маршруты – фактычна сам па іх праходзіў, вызначаючы, каб была нармальная нагрузка на слухачоў – каб ім гэта запомнілася. І хаця ў нас ішла і тэарэтычная падрыхтоўка, але важней за ўсё было менавіта замацаванне практыкай. Бацян ацэньваў, што гэта будзе – імітацыя ці сапраўды баявая дзейнасць. Можна зразумець, што яго партызанскі вопыт выклікаў у слухачоў вялікую цікавасць. Задавалі самыя нечаканыя пытанні, напрыклад: “Аляксей Мікалаевіч, а як вы ў лесе спалі?” І тут Бацян тлумачыў, што нельга, напрыклад, прыхінацца галавой да сасны ці да елкі, таму што пасля ад смалы валасы ледзьве адарвеш... Многа карыснага ён даваў слухачам! Не толькі як партызан і дыверсант, але яшчэ і як чалавек, які любіць, ведае і разумее прыроду... Такой інфармацыі, што яны ад яго атрымлівалі, ні ў адным падручніку не знойдзеш!»

Служба Аляксея Міклаевіча працягваецца – ён застаецца ў страі і сёння, калі яму ўжо больш за сто гадоў. Праўда, здароўе калі-нікалі падводзіць, але здзіўляцца не будзем: столькі выпрабаванняў перанёс гэты чалавек, што іх хапіла б на некалькі лёсаў. Таварышы падтрымліваюць свайго ветэрана, часта сустракаюцца з ім. Сярод іх і генерал-маёр Юрый Іванавіч Драздоў – легендарны начальнік легендарнага Упраўлення «С» (знешняя разведка) – успамінае: «Калі ён прыязджае да мяне – з кім-небудзь удваіх, бывае, нават утраіх, – мы заўсёды пасядзім, пагаворым, выцягнем бутэльку віна або гарэлкі, калі трэба, павіншуем адзін аднаго, закусім, прыпомнім. ...Ён абавязкова прыбавіць якое-небудзь цікавае прыслоўе, і, я думаю, гэта гаворыць пра тое, што старая гвардыя яшчэ працягвае жыць і працаваць!»

«Нармальна цяпер усё, – гаворыць і Бацян. – Вось ужо некалькі гадоў, як мой зубны тэхнік (жонка Галя. – *Ю. В.*) пайшла з жыцця... Але ёсць дачка, унучка, праўнукі – скардзіцца не магу!»

Пасля таго як быў падпісаны Указ аб прысваенні Бацяну Аляксею Мікалаевічу даўно заслужанага звання Героя і справядлівасць, хаця і праз дзясяткі, гадоў нарэшце ўступіла ў свае правы, праслаўленага чэкіста сталі пазнаваць у шырокіх колах грамадства. Яго партрэт стварыў народны мастак СССР Аляксандр Максавіч Шылаў, і твор гэты аказаўся выстаўлены ў славутай «шылаўскай галерыі» паблізу Крамля. Мастак, як вядома, здольны заўважыць і адлюстраваць у свайго героя тыя рысы характару, якія часта застаюцца па-за ўвагай іншых людзей. Так здарылася і з партрэтам А. М. Бацяна.

Пазнаёміўшыся з творам Шылава, кіраўнік прэсбюро Службы знешняй разведкі Сяргей Мікалаевіч Іваноў прызнаваўся мастаку, што па яго партрэце яны пра Бацяна даведаліся нават больш, чым калі кантактавалі з ім. Іваноў, убачыўшы партрэт у майстэрні, быў нямала здзіўлены, што Аляксей Мікалаевіч прадстаўлены там такім жорсткім. На такую заўвагу Аляксандр Максавіч адказаў: «Калі вы з чалавекам кантактуеце, то вы глядзіце на яго, так сказаць, няўважліва, павярхоўна. А вось задача партрэтыста – пры абсалютным знешнім падабенстве паказаць унутраны свет чалавека і яго характар. Нават калі проста ўзяць яго "працоўную дзейнасць", то ўжо ясна, што гэта можа быць чалавек вельмі смелы, рашучы і жорсткі. Мяккі чалавек, нерашучы, якім бы патрыётам ні быў, не змог бы здзейсніць таго, што рабіў Бацян падчас Вялікай Айчыннай вайны! Так што ён вельмі жорсткі чалавек. У яго ў вачах столькі ўсяго...

Менавіта гэтыя рысы я і спрабаваў выявіць, калі пісаў партрэт. Хаця Аляксею Мікалаевічу ідзе цяпер 97-ы (размова адбывалася ў 2014 г. – *Ю. В.*), але гэтыя якасці ў яго характары захаваліся да гэтага часу. Калі з ім размаўляеш, ён усміхаецца, – але за чалавекам трэба сачыць тады, калі ён не бачыць, што на яго глядзяць. І тады разумееш, што гэта – горны арол, які ў любы момант гатовы сарвацца са скалы і кінуцца на сваю ахвяру. Безумоўна, дзеля Радзімы, для таго, каб прынесці ёй карысць, а не проста паказаць, які ён рашучы і смелы. Я перакананы, што і цяпер, нягледзячы на свой узрост, ён таксама выдатна выканае свой абавязак перад Радзімай, як выконваў яго падчас Вялікай Айчыннай вайны. А калі спатрэбіцца – ён ахвяруе сабой дзеля

Радзімы імгненна. Яго ўнутраны стан увесь у вачах, у поглядзе. Я яго пісаў проста як горнага арла – з натхненнем!»

Тым не менш Аляксей Мікалаевіч ніколі не дэманструе сваю жорсткасць, хіба толькі ў экстрэмальных сітуацыях у барацьбе з заклятым ворагам. Ды і то не заўсёды: мы памятаем, як ён не дазволіў растраляць палонных немцаў. А вось з простым чалавекам і асабліва з сябрамі Бацян зусім іншы. Ён умее зачараваць любога субяседніка, бо асабістай прыцягальнасцю валодае ў поўнай меры. Паразмаўляеш з ім пару хвілін і адчуеш, што перад табой адкрыты, родны чалавек. Хаця адкрытасць гэта толькі да пэўнай мяжы: знешняя разведка не той род дзейнасці, дзе можна быць цалкам шчырым.

Так, не просты чалавек Аляксей Мікалаевіч Бацян. Калі яго без усякага блату трымалі ў ГДР цэлых сем гадоў, значыць працаваў ён там выдатна, выніkова. А калі пра гэту работу нам нічога невядома, то і праціўнік застаўся ў поўным няведанні. Для разведчыка – гэта самы лепшы вынік. Вядомымі, як правіла, становяцца тыя разведчыкі, якіх праціўнік раскрыў. Не, не прасцяк наш Аляксей Мікалаевіч, хаця глянеш – душа-чалавек, дабрынёй так і свеціцца! Але прафесія наклала на яго характар адбітак.

Яшчэ адну рысу характару нашага героя адзначаюць яго таварышы – гатоўнасць прыйсці на дапамогу. Распавядае адзін з сяброў Бацяна пра канкрэтны выпадак. Яму слова. «...Мы сустрэліся з Аляксеем Мікалаевічам на нейкім прыёме. Пагутарылі пра жыццё-быццё, пра тое-сёе... Праз некалькі дзён тэлефануе: “Ты скардзіўся, што

ў цябе няма дачы? Дык вось, ёсць дача!” І я, з яго дапамогай, купіў сабе дачу. А гэта былі тыя часы, калі на тое, каб купіць, дапусцім, цэглу, трэба было запісвацца і чакаць, калі паштоўку прышлюць. Неўзабаве раптам тэлефануе Бацян: “Слухай, ты дачу купіў? Табе цэгла патрэбная? А то ў мяне паштоўка прыйшла, але мне яна ўжо не трэба”. Заўважце, не я тэлефаную і пытаюся, а ён. Дык мала таго, што ён мне паштоўку перадаў, – мы з ім ездзілі кудысьці ў Падмаскоўе, на завод, і ён таксама грузіў, а пасля прыехаў са мной на дачу разгружаць... Такія вось адносіны – абсалютна бескарыслівыя...»

...Жыве сціплы гераічны чалавек, наш зямляк, у маскоўскім мікрараёне Чартанава. Ён сам выбраў для сваёй кватэры такі адрас, што напамінае яму пра яго малую радзіму – невялікую вёсачку на Валожыншчыне пад цікавай назвай Чартавічы. Успаміны пра дзяцінства і юнацтва грэюць сэрца і душу Аляксея Мікалаевіча. Яму 10 лютага 2019 года споўнілася 102 гады. Пажадаем жа яму, Герою Расіі, кім ганарыцца і Беларусь, далейшага шчаслівага жыцця!...

## ЗМЕСТ

Будзьце пільнымі, людзі! ........ 5

**КАМАНДАРМ ВАСЯМНАЦЦАТАЙ**

Цягнік у гераічнае будучае ........ 9

Праз церні – да зорак ........ 13

У стэпах Манголіі ........ 19

На Першым і Чацвёртым Украінскіх ........ 26

Шлях праз Карпаты ........ 31

Баі пасля капітуляцыі ........ 41

Камандавац, вучыць і вучыцца ........ 45

**КАМІСАР ФЁДАРАЎ І ІНШЫЯ**

Першыя дні вайны ........ 51
Ваяваць можна і за лініяй фронту ........ 62
Пякельныя колы «Шталага-352» ........ 68
З рабочай каманды – наўцёкі ........ 82
У атрадзе Асташонка ........ 90
Нараджэнне «Штурма» ........ 97
Іншаземцы ў партызанскіх радах ........ 103
Камендант Маладзечна помсціць ........ 116
Шырыцца партызанская барацьба ........ 120
Разгром Лагойскага гарнізона ........ 127
Станаўленне брыгады ........ 135
Рымальд дэ Юнг зводзіць рахунак ........ 140
...І свінцом з наборнай касы ........ 144
Жонка камісара ........ 151
Карнікі пачынаюць «Котбус» ........ 155
Вайна на рэйках ........ 176

У баявым страі – медыцына ........................ 182

Сакратар Мінскага абкама партыі ................. 189

Падчас цяжкіх выпрабаванняў ...................... 195

Самая важная аперацыя «Штурмавой» ............ 201

Краёвая абарона не абараніла ...................... 209

Апошняя блакада ........................................ 217

Злачынствы ў Манырльскім лесе ..................... 231

«На тое яны і партызаны...» ........................ 236

## «ВОЛГА» ВЫХОДЗІЦЬ НА СУВЯЗЬ

«Волга» плыве на захад ............................... 243

Нечаканая сустрэча .................................... 254

У пошук нялёгкі выходзіць разведка... ............ 258

Разведданыя – шырокім патокам ..................... 261

«Шышкі» ваяваць не збіраюцца ...................... 263

Будаўніцтва – справа небяспечная .................. 266

...І прыгожая палавіна чалавецтва .................. 270

Барацьбы розныя формы .......... 272

Няўдалае прызямленне .......... 279

Схватка над возерам .......... 282

Прарыў .......... 288

Па старых адрасах .......... 296

Выратаванне доктара і радысткі .......... 299

Здрада і расплата .......... 304

Наперад, да лініі фронту .......... 314

**МЫ АДКРЫЕМ ІМЁНЫ ГЕРОЯЎ**

Пачатак вялікага шляху .......... 324

«З баявога задання не вярнуўся...» .......... 329

Праз 66 гадоў: апошняя кропка .......... 340

Поспех прыходзіць да настойлівых .......... 345

Бюракраты супраць патрыётаў .......... 353

**ХТО ВЫ, ПАН ДВОРЖАК, або БЕЗ ПРАВА НА СЛАВУ – 2**

Пан Дворжак едзе «на радзіму» .......... 363

Цэнтр прысылае сувязнога....................................376

І зноў – «Прага»: “Nehmen sie, platz, bitte!”.....382

Замежныя камандзіроўкі........................................386

«Пражская вясна» ўпала ў Лету..........................393

«Спакой нам толькі сніцца...»................................400

**Высоцкі, Ю. С.**

В93 Перамогу набліжалі як маглі : дакументальныя аповесці / Юліян Высоцкі. – Мінск : Звязда, 2019. – 416 с., [8] л. іл.

ISBN 978-985-575-218-0.

Героі новых аповесцей Юліяна Высоцкага – генерал А. І. Гасціловіч, камандарм 18-й арміі, дзе Леанід Брэжнеў узначальваў палітаддзел, М. І. Фёдараў, камісар самай баявой і трагічнай на Беларусі партызанскай брыгады «Штурмавая», удзельнікі разведвальна-дэсантнай групы 1-га Беларускага фронту, у якой поплеч змагаліся савецкія афіцэры і жаўнеры адроджанага Войска Польскага. А таксама юныя следапыты – навучэнцы 30-й мінскай гімназіі, якія адкрылі некалькі невядомых старонак вайны, паказалі высокі прыклад шанавання герояў Вялікай Айчыннай і захавання памяці пра іх.

Зацікавіць чытача і другая частка дакументальнай аповесці пра Героя Расіі – нашага земляка-беларуса Аляксея Бацяна – пра насычанае патрыятычнымі падзеямі пасляваеннае жыццё гэтага легендарнага чалавека.

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**ВЫСОЦКІ** Юліян Станіслававіч

**ПЕРАМОГУ НАБЛІЖАЛІ ЯК МАГЛІ**

*Дакументальныя аповесці*

Мастак *В. Г. Паўлавец*
Мастацкі рэдактар *А. В. Жыткевіч*
Пераклад на беларускую мову *Ю. С. Высоцкі*
Камп'ютарная вёрстка *Д. С. Камейша*
Стыльрэдактары *Н. Ф. Крыцкая, В. В. Крывадубская*

Падпісана да друку 24.05.2019. Фармат 84×108$^1/_{32}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 21,84+вкл. 0,84. Ул.-выд. арк. 15,83+вкл. 0,95.
Тыраж 500 экз. Заказ 1443.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом «Звязда».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 1/8 ад 02.08.2013.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

12+

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 2/102 ад 01.04.2014 г.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

**Мінск**
**Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова**
**«Выдавецкі дом «Звязда»**

**Прапануем выданні:**

*Юліян Высоцкі*

**ЗА КРАЙ БАЦЬКОЎСКІ, ЗА РАДЗІМУ**

Дакументальныя аповесці

---

**В РИТМЕ ЛЕТЯЩИХ ЛЕТ...**

Очерки истории комсомола Беларуси

*Составитель В. Ф. Гигин*

---

*Пантелеймон Пономаренко*

**ЛИЧНЫЙ АРХИВ И КНИЖНОЕ СОБРАНИЕ**

Сводный каталог

Па пытаннях набыцця кніг
звяртайцеся ў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда»
па адрасе: Рэспубліка Беларусь,
г. Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефон:
(8017) 271-79-65.



**Юліян Станіслававіч Высоцкі** нарадзіўся ў вёсцы Роўкавічы на Валожыншчыне 10 верасня 1939 года. Пасля вучобы ў Філіпіняцкай сямігодцы, якую ён закончыў з пахвальнай граматай, у 1955 годзе паступіў у педагагічнае вучылішча. Накіраванне на работу атрымаў у Жомайдзьскую васьмігодку, дзе працаваў настаўнікам пачатковых класаў і выкладаў гісторыю, літаратуру, музыку і нямецкую мову ў 5–8 класах. Вучыўся на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта і абараніў дыплом у 1967 годзе. Працаваў у Ашмянскай міжраённай газеце «Красное знамя», пасля ў валожынскай раённай газеце «Працоўная слава». Далей была праца ў «Мінскай праўдзе», «Юридической газете», а таксама ў часопісах «Ахова працы», «Гермес». У двух апошніх выданнях – на пасадзе галоўнага рэдактара.

Аўтар кнігі дакументальных аповесцей на ваенную тэматыку «За край бацькоўскі, за Радзіму», якая выйшла ў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» ў 2014 годзе.

ISBN 978-985-585-218-0

9 789855 752180

Юліян ВЫСОЦКІ

# Перамогу набліжалі як маглі